ARCHE Зьмест № 6’03 ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ

1. Зьмест / Уводзіны
2. Аб беларуска-расейскім яднаньні. Валер Булгакаў у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
3. Гантынгтан, праверaны часам. Беларусь і постсавецкія краіны ў канфлікце цывілізацыяў. Алег Латышонак у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
4. Толькі мова можа быць асновай. Эндру Ўілсан у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
5. Эўрапейскі ці славянскі выбар? Стывэн Уайт у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
6. Сэнс вопраткі на грамадзкай тэрыторыі. Нэлі Бекус у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
7. “Каўказ” пада мной. Сьціслыя нататкі наконт фармаваньня і практычнага выкарыстаньня “вобразу ворага” ў дачыненьні да “асобаў каўкаскай нацыянальнасьці”. Аляксей Левінсон у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
8. Шчарбіцкі forever. Мікола Рабчук у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
9. Польскія беды на эўрапейскім парозе. Багуслаў Бакула ў ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
10. Польшча як хворы чалавек Эўропы. Яанна Такарска-Бакір у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
11. З кнігі «Лісты да запатрабавання». Генадзь Бураўкін у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
12. Месяц на востраве Патас. Людка Сільнова ў ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
13. І ўбачыла асьліца анёла. Нік Кейв у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
14. Міты поўначы Магілева. Аляксей Бацюкоў у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
15. Ідзі і глядзі. Даніла Жукоўскі ў ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».

16. Разбор палётаў беларускай думкі. Андрэй Екадумаў у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
17. Анталёгія бяз духу. Янка Трацяк у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
18. Убоства тэорыі. Анатоль Сідарэвіч у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
19. Занядбаная старонка правапісу: прапановы пісаньня прыназоўніка у/ў перад словамі, што пачынаюцца з галоснай. Юры Пацюпа ў ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
20. Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сербіі і Беларусі. Віталь Сіліцкі ў ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
21. Беларусазнаўства па-англійску. Лявон Юрэвіч у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
22. Апошняя кніга змагара. Вольф Рубінчык у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».
23. Чым адрозніваюцца і хто вінаваты. Арнольд Макмілін у ARCHE 6(29)-2003. «ЭЎРОПА НА ЎСХОД АД ЭЎРОПЫ».

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (29) – 2003**

[image]

[image]

[image]

Эўропа на ўсход ад Эўропы

аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]
[image]

З ь м е с т

Эўропа на ўсход ад Эўропы
Валер Булгакаў. **Аб беларуска-расейскім яднаньні.**
Алег Латышонак. **Гантынгтан, праверaны часам.**
Толькі мова можа быць асновай нацыянальнай ідэнтычнасьці беларусаў. Гутарка з *Эндру Ўілсанам*.
Стывэн Уайт. **Эўрапейскі ці славянскі выбар?**
Нэлі Бекус. **Сэнс вопраткі на грамадзкай тэрыторыі.**
Аляксей Левінсон. **“Каўказ” пада мной.**
Мікола Рабчук. **Шчарбіцкі forever.**
Багуслаў Бакула. **Польскія беды на эўрапейскім парозе.**
Яанна Такарска-Бакір. **Польшча як хворы чалавек Эўропы.**
лірыка
Генадзь Бураўкін. **З кнігі “Лісты да запатрабаваньня”.**
Людка Сільнова. **Месяц на востраве Патас.**
Нік Кейв. **І ўбачыла асьліца анёла.**
Аляксей Бацюкоў. **Міты поўначы Магілева.**
крытыка
Даніла Жукоўскі. **Ідзі і глядзі.**
Андрэй Екадумаў. **Разбор палётаў беларускай думкі.**
Янка Трацяк. **Анталёгія бяз духу.**
Анатоль Сідарэвіч. **Убоства тэорыі.**
гіпотэза
Юры Пацюпа. **Занядбаная старонка правапісу.**
палітыка

Віталь Сіліцкі. **Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі.**
беларускі сьвет
Лявон Юрэвіч. **Беларусазнаўства па-англійску.**
спавешчаньні
Вольф Рубінчык. **Апошняя кніга змагара.**
Арнольд Макмілін. **Чым адрозьніваюцца і хто вінаваты.**

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 6 (29) – 2003
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/24
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 6 (29) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
Эўропа на ўсход ад Эўропы
Эўропа на ўсход ад Эўропы
Эўропа на ўсход ад Эўропы

унутранай патрэбы — паявіўся ў Беларусі. Аб прывабнасьці для расейцаў Лукашэнкавай “вэртыкалі ўлады” таксама можна многа напісаць.
Тым дзіўней назіраць, што найважнейшыя падзеі ў палітычным календары Беларусі і Расеі — прэзыдэнцкія выбары верасьня 2001 году і парлямэнцкія выбары сьнежня 2003 — прайшлі фактычна па адным і тым жа сцэнары. Абедзьве прэзыдэнцкія адміністрацыі ў імя посьпеху сваіх кандыдатаў і краху “антынароднай апазыцыі” пладзілі палітычных мутантаў, якія, мімікруючы пад апазыцыю да кіраўнічага рэжыму, насамрэч былі ім створаным і залежалі ад яго. Улетку 2001 у Беларусі такімі палітычнымі клонамі былі Наталя Машэрава, Сяргей Гайдукевіч і Міхаіл Марыніч, увосень 2003 г. у Расеі — апрача «Адзінай Расеі», блёк Рагозіна—Глазьева «Радзіма», «Народная партыя» і блёк двух расейскіх сьпікераў. Гэта з тых, хто асабліва не хаваў свайго сапраўднага аблічча. Былі і больш закансьпіраваныя агенты ўплыву.

Натуральна, гаварыць пра люстэркавае падабенства гэтых дзьвюх электаральных кампаніяў не выпадае. Для Крамля было важна зламіць хрыбет свайму галоўнаму палітычнаму антаганісту — камуністам, а ня толькі правесьці свае партыі ўлады ў Думу. У імя гэтага яму давялося ахвяраваць парлямэнцкай будучыняй дзьвюх зь іх. (Хаця таксама нельга недаацэньваць важнасьць дасягненьня канстытуцыйнай большасьці ў Думе, каб было лягчэй праводзіць перадзел маёмасьці. Аб гэтым гавораць дадзеныя праведзенага камуністамі перападліку галасоў: іх забіралі ў «Яблыка», «СПС» і «Радзімы», а КПРФ і ЛДПР фактычна не чапалі.)
Расейскія выбары таксама вызначаліся большым “карнавальным” размахам. Чаго толькі вартае абяцаньне глазьеўска-рагозінскай «Радзімы» павысіць сярэднюю зарплату ў Расеі ў чатыры разы або яе паразытаваньне на іміджы “баявых” генэралаў Валянціна Варэньнікава і Георгія Шпака. Дарэчы, на стале ў апошняга ляжыць пара прапанаваных беларускімі бізнэсоўцамі праектаў, зьвязаных, у прыватнасьці, з інвэстыцыямі ў беларускі гасьцінічны бізнэс. Ня будзе нічога дзіўнага, калі праз чатыры гады ён зь вядомага расейскага дэпутата ператворыцца ў ціхага беларускага капіталіста або, глядзіш, у пуцінскага намесьніка у Беларусі.

Але ў асноўным ідэйны сэнс гэтых дзьвюх кампаніяў супадаў. Іх арганізатары і выканаўцы паставілі перад сабой дзьве стратэгічныя мэты. Па-першае, пры дапамозе калярытных, пазнавальных у народзе палітыкаў, якія прэзэнтуюць “альтэрнатыўныя” і ў той жа час блізкія пэўным сацыяльным групам погляды на разьвіцьцё грамадзтва, заручыцца падтрымкай электаральнага “балота”, г.зн. тых, хто ніяк ня можа вызначыцца, за якую палітычную сілу галасаваць, а таксама раскалоць цьвёрды пратэстны электарат. Адсюль такі разгул нацыянал-сацыялістаў і сацыял-імпэрыялістаў сёлета ў Расеі ды лібэралаў і эўраінтэгратараў з захаваньнем нацыянальнай спэцыфікі два гады таму назад у Беларусі. Па-другое, публічна прынізіць рэальную палітычную апазыцыю і траўмаваць верных ёй выбарцаў шляхам яе ператварэньня ў палітычнага аўтсайдэра, які ня мае шанцаў вызначаць палітычны курс краіны. Нарэшце, абедзьве кампаніі зьбліжае іх практычны посьпех: і тут, і там выбарцы прагаласавалі так, як і мае быць.

Высновы з гэтага ўсяго невясёлыя. Тое, што Лукашэнка два гады таму сьвяткаваў сваю “элегантную й прыгожую перамогу”, заслуга хутчэй не кіраўніка яго выбарчай кампаніі Ўрала Рамдракавіча Латыпава, а невядомых грамадзкасьці заежджых расейскіх палітычных інжынэраў, якія кансультавалі лукашэнкаўцаў. Значыць, ужо тады Беларусь выкарыстоўвалася як палігон для практычнай апрабацыі новых палітычных тэхналёгіяў. Таму ня трэба зьдзіўляцца, калі кампанія правядзеньня расейскіх прэзыдэнцкіх выбараў пройдзе па беларускай мадэлі або з выкарыстаньнем нашага досьведу (толькі хіба з больш рэалістычным вынікам для дзейнага расейскага прэзыдэнта — час жа не стаіць на месцы і зброя барацьбы за электарат пастаянна ўдасканальваецца).

Беларусаў жа чакае чарговы тэст на палітычную сьпеласьць: парлямэнцкія выбары ўвосень 2004 году. Карцінныя скандалы і валтузьня вакол Лібэральна-дэмакратычнай партыі, якія дэталёва асьвятляліся ў дзяржаўных мэдыях, падтрымліваючы высокі градус грамадзкага інтарэсу да гэтай па сутнасьці праўрадавай арганізацыі, як нішто іншае паказваюць, што падрыхтоўку да іх пачала ня толькі дэмакратычная “пяцёрка з плюсам”.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 6 (29) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
Эўропа на ўсход ад Эўропы
Эўропа на ўсход ад Эўропы
Эўропа на ўсход ад Эўропы

“У адрозьненьне ад Арменіі, Беларусь мае слабое пачуцьцяненьня нацыянальнай тоеснасьці. Яна яшчэ больш залежная ад расейскай дапамогі. Шмат яе жыхароў, як здаецца, атаясамліваюць сябе ў роўнай ступені з Расеяй, як з усякай іншай краінай. У студзені 1994 году заканадаўчы орган пасаду прэзыдэнта кансэрватыўнага прыхільніка Расеі, замяніў цэнтрысцкага нацыяналіста. У ліпені 1994 году большасьць электарату выбралі прэзыдэнтам краіны прарасейскага прыхільніка Ўладзімера Жырыноўскага. Беларусь разам з Расеяй ў Садружнасьць Незалежных Дзяржаваў, была заснаваная эканамічнага саюзу з Расеяй і Ўкраінай, створанага ў 1993 годзе, пагадзілася на валютны саюз з Расеяй, перадала Расеі ядзерную зброю і дала згоду на разьмяшчэньне расейскіх войскаў на сваёй тэрыторыі да канца гэтага стагодзьдзя [ужо мае быць **Аўт.**]. У 1995 г. Беларусь, калі не зважаць на назоў, часова практычна часткай Расеі”.

Ня ведаю, ці пазналі б сябе Мечыслаў Грыб, Станіслаў Шушкевіч і Аляксандар Лукашэнка ў характарыстыцы, дадзеных ім Гантынгтанам, — з цывілізацыйнай пэрспэктывы гэта, відаць, малаістотна.

Якім жа чынам Гантынгтан прыйшоў да гэткіх радыкальных высноваў? Ён дае ў сваёй кніжцы шырокую панараму вельмі сучаснага сьвету, падзеленага на асобныя цывілізацыі. Цывілізацыі ён акрэсьлівае наступным чынам:

“З усіх аб’ектыўных элемэнтаў, зь якіх можна скласьці дэфініцыю цывілізацыі, найважнейшую ролю звычайна адыгрывае рэлігія, што падкрэсьлівалі ўжо старажытныя. Наагул, вялікія цывілізацыі ў гісторыі чалавецтва да ўключна атаясамліваюцца зь вялікімі рэлігіямі сьвету; і людзі, якія належаць да аднаго народу моўна, але разьдзеленыя рэлігіяй, могуць рэзаць адзін аднаго, як гэта было ў Лібане, былой Югаславіі, і на [індыйскім] субкантынэнце”.

“сутыкненьня цывілізацыяў” апісаў у сваім артыкуле «Belarusian National Identity and the Clash of Civilizations» у прынесьвечаным Беларусі вакну ў імэрыканскага часопісу «International Journal of Sociology» (Fall 2001, Vol.31, No.3).

[1] Асноўныя тэзы Гантынгтан падаў у 1993 годзе ў часопісе «Foreign Affairs». Артыкул выклікаў шырокую дыскусію. Глядзі: *Samuel P.Huntington’s The clash of*

civilizations? The debate, **Foreign Affairs, New York, 1996. У форме кніжкі праца выйшла ў сьвет у 1996 г. Я карыстаўся выданнем: Samuel P.Huntington,** ***The Clash of Civilizations and the remaking of World Order*****, Touchstone Books, 1998.**

Затым Гантынгтан падзяляе чалавецтва на восем галоўных цывілізацыяў: кітайскую, японскую, ісламскую, індыйскую, заходнюю, праваслаўную, лацінаамэрыканскую і эвэнтуальна афрыканскую на поўдзень ад Сахары. Адносіны між гэтымі цывілізацыямі ён дэманструе на схеме «Глябальная палітыка. Узьнікаючыя хаўрусы»:

[image]

Няцяжка заўважыць, што ажно чатыры з вышэйназваных цывілізацыяў вызнаюць адну вялікую рэлігію — хрысьціянства. Калі рэлігія мае быць тым, чым яна ёсьць для цывілізацыі паводле Гантынгтана, дык ні пра якія цывілізацыйныя разрывы між Захадам, Лацінскай Амэрыкай, праваслаўем і пратэстанцка-каталіцкай часткай Афрыкі (Гантынгтан яшчэ выдзяляе сярод меншых цывілізацыяў хрысьціянскую цывілізацыю Этыёпіі) гаварыць не выпадае. Эўрапейскія

каталікі, пратэстанты і праваслаўныя, настолькі розныя з свайго гледзішча, з пункту гледжаньня Індыі проста эўрапейцы-хрысьціяне, а іхныя “сусьветныя” войны — усяго толькі эўрапейскія грамадзянскія войны. Калі рэлігія — гэта свайго роду цывілізацыйны код, дык няма ніякай падставы падзяляць хрысьціянства на асобныя цывілізацыі, бо ўва ўсіх хрысьціянаў адзін Бог і адзіная сыстэма вартасьцяў.
У сувязі з гэтым схема глябальнай палітыкі і цывілізацыйных хаўрусаў Гантынгтана павінна выглядаць гэтак:

[image]

Аказваецца, сьвет цывілізацыяў нашмат менш складаны, чым яго паказвае Гантынгтан. Пры тым прапанаваная вышэй схема адпавядае высновам Гантынгтана адносна будучага хаўрусу Захаду з Расеяй і Лацінскай Амэрыкай.

У схеме, аднак, сумнеўнай застаецца імавернасьць блёку Іслам — Кітай. Гэта працоўная гіпотэза аўтара і як такая аспрэчваньню не паддаецца. Хачу толькі зьвярнуць увагу на сутнасныя хібы аўтара адносна ісламска-кітайскага пытаньня, зьвязаныя зь ягонымі высновамі адносна расейскага блёку.
У гэтым выпадку Гантынгтан двойчы парушыў усталяваныя самім сабою правілы “цывілізацыйнай гульні”.
Па-першае, ён уключыў у склад праваслаўнай цывілізацыі аграмадныя абшары, населеныя мусульманамі: Паўночны Каўказ, Татарстан, Башкартастан і Казахстан. Як паказваюць палітычныя падзеі, мусульманскія народы ўключацца ў праваслаўную цывілізацыю ня думаюць. У выніку аўтар прызнае, што Расея мае “абгрунтаваныя інтарэсы што да бясьпекі ейных паўднёвых межаў”, але, згодна зь ягонай агульнай тэорыяй, Расея рэалізаваць гэтых інтарэсаў ня зможа.
Па-другое, вялікі абшар, населены мусульманамі, — Усходні Туркестан (Сіньцзянь-Уйгурыю) — Гантынгтан паказаў як прыналежны да кітайскай цывілізацыі.
Такім чынам, на карце і ўва ўяўленьні чытача ўзьнікае праваслаўна-кітайская мяжа ў некалькі тысяч кілямэтраў. На мой погляд, такое вялікае адступленьне Гантынгтана ад сваёй тэорыі ня можа вынікаць зь няведаньня. Як можна меркаваць, аўтар ахвяраваў прынцыпамі сваёй тэорыі дзеля акрэсьленай мэты — прамоцыі Расеі як патэнцыйнага хаўрусьніка Захаду

ў прадвешчаным ім канфлікце з кітайска-ісламскім блёкам. У рэальнасьці ж з Кітаем мяжуе толькі славянская атока над Амурам і Ўсуры. Этнічна расейскую Расею аддзяляе ад Кітаю шырокі пояс ісламскіх і будыйскіх краінаў. Як мусульмане, так і будысты змагаюцца з Кітаем не на жыцьцё, а на сьмерць. Пра праваслаўных гэтага аніяк ня скажаш. Дарэчы, сам Гантынгтан паказвае адносіны Расея—Кітай як менш канфліктныя. Гантынгтан апрыёры закладае канфлікт Захаду з ісламам і Кітаем. Тым часам канфлікт ісламу з хрысьціянствам не вынікае з цывілізацыйных перадумоваў. Калі прымаць усур'ёз тэорыю Гантынгтана аб рэлігійнай аснове цывілізацыі, дык існуе блёк трох рэлігіяў: юдаізму, хрысьціянства і ісламу, якія выводзяцца з "рэлігіі Абрагама". Мусульмане называюць гэты блёк "Народамі Кнігі". Гантынгтан, як ні дзіўна, адмаўляе існаваньне асобнай юдэйскай цывілізацыі, хаця, калі ўжыць ягоную тэорыю, справа зь юдаізмам простая: ёсьць рэлігія — дык павінна быць і цывілізацыя, няхай сабе й малая. "Народам Кнігі" можна супрацьпаставіць іншы магчымы цывілізацыйны блёк. Ён намнога менш выразны, расплывісты, тым ня менш ягоны контур можна акрэсьліць: Кітай, Індыя, Японія, будызм. Гэты апошні і ёсьць злучвом між трыма першымі. Будызм — злучво, нашмат слабейшае за "рэлігію Абрагама", таму Гантынгтан, які разглядае будызм як магчымае злучво згаданых цывілізацыяў, усё ж такі гэткай ягонай ролі не прызнае. Тым ня менш факт, што будызм, народжаны ў Індыі, заваяваў трывалыя пазыцыі ў Кітаі ды Японіі, можа паказваць на існаваньне нейкай слабой, але рэальнай цывілізацыйнай супольнасьці. Пры тым будызм у нашыя дні вяртаецца ў Індыю як рэлігія, якую маглі б прыняць за сваю індускія парыі.
Дзеля гэтага рэлігійны сьвет цывілізацыяў можна паказаць і так:

[image]

У гэтым сьвеце, нягледзячы на крывавыя канфлікты ўнутры блёкаў, асноўная частка энэргіі павінна накіроўвацца вонкі, супраць цывілізацыяў другога блёку. Паказваючы сьвет цывілізацыяў, Гантынгтан робіць яшчэ адну памылку, важнейшую за ўсе іншыя. Дэфінуючы Захад як заходняе хрысьціянства, ён недаацэньвае праблему дэхрысьціянізацыі

Захаду. Гантынгтан бачыць, што заходняя цывілізацыя ў Эўропе можа быць падарваная ў выніку аслабленьня хрысьціянства. Тым ня менш хрысьціянскія ідэалы, вартасьці і звычаі надалей, на яго думку, пранікаюць у эўрапейскую цывілізацыю. Гантынгтан тут прыводзіць прыклад нерэлігійнай Швэцыі, у якой грамадзтва сфармавалася дзякуючы лютэранскай спадчыне. (З гэтага гледзішча самаакрэсьленьне Аляксандра Лукашэнкі як “праваслаўнага атэіста” само зь сябе несупярэчнае.) У Амэрыцы Гантынгтан бачыць адраджэньне рэлігіі. Аднак, хаця падобнае тлумачэньне яшчэ зусім нядаўна адпавядала праўдзе, сёньня яно ёй ужо не адпавядае. Заходні хрысьціянскі атэізм эвалюцыянаваў у шматаблічны антыхрысьціянізм. Гантынгтан, відаць, гэта адчувае, называючы Эўропу і англасаксонскія краіны Захадам, а не заходнім хрысьціянствам. Ставячы кропкі над «і», варта было б прызнаць, што Захад у вялікай ступені не-хрысьціянства, а можа, нават і не-цывілізацыя. Як не-цывілізацыя, Захад супрацьстаіць усім абапёртым на рэлігіі цывілізацыям, уключна з заходнім хрысьціянствам. З гэтага вынікае, што асноўны цывілізацыйны канфлікт пралягае ўсё ж такі ўнутры Захаду (да тэракту 11 верасьня 2001 году самы крывавы антыдзяржаўны тэракт у Амэрыцы быў зьдзейсьнены амэрыканцам-хрысьціянінам). Калі справа стаіць так, дык перамога Гантынгтана ў спрэчцы з Фукуямам была абвешчаная заўчасна.

Тэракт 11 верасьня 2001 году, які фатальным чынам паспрыяў пашырэньню паглядаў Гантынгтана, можна тлумачыць ня толькі канфліктам рэлігійных цывілізацыяў. Ёсьць даволі добра падмацаваная думка, што, хутчэй за ўсё, гэта была праява арабскага нацыяналізму. Усе тэрарысты былі арабамі і атакавалі Амэрыку перш за ўсё не за ейнае хрысьціянства і не за падтрымку Ізраілю, а за разьмяшчэньне амэрыканскіх войскаў ля Мэккі й Мэдыны, якія і для арабаў, і для мусульманаў больш сьвятыя за Ерусалім. У кожным выпадку, скрадзеныя самалёты былі накіраваныя на дзяржаўныя, вайсковыя і фінансавыя аб’екты, а не на хрысьціянскія храмы («World Trade Center» можна лічыць толькі храмам Мамоны). Калі б «Аль Каіда» хацела абвясьціць вайну хрысьціянскаму Захаду, дык накіравала б самалёт у сабор Сьвятога Пятра ў Рыме, бо гэта найвядомейшы сымбаль заходняга

хрысьціянства.
Перайду цяпер да разгляду панятку “праваслаўная цывілізацыя”, бо да гэткай цывілізацыі Гантынгтан беззасьцярожна далучае і Беларусь.
Паводле яго, “некаторыя вучоныя вылучаюць праваслаўную цывілізацыю, цэнтар якой — Расея. Ад заходняга хрысьціянства яе адрозьнівае бізантыйскае паходжаньне, адмысловая літургічная практыка, 200 гадоў татарскага панаваньня, бюракратычны дэспатызм і абмежаваны кантакт з Рэнэсансам, Рэфармацыяй, Асьветніцтвам ды іншымі зьявамі, надзвычай важнымі для Захаду”. Хаця ў дэфініцыі відаць пэўная тонкасьць (“некаторыя вучоныя” — дык ня ўсе і нават ня большасьць), у далейшым Гантынгтан карыстаецца паняткам “праваслаўная цывілізацыя” як цэпам.
Расея для яго — цэнтар праваслаўнай цывілізацыі, адпаведны разам узятым Францыі і Нямеччыне на эўрапейскім Захадзе. У расейскі блёк Гантынгтан уключае ў першую чаргу Беларусь, Малдову і Арменію, а таксама Казахстан. Слабей зьвязанымі ён лічыць Грузію і Ўкраіну, у балканска-міжземнаморскай зоне як блізкіх хаўрусьнікаў Расеі пералічвае Баўгарыю, Грэцыю, Сэрбію й Кіпр, слабей зьвязанай лічыць Румынію. У расейскі блёк Гантынгтан уключае таксама буфэр у выглядзе адносна слабых, на яго думку, мусульманскіх рэспублік Цэнтральнай Азіі.
Гантынгтан уважае, што інтарэсы Захаду і Расеі — наноў вызначыць узаемны расклад сілаў, узгодніць абодвума бакамі асноўны балянс і зоны ўплываў. Асновы гэткага дагавору ён вылучае ў наступных пунктах:

“1. Прыняцьце Расеяй узбуйненьня Эўразьвязу і NATO заходнехрысьціянскімі дзяржавамі Ўсходняй і Заходняй Эўропы, а таксама забавязаньне Захадам не пашыраць NATO на ўсход, пакуль Украіна не распадзецца на дзьве дзяржавы (sic!).
2. Дамова пра партнэрства паміж Расеяй і NATO аб ненападзе, рэгулярных кансультацыях у пытаньнях бясьпекі, узаемных намаганьнях пазьбягаць гонкі ўзбраеньняў; падпісаньне ўзаемавыгаднага пагадненьня аб кантролі ўзбраеньняў, якое адпавядала б патрэбам бясьпекі абодвух бакоў пасьля заканчэньня халоднай вайны.
3. Прызнаньне Захадам факту таго, што перш за ўсё Расея

адказвае за ўтрыманьне бясьпекі ў праваслаўных краінах і на абшарах зь перавагай праваслаўя.
4. Дапамога Захадам Расеі ў вырашэньні наяўных і магчымых праблемаў бясьпекі на яе поўдні, а таксама ў абароне ад мусульманскіх народаў (...).
5. Узаемадзеяньне Расеі і Захаду на роўных у гэткіх пытаньнях, як праблема Босьніі, якія закранаюць як заходнія, так і праваслаўныя інтарэсы".
Надта ж дбайна гэты Гантынгтан адстойвае інтарэсы Расеі! Столькі тут "узаемнасьцяў", ажно перакладаць цяжка. Праект гэткі можна падсумаваць адным словам: новая Ялта.

Расею Гантынгтан залічае да г.зв. краінаў на раздарожжы, або "разарваных" (torn countries). Жыхары гэтых краінаў, паводле яго, сыходзяцца ў тым, хто яны, але ім не стае аднадумства наконт таго, якую цывілізацыю яны павінны лічыць сваёй. Расея знаходзіцца на раздарожжы з часоў Пятра I. Яе жыхары разыходзяцца ў думцы наконт таго, ці іхная краіна — частка заходняй цывілізацыі, ці цэнтар асобнай цывілізацыі. У сувязі з гэтым, калі Расея пяройдзе ў кола заходняй цывілізацыі, праваслаўная цывілізацыя перастане існаваць.
Гантынгтан як быццам не заўважае, што Расея належыць да краінаў, акрэсьленых ім як "расшчэпленыя" (cleft countries), нават калі забыцца пра мільёны мусульманаў і ўлічваць толькі этнічна расейскую Расею. За фасадам афіцыйнага праваслаўя растуць нэапратэстанцкія грамады. Паводле Гантынгтана, "у грамадзтвах, якія хутка мадэрнізуюцца і ў якіх традыцыйная рэлігія няздольная адаптавацца да патрэбаў мадэрнізацыі, існуе магчымасьць пашырэньня заходняга хрысьціянства й ісламу. У гэткіх грамадзтвах найбольш пасьпяховыя носьбіты заходняй культуры — гэта не нэаклясычныя эканамісты, змагарныя дэмакраты ці мэнэджэры зь міжнародных карпарацыяў. Найчасьцей гэта хрысьціянскія місіянэры". Расея, як і ўся постсавецкая прастора, — гэта поле дзейнасьці нэапратэстанцкіх місіянэраў, падобнае да Лацінскай Амэрыкі. Гантынгтан, які шмат піша ў гэтым кантэксьце пра Лацінскую Амэрыку, Азію й Афрыку, постсавецкую прастору пакідае ў гэтым выпадку па-за ўвагай.
Аб прарасейскасьці Гантынгтана, апрача адвольнасьці, зь якой ён трактуе сваю ўласную тэорыю ў дачыненьні да Расеі,

красамоўна сьведчыць незвычайна сур'ёзнае ўжываньне гэтай тэорыі адносна Ўкраіны.
Паводле яго, Украіне пагражае распад на праваслаўны Ўсход і каталіцкі Захад. Выглядае, ён ня ведае аб тым, што палова заходніх украінцаў — праваслаўныя валынцы. Толькі разгледзеўшы ўсе магчымыя катастрофы, якія неўзабаве (прайшло дзесяць гадоў, і ніводная ня зьдзейсьнілася) чакаюць Украіну, Гантынгтан згаджаецца з Джонам Морысанам, што адносіны між Расеяй і Ўкраінай для Ўсходняй Эўропы тое самае, што для Заходняй — адносіны між Нямеччынай і Францыяй. Узгадаем, што раней аўтар сьцьвярджаў, што Расея сама адыгрывае для праваслаўнай цывілізацыі ролю Францыі і Нямеччыны разам узятых. Такім чынам, маем дачыненьні з чарговай непасьлядоўнасьцю аўтара, гэтым разам вартай пахвалы: урэшце прызнаюцца рэаліі — хрысьціянскі Ўсход мае сама менш два цэнтры. Варта тут нагадаць і пра тое, што ўва Ўкраіне больш праваслаўных прыходаў, чым у Расеі. Калі ўкраінскія праваслаўныя цэрквы аб'яднаюцца ў адну, гэтая царква будзе найвялікшай праваслаўнай царквой у сьвеце. Дадам яшчэ, што Расея ніколі не выконвала ролі цывілізацыйнага цэнтру для праваслаўных краінаў балканска-міжземнаморскай зоны. Падпарадкаваць Расеі гэтую зону ня здолеў нават Сталін, пагатоў ніхто ня зробіць гэтага цяпер. Такім чынам, вылучаючы палітычны расейскі блёк як асобную цывілізацыю і паказваючы спосабы яго далучэньня да Захаду, Гантынгтан практыкуе нешта добра памятнае з часоў камунізму: зь вялікай натугай пераадольвае цяжкасьці, якія сам стварыў.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21

[image]

Толькі мова можа быць асновай

Гутарка з брытанскім тэарэтыкам нацыяналізму Эндру Ўілсанам

ЭНДРУ ЎІЛСАН — выкладчык лёнданскай «Школы славянскіх і ўсходнеэўрапейс дасьледаваньняў». У 2000 годзе выдаў кнігу «The Ukrainians: Unexpected Nation» (Yale University Press), рэцэнзія на якую нядаўна была зьмешчана ў «ARCHE».

— Як вынікае з Вашай кнігі «Ўкраінцы: неспадзяваная нацыя», Вы бачыце пэўную долю гістарычнай выпадковасьці ў тым, што зь беларусаў і ўкраінцаў паўсталі дзьве розныя нацыі. Што ж перашкодзіла беларусам і ўкраінцам ператварыцца ў адзін народ?

— Так, за часоў Скарыны існавала адна супольная дамадэрная русінская нацыя. Але трэба дапускаць, што ў той час нармальна было мець адначасова некалькі ідэнтычнасьцяў — і русіна, і грамадзяніна Літвы ці Польшчы. Я люблю новую кнігу Наталі Якавенкі «Паралельний світ» і, выкарыстоўваючы яе назву, хачу сказаць, што гэтыя ідэнтычнасьці сапраўды існавалі ў паралельных сьветах. Але, з другога боку, яны суіснавалі, можа, нават у сьвядомасьці адной і той жа асобы. Да таго ж, русіны займалі вялікую тэрыторыю і паміж русінскай

ідэнтычнасьцю ў Кіеве і ў Вільні існавалі адметнасьці. Апрача гэтага, у Кіеве падчас дзейнасьці Пятра Магілы адбылася сапраўдная культурная рэвалюцыя. Дадайце сюды яшчэ казацкія войны і расейскае нашэсьце ў XVII ст. Значыць, пасьля Магілы, пасьля Хмяльніцкага, пасьля Андрусова гэтыя розныя часткі магчымай нацыі пайшлі рознымі шляхамі.

— І Беларусь стала калёніяй Расеі?

— Тэарэтыкі посткаляніялізму заўсёды хочуць паказаць штось амаль універсальнае для розных краін. Але гістарычны досьвед гэтых краін розны. Што такое імпэрыя? Мне падабаецца дэфініцыя амэрыканскага навукоўца Аляксандра Мотыля. Імпэрыя мае свой цэнтар і шмат пэрыфэрыяў. Каб быць імпэрыяй, трэба мець больш за дзьве пэрыфэрыі. Нельга гаварыць пра былую Чэхаславаччыну як пра імпэрыю, бо яна мела адзін цэнтар і адну пэрыфэрыю. Значыць, адна імпэрыя мае дзьве, тры, чатыры і г.д. пэрыфэрыі і кантралюе іх недэмакратычнымі мэтадамі. Чаму я так шмат гавару пра тэарэтытычныя пытаньні? Некаторыя схаластычныя крытыкі маіх твораў пісалі, што цэнтар — Пецярбург або Масква, як, зрэшты, і шмат беларусаў, — ня думаў пра Ўкраіну ці Беларусь як апрычоную нацыю. Цэнтар ня бачыў Беларусь як пэрыфэрыю. Цэнтар, асабліва ў апошнія гады імпэрыі Раманавых, разумеў палітычныя, этналінгвістычныя працэсы і рабіў стаўку на нацыятворчы праект. І, безумоўна, беларускі народ быў для яго племем, а таму часткай гэтага праекту.

Так, Расейская імпэрыя мела свой цэнтар. Але цяжка сказаць, што гэты цэнтар быў расейскім народам. Расейская імпэрыя найперш была імпэрыяй Раманавых, а не імпэрыяй расейскага народу. Хаця ў самы апошні пэрыяд свайго існаваньня цэнтар выкарыстоўваў элемэнты расейскага нацыяналізму. Што да Савецкага Саюзу, то ён быў вельмі своеасаблівым утварэньнем. Тут можна выкарыстаць творы іншага тэарэтыка, Эрнэста Гелнэра. Згодна зь яго тэарэтычным падыходам да нацыялізму, да мадэрнізацыі існуе традыцыйнае грамадзтва з тыповай структурай: існуе эліта, існуюць меншасьці, якія валодаюць асаблівымі культурнымі адзнакамі. У такім грамадзтве шмат сялян — носьбітаў патрыярхальных ідэнтычнасьцяў — тутэйшых, кажучы па-беларуску. Працэс мадэрнізацыі павольна стварае новую супольнасьць. Савецкі Саюз быў унікальнай

спробай “закілзаць” гэтыя працэсы і спыніць мадэрнізацыю паводле Гелнэра, г.зн. замарозіць этнічныя ідэнтычнасьці і стварыць па-за імі новую ідэнтычнасьць. Савецкі Саюз стварыў для беларусаў “эрзацэтнаідэнтычнасьць”.
Значыць, можна гаварыць пра элемэнты расейскага каляніялізму ў дачыненьні да Беларусі, перадусім у галіне культуры і эканомікі. Але і ў імпэрыі Раманавых, і ў Савецкім Саюзе немагчыма вытлумачыць пазыцыі беларусаў толькі з пункту гледжаньня каляніялізму. Яго можна выкарыстоўваць, але будзе перабольшаньнем гаварыць, што Беларусь была звычайнай калёніяй.

— Больш за тое, Марцін Маля ў «Савецкай трагедыі» заўважыў, што й Савецкі Саюз спрычыніўся да стварэньня беларускай нацыі…
— Усё залежыць ад таго, дзе вы пачынаеце гісторыю. Была адна нацыя да 1839 або да 1667 году, і гэта была паўславянская шматнацыянальная нацыя Літвы. Трагедыяй для беларусаў было зьнішчэньне трэгераў яе ідэнтычнасьці. Яе носьбітамі былі перадусім эліты, і перадавалася яна праз каналы сярэднефэадальнай вэрсіі грамадзкай камунікацыі, г.зн. не праз газэты і школы, а праз царкву і іншыя дамадэрныя спосабы сацыяльнай камунікацыі. Усе гэтыя каналы і сацыяльныя слаі былі страчаныя. Другая вэрсія сучаснай беларускай гісторыі пачынаецца падчас другой сусьветнай вайны ex nihilis. Але толькі здаецца, што беларуская гісторыя пачынаецца амаль ex nihilis падчас вайны.
— Марцін Маля меў на ўвазе, што дзякуючы сваёй эрзацдзяржаўнасьці ў форме БССР і яе культурным, палітычным і г.д. інстытутам беларусы як цалкам негістарычная, пазбаўленая традыцый дзяржаўнасьці нацыя займелі які-ніякі сымбалічны капітал, ад якога быў невялікі масток да мысьленьня ў катэгорыях сваёй нацыянальнай дзяржавы.
— Так, ён меў рацыю. Цяпер цяжка зразумець бальшавікоў, што яны сапраўды думалі, якія наступствы дзеяньня гэтых структур сымбалічнага капіталу яны прадугледжвалі. Безумоўна, яны не чыталі твораў Гелнэра (*сьмяецца*). Яны былі ідэалістамі і меркавалі, што могуць супыніць і замарозіць пэўныя сацыяльныя працэсы і пэўныя тэндэнцыі, якія яны не хацелі

разьвіваць. І самі рана ўсьвядомілі, што стварылі для сябе праблему рэгіянальных кланаў і кліентур. Наступствы гэтых працэсаў праяўляюцца дагэтуль.

— Пасьля прыходу Лукашэнкі да ўлады кіраўніцтва краіны ўзяло курс на стварэньне ў Беларусі расейскамоўнай нацыі. Ці можа такая палітыка даць штуршок для ажыўленьня моўнага нацыяналізму беларусаў?

— Тут вельмі карысная тэорыя посткаляніялізму. Што такое мова? Ёсьць шмат прыкладаў нацыяў, якія маюць моцную ідэнтычнасьць, але выкарыстоўваюць мову іншага, суседняга народу. Возьмем, напрыклад, ірляндзкую нацыю. Але, па-першае, у Ірляндыі вельмі моцныя другасныя трэгеры ідэнтычнасьці — рэлігія, геаграфічнае палажэньне і г.д. Па-другое, так званая ангельская мова ў Ірляндыі таксама ёсьць трэгерам нацыянальнай ідэнтычнасьці. Ірляндзкая вэрсія ангельскай мовы розьніцца ад брытанскай акцэнтам і лексыкай. Да таго ж ангельская мова выкарыстоўвалася як інструмэнт для стварэньня нацыянальнай літаратуры, назавём хаця б Ейтса і іншых пісьменьнікаў.

Ці падобная сытуацыя ў Беларусі? Не. Па-першае, дзеля таго што другасныя трэгеры нацыянальнай ідэнтычнасьці тут нашмат слабейшыя. Па-другое, дзеля таго што мне — можа быць, я мыляюся — расейскамоўная беларуская нацыянальная традыцыя здаецца вельмі слабой. Беларускі русафон, безумоўна, ня ёсьць расейцам, але яму бракуе досыць моцных трэгераў нацыянальнай ідэнтычнасьці. Няма беларускай русафонскай вэрсіі рэлігіі, напрыклад, як няма пачуцьця геаграфічнай адасобленасьці ці разуменьня адзінства гістарычнага лёсу.

У апошнія пару гадоў Лукашэнка пачаў вельмі эклектычна выкарыстоўваць элемэнты беларускай традыцыі ў шырокім разуменьні. Але гэта вельмі эклектычна. Нацыя так не ствараецца. Гэта не нацыятварэньне. Што значыць быць беларусам паводле Лукашэнкі? Гэта значыць адчуваць прыналежнасьць да нейкай вельмі шырокай супольнасьці, супэрсупольнасьці — усходняга славянства ці славянства наогул. На тэарэтычным узроўні гэта частка цяперашняй беларускай ідэнтычнасьці.

— А колькі цяпер беларускіх ідэнтычнасьцяў існуе ў краіне? Ці няма паміж імі сутыкненьняў?
— Такая канкурэнцыя, безумоўна, ёсьць. Але канкрэтныя плыні рэпрэзэнтуюць толькі меншасьці беларусаў, а ня ўсё беларускае грамадзтва. У гэтым пытаньні цягам найбліжэйшага часу я не прадбачу вялікіх зьменаў. Задачы для новых лідэраў Беларусі будуць падобныя: паляпшаць адносіны з Расеяй і нармалізаваць адносіны з Захадам. Што гэта значыць для ўнутранай сытуацыі? У цяперашніх умовах вэрсія нацыянальнай ідэнтычнасьці а-ля БНФ або яе славянасабораўскі варыянт ня могуць перамагчы ў беларускім грамадзтве.
Гутарыў Валер Булгакаў

[image]
[image]

№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Стывэн Уайт
Эўрапейскі ці славянскі выбар?

СТЫВЭН ЛЕАНАРД УАЙТ (нар. у 1945 у Дубліне) — палітоляг, прафэсар катэдры паліталёгіі ўнівэрсытэту Глазга. Сёлета зрэдагаваў і апублікаваў трэці выпуск зборніку “Developments in Central and East European Politics”. Пераклад зьмешчанага ніжэй тэксту быў зроблены з ласкавай згоды

Заканчэньне халоднай вайны паставіла заходнія ўрады і грамадзтвы перад шэрагам новых пытаньняў, найважнейшае зь якіх — будучая форма адносінаў з новымі дзяржавамі, што зьявіліся ў эўрапейскай частцы посткамуністычнай прасторы. Чэхія, Польшча, Вугоршчына і яшчэ дзесяць іншых дзяржаваў рухаюцца да паўнапраўнага сяброўства ў Эўразьвязе. Але для краінаў, якія раней належалі да Савецкага Саюзу, уступленьне ў Эўразьвяз ня можа разглядацца як найбліжэйшая пэрспэктыва. Мы называем гэтыя краіны аўтсайдэрамі і ў агляднай будучыні яны будуць ствараць буфэр паміж паўнапраўнымі чальцамі эўрапейскай сям’і і рэштаю эўразійскай прасторы. Але адносіны зь імі будуць надзвычай важнымі для Эўропы, што так хутка мяняецца, а таксама для эканамічнай і палітычнай стабільнасьці яе новых усходніх сяброў.

У гэтым артыкуле мы паспрабуем разгледзець магчымасьці пашырэньня Эўразьвязу на краіны-аўтсайдэры, кіруючыся ўзорам чатырох былых савецкіх рэспублікаў — Расеі, Украіны, Беларусі і Малдовы.

Ці мысьляць сябе эўрапейцамі звычайныя грамадзяне тых **аўтарыт** краінаў? Ці, можа, адносяць сябе да нейкай іншай цывілізацыі, якая падзяляе некаторыя, але ня ўсе вартасьці заходніх суседзяў? Гаворачы больш абагульнена — якая падтрымка можа быць у тых грамадзтвах на карысьць “эўрапейскага выбару”, што мае на ўвазе больш цеснае партнэрства з краінамі Эўразьвязу, у супрацьлегласьць “славянскаму выбару”, які разумее ў якасьці галоўнага прыярытэту адносіны з Садружнасьцю Незалежных Дзяржаваў?

Геапалітычны кантэкст

Аўтсайдэрства гэтых чатырох краінаў выклікана ня толькі іх геаграфічным становішчам, але і шэрагам унутраных рэаліяў. Самая значная з унутраных праблемаў — эканамічны крызыс. У Расеі на працягу 90-х валавы нацыянальны прадукт няспынна падаў. Беларусь пацярпела меней за Расею, у той час як Малдова і Ўкраіна апынуліся ў найгоршым з усяго рэгіёну становішчы — узровень эканамічнай актыўнасьці там у 1998 годзе склаў меней за траціну ад таго, што быў зарэгістраваны на пачатку дзесяцігодзьдзя. Малдова пацярпела больш за ўсіх — і ўлетку 2000 году яе можна было б назваць найбяднейшай краінай Эўропы.

Такое падзеньне вытворчасьці і эканамічнай актыўнасьці нэгатыўна адбілася на геапалітычнай вазе краінаў — асабліва на былой “супэрдзяржаве”. Зразумела, што зьвесткі розных крыніцаў могуць разыходзіцца, але паводле ацэнак Сусьветнага банку аб’ём расейскай эканомікі цяпер у абсалютных лічбах ня большы за аб’ём эканомік Паўднёвай Карэі ці Нідэрляндаў. Заняпад гэты мае ня толькі эканамічны вымер. У Расеі назіраецца дэмаграфічны крызыс, што было выклікана каляпсам савецкай дзяржаўнай сыстэмы сацыяльнага забесьпячэньня, якая не была замененая на адпаведныя новыя інстытуты сацыяльнай дапамогі. Колькасьць хваробаў павялічылася, сярэдняя працягласьць жыцьця (асабліва мужчынаў) зьнізілася, а ўзровень нараджальнасьці стабільна падае пачынаючы з 1992 году. У сьвятле гэтых тэндэнцыяў цалкам зразумелае папярэджаньне Ўладзімера Пуціна ў ягоным звароце ад 1999 году, што Расея стаіць перад пагрозаю пераходу ў другі ці нават трэці эшалён краінаў.

Ня меней разбуральным стаў каляпс дзяржавы як такой — гэта тычыцца ня толькі распаду Савецкага Саюзу. Ніводная з чатырох краінаў, пра якія мы вядзем гаворку, ня мае жыцьцяздольнай партыйнай сыстэмы, якая б зьявілася на месцы камуністычнай манаполіі нядаўняй мінуўшчыны. Дамінантнай мадэльлю ў гэтых краінах зьяўляецца моцнае прэзыдэнцтва і слабы, падзелены электарат. Выбары даюць магчымасьць толькі фармальнага выбару — яны праводзяцца заўжды такім чынам, які гарантуе існым рэжымам перамогу, пераважна дзякуючы кантролю над сродкамі масавай інфармацыі. У некаторых з гэтых краінаў назіраліся даволі працяглыя канстытуцыйныя крызысы, што палягалі ў барацьбе паміж прэзыдэнтам і парлямэнтам за вяршэнства (выняткам у гэтым шэрагу стала Малдова, дзе пасьля працяглага супрацьстаяньня ўлетку 2000 году перамог парлямэнт, адстаяўшы сваё права выбіраць прэзыдэнта). Адносіны паміж цэнтрам і пэрыфэрыяй застаюцца даволі “кантэкстуальнымі” — урад зь цяжкасьцю зьбірае падаткі і падтрымлівае грамадзкі парадак. У Эўропе падобныя функцыі ў раду зьяўляюцца сынанімічнымі дзяржаўнасьці. У Расеі мы бачым сытуацыю адкрытага ўзброенага паўстаньня ў Чачэніі, а ў Малдове сэпаратысцкі ўрад трымае ўладу ў Прыднястроўі. З пункту гледжаньня міжсуб’ектных адносінаў СНД пакуль што ня стала і, мабыць, ніколі ня стане эфэктыўным і скаардынаваным міждзяржаўным утварэньнем.

Няпэўнасьці і праблемы застаюцца таксама ў сфэры нацыянальнае самаідэнтыфікацыі. У часе перапісу насельніцтва 1989 году больш за 25 мільёнаў расейцаў жыло за межамі Расейскай Фэдэрацыі ў іншых саюзных рэспубліках. Раптам яны сталі грамадзянамі, а часам і не-грамадзянамі новых незалежных дзяржаваў. Яны складаюць больш за траціну насельніцтва ў Латвіі і Казахстане і больш за адну пятую ў Эстоніі і Ўкраіне. Таксама і 6 мільёнаў украінцаў жывуць у той ці іншай з былых савецкіх рэспублік, тое самае тычыцца двух мільёнаў беларусаў і паўмільёна малдаванаў. Гэта прапарцыйна, а ў выпадку беларусаў нават болей за долю расейцаў, што апынуліся за мяжою. Межы паміж новымі дзяржавамі адносна стабільныя, хаця да гэтага часу ня вырашана спрэчнае пытаньне наконт расейска-балтыйскай мяжы, таксама застаецца праблемным непаўнапраўны статус

расейскамоўнага насельніцтва ў некаторых з новаўтвораных дзяржаваў. Яшчэ адною праблемай зьяўляецца адсутнасьць у гэтых краінах нацыянальных ідэяў і вартасьцяў для аб'яднаньня грамадзтваў, што паўсталі б на месцы афіцыйнай ідэалёгіі нядаўняй мінуўшчыны. Асабліва цяжка перажывае гэта Расея. Параза ў халоднай вайне і дамінантная пазыцыя ЗША ў цяперашнім сьвеце сталі для яе невыносным псыхалягічным ударам. Гаворачы аб страце Расеяй ейных былых пазыцыяў, трэба сказаць пра маргіналізацыю Расеі і ўсяго расейскага ў тых частках сьвету, што калісьці знаходзіліся пад значным уплывам СССР.

Замежная палітыка і абарона

Усе былыя савецкія рэспублікі сутыкнуліся ў гэтым выпадку зь цяжкімі альтэрнатывамі, найцяжэйшай зь якіх стаўся выбар паміж ідэйна і палітычна супрацьлеглымі "эўрапейскай" і "славянскай" арыентацыямі. У Расеі, выбар якой можа стаць вырашальным для ўсёй постсавецкай прасторы, супрацьстаяньне паміж "эўрапейскім" і "славянскім" вэктарамі нагадвае колішнюю барацьбу "заходнікаў" і "славянафілаў". "Заходнікі" зьяўляюцца носьбітамі новага палітычнага мысьленьня, характэрнага для часоў Гарбачова і Шэварднадзэ, якое робіць стаўку на супольнае вырашэньне Ўсходам і Захадам задачаў, што стаяць перад усім сьветам. "Заходнікі", аднак, пачалі страчваць свае пазыцыі, бо Захад у сваіх дзеяньнях мала лічыўся з інтарэсамі Расеі. Расчараваньне грамадзкае думкі расло ў меру таго, як рэформы, што ажыццяўляліся паводле рэцэптаў заходніх дарадцаў, сталі прыводзіць да ўсё большага падзеньня ўзроўню жыцьця простых людзей. Спадкаемца Ельцына Ўладзімер Пуцін падзяляў погляды Прымакова на пытаньні замежнай палітыкі і таму прыняў шэраг дакумэнтаў, у якіх ішла гаворка пра абарону дзяржаўных і нацыянальных інтарэсаў Расеі. Паводле новай Абароннай дактрыны, прынятай у красавіку 2000 году, магчымасьць буйнамаштабнай вайны прызнавалася малаімавернай, але замежная і ўнутраная пагрозы для расейскай бясьпекі разглядаліся як актуальныя; у ёй таксама сьцьвярджалася, што міжнародная супольнасьць павінна прызнаць за Расеяй права на выкарыстаньне атамнай зброі ня толькі ў выпадку ядравай атакі на Расейскую Фэдэрацыю, але

і нападу з ужываньнем звычайных узбраеньняў, які б сур'ёзна пагражаў нацыянальнай бясьпецы. Гэты змрочны тон, што застаўся ў спадчыну ад савецкіх часоў, а бадай, і з часоў царызму, адлюстроўвае, аднак, бачаньне ўнутранай і міжнароднай сытуацыі даволі шырокімі коламі расейскага грамадзтва. Амаль чвэрць расейцаў, апытаных на пачатку 2000 году, былі ўпэўнены ці амаль упэўнены ў тым, што цягам найбліжэйшых пяці гадоў іншая краіна можа распачаць ваенную кампанію супраць Расеі, хаця толькі 6% апытаных былі заклапочаныя пашырэньнем NATO на Чэхію, Польшчу і Вугоршчыну (і нават далучэньне да Паўночнаатлянтычнага альянсу Прыбалтыкі толькі 14% палічылі б сур'ёзнай пагрозаю расейскай бясьпецы, а значная большасьць апытаных увогуле ня мелі наконт гэтага ніякіх меркаваньняў). Значна большая пагроза, на думку многіх расейцаў, зыходзіць з Каўказу і Цэнтральнай Азіі. Гэта пагроза тэрарызму, ісламскага ды іншых рэлігійных экстрэмізмаў, і, на думку большасьці апытаных (70%), за апошнія два—тры гады гэтая пагроза значна ўзрасла. Беручы пад увагу нестабільнае міжнароднае становішча, 60% апытаных выказаліся за павышэньне вайсковых выдаткаў і толькі 14% — супраць. Таксама вельмі мала апытаных (17% супраць 82%) выказаліся за аднабаковую адмову Расеі ад атамнай зброі, і, нягледзячы на заканчэньне халоднай вайны, другую пагрозу, пасьля той, што зыходзіць ад нерасейскага насельніцтва Расейскай Фэдэрацыі, апытаная большасьць бачыла ў ЗША (гл. **табліцу 1**).

Беларусь, Украіна і Малдова маюць больш шанцаў для "эўрапейскага выбару" — усе гэтыя краіны маюць фармальнае права прэтэндаваць на ўваходжаньне ў Эўразьвяз і прытрымліваюцца нэўтралітэту ці стратэгіі недалучэньня ў сваёй замежнай палітыцы. У прыватнасьці, дзяржаўная палітыка Ўкраіны і Малдовы накіраваная на інтэграцыю ў эўрапейскія альбо нават "эўраатлянтычныя" структуры, што выразна гаворыць пра магчымае ў будучыні чалецтва ў NATO. Усе тры краіны цяжка пацярпелі ад расейскага дэфолту 1998 году і ня маюць ніякага жаданьня быць уцягнутымі ў адноўлены чачэнскі канфлікт. (Непрыняцьце чачэнскага канфлікту асабліва ўласьціва беларусам.) Адначасова значная частка насельніцтва гэтых краінаў расейская паводле нацыянальнасьці, мовы, а часам і паводле грамадзянства. Усе

тры краіны ў значнай ступені залежалі ад паставак расейскіх энэрганосьбітаў, і да гэтага часу Расея застаецца галоўным рынкам іх экспарту (надзвычай актыўным зьяўляецца памежны гандаль: пры канцы 1990-х штогод фіксавалася больш за 20 мільёнаў перасячэньняў мяжы паміж Украінай і Расеяй). У Беларусі, якая ёсьць часткай сыстэмы калектыўнай абароны СНД, больш аргумэнтаў на карысьць эканамічнай блізіні з Расеяй, што была дасягнутая праз увядзеньне адзінай мытнай мяжы і абароннае супрацоўніцтва. Такім чынам, Беларусь сталася найбліжэйшым хаўрусьнікам Расеі. Першапачаткова новы ўрад незалежнай Беларусі арыентаваўся на Захад, былі падпісаныя пагадненьні з шэрагам міжнародных арганізацыяў, у тым ліку зь Міжнародным валютным фондам і Эўрапейскім банкам рэканструкцыі і разьвіцьця. Беларускі парлямэнт ратыфікаваў START-1 і Дамову аб нераспаўсюджваньні атамнай зброі (1993); усе боегалоўкі былі зьнішчаны да 1996 году. Таксама былі ўсталяваныя дыпляматычныя адносіны з Эўразьвязам, і ў 1994 годзе было ўкладзена Пагадненьне аб партнэрстве і супрацоўніцтве. Але абраньне ў тым жа годзе энэргічнага папуліста першым прэзыдэнтам краіны прывяло да ўсё больш відавочнага ўхілу ў бок Расеі і СНД. Пагадненьне аб партнэрстве з Эўразьвязам так і не было падпісана, а ў красавіку 1996-га была ратыфікавана першая дамова з шэрагу тых, што адзначылі пачатак інтэграцыі Беларусі зь яе вялікім славянскім суседам. У лістападзе таго ж году адбыўся рэфэрэндум, які пашырыў паўнамоцтвы прэзыдэнта і тэрмін яго кіраваньня ў такой ступені, што быў прызнаны большасьцю заходніх краінаў нелегітымным. Фактычна Беларусь была змушана да “шматвэктарнасьці”. Як зазначаў прэзыдэнт Лукашэнка ў сваім звароце ў красавіку 2000 году, важна стварыць “пояс добрасуседзкіх адносінаў” вакол Беларусі, часткаю якога быў бы “актыўны дыялёг” з Эўразьвязам. Таксама мае быць “канструктыўнае супрацоўніцтва” з Злучанымі Штатамі і “нармальныя адносіны” з NATO і яго дзяржавамі-чальцамі. Але Расея, як ён зазначыў, мусіць стаць “галоўным вэктарам”, і асноўнай мэтай ураду Лукашэнкі павінна стаць стварэньне саюзнай дзяржавы згодна з дамоваю ад сьнежня 1999-га. Такім чынам, “шматвэктарнасьць”, на думку аналітыкаў, існуе толькі на паперы, і фактычна замежная палітыка Беларусі круціцца вакол Усходу,

у прыватнасьці вакол Расеі.
Украіна больш зацікаўленая ў правядзеньні незалежнай палітыкі і ў блізкіх адносінах з эўрапейскімі краінамі, але яе памеры, колькасьць насельніцтва і геаграфічнае становішча робяць гэтыя рашэньні асабліва важнымі для расейскага суседа. Іншыя эўрапейскія краіны стараюцца будаваць свае адносіны з украінскай уладай такім чынам, каб гэта не псавала больш важных адносінаў з Масквой. Гэта значыць, што эканамічнае супрацоўніцтва будзе разгортвацца хутчэй за вайсковае. Украіна першай з былых савецкіх рэспублікаў уклала Пагадненьне аб партнэрстве і супрацоўніцтве з Эўразьвязам у чэрвені 1994 году, але яно набыло моц толькі ў сакавіку 1998 году. Грамадзтва Ўкраіны вельмі неадназначна ставіцца да супрацоўніцтва з NATO, бо яно наўрад ці падыме ўзровень жыцьця, але можа запатрабаваць значна большых вайсковых выдаткаў. Ніводны з кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта на выбарах у кастрычніку 1999 году, адпаведна, не рабіў супрацоўніцтва з NATO прыярытэтным пунктам сваёй выбарчай праграмы.
Малдова таксама будуе сваю замежнапалітычную дактрыну на канцэпцыі “поўнага нэўтралітэту”. У гэтай краіне жывуць значныя па колькасьці расейскія і ўкраінскія этнічныя меншасьці, а Прыднястроўе — увогуле амаль цалкам славянскі рэгіён, які падпарадкоўваецца хутчэй Тыраспалю, чым Кішынэву, і знаходзіцца пад кантролем расейскіх узброеных сілаў. Для нацыяналістаў, якія былі пры ўладзе на першапачатковым этапе малдаўскай незалежнасьці, тая незалежнасьць была ня болей чым прамежкавым крокам перад узьяднаньнем з Румыніяй, але зь перамогаю Аграрнай партыі ў парлямэнцкіх выбарах 1994-га акцэнты зрушыліся ў бок стварэньня незалежнай дзяржавы ў існых межах, а рэфэрэндум, праведзены ў тым жа годзе, пацьвердзіў, што 95 адсоткаў насельніцтва падзяляе гэтыя погляды. Пераход да цалкам парлямэнцкай рэспублікі ў 2000 годзе стварыў значны ўхіл у бок “славянскага выбару”, асабліва калі браць да ўвагі колькасную перавагу камуністаў у парлямэнце і (пасьля выбараў у лютым 2001-га) іх абсалютную большасьць.

Эўрапейская самаідэнтыфікацыя?

Куды, у гэтых складаных і зьменлівых міжнародных у мовах,

адносяць свае краіны звычайныя грамадзяне? Ці лічаць яны сябе проста эўрапейцамі, ці, у выпадку Расеі, маюць больш складаную ідэнтыфікацыю, асабліва калі браць да ўвагі эўразійскае геаграфічнае становішча гэтай краіны, а таксама вельмі амбівалентнае стаўленьне Расеі і расейцаў да рэшты кантынэнту? Ці можна гэтыя складаныя і супярэчлівыя прыхільнасьці апісаць простай дыхатаміяй Захад / Усход? Сьведчаньні можна пабачыць у **табліцы 2**. Дзіўна, але менавіта расейцы часьцей за ўсё адносілі сябе да эўрапейцаў, дарма што чвэрць насельніцтва Расеі жыве ў геаграфічнай Азіі, і з усіх чатырох групаў менавіта расейцы адчувалі найменшую складанасьць у адказе на гэтае пытаньне. Беларусы, якія цалкам адчуваюць сябе эўрапейцамі, на афіцыйным і на масавым узроўні схіляюцца да альянсу з сваім усходнім суседам, бо адказвалі вельмі падобна да расейцаў. Малдаване і ўкраінцы ў найменшай ступені адчувалі сябе эўрапейцамі (хаця іхныя краіны цалкам эўрапейскія паводле сваёй геаграфіі), а на ўрадавым і грамадзкім узроўні быў зроблены недвухсэнсоўны выбар на карысьць эўрапейскай інтэграцыі. Але ўва ўсіх чатырох краінах ня больш за палову апытаных думалі пра сябе як пра эўрапейцаў і толькі невялічкая меншасьць думала так “часта”.

Сяброўства ў Эўразьвязе — гэта адзін з найпрасьцейшых шляхоў, на якім краіна можа праявіць сваю эўрапейскасьць. Аднак адказы апытаных застаюцца супярэчлівымі і неадназначнымі (гл. **табліцу 3**). Значная частка людзей — менш у Расеі, але большасьць у Малдове — ставіцца вельмі ці ў значнай ступені дадатна да мэтаў і дзейнасьці Эўразьвязу; вельмі малая частка апытаных (ад 6% да 12%) ставіцца да Эўразьвязу ў значнай ступені нэгатыўна ці вельмі нэгатыўна. У трох з чатырох краінаў большасьць апытаных (а таксама вялікая колькасьць апытаных з Расеі) дадатна ўспрымае сяброўства ў Эўразьвязе. Але гэта ня сьведчыць пра тое, што грамадзкасьць ці палітыкі ў сваёй масе добра інфармаваныя ў гэтай тэматыцы. Значная колькасьць апытаных ня мела яснага адказу на пытаньні аб дзейнасьці і мэтах Эўразьвязу ці аб дадатных аспэктах такога чалецтва для іх краінаў. Зразумела таксама й тое, што эўрапейская самаідэнтыфікацыя, прынамсі на масавым узроўні, не абавязкова зьвязаная з жаданьнем увайсьці ў склад Эўразьвязу. Нашыя малдаўскія

рэспандэнты, якія найменш адчувалі сябе эўрапейцамі, з найбольшым энтузіязмам паставіліся да ідэі ўступленьня, у той час як расейцы, якія ў найбольшай ступені адчувалі сябе эўрапейцамі, паставіліся да гэтага найбольш скептычна. Узровень ведаў апытаных аб сьвеце быў разьмеркаваны згодна з геаграфічным становішчам іх краінаў, і нельга назваць яго прыдатным для эфэктыўнага фармаваньня эўрапейскай самаідэнтыфікацыі ці схільнасьці да сяброўства ў Эўразьвязе. Расейцы выказалі менш меркаваньняў аб самім Эўразьвязе і аб чалецтве ў ім, чым апытаныя зь іншых краінаў. Таксама яны маюць меншы за ўсіх досьвед вандровак па іншых краінах, уключаючы былыя савецкія рэспублікі. Але беларусы, якія маюць погляды, падобныя да расейскіх, зьяўляюцца найбольшымі касмапалітамі з прадстаўнікоў усіх апытаных краінаў. У сувязі з гэтым мы пыталіся ў нашых рэспандэнтаў, ці часта ім удавалася наведваць балтыйскія рэспублікі і краіны — кандыдаткі на чалецтва ў Эўразьвязе ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе. Расейцы, з зразумелых прычынаў, часьцей за малдаван наведвалі балтыйскія рэспублікі. Але значна меншая колькасьць расейскіх рэспандэнтаў бывала ў краінах Усходняй ці Цэнтральнай Эўропы, такіх, як Баўгарыя, Вугоршчына, Польшча і Чэхія, і значна менш за беларусаў ці ўкраінцаў яны наведвалі балтыйскія рэспублікі. Толькі 15% з апытаных расейцаў (у параўнаньні з 31% беларусаў) калісьці адведвалі Латвію, траціну насельніцтва якой складаюць расейцы; 14% апытаных расейцаў бывалі ў Літве (у параўнаньні з 42% беларусаў). І толькі 5% бывалі ў Польшчы, у параўнаньні з 16% малдаван і ўкраінцаў і 36% беларусаў.

У парадку экспэрымэнту мы правялі апытаньне — у якім зь пяці прапанаваных гарадоў знаходзяцца кіраўнічыя органы Эўразьвязу? Каля траціны апытаных справіліся з заданьнем (украінцы горш за ўсіх, малдаване лепш за ўсіх), але 30% — гэта ня значна больш за тых, хто мог бы назваць Брусэль выпадкова. Лепшая сытуацыя была з пытаньнем наконт NATO — больш за палову апытаных адказалі, што гэта “вайсковы альянс пад кіраўніцтвам ЗША”.

Статыстычная агенцыя “Эўрабаромэтар” праводзіла аналягічныя апытаньні спачатку сярод насельніцтва краінаў-кандыдатак, а з 1997 году — сярод насельніцтва Беларусі і Ўкраіны. Пытаньні тычыліся крыніцаў інфармацыі пра

Эўразьвяз, даступных жыхарам той ці іншай краіны. Каля 12% апытаных беларусаў паведамілі, што ўвогуле нічога ня ведаюць пра Эўразьвяз; тое самае адказалі 21% украінцаў (гэта самы высокі адсотак неінфармаванасьці сярод рэспандэнтаў ува ўсіх краінах, дзе праводзілася апытаньне).

Славянскі выбар?

Расея, зразумела, займае дамінантнае становішча ў замежнай палітыцы і эканоміцы астатніх краінаў-аўтсайдэраў. Рэспандэнты з Малдовы, Украіны і Беларусі выказалі амаль аднолькавае меркаваньне аб тым, што добрыя адносіны з Расеяй для іх краінаў “надзвычай важныя”, значна важнейшыя за добрыя стасункі з Кітаем, Вялікай Брытаніяй, ЗША, Нямеччынай, Японіяй і Эўразьвязам (гл. **табліцу 4**). Важнасьць добрых адносінаў з Расеяй — ня толькі пытаньне гандлю і стабільнага міжнароднага становішча. Адна з найважнейшых прычынаў такой пазыцыі палягае ў тым, што апытаныя ўва ўсіх чатырох краінах маюць асабістыя і сваяцкія сувязі, якія яны вельмі жадалі б захаваць. У сувязі з гэтым мы запыталіся ў нашых рэспандэнтаў, ці маюць яны блізкіх сваякоў у Расеі. Больш за палову нашых рэспандэнтаў у Беларусі маюць аднаго (16%) ці некалькіх (44%) сваякоў; і палова ўкраінскіх апытаных мае аднаго (10%) ці некалькіх сваякоў у Расеі. Нават сярод больш далёкіх геаграфічна малдаван траціна мае аднаго (15%) ці некалькіх (18%) блізкіх сваякоў у Расеі. Такім жа колькасьці апытаных (41% у Беларусі, 24% ува Ўкраіне і 31% у Малдове) маюць блізкіх сваякоў у іншых краінах СНД, а самі расейцы маюць аднаго (11%) ці некалькіх (25%) блізкіх сваякоў у іншых краінах СНД. Як мы й меркавалі, упэўненасьць у неабходнасьці добрых адносінаў з Расеяй знаходзіцца ў лінейнай залежнасьці ад наяўнасьці ў апытаных аднаго ці некалькіх сваякоў у Расеі. Залежнасьць жаданьня інтэграцыі ці больш блізкіх палітычных зносінаў ад наяўнасьці сваякоў у іншых рэспубліках СНД (асабліва ў славянскіх — ува Ўкраіне і Беларусі) мае месца і ў расейскіх рэспандэнтаў. А ўвогуле, сярод многіх апытаных была вельмі празрыстай прыхільнасьць да ідэі аднаўленьня СССР (гл. **табліцу 5**). Толькі 9% апытаных беларусаў і 15% апытаных украінцаў выказалі меркаваньне, што іх краіны мусяць мець з Расеяй такія ж самыя межы, як зь іншымі дзяржавамі, — з мытнямі і візавым рэжымам. Але ня

[1] У Беларусі адказ вельмі залежаў ад фармулёўкі пытаньня: ад 42% да 55% рэспандэнтаў напрыканцы 1990-х былі гатовыя прагаласаваць за “аб’яднаньне” на гіпатэтычным рэфэрэндуме, але толькі ад 22% да 28% былі за стварэньне адзінай дзяржавы (“Аналитический бюллетень белорусских фабрик мысли”, 1999, №5, с.7).

болей за 25% у краінцаў і 33% беларусаў лічаць неабходным стварэньне палітычнага саюзу з Расеяй. Найбольш тыповым адказам на гэтае пытаньне як ува Ўкраіне, так і ў Беларусі было выказваньне “Неабходна падтрымліваць сяброўскія, але незалежныя адносіны” — вельмі падобныя да тых, што існуюць у цяперашнім саюзе Беларусі і Расеі, дзе кожны з суб’ектаў захоўвае сваю палітычную самастойнасьць[1]. Нават расейскія рэспандэнты даволі адмоўна ставіліся да ідэі больш цесных аб’яднаньняў у выпадку, калі дзеля гэтага давялося б павялічыць выдаткі Расеі на ўтрыманьне гэтага саюзу. Узровень падтрымкі ідэі эўрапейскага выбару ў параўнаньні з славянскім ува ўсіх чатырох дзяржавах быў даволі розным. Гэтую статыстыку мы прыводзім у **табліцы 6**, абмяжоўваючыся толькі Беларусяй, Украінай і Малдовай. У гэтай сувязі мы вылучаем чатыры розныя пазыцыі. Эўрапрагрэсістамі мы называем тых, хто стаіць за сяброўства ў Эўразьвязе і не шкадуе аб распадзе СССР. Эўрарэалісты — тыя, хто прыхільна ставіцца да чалецтва ў Эўразьвязе, але шкадуе аб распадзе СССР з далейшым пагаршэньнем узроўню жыцьця ў былых рэспубліках. Незалежнікі выступаюць супраць уваходжаньня ў Эўразьвяз, але не шкадуюць аб распадзе СССР, таксама як і ня маюць асаблівай прыхільнасьці да іншых славянскіх рэспублікаў былога СССР. І, нарэшце, славянскія традыцыяналісты — тыя, хто таксама супраць чалецтва ў Эўразьвязе, вельмі шкадуюць аб распадзе СССР і падтрымліваюць устанаўленьне больш блізкіх адносінаў паміж былымі савецкімі рэспублікамі. Як можна ўбачыць у **табліцы 6**, “эўрапрагрэсісты” складаюць паміж 20% і 28% у трох дзяржавах (Беларусь, Украіна і Малдова) з самым высокім адсоткам ува Ўкраіне. Значна большую колькасьць складаюць “эўрарэалісты”, асабліва ў Малдове, — тыя, у каго падтрымка эўраінтэграцыі спалучаецца з шкадаваньнямі аб распадзе СССР з усімі яго адмоўнымі наступствамі для краіны рэспандэнта. Ува ўсіх трох краінах славянскі выбар быў падтрыманы меншасьцю рэспандэнтаў, хаця ў Беларусі гэтая меншасьць наблізілася да колькасьці тых, хто падтрымлівае эўрапейскі вэктар. Але ўва ўсіх трох краінах колькасьць славянскіх традыцыяналістаў пераважае над колькасьцю эўрарэалістаў прыкладна ў суадносінах два да аднаго. І, натуральна, у Малдове прыхільнасьць да славянскага выбару

значна меншая, чым у Беларусі ці Украіне, дзе меркаваньні падзеленыя больш-менш роўна з трохі большым “праславянскім” ухілам у Беларусі.

Пазыцыі, грамадзтвы і палітыка

Зразумела, што “нацыянальныя грамадзтвы” ў значнай ступені зьяўляюцца абстракцыяй. Адрозьненьні, якія мы назіраем, могуць у рэальнасьці быць вельмі ўмоўнымі і залежаць хутчэй ад рознага ўзроўню ўрбанізацыі і адукацыі, уласьцівага розным рэгіёнам гэтых чатырох краінаў, чым ад простых варыяцыяў у разьмеркаваньні поглядаў асобных індывідаў, з у лікам таго, што іншыя фактары застаюцца аднолькавымі. У прыватнасьці, ува Украіне адрозьненьні паміж меркаваньнямі ўнутры адной дзяржавы, мабыць, нават большыя, чым паміж грамадзтвамі розных краінаў: заходнія ўкраінцы значна больш дадатна ставяцца да эўрапейскага выбару, у той час як усходнія і паўднёвая, больш русіфікаваныя часткі Украіны схіляюцца да славянскага выбару. Суадносіны паміж славянскім і эўрапейскім выбарам і тымі палітычнымі прыхільнасьцямі, што вынікаюць зь іх, паказаныя ў **табліцы 7**. У кожнай з чатырох краінаў мы пыталіся ў нашых рэспандэнтаў, як яны прагаласавалі на апошніх парлямэнцкіх ці прэзыдэнцкіх выбарах і як яны плянуюць галасаваць наступным разам. Але ў дадатак, каб палепшыць параўнальнасьць, мы пыталіся пра тыпы партый (нацыяналісты, партыі прарынкавай арыентацыі, камуністы, зялёныя і да т.п.), да якіх схільныя нашыя рэспандэнты. Гэта давала добрую магчымасьць высьвятліць, хутчэй агульнапалітычныя схільнасьці рэспандэнтаў, чым іх непасрэдны электаральны выбар: у грамадзтвах, дзе партыйная сыстэма яшчэ не ўкаранілася ў сацыяльна-эканамічных структурах і ня мае сталай ідэалягічнай базы, у адрозьненьне ад заходніх грамадзтваў, электаральны выбар зьяўляецца хутчэй выпадковым і няпэўным, чым сталым і ўзважаным. Значная колькасьць апытаных цалкам падтрымлівала якую небудзь адну партыю ці, часьцей за ўсё, увогуле ніякую. Да другой групы мы аднесьлі тых, хто быў няўпэўнены ці адмовіўся адказаць. Але сярод тых, хто быў падрыхтаваны да сьвядомага выбару на карысьць той ці іншай групы партыяў, у прыватнасьці, ува Украіне і ў Малдове, назіраецца простая сувязь паміж “прагрэсіўнай” пазыцыяй і падтрымкай

[2] Залежная пераменная вылічаецца згодна з заўвагай да табліцы 8, з выкарыстаньнем двух пытаньняў табліцы 6. Карэляцыі паміж двума пытаньнямі пададзеныя ў наступным парадку: Беларусь, r = 0,20; Малдова, r = 0,16; Украіна, r = 0,27. Усе карэляцыі статыстычна значныя пры p < 0,01, двухбаковы тэст. Праверка карэляцыйнай матрыцы залежных пераменных

прарынкавых партыяў. І наадварот, відаць простая сувязь паміж падтрымкай прарынкавых партыяў і “прагрэсіўнай” перамены, якая натуральна дапасуецца да ідэяў свабоднай цыркуляцыі працоўнай сілы і капіталаў паміж краінамі — сябрамі Эўразьвязу. “Прагрэсіўная” пазыцыя таксама зазнала моцную падтрымку нацыяналістаў, для якіх уваход у Эўразьвяз самым эфэктыўным шляхам для збавеньня сваіх краінаў ад той абмежаванасьці сувэрэнітэту, ад якой яны пакутавалі ў савецкія часы.

Традыцыяналісты таксама часта зьвязваюць сябе з пэўнай партыйнай групай, але ў гэтым выпадку — з камуністычнымі ці, радзей, з сацыялістычнымі партыямі. Амаль заўсёды большасьць “традыцыяналістаў” падтрымлівала камуністычную партыю (гэта больш за палову “традыцыяналістаў” Украіны, трохі менш за палову ў Малдове і толькі на другім месцы пасьля зялёных у Беларусі). Ізноў назіраецца простая сувязь у супрацьлеглым кірунку: прыхільнікі камуністычных партыяў ува ўсіх трох краінах амаль заўсёды асацыююцца з традыцыяналісцкай пазыцыяй, непрыманьнем чалецтва ў Эўразьвязе і прыхільнасьцю да прынцыпаў СССР. Таксама, асабліва ўва Ўкраіне, існуе сувязь паміж традыцыяналістамі і сацыялістычнымі партыямі. Калі браць да ўвагі долю падтрымкі, якая прыпадае на камуністычныя партыі — самую вялікую партыйную групу ўва Ўкраіне ды Малдове і другую па велічыні ў Беларусі, — то мы маем досыць шырокую электаральную базу, якая сумяшчае ў сабе непрыманьне інтэграцыі з Эўразьвязам і моцнае імкненьне да ўсталяваньня цясьнейшых адносінаў паміж іншымі рэспублікамі былога СССР.

Нарэшце мы мусім разгледзець характарыстыкі, што стаяць па-за славянскай ці эўрапейскай арыентацыяй і па-за палітычным выбарам, зь якім гэтыя арыентацыі асацыююцца[2]. Як мы бачым, у дзьвюх з трох краінаў значную ролю грае полавая прыналежнасьць: жанчыны значна больш “славянскія” за мужчынаў ува Ўкраіне і Беларусі. Ува ўсіх трох выпадках вялікае значэньне мае ўзрост: чым старэйшы рэспандэнт, тым большая імавернасьць славянскага выбару зь ягонага боку. Нацыянальнасьць рэспандэнтаў сталася малаважным фактарам, акрамя выпадку Малдовы, дзе карэнныя малдаване ў значна меншай ступені падтрымліваюць славянскую

арыентацыю, чым іх расейска-ўкраінскія суайчыньнікі. Вельмі важным фактарам стаўся моўны падзел ува Ўкраіне — чым больш украінская мова выкарыстоўваецца дома, тым меншая імавернасьць падтрымкі збліжэньня з Расеяй і іншымі рэспублікамі былога СССР. Пры іншых роўных умовах гарадзкія жыхары, што маюць вышэйшы ўзровень адукацыі і заробкаў (ува Ўкраіне і Малдове), з большай варожасьцю ставяцца да славянскага выбару; невялічкім штуршком у супрацьлеглым кірунку зьяўляецца наяўнасьць сваякоў у Расеі. Тыя ж, хто меў досьвед вандровак па Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе, хутчэй схільныя да эўрапейскай арыентацыі.

Унівэрсытэт Глазга
Нацыянальны аўстралійскі ўнівэрсытэт
Лёнданская школа эканомікі і палітычных навук

Сацыялягічныя апытаньні ў кожнай краіне былі праведзены з выкарыстаньнем адзінага сьпісу пытаньняў празь мясцовыя інфармацыйныя агенцтвы. Апытаньне ў Беларусі было праведзена агенцтвам “Новак” пад кіраўніцтвам Андрэя Вардамацкага. Палявая праца праходзіла з 13 да 27 красавіка 2000 г. У Малдове нашае апытаньне было праведзена агенцтвам “Апінія” пад кіраўніцтвам Тудара Данііі, пры супрацоўніцтве з кіеўскім агенцтвам “Соцыс”. Палявая праца праходзіла з 12 да 19 лютага 2000 г. У Кіеве нашае апытаньне праводзілася Кіеўскім міжнародным інстытутам сацыялёгіі пад кіраўніцтвам Уладзімера Панёта і Валерыі Карук. Сьпіс пытаньняў быў вывераны 28—31 студзеня, а палявая праца была праведзена з 18 лютага да 3 сакавіка 2000 г.
Пераклаў з ангельскай з скаротамі
Аляксей Ігнатовіч
паводле: Stephen White. A European or Slavic Choice? Foreign Policy and Public Attitudes in Post-Soviet Europe // Europe-Asia Studies.

2002. March.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

[image]
A R C H E

П а ч а т а к № 6 (29) – 2003
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
Эўропа на ўсход ад Эўропы
[image] [image] [image]
Эўропа • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

Нэлі Бекус
Сэнс вопраткі на грамадзкай тэрыторыі

Ісьціна — далёка ня самая зручная рэч для жыцьця ў грамадзтве, прывабнае аблічча каштуе тут нашмат болей, амаль як у жывапісе...

Імануэль Кант

Гэты тэкст прысьвечаны вопратцы як спэцыфічнай сацыяльнай функцыі ў жыцьці чалавека. У самой прыродзе вопраткі ёсьць штосьці ад буфэру, яе знакава-візуальны складнік зьмякчае й запавольвае стасункі з асяродзьдзем. Вось і ў прымаўках: накшталт “Не апратка здобіць чалавека...” ці “Не глядзі, што на галаве...”, адлюстроўваецца гэтая яе сутнасьць, якая выяўляецца ў стварэньні асаблівай прасторы для камунікацыйных манэўраў. За ёй, вопраткай, можна схавацца ў натоўпе, а можна, наадварот, пры дапамозе вопраткі апынуцца ў цэнтры ўвагі.

Нягледзячы на гэтую відавочную сацыяльную функцыянальнасьць вопраткі, нельга сказаць, што грамадзтва цалкам вызначае форму ці стыль таго, што людзі носяць. Хаця і зусім свабодным ад макракантролю ў гэтай галіне чалавека не назавеш. Тут існуе пэўны “канвэнцыянальны зазор”, які

НЭЛІ БЕКУС — філёзаф, сацыёляг. Скончыла ў 1992 годзе філязофска-эканамічны факультэт БДУ. Жыве пад Варшавай, супрацоўнічае з Польскай акадэміяй навук. Апошняя публікацыя — артыкул «The Invisible Wall: Hidden factor of the Belarusian reality», які зьявіўся ў інтэрнэт-выданьні

www.eurozine.com

дазваляе ператварыць адносіны абодвух бакоў ува ўзаемадзеяньне. У гэтым зазоры адліваецца і фармуецца своеасаблівы кіроўны прынцып, які і вызначае індывідуальныя “вопраткавыя паводзіны” чалавека ў сацыяльным асяродзьдзі. Прынцып гэты — вытворная многіх складнікаў: тут і культура з нацыянальнай традыцыяй, і грамадзкая сыстэма з ідэалёгіяй, і асабовыя арыенціры ў шматвэктарным полі сучаснасьці, і, без сумневу, мода. Насуперак усім эфэктам глябалізацыі, якіх безьліч на паверхні жыцьця, і сёньня ўсё яшчэ адчуваецца розьніца паміж краінамі ў манеры апранацца. Хаця адрозьненьняў становіцца ўсё меней, а рысы ўнутрынацыянальнага адзінства ўсё танчэюць. Але некаторыя межы на тэрыторыі вопратке працягваюць функцыянаваць. Працуе, прыкладам, мяжа, якая аддзяляе тэрыторыі “пасьля сацыялізму” ад заходніх. Гэта й ня дзіва. Практычна ўвесь досьвед вопратке па розныя бакі гэтай мяжы заўсёды адрозьніваўся на ўсіх узроўнях, ад яе вытворчасьці і да набыцьця і стаўленьня да рэчаў падчас нашэньня. Як лёгка заўсёды счытваліся савецкія турысты за мяжой, так і замежнікі ў нашай краіне заўсёды і беспамылкова адгадваліся. Практыка вопратке гаварыла сама за сябе.

Відавочна, што за гэтай звонку даволі будзённай тэмай вопратке праглядаецца куды больш глыбокая праблематыка — гэта і стратэгія прэзэнтацыі чалавека ў соцыюме, і сэнсы цела ў сыстэме сацыяльных адносін, і праблема сэміятычнага падаў у вопратцы, і за ёй — у грамадзкіх месцах.

* **Советская Белоруссия. 2003. 24 лютага.**

Сёньня сацлягеру больш не існуе, Эўропа аб’ядноўваецца, дзяржаўныя межы, там, дзе яны захавалі свае функцыі, усё часьцей перасякаюцца ў абодвух кірунках. Аднак розны досьвед вопратке ў жыцьці людзей працягвае адлюстроўвацца. Ён тым больш відавочны ў Беларусі, якую наведвае няшмат замежнікаў і грамадзяне якой нячаста выяжджаюць за мяжу. Усё гэта спрыяе гермэтызацыі мінулага досьведу ў межах асобнага грамадзтва і падаўжэньню, пакуль на няпэўны тэрмін, яго паўнамоцтваў.

Адным з наступстваў гэтай беларускай спэцыфікі зьяўляецца зьдзіўленьне, якое нязьменна выклікае ў замежнікаў выгляд людзей на беларускіх вуліцах. Зьдзіўленьне гэтае ёсьць настолькі сталай формай рэакцыі на знаёмства з нашай

рэальнасьцю, што міжволі закрадаецца падозраньне, што мы маем справу зь нейкім асаблівым эфэктам, які ўзьнікае пры трапленьні чужога позірку на гэты “верхні” слой нашай будзённасьці і які не праглядаецца нашай уласнай, хатняй оптыкай. Што канкрэтна тут адбываецца, можна паспрабаваць зразумець, калі скарыстацца на нейкі час гэтым чужым поглядам.

За мяжой ведаюць пра цяжкую спадчыну сацыялізму, пра сёньняшнія эканамічныя цяжкасьці, пра сацыяльную неўладкаванасьць і нізкія даходы — пра ўсё тое, што заўсёды розьніла сацлягер ад Захаду, а сёньня — Беларусь ад постсацыялістычных краінаў Цэнтральнай Эўропы. Па прыезьдзе сюды замежнік чакае пабачыць карціну, рэлевантную гэтаму веданьню, якая грунтоўна падтрымліваецца статыстыкай і аналітычнымі матэрыяламі на старонках нашага і заходняга друку. Яны, прыкладам, могуць ведаць, што, паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, летам 2002 году сярэдні заробак у Беларусі складаў 183 735 рублёў.

І нікому не падаецца дзіўным, што, паводле апытаньня ў студзені 2003 году, 51% рэспандэнтаў прызналі, што вымушаны адмаўляць сабе ў самых неабходных рэчах, што 61% часта не маглі дазволіць сабе набыць вопратку, 44% адмаўляліся ад мэдыкамэнтаў. І толькі 30% *рэдка не маглі* дазволіць сабе набыць вопратку, і толькі 9% ніколі не сутыкаліся з падобнымі цяжкасьцямі*.

Аднак карціна нашых вуліц аніяк не падтрымлівае гэтага веданьня, хутчэй, наадварот, увачавідкі супярэчыць. Свае эмоцыі людзі з розных краін выказваюць па-рознаму. Ад “як добра беларускія жанчыны апранутыя”, “як шмат “жаноцкасьці” ў абліччы беларускіх жанчын, што даўно страчана на Захадзе”, да “як вульгарна і крыкліва карыстаюцца касмэтыкай вашыя жанчыны”, “у нас міні-спадніцы ў спалучэньні з высокім абцасам — першая прыкмета жанчыны лёгкіх паводзінаў, а тут...”. У кожным з гэтых розных, а то і інтанацыйна супрацьлеглых водгукаў лёгка знайсьці сьляды аднаго й таго ж сындрому — нейкай відавочнай неадэкватнасьці, якая ставіць у тупік недасьведчанага ў нашай рэальнасьці замежніка. Варта адзначыць, аднак, што неадэкватнасьць гэтая мае і адваротны бок — “нашы” людзі па прыезьдзе з-за мяжы таксама маюць падобныя ўражаньні аб

“дзіўнасьці” выгляду людзей на *іхных* вуліцах. Пра занадта проста і нецікава апранутых жанчын, пра адсутнасьць у іх інтарэсу да моды, касмэтыкі, упрыгожаньняў і г.д.

Відавочная супярэчнасьць паміж рэальным станам справаў у краіне, зьвесткамі статыстыкі, зьмесьцівам вітрын беларускіх крамаў і абліччам людзей становіцца галоўнай крыніцай зьдзіўленьня замежнікаў. “Аранжыроўка”, якая выбіраецца людзьмі для зьяўленьня ў грамадзкіх месцах — у крамах, на пошце, садках, — уваходзіць у канфлікт з схаванай за гэтым выглядам рэальнасьцю. Прасьцей кажучы, колькасьць натуральных футраў на беларускіх вуліцах не ўкладаецца ў рамкі фінансавых абмежаваньняў, якімі беларуская эканамічная сыстэма апярэзвае беларускую рэчаіснасьць. Выгляд людзей упарта стварае ўражаньне пра краіну, шмат у якіх аспэктах квітнеючую. Але ёсьць і другі аспэкт неадэкватнасьці, зь якім маюць справу замежнікі, што завіталі ў Беларусь, — гэта своеасаблівая стылістычная дэканструкцыя, якую зьдзяйсьняюць нашыя жанчыны над вопраткай у сваёй будзённасьці. Для сваіх будзённых заняткаў яны часьцяком выбіраюць тыя стылістычныя абароты, якія адмаўляюць сабой будзённасьць: тут і абутак на высокім абцасе, і сукенкі *a la* вячэрнія, і ўпрыгожаньні, і інтэнсіўны макіяж. Такі стылістычны трэнд на Захадзе, як правіла, ёсьць азнакаю “асаблівага выпадку”, дзеля якога ён выкарыстоўваецца. Тут жа, зь зьдзіўленьнем даведваюцца іншаземцы, такі выгляд можа быць прызначаны для простага выхаду на вуліцу. Нікому з нас не здаецца дзіўным выгляд маладой жанчыны, апранутай як на вячэрні прыём, якая робіць закупы ў найбліжэйшым унівэрсаме. Гэта моцна ўражвае замежнікаў, у сьвядомасьці якіх існуе строга ранжаванае ўяўленьне пра вопратку, у якой усё, нават неахайнасьць, займае спэцыяльна вылучанае месца. Падобнае заціраньне межаў і функцыяў, замацаваных за рознымі прадметамі туалету, у строях людзей на беларускіх вуліцах становіцца своеасаблівым маскаваньнем сацыяльнай праўды. Відавочна, што стварэньне такога “характэрнага” аблічча, якое суправаджае нашых людзей у грамадзкіх месцах, патрабуе ад іх спэцыяльных высілкаў. Сытуацыя нечым нагадвае касмэтычную апэрацыю на тканках будзённасьці, у выніку якой кожны чалавек пачынае здавацца ці то некім

іншым, ці то самім сабой, але не на сваім месцы. А вуліцы, поўныя добра апранутых людзей, пачынаюць успрымацца асаблівым псыхасацыяльным фэномэнам тутэйшага жыцьця. Агульны сэнс падобнага выгляду можна вызначыць — і менавіта так ён і прачытваецца замежнікамі — як пэрфарматыўную дэклярацыю росквіту і дастатку, пасьпяховага сацыяльнага лёсу і недасягальнага (можа быць, у рэальнасьці) багацьця. Усе разам здаюцца схаванымі за калектыўнай маскай, на якую нанесены занадта тоўсты слой залішняй рэпрэзэнтацыі. І калі пагадзіцца зь цьверджаньнем сацыёляга Фіна Колінза, што “вопратка стварае камэнтары да бягучых сацыяльных падзеяў, узмацняе і разьвівае адрозныя рысы сацыяльнага жыцьця”, то і гэты сымбалічны камуфляж на беларускіх вуліцах можна прачытаць як своеасаблівы камэнтар да рэчаіснасьці. Зразумела, што “элегантныя строі” ў беларускіх грамадзкіх месцах ня маюць аніякай простай сэміятычнай канатацыі. За лёгікай простага прыкрыцьця праўды жыцьця можна выявіць складаную сыстэму ўзаемадзеяньня між рознымі бакамі сацыяльнай камунікацыі. Заўважым, што асобныя элемэнты стыляў вопраткі, якія выкарыстоўваюцца беларускімі жанчынамі, не зьяўляюцца прадуктамі ўласна беларускай рэчаіснасьці і ёсьць артэфактамі зусім іншага сымбалічнага кшталту. І таму тое, што мы назіраем, не зьяўляецца стварэньнем нечага якасна новага зь нічога, але дасягаецца шляхам трансфармацыі і рэарганізацыі элемэнтаў, запазычаных і прыўнесеных у новы кантэкст. Элемэнты існых стыляў інсталююцца ў новую канфігурацыю грамадзкай прасторы. У тым, як і чаму гэта адбываецца, можна паспрабаваць разабрацца.

* * *

Не сакрэт, што ў сацыялістычным мінулым каштоўнасьць вопраткі фармавалася ідэямі практычнасьці і функцыянальнасьці. Фактычна, у вызначэньні выгляду людзей тады пераважала простая лёгіка неабходнасьці і нават патрэбы. Апрача таго, любая асаблівая ўвага да вопраткі, інакшы вонкавы выгляд некаторых людзей імгненна ўводзіў іх у “сыстэмны канфлікт” з кіроўным прынцыпам, паводле якога ўсе магчымыя адрозьненьні ў грамадзтве павінны быць сьцертыя. Афіцыйна абвешчаная ідэя татальнай сацыяльнай

роўнасьці абарочвалася прынцыповай гамагеннасьцю поля сымбалічнай рэпрэзэнтацыі, сфармаванай сацыялістычнай ідэалёгіяй. Яна забараняла любую бачную дэманстрацыю свайго “адрозьненьня” ў сацыяльным жыцьці і грамадзкіх месцах. Да гэтага ідэалягічнага партрэту можна дадаць памятную ўсімі перавагу грамадзкіх інтарэсаў над асабістымі. Усялякая гіпатэтычная цікавасьць да вопраткі імгненна тлумачылася намеранай экспазыцыяй “асабістага”, што ня ўпісвалася ў агульны дызайн сацыяльнай прасторы. Натуральна, што адрозьненьні паміж слаямі грамадзтва існавалі, і яны таксама натуральна суправаджаліся разнастайнасьцю стыляў грамадзкай самапрэзэнтацыі. Але з прычыны таго, што гэта ніяк не адлюстроўвалася ў ідэалёгіі сацыяльнай сыстэмы, адрозьненьні гэтыя ня склаліся ў празрыстую “мову” вопраткі і засталіся на ўзроўні спантанных і стыхійных экспрэсій.
Становішча пачало мяняцца ў часы позьняга сацыялізму, калі асобныя атрыбуты заходняга стандарту жыцьця пачалі праточвацца ў сацыялістычнае грамадзтва і нанасіць асаблівыя значкі на візуальную манатоннасьць сацыялістычнай рэчаіснасьці. Аднак і гэтыя асобныя прадметы, ізаляваныя ад свайго арыгінальнага сымбалічнага і сацыяльнага кантэксту, не былі здольныя сфармуляваць хоць якое рэлевантнае “паведамленьне” на сваёй мове. Тое, што яны казалі, зводзілася, па сутнасьці, да паведамленьня пра сваё заходняе паходжаньне, і гэтым абмяжоўвалася. Да таго ж гэтыя рэчы з Захаду, як правіла, траплялі “на людзі” праз чорны рынак, які быў нечым накшталт паралельнай культуры. Ён суіснаваў з афіцыйнай сфэрай і ня меў на яе асаблівага ўплыву. Па сутнасьці, абмежаваныя рамкамі “культуры чорнага рынку”, гэтыя рэчы з Захаду не былі здольныя ні “зрушыць”, ні расхістаць ідэалягічную канструкцыю, якая, паводле палітоляга Аляксея Юрчака, функцыянавала як гегемонія рэпрэзэнтацыі. У сваім артыкуле “Цынічныя прычыны позьняга сацыялізму” Юрчак пісаў, што ў той пэрыяд ідэалягічныя пасланьні былі элемэнтамі ўсёабдымнай паноўнай рэпрэзэнтацыі, і хаця яны ўжо даўно перасталі разумецца літаральна, але па-ранейшаму ўспрымаліся як непазьбежныя і паўсюдныя. Гэты бясспрэчны характар дзейных законаў сацыяльнага сьвету быў упісаны ў асабісты досьвед савецкіх грамадзян. Яны ўсьведамлялі

поўны кантроль улады над усімі мэханізмамі рэпрэзэнтацыі. У гэтай сытуацыі афіцыйная рэчаіснасьць мела абсалютны і “неадменны” характар не таму, што лічылася сапраўднай, і нават не таму, што людзі баяліся ёй што-небудзь супрацьставіць, але менавіта таму, што ніякай іншай формы грамадзкай рэпрэзэнтацыі рэчаіснасьці ў афіцыйнай сфэры не было і зьявіцца не магло. Сыстэма гэтая цалкам ахоплівала такія сфэры жыцьця, як вопратка, кватэры, мэбля, і ніколі яшчэ не апыналася пад знакам сумневу на ўзроўні ідэалёгіі. Таму і тыя асобныя элемэнты заходняй вопраткі, трапляючы ў савецкае грамадзтва, аказваліся ў ролі ўсяго толькі чужых, хаця і прывабных, парушальнікаў ідэалягічных межаў. Для сацыялістычнага ладу грамадзкай сыстэмы была вельмі важнай мяжа, якая праходзіла дакладна ўздоўж рысы судакрананьня вопраткі з чалавечым целам: па розныя бакі гэтай мяжы знаходзіліся тэрыторыі, падкантрольныя розным інстанцыям. Вопратка была цалкам падначалена ідэалёгіі, у той час як цела было агентам прыватнага, асабістага жыцьця (ня як у Маклюэна, для якога вопратка — працяг скуры).

* * *

З гэтай кароткай перадгісторыі беларускай сучаснасьці зразумела, што ідэалягічны масіў, які доўгія гады панаваў на гэтай тэрыторыі, зрабіў немагчымым узьнікненьне якіх-кольвек уласных уцямных сэміятычных кодаў вопраткі, параўнальных з тымі, што разьвіліся ў заходніх краінах. Не было таксама і рэзкага пераходу ў іншую сацыяльную сыстэму, як у краінах Усходняй і Цэнтральнай Эўропы, пры якім адбылася таксама поўная замена ідэалёгіі і практыкі вопраткі. Разам зь фірмовымі буцікамі вядомых сусьветных вытворцаў на вуліцы Прагі, Будапэшту, Варшавы прыйшлі новыя формы сацыяльнай рэпрэзэнтацыі, строга ранжаваныя ў стылі, статусе, месцы. Нічога падобнага не было ў Беларусі. У выніку паступовага і стыхійнага зьяўленьня ў нашай вопратцы ідэалягічных дадаткаў і дамешкаў з Захаду, часьцей за ўсё апасродкаваных трэцімі краінамі, узьнікла новая канфігурацыя гэтай сэміятычнай прасторы, у якой можна знайсьці абрыўкі розных стыляў, наборы, складзеныя з фрагмэнтаў чужой мовы вопраткі, сымбаляў, узятых зь іншых сыстэм і кантэкстаў. Разам з “прадметамі туалету”, натуральна, трансьлююцца

і сымбалічныя значэньні, але яны ўжо зусім іначай функцыянуюць у новым кантэксьце. Адпаведна, і для расшыфроўкі такіх тэкстаў патрэбна асобная граматыка, якая ўлічвала б гэты трансфэр значэньняў і будавалася б на перакрыжаваным узаемадзеяньні арыгінальнага сымбалічнага парадку і той галіны “беларускага рэальнага”, куды яны перасунуліся.
Тое, што адкрываецца погляду на беларускіх вуліцах, — гэта своеасаблівая гульня прадметамі туалету, якая разгортваецца не на адным, а адразу на некалькіх сымбалічных палёх, і гэты стан суіснаваньня дрэс-кодаў у беларускіх грамадзкіх месцах і становіцца крыніцай неразуменьня, неадэкватнай інтэрпрэтацыі іх зьместаў. Замежнікі — навабранцы нашай будзённасьці — проста ня могуць зразумець паведамленьне, якое трансьлітаравана ў новы кантэкст без уліку старых значэньняў.

* * *

Тое, што аранжыроўка свайго зьяўленьня ў грамадзкім месцы зьяўляецца своеасаблівым сацыяльным дзеяньнем, сацыёлягі давялі даўно. У гэтым былі згодныя нават самыя зацятыя антаганісты — ад структуралістаў і канструктывістаў, што ставяць на аб’ектыўны зьмест у нашых паводзінах, да філёзафаў суб’екта, якія бачаць ува ўсім спантаннасьць, якая ідзе з глыбінь суб’ектыўнасьці. Аднак ні адны, ні другія не маглі пазьбегчы сваёй крайнасьці ўва ўзнаўленьні лёгікі, якая кіруе сацыяльнымі паводзінамі чалавека і ягонай манерай апранацца. Той самай лёгікі, якая актуалізуецца, калі чалавек падыходзіць да свайго гардэробу і выбірае, у чым сёньня зьявіцца на людзях. Каб пазьбегчы крайнасьцяў і вывесьці сынтэтычную формулу, у якой былі б адначасова і “насьледаваньне аб’ектыўным сацыяльным правілам”, і цяжкавыразны элемэнт унутранага суб’ектыўнага разуменьня, французскі сацыёляг Бурд’ё ўвёў у сацыяльную тэорыю панятак “*habitus*”. *Habitus* быў для яго катэгорыяй, здольнай унесьці стратэгічную раўнавагу ў апісаньне чалавечых дзеяньняў у сацыяльнай прасторы. *Habitus* — гэта сыстэма дыспазыцыяў, якая ўлучае рэальны прынцып, схаваны ў стратэгіі практычны сэнс, тое, што спартоўцы называюць пачуцьцем гульні, такое сабе своеасаблівае валоданьне лёгікай, непадкантрольнае

сьвядомасьці і дыскурсу.
Панятак “*habitus*” ахоплівае сетку ключавых зьяваў, якія дазваляе вытлумачыць, — пачуцьце формы, стылю, густу. Так і ў паводзінах чалавека, занятага сэгрэгацыяй масы выраблянай сёньня вопраткі дзеля стварэньня свайго ўласнага індывідуальнага аблічча, дзейнічае, без сумневу, *habitus*.
У дадзеным выпадку гэтае “практычнае веданьне” мае справу з значэньнямі мовы і канвэнцыямі, якія склаліся ў грамадзтве ў дачыненьні да вопраткі. Гэтая мова наўпрост зьвязаная з сэмантычным полем культуры, якое і спараджае пэўныя паняткі — “элегантнасьці”, “фармальнасьці”, “будзённасьці”, “рамантычнасьці” і г.д. З гэтага гледзішча маніпуляцыя сваім выглядам, якую людзі зьдзяйсьняюць пры дапамозе вопраткі, дазваляе лёгка выявіць сувязь наноў сфармуляванага праз вопратку пасланьня з ідэалягічнымі рамкамі агульнага культурнага поля. Фармулёўка спэцыяльнага пасланьня — у тым ліку пры дапамозе вопраткі і вонкавага выгляду — зь неабходнасьцю зьвязана з пэўным рэлевантным сэмантычным кантэкстам, які, уласна, і робіць пасланьне даступным чытаньню і дэшыфраваньню. Пазбаўленыя свайго кантэксту і значэньня, прадметы туалету набываюць сэміятычную самастойнасьць, за якой можа адбывацца альбо поўны знакавы распад дрэс-коду, альбо ўзьнікненьне новай мовы, аніяк ня зьвязанай з сэміятычным мінулым. Гэтую залежнасьць пацьвярджаюць прыклады маніпуляцыі вопраткай, якія можна выявіць у моладзевых субкультурах пасьляваеннай Брытаніі. Найбольш вядомымі сярод іх былі групы «Тэдзі-бойз» і «Модз».
Свае “сацыяльныя праграмы” ўдзельнікі гэтых рухаў рэалізоўвалі праз вонкавы выгляд — праз спэцыфічнае выкарыстаньне стыляў, асобных прадметаў туалету. Акурат у спэцыяльна сфармаваны “выгляд” яны ўкладвалі сутнасьць сваіх грамадзкіх акцыяў. Вось жа, «Тэдзі-бойз» запазычылі ў вышэйшых слаёў так званае “Эдвардыянскае аблічча” і з асобных яго элемэнтаў стваралі ўласныя камбінацыі. Натуральна, што, выбіраючы сярод розных прадметаў туалету, яны, па сутнасьці, цікавіліся ня ўласна вопраткай, а тымі сацыяльна-сымбалічнымі канатацыямі, якія за ёй стаялі. Апранаючы рэчы, якія традыцыйна насілі арыстакратычныя дэндзі, яны нібы набывалі новы візуальна-сацыяльны статус.

І выдаткоўвалі на гэта часьцяком усе свае сродкі: большасьць прадстаўнікоў «Тэдзі-бойз» належалі да калялюмпэнскіх, то бок бедных слаёў грамадзтва. “Яны фармавалі свой выгляд, запазычваючы асобныя дэталі з чужога слоўніка вопраткі і перапрацоўвалі іх ува ўласны, толькі ім уласьцівы стыль”, — піша Тоні Джэфэрсан.

У іншую групу — «Модз» — уваходзілі пераважна лёнданскія падлеткі з рабочага асяродзьдзя, якія таксама імкнуліся аформіць і паказаць соцыюму сваю ідэнтычнасьць пры дапамозе характэрных фрызур і стылю вопраткі. “Яны літаральна прысьвячалі сябе вопратцы... пры гэтым стваралі асаблівыя камбінацыі з разрозьненых элемэнтаў і ператваралі сваё аблічча ў мэтафару”, — пісаў ангельскі сацыёляг Дык Гебдыдж. Па сутнасьці, яны зьдзяйсьнялі інвэрсію каштоўнасьцяў, якія да іх асацыяваліся з добрай вопраткай — з пэўнай формай гальштукаў, кроем і матэрыялам нагавіц, колерамі кашуль. Гэтак яны кідалі выклік асновам, на якіх гэтыя каштоўнасьці трымаліся. “Іх ідэя была ў тым, каб падмануць чаканьні, зьдзейсьніць падмену таго зьместу, які звычайна стаяў за падобным выглядам”, — піша Джэфэрсан. Гэтыя своеасаблівыя брыкаляжы (*bricoleur*), якія брытанская моладзь стварала ў вопратцы, і ідэя, якую яны выказвалі, маглі існаваць толькі пры наяўнасьці асновасяжнай формы дыскурсу моды, якая служыла сэмантычным полем і ідэалягічнымі рамкамі для гэткіх дзеяньняў. Іншымі словамі, каб быць асэнсаванымі і адэкватна зразумелымі, ідэям хлопчыкаў «Тэдзі» і «Модз» была неабходна сымбалічная падтрымка. Такой падтрымкай служылі агульнае сацыяльнае й сымбалічнае асяродзьдзе з уласьцівым яму дыскурсам, у якім прадметы туалету, аксэсуары ня проста існавалі, але і несьлі выразныя значэньні, арганізаваныя ў сыстэму. Прычым такая сыстэма мусіла быць настолькі трывалай, каб любое запазычаньне, перасоўваньне яе элемэнтаў у іншы кантэкст пакідала па сабе выразны знакавы сьлед, дазваляла прасачыць траекторыю — каб яна мела інфармацыю пра арыгінальных спажыўцоў, для якіх гэтыя прадметы выраблялiся. Гэтая інфармацыя ўваходзіла ў склад новага зьместу, які ўзьнік пасьля апрапрыяцыі. Можна сказаць, што паводзіны брытанскіх падлеткаў былі строга пазыцыянаваныя адносна тых, хто быў арыгінальным носьбітам

гэтых прадметаў і іх стылёвай крыніцай, адносна агульнай сыстэмы значэньняў вопраткі і сацыяльных адносін. Праблема пазыцыянаваньня зьяўляецца вызначальнай для адэкватнага разуменьня ідэй, выражаных у любых сацыяльных дзеяньнях, у тым ліку зьвязаных з маніпуляцыяй вопраткай. І акурат яна дапаможа разабрацца ў значэньні стыхійных брыкаляжаў на беларускіх вуліцах. У хаатычным, часта гранічна экспрэсіўным і спрошчаным стаўленьні да стылю, які мы тут назіраем, лёгка заўважыць фактычную абыякавасьць усіх гэтых мужчын і жанчын да ўласна мовы вопраткі. Прадметы туалету, аксэсуары, касмэтыка служаць інструмэнтарам, які адсылае, як і ў брытанскіх субкультурах, да сацыяльных адносін. Толькі тут гэтыя адносіны закранутыя ў іншым вымярэньні, што й ня дзіва, бо савецкі сацыялістычны досьвед праблематызуе зусім іншыя аспэкты сацыяльнага жыцьця. Вопратка для савецкіх людзей знаходзілася пад знакам праблематызацыі асабістай свабоды, на мяжы паміж грамадзкім і прыватным. Яна ж была адным з найбольш даступных шляхоў выхаду з-пад кантролю ідэалёгіі. Якраз у гэтай сфэры пазыцыянуецца зьмест выгляду людзей на беларускіх вуліцах. У ім адбываецца своеасаблівая рэарганізацыя адносін паміж целам і палітыкай яго публічнага выяўленьня, фактычна — рэвалюцыя ў асобна ўзятай сфэры сацыяльнага жыцьця. Так, нібыта вопратка стала першым адваяваным ува ўлады бастыёнам.

Яшчэ ў недалёкім мінулым сацыяльны досьвед гэтых людзей трымаўся на фундамэнтальным дэфіцыце ўласнасьці. Да мінімуму была зьведзеная практыка валоданьня, якую можна разглядаць як адну з асноўных формаў пашырэньня прасторы чалавечай кампэтэнцыі, што фармуе вонкавыя вэктары ягонай заклапочанасьці, інтарэсу і асабістай улучанасьці. Па сутнасьці, нястача пазытыўнага досьведу ўласьніцтва была характэрнай рысай усёй міталёгіі будзённага і сацыяльнага жыцьця таго ладу. Тады акурат чалавечае цела служыла апірышчам чалавечай прыватнасьці, было сымбалем той мяжы, за якую не заходзіла паноўная ў грамадзтве ўлада. Гэты прыватны статус цела не экспанаваўся, але й ня надта адмаўляўся ідэалёгіяй.
З таго часу шмат што зьмянілася. І хаця ў Беларусі не было

сацыяльна-сыстэмных пераваротаў, зьмены закранулі асобныя сфэры грамадзкага жыцьця, сярод іх — вопратку. Скасаваньне ўніформы для дзяцей у агульнаадукацыйных установах было адным з знакаў такога сымбалічнага вызваленьня. Але той ранейшы досьвед, як ні дзіўна, і сёньня фармуе паводзіны беларусаў і беларусак.

Па сутнасьці, іх сучасны выгляд ня кажа пра багацьце ці галечу, дабрабыт ці ягоную нястачу. Ён ёсьць своеасаблівай дэклярацыяй — бачнай, яўнай, часам неапраўдана крыклівай — уласнага, асабістага статусу непадзельна належнага ім цела. Вопратка, адпаведна, зьяўляецца асноўнай мовай, пры дапамозе якой людзі адкрыта і публічна абвяшчаюць пра гэтае права. Цела падаецца соцыюму як толькі і выключна собскае, як бачны сымбаль “сябе”, як тэрыторыя, дзе “раблю ўсё, што хачу”, замест таго, каб быць, як раней, фізычнай матэрыяй, схаванай за шорамі сацыяльных ідэалягізмаў.

На першы погляд, такія публічныя паводзіны беларусаў здаюцца гранічна антысацыялістычнымі. Акцэнт на асабістым і індывідуальным, пастаўлены навідавоку ўва ўсіх, новая практыка дэманстратыўнага клопату аб целе пры дапамозе вопраткі і ягонае экспанаваньне ў грамадзкіх месцах зьяўляюцца нібыта адказам на ранейшыя і яшчэ не зусім забытыя забароны. Такім чынам, тая тэрыторыя, калісь акрэсьленая і цалкам падкантрольная сацыяльнай сыстэме рэпрэзэнтацыі, апынаецца ў мінулым. Аднак у сапраўднасьці эфэкт, які дасягаецца такімі паводзінамі і вопраткай, па сутнасьці, супрацьлеглы: яны дэманструюць гістарычную жывучасьць былога сацыялістычнага *habitus*-у.

Habitus можа разумецца ня толькі як простая асыміляцыя вонкавых правілаў у працэсе ўдзелу ў сацыяльным жыцьці, але і як унутраная інкалькуляцыя адпаведных дыспазыцыяў. Як такая, улучанасьць у агульны культурны і сацыяльны парадак дасягаецца праз уваходжаньне ў мноства прыватных дамінантна-падначаленых суадносін, якія ён задае. Адна з такіх дыспазыцыяў сацыяльнай прасторы ў эпоху сацыялізму закранала адносіны паміж прыватнай і грамадзкай сфэрамі. Чалавечае цела ў гэтай схеме пазначала сабой мяжу прыватнасьці. І тое, што мы назіраем сёньня ў беларускіх грамадзкіх месцах, — ці не ўвасабленьне гэта ў жыцьцё той старой знаёмай сацыялістычнай дыспазыцыі прыватнага

і грамадзкага, якая, як бачым, захавалася і па-ранейшаму вызначае сацыяльныя паводзіны людзей? Здаецца, што яны рэвалюцыйна зьмяніліся, калі людзі пачалі апранаць ці занадта прывабную, ці адкрыта правакацыйную вопратку. Але за такім бачным бунтам праглядаецца стары добры чалавечы *habitus* эпохі сацыялізму, які ня зьнік з глыбіняў псыхалёгіі сацыяльнага суб'екта. І ў поўнай адпаведнасьці зь ім людзі па-ранейшаму застаюцца ўва ўладзе старой ідэалягемы, якая гаворыць ім, што цела — адзіная "асабістая справа" ў чалавечым жыцьці, яно ж — мяжа, якая акрэсьлівае рамкі "прыватнага" на грамадзкай, падкантрольнай усім уладам тэрыторыі.

Вена, 2003

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 6 (29) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
Эўропа на ўсход ад Эўропы
Эўропа на ўсход ад Эўропы
Эўропа на ўсход ад Эўропы

дзеяньні на Каўказе, паводле перакананьня шматлікіх тэрыторыяльных удзельнікаў і назіральнікаў, таксама вядуцца фэдэральнымі сіламі менавіта супраць людзей пэўнай — “каўказскай” — нацыянальнасьці.

Мы мяркуем, што такая ўнівэрсалісцкая рыторыка зьяўляецца інструмэнтам, хто ажыцьцяўляе названыя практыкі, зьяўляецца інструмэнтам, што выводзіць іх з-пад адказнасьці. Бо адказнасьць за цкаваньне паводле нацыянальнай прыкметы, калі б гэта была вызначаная, аказалася б вельмі сур’ёзнай. Зрэшты, **суб’екты** адказнасьці маглі б стаць некаторыя асобы. Мы ж тут і далей будзем гаварыць пра працэсы ў безаблічнай (і безадказнай) грамадзкай думцы, масавай сьвядомасьці. Такім чынам, на жаль, у нас досыць прычын, каб казаць пра наяўнасьць масава варожага стаўленьня да гэтай катэгорыі АКН, пра тое, што ў шэрагу выпадкаў АКН аказваюцца ў ролі ворага. Аднак панятак “варожасьць” і яго навуковыя эквіваленты (ксэнафобія, этнічны нэгатывізм, этнічная эксклюзія), як і панятак “ворага” (праціўніка), мае іншую прыроду, чым панятак “вобраз ворага”. Апошні ўключае фігуру, інстанцыю дасьледчыка, які кваліфікуе сытуацыю, але знаходзіцца па-за ёй. Апрача таго, катэгорыя “вобразу ворага” прыцягваецца для апісаньня суб’екта варожага стаўленьня, у адрозьненьне ад панятку “ворага”, які дадаецца да аб’екту такога стаўленьня. Нарэшце, канцэпт “вобразу ворага”, на наш погляд, варта скарыстоўваць для аналізу тых выпадкаў, калі выказваньне нэгатывізму на адрас якога-небудзь сацыяльнага аб’екту мае вынікам (фактычнай / лятэнтнай мэтай) не нанясеньне яму шкоды, яго зьнішчэньне і да т.п., але павышэньне салідарнасьці ў нейкім згуртаваньні — суб’екце гэтых нэгатыўных перажываньняў, афэктаў.

мяне зацікавіла пытаньняў, што прыводзіць Ўсеагульным, скім цкаваньне выбіраным вынікам грамадзкае думкі.

“Вобраз ворага” — мы можам сказаць, складаны аналітычны канцэпт, канструкцыя, стваральнікі і карыстальнікі якой належаць да таго ж боку, што й аўтар і чытачы гэтых радкоў, назавём яго “апісальным”. Катэгорыя ж АКН належыць, як мы пакажам, боку, “які апісваюць”. Сама катэгорыя, што таксама будзе паказана, зьяўляецца, у сваю чаргу, вельмі складанай канструкцыяй, стваральнікаў якой мы назавём.

На наступных старонках мы зьвернемся да некаторых гістарычных і сацыяльных перадумоваў фармаваньня “вобразу ворага” менавіта з “каўказцаў”, а пасьля разгледзім адзін

з выпадкаў выкарыстаньня гэтага вобразу.

“Нацыянальнасьць” як галоўная антрапалягічная кваліфікацыя

Сказаўшы, што аб’ектам варожасьці вельмі часта аказваюцца асобы некаторай нацыянальнасьці, варта запытаць сябе, чаму менавіта нацыянальнасьць зьяўляецца прычынай для дыскрымінацыі (ці выдаецца за такую). Адмысловец лёгка заўважыць, што ў большасьці выпадкаў, калі дыскрымінацыя таго ці іншага кшталту ажыцьцяўляецца ў дачыненьні да “каўказцаў”, яна зьяўляецца дыскрымінацыяй расавай, а не нацыянальнай. Гэта найбольш зразумела, калі ўжываецца слова “чорныя” і ягоныя эквіваленты, і найбольш наглядна, калі пад імя “азераў”, што зьяўляецца свайго роду нацыянальнай кваліфікацыяй, залічваюць прадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў.

Нашае разуменьне “тых, хто апісвае”, што пад нацыянальнасьцю ў гэтых выпадках разумеюць расу, важнае для нас саміх. Але ня менш важна было б зразумець, чаму выкарыстоўваецца слова “нацыянальнасьць”.

Мы не прэтэндуем на асьвятленьне ўсяго велізарнага комплексу пытаньняў, зьвязаных з выкарыстаньнем гэтай катэгорыі. Мы хочам толькі адзначыць узрастаньне ролі нацыянальнай кваліфікацыі і самакваліфікацыі ў 1990-я гады на савецкай, далей постсавецкай прасторы.

Сьцісла кажучы, распад адносна складаных сацыяльных структураў суправаджаўся кампэнсатарным умацаваньнем адносінаў прасьцейшага характару, да якіх належаць салідарнасьці на “прыродных”, прымардыяльных пачатках, такіх, як век, нацыянальнасьць ці месца жыхарства (пры пашыраным разуменьні адпаведных тэрмінаў іх часам называюць гендэрнымі ці расавымі катэгорыямі).

Можна меркаваць, што прычыны наступныя.

Інстытуцыянальнае ўпарадкаваньне савецкай дзяржавы як формы для грамадзтва было закладзенае, як вядома, на высока ўнівэрсалісцкіх пачатках, уласьцівых адному з утапічных варыянтаў камуністычнай ідэалёгіі пачатку XX стагодзьдзя. Да аднога з гэтых пачаткаў належыць усталяваньне ўсеагульнай роўнасьці ў незалежнасьці ад расы ці нацыянальнасьці. Больш за тое, сьцьвярджалася такая мэта-ідэал, як ліквідаваньне

нацыяў і нацыянальных адрозьненьняў.
Зь цягам часу гэтае ўпарадкаваньне эвалюцыянавала. Варта нагадаць, што ідэолягі і іх прыхільнікі, якія падтрымлівалі першапачатковую ўтапічную пазанацыянальную вэрсію, былі рэпрэсаваныя. Далей шырока апісаная эвалюцыя рэжыму ў канцы 1930—1940-х гадоў, якая была выкліканая падцягнуць і кансалідаваць новыя слаі мясцовай бюракратыі, што зьявіліся ў выніку паскоранай ратацыі. Катэгорыя нацыянальнага была рэабілітаваная і пушчаная ў справу як інструмэнт. “Нацыянальнасьць” атрымала каштоўнасную афарбоўку — часткова з апірышчам на падобныя традыцыйныя катэгарызацыі (народнасьць, веравызнаньне), часткова як новы атрыбут чалавека ці групы. У выпадку пазытыўнага знаку нацыянальнасьць для чалавека ці групы магла ператварацца ў рэсурс, у тым ліку для вэртыкальнай мабільнасьці. Нацыянальнасьць жа магла трансфармавацца ў карпаратыўны рэсурс мясцовай бюракратыі ў адносінах з вышэйшымі інстанцыямі.
Пасьля істотных хваляваньняў і канфліктаў у хрушчоўскія часы балянс наяўных бюракратычных групаў, у тым ліку тых, якія апазнавалі сябе як “нацыянальныя”, быў усталяваны. Гэта пачало надалей успрымацца як брэжнеўскі застой. Разьвіцьцё бюракратычнай сыстэмы прыняло характар інвалюцыі. Ідэалягічныя групы, якія абслугоўвалі сыстэму і былі зьвязаныя з унівэрсалісцкім камуністычным дыскурсам, дасягнулі верхніх паверхаў адведзеных ім каналаў мабільнасьці і замацаваліся там. Замацаваўшыся, яны манапалізавалі свае правы на інтэрпрэтацыю адпаведных ідэалягемаў і на эмісію адпаведных сымбалічных прадуктаў, якімі яны абслугоўвалі палітычны рэжым.
У сувязі з гэтым такія кірункі, як навука, ідэалёгія, культура — ува ўнівэрсалісцкай іх трактоўцы — згубілі пэрспэктыўнасьць для арыентаванай на мабільнасьць зьмены. Толькі вузкая катэгорыя імпэрска-сталічнай інтэлігенцыі магла працягваць пошук на ўнівэрсалісцкіх жа шляхах, але зьмяніўшы “камуністычны” варыянт унівэрсалізму на “гуманістычны” ці “агульначалавечы”. А для мясцовых субэлітных групаў альтэрнатыўны шлях ляжаў празь незанятыя сэнсавыя зоны рэлігійнага, этнічнага, містычнага, нарэшце, нацыянальнага. Першыя этапы крызы вышэйшай дзяржаўнай бюракратыі

(“галоснасьць”) разблякавалі шляхі адначасова для абодвух дыскурсаў — “агульначалавечага” і “нацыянальнага”. Фракцыя вышэйшай бюракратыі, што перамагла на гэтым першым этапе, зрабіла стаўку на саюз з былым ідэалягічным праціўнікам — “Захадам”. Адпаведна, унутры краіны яна прыцягнула носьбітаў “агульначалавечых” універсалісцкіх пераканаьняў (“перабудова”). Тады саюзьнікам цэнтральнай улады (М.Гарбачова) выступіў аўтар той рэпэтыцыі “перабудовы”, што была праведзеная на Каўказе, — Э.Шэварднадзэ, які ўжо пакінуў сваю рэгіянальную пасаду. Нерэпрэсіўны характар слабога рэжыму пакінуў “нацыяналістычны” дыскурс у распараджэньні ніжэйшых групаў бюракратыі.

Гэты дыскурс выявіў для іх сваю высокую інструмэнтальнасьць, бо ён дазволіў адмабілізаваць пад кожную зь мясцовых элітаў “сваё” грамадзтва. Дадзены этап успрымаўся як “нацыянальны ўздым”. Далей з апірышчам на гэты рэсурс мясцовыя эліты змаглі дабіцца незалежнасьці ад цэнтру (што пасьля было названае “парадам сувэрэнітэтаў”). На Каўказе гэты працэс прыняў асабліва канфліктныя формы. Грузія, якая паводле структуры найбольш нагадвала ўласную мэтраполію, перажыла параксізмы нацыяналістычна арыентаванага рэжыму з аўтарытарна-таталітарнымі ўхваткамі, чараду канфліктаў, што мелі характар грамадзянскай вайны, а далей — сэрыю сэпаратысцкіх выступаў, якія мелі і ўласныя “нацыянальныя” крыніцы, і падтрымку звонку.

У большасьці выпадкаў інвалюцыя мясцовай дзяржбюракратыі, што была вызваленая з-пад кантролю цэнтру і атрымала “свае” рэсурсы ў непадзельнае карыстаньне, паглыблялася. Складаныя структуры кіраваньня, калі яны не былі зьвязаныя з працэсамі пераразьмеркаваньня ўласнасьці ці заміналі ім, былі разбураныя. Адпаведна, складаныя формы імпэрскай ідэнтычнасьці і ляяльнасьці згубілі свой практычны сэнс. Імпэрская культура, якую перасталі падтрымліваць, — а гэта была адзіная інстытуцыйна ўладкаваная культура, — пачала імкліва разбурацца. Гэта выявілася ў формах разбурэньня навукі, адукацыі. Простыя формы ідэнтычнасьці, для падтрымкі якіх патрэбны мінімум інстытуцыянальна-арганізацыйных сродкаў, пачалі прыходзіць на зьмену. “Нацыя”, “нацыянальнасьць” належаць менавіта да гэткіх.

АКН як габрэй нашага часу

Адзін з клясычных варыянтаў “вобразу ворага” для многіх грамадзтваў — “габрэй”, “жыд”. Сындраматыка антыкаўкаскіх установак сярод насельніцтва цэнтральных і шэрагу ўскраінных раёнаў Расеі шмат у чым нагадвае клясычны антысэмітызм, якім ён быў у канцы XIX — пачатку XX стагодзьдзя ў Расейскай імпэрыі. Сапраўды, у абодвух выпадках аб’ектам зьяўляецца меншасьць, чальцы якой маюць выгляд, манеру маўленьня (акцэнт), імёны, што лічацца характэрнымі, то бок тымі, якія гавораць пра пэўныя (непрымальныя) чалавечыя якасьці і нават пра чужыя каштоўнасьці ды варожыя для большасьці мэты іх носьбітаў. Як і ў выпадку з габрэйствам зь мястэчкаў, “каўказцы” ўнутры сябе камунікуюць на чужой і незразумелай для большасьці мове, слухаюць сваю музыку, выконваюць свае рытуалы і адзначаюць свае сьвяты, захоўваюць уласныя пабытовыя звычкі, разам з спосабам арганізацыі сям’і і колькасьцю дзяцей, стаўленьнем да іх выхаваньня, стаўленьнем да навучаньня. Іхная група, як калісьці габрэі, мае ўласную пабытовую этыку, сваю працоўную і камэрцыйную этыку і, нарэшце, уласную веру. Далей, што “чорныя”, што габрэі, як часта зь непрыязнасьцю заўважаюць у іх атачэньні, імкнуцца трымацца разам, дапамагаюць адзін аднаму. Яны кампактна жывуць і канцэнтруюцца ў пэўных прафэсійных і эканамічных нішах. Адна з найважнейшых акалічнасьцяў — яны дзейнічаюць у прадпрымальніцтве (камэрцыі, гандлі, бізнэсе). Пры гэтым трэба зазначыць, што дзеля шэрагу прычынаў гэтыя групы-меншасьці маюць, як правіла, большы посьпех у прадпрымальніцтве, чымся большасьць, сярод якой яны жывуць і якая аказваецца ў становішчы іх кліентаў і іх працаўнікоў. Уласна, яны акумулююць капітал.

У “нацыянальнага пачуцьця” зьяўляецца клясавы кампанэнт. Гэтыя групы лёгка становяцца аб’ектам канцэнтраванага антаганізму, што нярэдка ўключае такі эксцэс, як пагром. Няцяжка заўважыць, што гэтыя прыкметы (прыдатныя для апісаньня многіх групаў, напрыклад, кітайцаў у Паўднёва-Ўсходняй Азіі ці індыйцаў у Афрыцы), дапасавальныя да габрэйства канца XIX — пачатку XX стагодзьдзя ў Расеі і некаторых іншых краінах Усходняй Эўропы, не дапасуюцца да габрэйства сёньняшняга. Апошняе згубіла свае адрозьненьні ад атачальнай большасьці і паводле мовы, і паводле веры,

пабытовай культуры ды інш. Яно таксама ў значнай ступені разьмеркавалася ў розных эканамічных і сацыяльных нішах. Адбылася асыміляцыя габрэяў. Яны трансфармаваліся ў супольнасьць зусім іншага кшталту, нашмат больш інтэграваную ў мясцовую культуру. Пра кошт гэтай асыміляцыі, якая ўключае ледзь ня ўдалае “канчатковае рашэньне габрэйскага пытаньня”, тут гаворка ня пойдзе. Такія габрэі таксама часам становяцца аб’ектам нэгатыўных адносінаў, і гэтыя адносіны таксама маюць назву “антысэмітызм”. Аднак, паводле нашага глыбокага перакананьня, вельмі важна правесьці адрозьненьне. “Клясычны” антысэмітызм, які праіснаваў доўгі час ажно да самых першых дзесяцігодзьдзяў ХХ стагодзьдзя, быў скіраваны супраць меншасьці, якая пужала большасьць сваёй небясьпечнай чужасьцю. Сёньняшні антысэмітызм нацэлены на групы асымілявaных габрэяў, якія пужаюць сваёй небясьпечнай блізінёй.

Сярод выхадцаў з Каўказу частка належыць да ранейшых хваляў, чымся цяперашнія мігранты і ўцекачы. Ступень іх асыміляцыі ў савецкую і расейскую культуру прыкладна такая ж паводле глыбіні, як у сучаснага габрэйства. Адпаведна, калі яны і робяцца аб’ектамі варожага стаўленьня, дык тыпу сучаснага антысэмітызму.

Што тычыцца цяперашніх “каўкаскіх” дыяспараў у Расеі, ім выпадае на долю цалкам клясычная форма непрыязнасьці да “гандлёвага народу”. Яны зазнаюць долю ня проста тых, кім пагарджаюць і каго ненавідзяць, але тых, каго цкуюць, грамяць і да т.п. Пры гэтым у некаторых групаў “каўказцаў”, як, напрыклад, армянаў, а таксама чачэнцаў, у калектыўнай памяці, як і ў габрэяў, жыве траўма (спроба генацыду ці мэтанакіраваных рэпрэсіяў супраць іх як народу). Гэта фармуе дадатковыя характарыстыкі дыяспары і афарбоўвае адносіны з большасьцю.

Каўказ. Практыкаваньні ў геаграфічным дэтэрмінізьме

Каўказ — горнае ўтварэньне, якое ляжыць ля мора. У пэрыяд, калі фармавалася сучасная мапа сьвету, Каўкаскія горы і мора за імі — пры наяўных рэсурсах і сродках вядзеньня вайны ды ўвогуле аказаньня сілавога ціску — былі цяжкапераадольнай

перашкодай для далейшага пашырэньня Расейскай дзяржавы. Балянс сілаў паміж Расеяй і іншымі краінамі замацаваўся ў XIX стагодзьдзі так, што Каўказ стаў краем, мяжой расейскай экспансіі ў гэтым кірунку. У гэтым сэнсе Каўказ — мяжа магчымасьцяў імпэрыі.

У ходзе яе напаўраспаду, прыпыненага ў канцы XX стагодзьдзя, Каўказ ізноў паказаў сябе ў гэтай якасьці ліміналнай акалічнасьці расейскага існаваньня. Па яго хрыбце пралягла новая мяжа. Але і яго паўночныя схілы як тэрыторыя — зона найвышэйшай рызыкі, дзе Расея можа страціць землі, і зона найбольшай імавернасьці (ці найбольшых ілюзіяў) набыцьця, вяртаньня адпалых земляў. Менавіта там — участкі тэрыторыі РФ, дзе фактычна няма яе юрысдыкцыі, дзе супраць краіны на яе тэрыторыі вядуць вайсковыя дзеяньні іншаземцы — не абстрактныя “міжнародныя тэрарысты”, а грамадзяне іншых дзяржаваў. Разам з тым менавіта на Каўказе і толькі на Каўказе Расея заяўляе прэтэнзіі на кантроль над тэрыторыямі, якія належаць сумежнай дзяржаве, ажыцьцяўляе сілавыя і палітычныя дзеяньні, якія многім здаюцца падобнымі да анэксіі. Скажам так, Каўказ — гэта геаграфічнае месца, дзе працягваецца каляніяльная гісторыя Расеі, адзінае месца, дзе Расея можа паводзіць ці ня можа сябе не паводзіць як каляніяльная дзяржава.

Больш за тое, на Каўказе працягвае разыгрывацца геапалітычная драма часоў халоднай вайны. Акурат там Расея знаходзіцца сваімі вайсковымі структурамі ў найбольш цесным сутыкненьні, фактычна — супрацьстаяньні з сваім былым асноўным супернікам і патэнцыйным вайсковым праціўнікам — ЗША.

Расейскія вайсковыя аб’екты суседнічаюць з амэрыканскімі ў постсавецкай Сярэдняй Азіі, але там ёсьць флёр новай “пуцінскай” палітычнай рэчаіснасьці, то бок хаця б бачнасьць супадзеньня “контртэрарыстычных” мэтаў і інтарэсаў абедзьвюх краінаў. Зьяўленьне ж амэрыканскіх вайскоўцаў у Грузіі ёсьць адкрытым супрацьстаяньнем расейскім намерам і ў гэтым сэнсе — чарговым абазначэньнем Каўказу як мяжы, бар’еру для расейскай экспансіі — цяпер не прыроднага, ляндшафтнага, але геапалітычнага.

Вайна і курорт

Але геаграфічнае палажэньне Каўказу мае і іншую праекцыю, назавем яе прыродна-этна-культурнай. Чорнае мора як дальняя пэрыфэрыя міжземнаморскага басэйну аказалася паўночнай мяжой пашырэньня адпаведнай культуры. У сілу гэтай акалічнасьці ў зоне Каўказу зьдзяйсьняўся культурны кантакт. Расейская (стэпавая, лясная, паўночная — словам, кантынэнтальная) культура зналася з культурай, якая была перш за ўсё фундамэнтальна “іншай”. Пры гэтым, у адрозьненьне ад “іншых” на паўночнай і ўсходняй межах савецкай айкумэны (і ў падабенства з гэткай на заходняй мяжы) яна была зараджаная больш высокім патэнцыялам і таму прыцягальная. Расейцы ўступілі ў кантакт з гэтым культурным комплексам тады, калі ён паступова выходзіў з-пад уплыву Асманскай імпэрыі. Адпаведна міжземнаморская культурная лінія, якая дайшла да расейскіх вачэй і вушэй, мела моцную “прысадку” мусульманскай — цюрска-пэрсідзка-арабскай — традыцыі. У культурным сэнсе гэты “паўднёвы Захад” раз-пораз пераходзіў у “паўднёвы Ўсход”. Тыфліс для расейцаў быў настолькі ж Парыжам, наколькі Стамбулам.

Каўказ, будучы яшчэ тэатрам ваенных дзеяньняў у XIX стагодзьдзі, атрымаў у літаратуры і сярод абслугоўванай ёю чытацкай публікі статус экзатычнай краіны. Рамантычная праекцыя ці не найлепш удалася менавіта ў дачыненьні да Каўказу як прыроднай зоны і як прытулішча плямёнаў ды народаў.

Для эўрапейскіх нацыяў доўгатэрміновыя каляніяльныя войны — у адрозьненьне ад адносна карацейшых, але больш небясьпечных для нацыі войнаў з роўным праціўнікам, іншай дзяржавай — безумоўна, гралі асаблівую й істотную ролю ў культуры. Расеі дапамагло стаць у гэты шэраг непасьпяховае і таму доўгатэрміновае пакарэньне Каўказу. Наяўнасьць Каўказу як месца для подзьвігу, для слаўнай сьмерці адыграла істотную ролю ў станаўленьні этычнай сыстэмы расейскага дваранства якраз тады, калі яно (дваранства) закладала асновы таго, што цяпер завецца “расейскай культурай”. Ваенная заваёва Сібіры і Паволжа прайшла да гэтага часу, заваёва Цэнтральнай Азіі — у асноўным пасьля. Таму рамантычнае ў расейскай культуры аказалася зьвязаным перш за ўсё з Каўказам.

Каўказ даў выхад да дзьвюх культурных зонаў. Адна —

Міжземнамор'е, паўночнай ускраінай якога было чарнаморскае ўзьбярэжжа Каўказу (і Крым). Амбіянс міжземнаморскіх партовых гарадоў, культура курорту адыгралі істотную ролю ў складаньні сьпярша культуры клясы, якая жыла, нічога ня робячы, далей — сьвяточнай культуры дваранства, пасьля — формаў непаўсядзённасьці для іх нашчадкаў у савецкія часы. Тут можна было гуляць у Эўропу.
Другі выхад — да Малой Азіі, на Ўсход. Мусульманскі кампанэнт, што прысутнічаў на Каўказе, у кароткі пэрыяд савецкага спакою ўжываўся як дэкор для стварэньня арыентальнага асяродзьдзя.
Масавай жа культуры належаць — гэтаму ніхто ня будзе пярэчыць — разнастайныя фільмы, тэлеспэктаклі, якія эксплюатуюць сымбалічны фонд Каўказу як гісторыі. Сюды, у сваю чаргу, адносяцца гістарычныя паводле сваёй пазнакі зьвесткі, якія атрымліваюць на самім Каўказе тыя, хто там пабываў. Існы фонд "мінулага", калі хочаце — "традыцыі", выконвае, як яму і належыць, ролю абгрунтаваньня сёньняшніх пазыцыяў.
Тут паўстае адна сур'ёзная праблема. Этычныя праблемы, якімі былі заклапочаныя ў свае часы расейскія літаратурныя клясыкі, не ўключалі пытаньня пра правы — правы чалавека, правы людзей розных канфэсіяў на свабоду сумленьня, правы нацыяў на самавызначэньне, правы адной краіны на тэрыторыю іншай і да т.п. Для іх гэтыя пытаньні яшчэ не ўставалі ці не ўставалі ў дачыненьні да сытуацыі на Каўказе. Норма інтэрнацыяналізму, якая зьявілася зь іншых парадыгмаў, ня кажучы пра нормы грамадзянскіх правоў, блага стыкуецца з тым, як падыходзілі да расейскай палітыкі на Каўказе Пушкін і іншыя "нашы ўсе". Зь зьяўленьнем марксісцкай касмапалітычнай дактрыны і пралетарскага інтэрнацыяналізму, што вырас зь яе, быў выпрацаваны падыход і да афіцыйнай карціны сучаснасьці, і да афіцыйнай карціны гісторыі. Ня месца выкладаць яго тут. Важна падкрэсьліць, што гэты падыход дастаткова складна ўвязваў усе маральна значныя рашэньні, якія маглі сустрэцца на прадугледжаным гэтай мас-культурай жыцьцёвым шляху савецкага чалавека.
У прыватнасьці, пераход Каўказу, населенага, што зразумела, людзьмі зь іншай часткі сьвету, ува ўласнасьць Расеі, а пасьля СССР, як і правы "нас" на "іхныя" рэсурсы, што вынікаюць

з гэтага, там былі абгрунтаваныя ня “нашымі” эгаістычнымі (па-цяперашняму — нацыянальнымі) інтарэсамі, а “іхным” інтарэсам і карысьцю. Калі б ня мы, яны б не прылучыліся... Іншая справа, што поруч з гэтай афіцыйнай мас-культурай існавала нейкая фольк-традыцыя, асаблівы дыскурс, у якім таксама было сваё гістарычнае меркаваньне, як і свая антрапалёгія, этналёгія і сацыялёгія.

Акурат гэтаму прынцыпова непісьменнаму сучаснаму фольк-дыскурсу, як ні дзіўна, карэспандуе этыка Пушкіна і Лермантава — у той частцы, у якой яна адпавядала этыцы казакоў і генэралаў. Там няма сумневу, чаму чачэнец — злы, як няма пытаньня, ці можна абвяшчаць злымі/добрымі цэлыя народы і да т.п.

Такая фольк-гісторыя — этнагісторыя, калі хочаце, — дае людзям упэўненасьць у тым, што цяперашнія абставіны не навіна, што такое разьмеркаваньне роляў — мы змагаемся зь імі, яны спрабуюць нам шкодзіць — нармальнае, што “яны заўжды нас ненавідзелі”, “яны тысячу гадоў з намі ваююць”. Аповедамі пра тое, што Каўказ быў заваяваны, і прытым у ходзе працяглых войнаў, абгрунтоўваецца права на гэты край. Антрапалягічны падыход тут тлумачыць інакшасьць каўказцаў вельмі проста. Ён прымае яе за дадзенасьць, але не пакідае яе ў статусе факту, акалічнасьці, якую трэба патлумачыць, а, наадварот, ператварае яе ў тлумачальны аргумэнт. Акурат таму яны да нас варожыя, бо яны іншыя. Асымэтрыя не бянтэжыць. На адным баку мы — такія, якія мы ёсьць, беспрэдыкатныя. З таго, якія мы, увогуле нічога не вынікае — мы для сябе празрыстыя, нябачныя. А на іншым баку яны, не такія. Яны, вядома, зусім непразрыстыя, і ня варта разглядаць іх знутры, вывучаць як людзей. Зразумела, што іх непадобнасьць да нас і ёсьць прычынай таго, што “яны нас ня любяць”, яны шкодзяць.

А вось такое ж фольк-сацыялягічнае меркаваньне: яны ўсе трымаюцца разам, усе адзін за аднога, адзін пралезе — усіх за сабой цягне. У іх слухаюцца старэйшых, паважаюць жанчынаў, помсьцяць за сваіх. У нас нічога гэтага няма. Гэтыя якасьці нам даспадобы, як нам даспадобы багацьце. Яны ў гэтым сэнсе багатыя, мы бедныя. У нас перавага (перад самімі сабой), якую бедны мае ў вачах народу: “нам цяжэй”. Яны ня п’юць, у іх такі закон, ці — яны п’юць і не сьпіваюцца, а мы шмат п’ём,

сьпіваемся, нам і ад гэтага цяжэй.
Нашая перавага даведзеная. Яна захоўваецца і ў тых выпадках, калі прызнаецца, напрыклад, іх (чачэнцаў) неадольнасьць.

Яшчэ раз пра “гісторыю бальшавіцкіх арганізацыяў у Закаўказьзі”

Калянізацыя Каўказу пасьля заканчэньня вайсковага супраціву йшла шляхам уключэньня рэгіёну ў агульную імпэрскую рамку ў якасьці адной з правінцыяў. Такая сытуацыя адкрыла перад грамадзтвамі Каўказу пэўныя пэрспэктывы мабільнасьці ў адносна шырокіх межах той сацыяльнай сыстэмы, якую ўяўляла зь сябе Расейская імпэрыя. Адна лінія — гэта ўключэньне мясцовых элітаў у склад імпэрскай знаці. Другая — падключэньне да аднога з галоўных мэханізмаў вэртыкальнай мабільнасьці — сыстэмы адукацыі. Нарэшце, трэцяя лінія ўяўляла зь сябе ўключэньне ў контрэліту, апазыцыю, якая змагалася за ўладу з самаўладзьдзем.
Па такім канале ўзыходзілі на агульнаімпэрскі ўзровень многія жыхары Каўказу, сярод іх Ёсіп Джугашвілі. Імпэрыя на тое й імпэрыя, што яе лёс часам вырашаюць маргіналы, але заўсёды вырашаюць у цэнтры. Для імпэрскага цэнтру Джугашвілі з Каўказу быў у яшчэ большай ступені маргінал, чымся Ўльянаў з Паволжа ці Бранштэйн з Наваросіі.
Каўкаскаму паходжаньню Сталіна трэба сёньня надаць асаблівую ўвагу. Сярод цывілізацыйных асяродкаў, заваяваных расейскімі царамі, Каўказ меў асаблівае значэньне. Гэты край гістарычна старэйшы за Расею, ён жа за яе дэмаграфічна маладзейшы. Яго народы валодаюць сацыяльнымі рэсурсамі, якіх няма ў расейцаў, але маюць патрэбу ў тым, што яны могуць знайсьці толькі ў Расеі. Каўказ як населенае месца меў зусім іншую структуру сацыяльных сувязяў, чымся цэнтральная частка імпэрыі. Сталін наклаў сетку адных адносінаў на іншыя і карыстаўся абедзьвюма з выгадай для сябе. Як толькі Сталін стаў на чале імпэрыі, ён, не забудземся, выступіў і як уладар Каўказу. У сваёй правінцыі ён зьнішчаў роды й кланы, перасяляў ці выганяў народы, забараняў мовы.
Аднак ён жа даў тым, хто застаўся пасьля ягонага тэрору, рэнту (цэны на сыравіну), якая пасьля ягонай сьмерці карміла гэты

край яшчэ гадоў сорак, да распаду імпэрыі. Пры ім былі ўсталяваныя такія закупкавыя цэны на мандарыны, бабкоў ліст й іншыя ўнікальныя прадукты субтрапічнага краю, што туды пацяклі грошы з усяго Саюзу. Ён заклаў асновы каўкаскага фэадальнага капіталізму, які перагнаў расейскі. Мабыць, тады ўзьнікла роля Каўказу, у першую чаргу Грузіі, служыць экспэрымэнтальнай пляцоўкай для ўсіх галоўных сацыяльных і эканамічных працэсаў, што пасьля будуць узрушваць Расею. Татальная карупцыя, мэханізмы блату й дэфіцыту, ценевікі, цэхі і цэхавікі — усё гэта спачатку зьяўлялася на Каўказе, пазьней трапляла ў Расею. Больш за тое, перабудова рэпэтавалася ў Грузіі пры Шэварднадзэ. Корпус элемэнтаў былога СССР, які разьвітваецца зь дзяржсацыялізмам, стаіць перад выбарам, якую мадэль капіталізму прыняць. Адну прапаноўвалі наша Поўнач, наш Захад — Прыбалтыка. Другую — наш Поўдзень, наш Усход. Гэта Каўказ і Цэнтральная Азія. Першая мадэль, будзем лічыць, — гэта клясычны капіталізм, “паводле Вэбэра”. Рацыянальнасьць, эфэктыўнасьць, празрыстасьць, чысьціня. Уласна ў Расеі гэтым шляхам мелі намер рухацца некаторыя з каапэратараў самай першай хвалі, якія прыйшлі з НДІ, з ВНУ. Хацелі выпускаць недарагі дыхтоўны абутак і мець сумленны высокі прыбытак. Другая мадэль — капіталізм, які можна назваць каўкаскім ці паўднёвым. Для нас ён паўднёвы, таму што ў формах, якія цяпер у нас пануюць, ён закладаўся адно-два пакаленьні назад, перш за ўсё на Каўказе, на так званых “поўднях”, а таксама ў некаторых раёнах Сярэдняй Азіі. Але расквітнеў ён перш за ўсё на прасторах Расеі, часткова Ўкраіны. Яго можна ў шырокім сэнсе назваць міжземнаморскім, але ў Міжземнамор’і яго называюць левантыйскім. Гэта капіталізм, які нарадзіўся і жыве па-за рэчышчам пратэстанцкай этыкі.

Прайшоў нейкі час, і давялося канстатаваць, што выбар у Расеі зроблены, і зроблены на карысьць другога тыпу. Сапраўды, у Расеі пачаў дамінаваць бізнэс, заснаваны на сувязях роднасьці й знаёмства, а не фармальных роляў, на вусных дамовах і пагрозе расправаў, а не на дакумэнтах і юрыдычнай урэгуляванасьці і да т.п. Упадабаны жарт “у нас базар, а ня рынак” самім ужываньнем пэрсідзкага слова паказваў на “пэрсіянскі”, “азіяцкі” радавод нашага капіталізму, што склаўся

абы-як. Больш навуковыя разважаньні пра яго мафіёзна-бюракратычную аснову вялі да таго ж да аналёгіяў з трэцім сьветам, то бок з той жа “азіятчынай”.

Дэпартацыя

Тут ня будзе абмяркоўвацца роля Сталіна ў гісторыі імпэрыі ў цэлым і ягоная роля ў дачыненьні да Каўказу. Мы абмяжуемся згадкай пра рэпрэсіі, якія на яго непасрэдныя ўказаньні, але ад імя савецкай (= расейскай) дзяржавы ажыццяўляліся на Каўказе і якія паўплывалі на ляяльнасьць да гэтай дзяржавы з боку горцаў, скораных ёю менш чым два пакаленьні назад. На гэтую зьніжаную ляяльнасьць Сталін адказаў рэпрэсіямі цяпер ужо на ўзроўні народаў, у прыватнасьці — чачэнскага народу. Шараговаму складу і афіцэрам НКВД, відаць, палітычныя органы прапанавалі нейкія тлумачэньні, чаму яны павінны дэпартаваць мірных жыхароў. Можна лічыць, што ў рамках гэтай часткі грамадзтва быў сфармаваны вобраз ворага, які меў аб’ектам чачэнцаў (інгушоў, калмыкаў). Аднак для астатняга грамадзтва паноўнай заставалася канцэпцыя дружбы народаў і курортнага паказу адпаведнай мясцовасьці.

Не Ярмолаў, а Сталін стварыў для Расеі тую праблему Каўказу, ад якой Расея пакутуе і якой цяпер мучыць Каўказ. Ня ў сілах справіцца з чачэнцамі, яна заклікае цень Сталіна, каб ён ізноў іх выселіў.

Якую ролю адыграла дэпартацыя і рэабілітацыя ў той форме, у якой яна прайшла, у матывацыях прыхільнікаў аддзяленьня Чачэніі ад Расеі, мы не бяромся ацэньваць. Але нашыя дасьледаваньні паказваюць, што празь дзесяцігодзьдзе пасьля таго, як была праведзеная рэабілітацыя рэпрэсаваных народаў, сярод расейцаў, ад імя якіх дзеяла рэпрэсіўная ўлада, пераважала ідэнтыфікацыя з гэтай уладай, а ня з той, што правяла рэабілітацыю.

Паводле стану на 2000 год каля паловы расейцаў лічылі “безумоўна правільнай” ці “хутчэй правільнай” справай распачатую Сталіным дэпартацыю чачэнцаў. “Хутчэй няправільным” ці “безумоўна няправільным” лічыла гэта толькі траціна грамадзянаў краіны. Усяго ў суадносінах 48:34 мы назіраем перамогу сталінскіх ідэяў над пастановамі канстытуцыйных органаў Расеі пра рэабілітацыю рэпрэсаваных

народаў. І тут на бабулек-сталіністак не спасьлешся.
У пакаленьні 18—24-гадовых за высылку выступаюць 52% — найвышэйшая доля сярод усіх узроставых групаў. У студэнцтве, якое папоўніць шэрагі адукаванай супольнасьці, — суадносіны 48:42. Уліецца яно — лясьне хісткая перавага праціўнікаў дэпартацыяў сярод адукаваных (44:46).
Але гэтая ж сьвядомасьць прытрымліваецца іншай, больш архаічнай, "мясцовай" сыстэмы нормаў, у адпаведнасьці зь якой адносіны народаў, плямёнаў пэрсаналізуюцца і ўсім членам адпаведнай калектыўнай пэрсоны прэскрыптыўна ставяцца пэўныя правіны ці заслугі, заганы ці добрыя якасьці. Адносіны такіх суб'ектаў заўжды асымэтрычныя, бо карціна заўжды будуецца эгацэнтрычна з пункту гледжаньня калектыўнага Эга (мы), для якога астатнія — яны.

Каўказ і "Каўказ"

Апрача Каўказу, ёсьць яшчэ і катэгорыя "Каўказ", частка расейскага масавага сацыяльна-палітычнага дыскурсу. Для нашых мэтаў зручна трактаваць "Каўказ" як рэчаіснасьць, імплікаваную катэгорыяй АКН. Нагадаем, што ў такім ужытку гэтая катэгорыя далей ня дробіцца, у ёй не адрозьніваюцца супольнасьці, якія, як вядома, у рамках іншых дыскурсаў разглядаюцца ў якасьці асобных народаў, дзяржаваў, геаграфічных зонаў ды інш. У прыватнасьці, гэты панятак не адрозьнівае Паўночнага Каўказу і Закаўказьзя. "Каўказ", які задаецца такім азначэньнем, ня ўласна геаграфічны назоў, і азначаецца ім не фізычная, тая, што падлягае вымярэньню, прастора. У паўсядзённым ужытку, на які мы будзем абапірацца, "Каўказ" — гэта катэгорыя ня столькі геаграфічная, колькі гістарычная, а таксама псыхалягічная, палітычная, геапалітычная, крыміналягічная, плюс яшчэ культурная і сацыяльная. Словам, гэта "месца", лякаль паводле Гідэнса. Такіх "звышгеаграфічных" месцаў наўкола нямала, узяць хаця б "Захад", "поўначы" і "поўдні", якія перасякаюцца з Каўказам. Гэта таксама ня столькі геаграфічны, колькі гістарычна-культурна-этна-эканамічны панятак. Сказаць, што "поўдні", "Каўказ" — гэта месца, дзе жывуць АКН, цяпер было б няслушна. Гэта месца, адкуль яны прыяжджаюць. Тонкасьць у тым, што там, дзе яны жывуць, яны зьяўляюцца армянамі, ці грузінамі, ці чачэнцамі, ці азэрбайджанцамі і г.д. Там іх гэтым

лягерна-казарменным зборным тэрмінам не назавеш. Акрамя таго, “Каўказ” існуе ня толькі ў раёне Каўкаскага хрыбта, але, паводле перакананьня значнай часткі расейцаў, усюды. Выраз “у нас тут поўны Каўказ” зьяўляецца хадзячай формулай і сустракаецца практычна па ўсёй астатняй Расеі.
Будзьма пэдантамі і патлумачым, што гэтай формулай абазначаецца адразу некалькі істотных для дадзенай тэмы зьяваў.
Па-першае, формула зьяўляецца адлюстраваньнем тых працэсаў і падзеяў на Каўказе, што вядуць да масавай міграцыі з гэтага рэгіёну.
Па-другое, у ёй адлюстроўваецца факт дыяспарычнага расьсяленьня выхадцаў з Паўночнага Каўказу і Закаўказьзя на прасторы былога СССР, у прыватнасьці Расеі.
Па-трэцяе, яна фіксуе пры гэтым факт іх лякальнай канцэнтрацыі, трайбалістычныя тэндэнцыі ў характары іх расьсяленьня.
Па-чацьвертае, яна паказвае на адносна малую ступень асыміляцыі гэтых выхадцаў з Каўказу ў іншыя лякальныя і этнічныя супольнасьці, што перажываецца як іх чужасьць, недарэчнасьць.
Нарэшце, па-пятае, яна адлюстроўвае напружанасьць у адносінах паміж мясцовым насельніцтвам і “каўказам”, кажа пра варожасьць у дачыненьні да яго.

Катэгорыя АКН. Паходжаньне

Свайго камэнтару заслугоўвае базавая катэгорыя нашае сыстэмы паняткаў. Панятак “асобы каўкаскай нацыянальнасьці”, як паказалі нашыя дасьледаваньні, нарадзіўся ў брэжнеўскую эпоху. Месцам яго паходжаньня зьяўляюцца казармы і вайсковыя гарадкі, дакладней — кабінэты палітработнікаў. Менавіта ў апошніх зьявілася неабходнасьць у адмысловых катэгорыях для абазначэньня раней невядомага сацыякультурнага фэномэну. Вядомым ён стаў нашмат пазьней і называецца з тых часоў “развалам СССР”. (Сувязь локалу “Каўказ” з локалам “Захад” тут простая. Паводле перакананьня многіх, развалілі СССР дэмакраты, падбухтораныя ворагамі СССР з Захаду.)
Такім чынам, у Савецкай Арміі пачалі разьвівацца т.зв. “нестатутныя адносіны”. Гэты апафатычны тэрмін, як і тэрмін

“нефармальныя аб’яднаньні”, што зьявіўся ўсьлед за ім, а далей — “незаконныя фармаваньні”, рэгіструючы тое, што сацыёлягі (у сваю чаргу, чыста адмоўным чынам) вызначаюць як нефармальныя сацыяльныя структуры, выраслыя ўнутры фармальных. Самая звычайная рэч, але ў Савецкай Арміі, дзе такі від “нестатутных адносінаў”, як “дзедаўшчына”, падмяў пад сябе частку адносінаў статутных, сытуацыя была асаблівай. У дадзеным выпадку гаворка йдзе пра такія нестатутныя адносіны, якія на мове саміх іх удзельнікаў называліся то старым расейскім словам “зямляцтва”, то замежным навуковым тэрмінам “нацыяналізм”.

У адрозьненьне ад інстытуту дзедаўшчыны, які абапіраецца на часавыя адносіны і абумоўлівае статус салдата часам ягонага прызыву (ствараючы, вядома, уласны сацыяльны час, які вымяраецца прызывамі), інстытут армейскіх зямляцтваў разьмяркоўвае статусы згодна з зонамі пэўнай сацыякультурнай прасторы. Сама прастора ў цэлым заўжды існавала ў неазначаным выглядзе, але яна супадала з сутнасьцю, якая называлася СССР.

У папярэдняй фразе значным зьяўляецца словазлучэньне “ў цэлым”. Справа ў тым, што зямляцтвы ўзьніклі ў Савецкай Арміі акурат тады, калі расшчапілася гэтая цэласнасьць. Заслугоўвае хаця б кароткага разгляду пытаньне пра тое, ці быў гэты працэс натуральным. Можна трымацца пункту погляду, што распад — натуральная доля любой імпэрыі, можна лічыць, што для расейскай, ці савецкай імпэрыі распасьціся тым больш натуральна. Пры гэтай лёгіцы, аднак, трэба лічыць, што ствараць вобраз ворага — натуральная справа любой супольнасьці, а такой супольнасьці, як нашая, — у асаблівасьці.

Мы ня будзем самі палемізаваць з гэткімі меркаваньнямі. Скажам толькі, што нам вядомы й іншы пункт погляду, і вядома, што ён належыць большасьці насельніцтва Расеі. Гэтыя людзі думаюць, што Саюз не распаўся, а што яго развалілі. Віну вельмі многія ўскладаюць на Ельцына з Гарбачовым. Часам да іх дадаюць іншых прэзыдэнтаў зь ліку тых, хто падпісаў Белавескія дакумэнты. Існуе меркаваньне, што Савецкі Саюз расьцягнулі на кавалкі асьмялелыя рэспубліканскія эліты.

Але, не выбіраючы паміж опцыямі “непазьбежная энтрапія”

і “злачынная змова”, мы зазначым, што імпэрыі ня стала ўласна імпэрскага пачатку ў культуры і сацыяльнай практыцы, каб захаваць сябе. Гаворка йдзе пра тое, што акурат у імпэрыях зьяўляецца магчымасьць практыкаваць тое, што можна назваць “лакальным універсалізмам”, “мясцовым касмапалітызмам”. Частка імпэрскіх інстытутаў, як, напрыклад, грамадзянства, грашовая сыстэма і некаторыя іншыя, у нейкай ступені адпавядала гэтым патрабаваньням. Зазначаную ролю здольная была граць катэгорыя “савецкага”, але ў тых выпадках, калі яна ўжывалася ня цэнтрам для рэпрэсіі тых ці іншых зонаў пэрыфэрыі, а пэрыфэрыйнымі суб’ектамі для камунікаваньня міжсобку.

Пабудова партыйнай, а зь ёй і ўсіх астатніх сыстэмаў паводле тэрытарыяльна-нацыянальнай прыкметы, насуперак інтэрнацыяналісцкай, універсалісцкай паводле сваёй інтэнцыі камуністычнай ідэалёгіі, была тактычнай выйгранкай і стратэгічнай прайгранкай бальшавіцкай улады ў ейным сталінскім варыянце. Адмаўляючыся ад універсалісцкіх прынцыпаў на карысьць партыкулярысцкіх мадэляў, улада атрымлівала апірышчы. У адных выпадках імі выступалі сыстэмы сваяцтва-кумаўства, у іншых — сыстэмы, пабудаваныя на ляяльнасьці, “глебе”, мясцовай традыцыі ды інш. Асаблівая роля адводзілася панятку “нацыі” і “нацыянальнасьці”. Нібыта дэмістыфікаваная бальшавікамі і, у прыватнасьці, самім Сталіным, яна наноў містыфікавалася, бо моўчкі прызнавалася за базавае (“прыроднае”) азначэньне асобы, супольнасьці, дзяржавы. Асноўны жэст улады быў у кожным разе зразумелы: універсалісцкія пачаткі — гэта дэманстратыўны, вонкавы, намінальны бок справы. Усё рэальнае скрозь і заўжды абапіраецца на партыкулярысцкія і “прыродныя” асновы. Трэба падкрэсьліць, што ад гэтай агульнай каштоўнаснай арыентацыі пралягала простая дарога да адпаведных практык, у тым ліку практык палітычнага кіраваньня, а таксама кантролю і выхаваньня.

Калі гэтыя практыкі пачалі рэалізоўвацца ў спэцыфічным асяродзьдзі арміі, яны далі вычварныя вынікі. Нагадаем, што прызыў на абавязковую службу ў Савецкай арміі праходзіў па ўсёй тэрыторыі СССР, але няўхільна выконвалася правіла экстэрытарыяльнасьці. Вялікая плошча краіны дазваляла аддаляць ад дому любога прызванага. За гэтым правілам,

заўважым, стаяла ўяўленьне, што мясцовыя сувязі і мясцовыя ляяльнасьці вайскоўца будуць заведама мацнейшымі за тыя, якія яму запрапануе ўнівэрсальны інстытут арміі.
Уласна кажучы, так і адбылося. З тым толькі адрозьненьнем, што “мясцовымі”, “прыроднымі” асновамі аказаліся тыя, што да мясцовасьці былі прывязаныя ня больш, чымся тэрмін прызыву да веку прызыўніка. У канфліктным асяродзьдзі казармы пачалі фармавацца супярэчныя адна адной віртуальныя, як цяпер кажуць, супольнасьці, сфармаваныя паводле зьмяшаных расава-культурна-геаграфічных і геапалітычных прыкметах. Ёсьць падставы лічыць, што першымі крокамі былі дзеяньні па статуснай субардынацыі прызыўнікоў зь неславянскіх этнасаў. Яны дыскрымінаваліся як “чуркі”. Далей сярод іх пачалі адрозьнівацца “ўрукі” і “шашлыкі”, першыя, адпаведна, выхадцы зь Сярэдняй Азіі, другія — з Каўказу.
Наўрад ці можна казаць пра фармаваньне ў арміі паўнавартаснай (з пункту гледжаньня адпаведнасьці тэорыі) канструкцыі “вобразу ворага”, але ўтварэньне жорсткай і рэпрадуктыўнай варожасьці бессумнеўнае. Больш за тое, гэтая варожасьць выявіла магчымасьці пашыранага рэпрадукаваньня. Былі знойдзеныя новыя асновы для кансалідацыі і разьмежаваньня. Дыскрымінацыя масквічоў праходзіла на пазаэтнічнай аснове, іншыя асновы разглядаліся як нацыянальныя. У вайсковых гарадках ці ў асобных падразьдзяленьнях, часам нават у асобных прызывах, станавілася абавязковым разьмежаваньне паводле якоесь сканструяванае прыкметы.
Ня варта ўпадаць у аблуду наконт наўмыснай сканструяванасьці гэтых сытуацыяў. Канцэнтрацыя прызыўнікоў з аднога рэгіёну ці аб’яднаных якой-небудзь яшчэ, значнай у вайсковых умовах, прыкметай ніколі не здаралася “сама”, “стыхійна”. Фармаваньне складу часьцей і падразьдзяленьняў поўнасьцю было ў руках адпаведных інстанцыяў вайсковага ведамства. Іхнымі намаганьнямі ў гэтых частках ствараласа дамінаваньне адной ці другой групоўкі. Іншая справа, што прыкмета, якая рабілася ці асновай для салідарнасьці, ці асновай для дыскрымінацыі, задавалася ня імі, а ўзьнікала ў цесным казармавым асяродзьдзі, якое ў сотні разоў згушчала паветра імпэрыі.

Варта згадаць і тое, што падпарадкаванае становішча “чурак” у сілу хаця б дэмаграфічнай сытуацыі ў СССР складалася не ўва ўсіх часцях. Іх контрдзеяньні сяды-тады давалі адчуць на сабе цяжар казармавага тэрору “асобам славянскай нацыянальнасьці” — нядружным між сабой кацапам, хахлам і бульбашам. Часам даміноўным бокам аказваліся памянёныя “шашлыкі”, ня менш складанае аб’яднаньне хачаў з азерамі і да т.п.

Так ці йнакш, сабраны ў няволю казармы “ўвесь савецкі народ” у сваёй маладой мужчынскай частцы ў сямідзясятыя гады ўжо безумоўна ня прагнуў падтрымліваць “дружбу народаў”, намінальнае апірышча нібыта свабоднай айчыны. А падзяліць прызыўныя кантынгенты і дазволіць праходзіць службу на сваёй тэрыторыі не пагаджалася кіраўніцтва, у першую чаргу вайсковае. Такім чынам яно ахоўвала цэласнасьць краіны. Напэўна, і да гэтых часоў думае, што правільна рабіла. Узьніклая варожасьць разьмяжоўвала юнакоў 18—20 гадоў. Эксцэсы варожасьці выклікалі клопат паліторганаў арміі, якім даводзілася ў той ці іншай ступені адказваць за іх. Для апісаньня гэтых працэсаў быў прыдуманы, як казалі, тэрмін “нестатутныя адносіны”, які, у адрозьненьне ад словаў салдацкага жаргону, падкрэсьліваў дыстанцыю моўцы ад самой зьявы. Такім жа чынам былі прыдуманыя назвы для аб’яднаньняў, зададзеных унутрыказармавай сытуацыяй. Аснова, якую палітработнікі імкнуліся пакласьці ў аснову тэрміну, была, як ужо паказвалася, прадвызначаная нясклaдзеным імпэрскім кантэкстам, нязьдзейсьненым плавільным катлом.

Таму апорным тэрмінам стала слова “нацыянальнасьць”. Уласна, так быў вызначаны будучы вобраз ворага, замацаваны прынцып для яго ўзнаўленьня. Далей меркаваньне палітработнікаў паклала — надоўга — на адну плоскасьць этнас, рэгіён, канфэсію. “Асобы славянскай нацыянальнасьці” vs “асобы каўкаскай нацыянальнасьці” vs “асобы мусульманскай нацыянальнасьці”. Апошняе азначэньне, зрэшты, сышло з распадам СССР, паколькі было прызначанае для “ўрукаў”. Ні татараў, ні чачэнцаў, ні іншых унутрырасейскіх магамэтанаў яно не абдымала.

Адзінства “братэрскіх славянскіх народаў” пасьля распаду СССР таксама ня раз паддавалася рызыцы. Апытаньні 1992—

1993 гадоў рэгістравалі ўсё большую наяўнасьць сярод расейцаў тых, хто гатовы быў дзеля вяртаньня Севастопалю ці Крыму ўжыць вайсковую моц супраць Украіны. Ад рэспандэнтаў — выпускнікоў вайсковых навучальных установаў, дзе курс набіраўся яшчэ да 1991 году, даводзілася не аднойчы чуць аповеды пра тое, як разьвітваліся з аднакурсьнікамі-ўкраінцамі: “Ня дай нам Божа сустрэцца”. Ёсьць яшчэ некалькі ўскосных сьведчаньняў таго, што акурат украінцаў прызначалі на месца “ворага”. Пераключэньне на Чачэнію спыніла гэты працэс.
Знойдзены новы вораг быў куды больш прыдатным. Адна зь першых перавагаў была ў тым, што чачэнцы належалі да згаданых АКН.

Злы чачэнец

Антычачэнскія настроі ўтвараюць самастойную падтэму ў пытаньні пра варожае стаўленьне часткі жыхароў Расеі да АКН.
З аднога боку, антычачэнскія настроі найбольш рэзка й моцна выражаюць комплекс варожасьці да “каўказцаў”. У той жа час, варожыя адносіны з чачэнцамі разьвітыя па шэрагу кірункаў куды далей, чымся зь іншымі групамі, якія адносяцца да АКН. Супраць чачэнцаў (сэпаратыстаў, удзельнікаў незаконных фармаваньняў, бандытаў, але ўсё ж — чачэнцаў) вядуцца вайсковыя дзеяньні. Яны для некаторай часткі расейцаў — вайскоўцаў, накіраваных у Чачэнію, — жывыя вайсковыя праціўнікі. Гэта іншы статус, чымся носьбіт вобразу ворага. Але для большай часткі насельніцтва Расеі яны могуць адыгрываць ролю носьбітаў вобразу ворага. У шэрагу выпадкаў іх ня ўмеюць адрозьніваць ад грузінаў ці азэрбайджанцаў, яны аказваюцца “хачамі”, але часам яны ўдакладняюцца да “чэхаў”. Хаця з чачэнцамі ваююць у Чачэніі, а з “чачэнскай мафіяй” ваююць паўсюль, хаця чачэнцаў паддаюць іншым разам гвалту ў аддзяленьнях міліцыі, але, наколькі можна меркаваць паводле чутак і прэсы, супраць іх не зьдзяйсьняюцца акты масавага гвалту — пагромы. Ахвярамі пагромаў бываюць азэрбайджанцы ці армяне, але не чачэнцы. Ня выключана, што арганізатары пагромаў баяцца іх кранаць. У кожным разе, у грамадзкай думцы чачэнцы маюць рэпутацыю “злосных”, “помсьлівых” (тых, хто практыкуе крывавую помсту). Іх не

называюць сьмелымі, але за імі бясспрэчна прызнаюцца байцоўскія якасьці, якія не прыпісваюцца ні грузінам, ні армянам, ні азэрбайджанцам. Больш за тое, у апошнія гады, калі спатрэбілася знайсьці апраўданьне няўдачам фэдэралаў у Чачэніі, была пушчана формула: яны самі пра сябе гавораць — мы ўмеем толькі ваяваць ці рабаваць. Такога праціўніка “нармальнай” арміі не перамагчы — у гэтым сэнс выкарыстаньня формулы.

Вобраз ворага — трыгер вайны

Савецкая армія пасьля сыходу з Аўганістану была абцяжараная “аўганскім сындромам”, які можна лічыць складанай рэакцыяй грамадзтва (і вайскоўцаў як яго часткі) на “вялікую і прайграную вайну”. У гэтым стане ўзьніклі так званыя “антываенныя настроі”. У палітыкаў, якія распараджаліся тады бюджэтам, зьявілася магчымасьць скараціць вайсковыя выдаткі, абапіраючыся на згоду большасьці жыхароў краіны (на пачатку 1990-х больш за 70% грамадзянаў лічылі патрэбным гэтыя выдаткі скараціць). У грамадзтве пачала дзеяць тэндэнцыя — патрабаваць скарачэньня арміі і вайсковых выдаткаў. Да канца 1990-х тэндэнцыя згубіла сваю рэзкасьць, але тым ня менш у 1997 годзе скарачэньне арміі падтрымалі 43% жыхароў краіны. За скарачэньне выступалі ў сваёй большасьці прадпрымальнікі і кіраўнічыя работнікі, спэцыялісты, студэнты, службоўцы, рабочыя.

Траціна жыхароў, перш за ўсё старэйшае пакаленьне, была супраць скарачэньня. Але і іх спыняла не магчымае зьніжэньне абараназдольнасьці краіны. Гэты матыў высунулі менш за пяціну насельніцтва (17%), а сярод вайскоўцаў гэты матыў высунулі толькі 11%. Ня менш значным доказам супраць скарачэньня ў вачах грамадзтва ў цэлым (16%), а для непасрэдна зацікаўленых групаў і нашмат больш значным (27% сярод вайскоўцаў) было тое, што “ўрад ня зможа забясьпечыць афіцэраў, якія сыходзяць у адстаўку, жытлом і працай”. Нават сярод самых зацятых праціўнікаў скарачэньня і самых зацятых прыхільнікаў таго, што скарачэньне немагчымае, бо наробіць шкоду абараназдольнасьці (гэта прыхільнікі Г.Зюганава), і тое апошні матыў усяго толькі роўны па ступені значнасьці матыву “няма чым забясьпечыць афіцэраў” (па 24%).

Іншымі словамі, армія ў вачах значнай часткі грамадзтва мела

патрэбу ў падтрымцы і захаваньні не з ваенных прычынаў. Армія як армія губляла аўтарытэт. Адбывалася імклівае адцясьненьне яе з пазыцыяў “восевага” інстытуту грамадзтва, якім яна — нароўні з партыяй і органамі — была пры савецкім ладзе. У 1992—1993 гадох можна было зафіксаваць “правал” нават на тле больш агульнага трэнду падзеньня даверу да арміі і двух іншых названых інстытутаў.

Вайскоўцы як карпарацыя спрабавалі абараніць сябе шляхам стварэньня ўласных грамадзкіх арганізацыяў, шляхам парлямэнцкіх дэбатаў. Грамадзтва іх ня слухала.

Страта аўтарытэту азначала, як мы паказалі, страту ня толькі сымбалічных дабротаў, але і статусаў, то бок улады, а таксама бюджэту, то бок дабротаў матэрыяльных.

Быць можа, першы крок зрабілі ня ўласна вайскоўцы, а больш тонка арганізаваныя структуры. Але на другім кроку армія далучылася спробай ізноў запрапанаваць грамадзтву “галоўную справу” — вайну. Вайна з замежным праціўнікам з шматлікіх прычынаў была немагчымая. Армія пачала вайсковыя дзеяньні на тэрыторыі ўласнай краіны. Вядома, ня супраць “сваіх”, а супраць тых, хто найбольш падыходзіў на ролю “ворага”. Гэта былі чачэнцы.

Армія дамаглася грамадзкай увагі. Але з адмоўным знакам. Дзейнасьць арміі ў чачэнскіх падзеях ацэньвалі як “вельмі добрую” 1—2% расейцаў. Адносная большасьць у 40—45% лічыла яе нездавальняльнай.

У інтэрвію пра ролю арміі ў чачэнскай крызе часьцей за ўсё выказвалі спачуваньне шараговым вайскоўцам, але пра вайсковае камандаваньне часьцей за ўсё заяўлялі, што яно зацікаўленае ў працягу вайны. Меркаваньне пра наяўнасьць глыбокай зацікаўленасьці вярхоў, у тым ліку вайсковых, у працягу вайны, было вельмі распаўсюджаным у сярэдзіне 1996 году.

А ў чым было зацікаўленае грамадзтва? У канцы 1996-га 35%, а на пачатку 1997 году 29% заяўлялі, што “былі б толькі рады аддзяленьню Чачэніі ад Расеі”. Немалая частка (21% і 29% адпаведна) былі “супраць, але гатовыя прыняць яго”, 24% і 22% заяўлялі, што “гэта не зрабіла б на іх асаблівага ўражаньня”, па 13% ня ведалі, што адказаць, і толькі 8% у абодвух апытаньнях казалі, што “аддзяленьню Чачэніі варта перашкодзіць усімі сродкамі, у тым ліку і ваеннымі”. Варта заўважыць, што апошні

варыянт адказу нават сярод вайскоўцаў сьпярша выбіралі ня больш за 12%. Што тычыцца варыянту першага (“быў бы рады...”), то ў некаторых сацыяльных групах (напрыклад, студэнты) яго ў канцы 1996 году давала больш чым траціна апытаных, а сярод прадпрымальнікаў — палова.
Мірную дамову, заўважым, не лічылі крокам да аддзяленьня (так думалі толькі 10%). У чэрвені 1997 году тры чвэрці насельніцтва Расеі (74%) ухвалялі падпісаньне дамовы пра мір і прынцыпы ўзаемадачыненьняў з Чачэніяй (не ўхвалялі 12%). Але кошт мірнай дамове ведалі. Яе палічылі “гістарычным паваротам у адносінах паміж нашымі народамі, знакам спыненьня векавой варожасьці” усяго толькі 7% расейцаў. Прызнаньнем паразы расейскай арміі ў вайне 1994—1996 гадоў палічылі яе 14%. Для чвэрці гэта быў ня мір, а ілюзія міру, іншыя 24% лічылі, што мір — малазначны факт, паколькі кіраўніцтва Чачэніі, на іхную думку, не кантралюе становішча ў рэспубліцы.
Гэтыя зьвесткі сьведчаць пра тое, што грамадзкая сьвядомасьць большасьці перажывала вельмі складаныя часы. Згода на аддзяленьне Чачэніі для гэтай часткі грамадзтва вынікала не з спачуваньня да імкненьняў аднаго з народаў былога СССР да незалежнасьці. У кастрычніку 1996 году дзьве траціны расейскага грамадзтва (62%) заявілі, што паставіліся б адмоўна (у тым ліку 33% — рэзка адмоўна) да ўключэньня ў канстытуцыю РФ права любога суб’екта фэдэрацыі (краю, вобласьці, рэспублікі) на выхад з складу Расеі.

Згода на аддзяленьне Чачэніі, выказаная да таго ж у форме “быў бы рады...”, накшталт праяўленай за некалькі год да таго згоды на аддзяленьне рэспублік Прыбалтыкі ад СССР, была рэакцыяй глыбока абражанага самалюбства краіны-мэтраполіі. Назіраньні за стаўленьнем да адасабленьня рэспублік Балтыі паказваюць, што згода на сыход аднога з уладаньняў мэтраполіі, якая даецца ёй вельмі вялікім унутраным напружаньнем, далей трансфармуецца ў трывалую непрыязнасьць і залічэньне таго, хто сышоў, у шэраг непрыяцеляў Расеі, тых самых “ворагаў”.
Наколькі няпростай па сваёй прыродзе была памяркоўнасьць да меркаванага аддзяленьня Чачэніі, настолькі няпростым па прыродзе быў і пацыфісцкі настрой грамадзтва на пачатку і на

працягу першай чачэнскай вайны. Ня варта забывацца, што грамадзтва заяўляла свой пратэст супраць вядзеньня вайны ў Чачэніі досыць яўна — такое меркаваньне самога грамадзтва. У лістападзе 1996-га 61% расейцаў заявілі, а ў студзені 1997 году, азіраючыся на скончаную вайну, 61% пацьвердзілі, што галоўную ролю ў спыненьні ваенных дзеяньняў у Чачэніі адыгралі дзеяньні А.Лебедзя (61%) (вяршэнства гэтага фактару пацьвярджалася і пазьней; у верасьні 1997 году — 40%). Але другім паводле значнасьці фактарам былі палічаныя "настойлівыя пратэсты грамадзкасьці, арганізацыяў салдацкіх мацярок, прэсы". Адносная значнасьць акурат гэтага фактару расла ў вачох грамадзкасьці ў меру аддаленьня ў часе ад саміх падзеяў. Яго зазначалі амаль 30% у кастрычніку, то бок напалову менш, чымся ўнёсак А.Лебедзя, і ўжо 40% у студзені 1997-га — то бок дзьве траціны, і 30% у верасьні 1997-га — тры чвэрці ад "фактару Лебедзя".

Сам факт таго, што Расея пацярпела паразу ў "чачэнскай вайне", у верасьні 1997 году прызнавалі 49%, аддзяленьне Чачэніі большасьць расейцаў лічыла вырашанай справай. Тады, у верасьні 1997 году, больш за палову расейцаў выказвалі перакананьне, што ў будучыні Чачэнія стане незалежнай дзяржавай. Што яна застанецца ў складзе Расеі, лічылі менш за чвэрць расейцаў (24%). Істотна, што ў асяродзьдзі кіраўнікоў перакананасьць у дасягненьні Чачэніяй незалежнасьці была вышэйшай — 60%, а сярод вайскоўцаў гэта было проста паноўным меркаваньнем — 68%.

Паход расейскіх вайскоўцаў па грамадзкае прызнаньне і аўтарытэт скончыўся поўным правалам. Адзінае, што яны здолелі захаваць, — гэта тэзыс пра ідэнтычнасьць арміі і дзяржавы, краіны, нацыі. Параза мілітарысцкай карпаратыўнай структуры ад іншай такой жа была інтэрпрэтаваная як нацыянальная параза, як глыбока перажытая нацыянальная ганьба.

На гэтым фоне не зьдзіўляе, што жаданьня зноўку распачынаць ваенныя дзеяньні ў грамадзтве было няшмат. "Пробная" заява міністра ўнутраных справаў на пачатку 1998 году пра магчымасьць прэвэнтыўных удараў па базах баевікоў на тэрыторыі Чачэніі сустрэла адмоўную рэакцыю 53% насельніцтва і падтрымку 30%. Сканчэньне выводу расейскіх войскаў з Чачэніі было часьцей за ўсе іншыя названае

найгалоўнейшай падзеяй 1997 году — так заявілі 44% расейцаў у канцы году.
Між тым, перарваная Хасаўюртам чачэнская вайна пасьпела стаць істотным функцыянальным элемэнтам многіх эканамічных схемаў і палітычных камбінацыяў. Вайна, як гэта часта бывае, выявіла сваю карыснасьць па-за сваімі намінальнымі мэтамі кшталту разгрому праціўніка, дасягненьня перавагі над ім і да т.п. Паводле аповедаў рэспандэнтаў, вайна як працэс была патрэбная некалькім інстытутам, як зьвязаным з абаронай і арміяй, так і, на першы погляд, цалкам мірным, кшталту фінансавых установаў. Асаблівую каштоўнасьць уяўляла захопленая вайной прастора Чачэніі, дзе практычна былі скасаваныя законы й парадкі, што дзеялі на астатняй тэрыторыі РФ, але дзе праз гэта аказалася магчымым многае зь недаступнага там. А гаспадарамі гэтага сьвету вялікіх магчымасьцяў апыналіся сілавікі. Як казалі некаторыя з рэспандэнтаў, яны там падзялялі ўладу з сваімі мясцовымі калегамі. У вобразе “ворага” зьяўляліся зусім новыя рысы партнэра. Мір аказаўся вялікай перашкодай такому разьвіццю справаў, тым больш што ён фіксаваў непачэсную для фэдэральнага сілавога блёку сытуацыю ў Чачэніі.
І замацоўваў устаноўку грамадзкай думкі супраць вайны і вайскоўцаў.
Тым, хто хацеў ізноў ваяваць, трэ было ці дзеяць супраць грамадзкай думкі, ці трансфармаваць пазыцыю грамадзтва. Вось тут спрацаваў вобраз ворага. Безыменныя тэрарысты, якія ўзарвалі дамы ў Маскве, у масавай сьвядомасьці былі апазнаныя як “каўказцы”, як чачэнцы.
Вось вынік: у кастрычніку 1999 году 65% насельніцтва падтрымалі бамбёжку вайсковых базаў і прамысловых аб’ектаў на тэрыторыі Чачэніі. Адмову ад мірных пагадненьняў, падпісаных А.Лебедзем і А.Масхадавым, падтрымалі больш за 50%. У сьнежні 1999 году 44% паверылі ў тое, што “баевікі будуць разьбітыя, і ўся Чачэнія будзе вернутая ў склад Расейскай Фэдэрацыі”. Інакш кажучы, грамадзкая сьвядомасьць павярнулася тады на 180 градусаў.

Тыя, хто лічыў тады, што “канфлікт прывядзе да велізарных стратаў з абодвух бакоў і скончыцца так, як гэта было ў 1996 годзе”, складалі меншасьць у 11%. Удвая больш было тых, хто

чакаў, што канфлікт набудзе працяглы характар і пашырыцца на іншыя рэгіёны Паўночнага Каўказу. Але і абедзьве гэтыя катэгорыі разам саступалі па колькасьці тым, хто верыў у хуткую перамогу.

Зазначанае вышэй напружаньне, зь якім грамадзтва давала згоду на адасабленьне Чачэніі і адмаўлялася перашкаджаць гэтаму працэсу ваенным шляхам, можна лічыць свайго роду праявай “аўганскага сындрому”. Сапраўды, адным з галоўных антываенных матываў быў “мацярынскі” пратэст супраць гібелі “нашых хлопчыкаў”. За гэтым пратэстам стаяла радзей вымаўлянае — “бессэнсоўнай гібелі”, то бок той, што не вяла да дасягненьня пастаўленай геапалітычнай мэты — падпарадкаваць суперніка, чужака. Цяпер, на пачатку другой чачэнскай кампаніі, усё зьмянілася. Спалучэньне боязі помсты з боку чачэнцаў, страху (яго адчувалі 60% у лістападзе 1999 году) і жаданьня ўласнай помсты (61% прызнаваўся ў пачуцьцях “помсты і нянавісьці да тэрарыстаў і баевікоў”) знайшлі псыхалягічную рэалізацыю ў распачатых баявых дзеяньнях: 60% лічылі, што “чачэнцы цяпер маюць паводле заслугаў”. Вайскоўцам быў дадзены карт-блянш з боку грамадзтва. Правядзеньне “буйнамаштабнай ваеннай апэрацыі” падтрымалі 75%. Ці гэта не трыюмф у выкарыстаньні “вобразу ворага” як інструмэнту для разьвязваньня вайны?

Як мы казалі напачатку, паводле свайго прызначэньня “вобраз ворага” выкарыстоўваецца не для рашэньня ваенных задачаў (перамога над праціўнікам), а для дасягненьня нейкіх мэтаў унутры той супольнасьці, у якой гэты вобраз мае сэнс і пашырэньне. Так выйшла і гэтым разам.

На пачатку другой чачэнскай кампаніі расейскае грамадзтва паверыла ў хуткую ваенную перамогу. Абсалютная большасьць падтрымлівала правядзеньне ваенных апэрацыяў. Інакш кажучы, грамадзтва прыняло канвэнцыйны сцэнар “маленькай пераможнай вайны” і чакала належных пазытыўных вынікаў ад яго рэалізацыі — славы, гонару і г.д.

Неўзабаве стала зразумела, што другая кампанія поўнасьцю паўтарае першую. Частка людзей, якія лічылі, што вайсковыя апэрацыі ў Чачэніі перасьледуюць нейкія іншыя мэты, акрамя абвешчаных, ізноў пачала расьці. Пачала расьці і частка перакананых, што вайсковыя дзеяньні ў Чачэніі будуць працягвацца доўга ці вельмі доўга. Але яшчэ больш значна

пачала расьці частка тых, хто выступаў за непрымальны для вайскоўцаў варыянт — пераход да перамоваў. Усталяваліся характэрныя для першай чачэнскай кампаніі суадносіны прыхільнікаў спыненьня і прыхільнікаў працягу ваенных дзеяньняў як 2:1.
Гэтыя зьмены ня сталі прычынай разбурэньня “вобразу ворага”. Але сышоў істотны кампанэнт — магчымасьць выкарыстоўваць яго для мабілізацыі грамадзтва. Гэта даказана ў жахлівым экспэрымэнце, якім сталіся падзеі на Дуброўцы. Для тых, хто хацеў, каб грамадзтва затрымцела, убачыўшы вобраз ворага, гэтыя падзеі адкрылі крайнія магчымасьці. Які вынік?
У паўтара разу павялічылася колькасьць тых, хто выступае за працяг ваенных дзеяньняў. Але гэта быў усплёск, а ня доўгатэрміновая мабілізацыя, на якой можна было б пабудаваць больш-менш сур’ёзную палітычную канструкцыю. Праз два месяцы аднавіліся апісаныя вышэй суадносіны 2:1. Пасьля адбыліся падзеі ў Іраку. Дэзарыентаваная грамадзкая думка адначасова хацела б быць разам з усім багатым і цывілізаваным Захадам, да чаго мы ўжо пачалі прызвычайвацца, але па старой памяці хацела б разам з былымі сябрамі СССР выступіць супраць звычнага “вобразу ворага” — ЗША. Генэральскае лобі дапамагло павярнуць вэктар дзяржаўнай палітыкі на рэйкі другога варыянту. Усплёск прамілітарысцкага энтузіязму, на гэты раз зусім кароткі, суправаджаў фазу такіх доўгачаканых вестак пра ваенныя няўдачы нашага былога галоўнага праціўніка.
Потым аказалася, што наш былы саюзьнік здаўся бяз бою, кінуўшы нашу зброю... У масавай сьвядомасьці настала расчараваньне. За працяг ваенных дзеяньняў у Чачэніі цяпер выступае менш за адну пятую. За пераход да перамоваў з чачэнскім бокам — больш за 70%.
Фіяска кампаніі, разьвязанай з дапамогай “вобразу ворага”, уражвае ня менш за яе трыюмф.
З расейскай мовы пераклала Наста Бакшанская

[image]
[image]

№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/01/21**
[image]

[image]
A R C H E
П а ч а т а к
№ 6 (29) – 2003
[image]

Мікола Рабчук Шчарбіцкі forever

МІКОЛА РАБЧУК (нар. у 1953, Луцк) — культурны і палітычны аналітык, гісторык культуры, дасьледчык украінскага нацыяналізму. Сёлета ў «ARCHE» друкаваўся артыкул Рабчука «Імпэрыя да дыскурс» (№ 1-2003). Тэкст друкуецца з ўласнай згоды аўтара.

1

Сярод шматлікіх анэкдотаў часоў “разьвітага сацыялізму”, што ўтваралі альтэрнатыўную, ці, як сказаў бы Бахцін, “карнавалізаваную”, пастаўленую дагары нагамі вэрсію савецкае гісторыі, хапала разнастайных апакрыфічных аповедаў пра гістарычных асобаў — ад легендарнага Вета Іванавіча Чапаева і яшчэ легендарнейшага Штырліца да цалкам канкрэтных Леніна-Сталіна-Хрушчова-Брэжнева і нарэшце Гарбачова. Адна з такіх показак, што набыла папулярнасьць напярэдадні 100-годзьдзя з дня нараджэньня “Ільліча”, парадыявала пашыраную ў тыя часы практыку запрашаць усялякіх “сьведкаў і ўдзельнікаў бурлівых падзеяў” да школьнікаў — падзяліцца незабыўнымі ўражаньнямі пра выдатных асобаў. Вэтэран апавядае дзецям пра дабрыню дзядулі Леніна: “Быў я тады, — кажа, — беспрытулным хлопчыкам-сіратом, валачуся неяк галодны падмасковнымі Горкамі, аж бачу, у парку на лавачцы сядзіць дзядовы ніжэйшы яблык выразае. Я падыходжу і кажу: “Дзядуля, дай кавалак яблычка”. Той і адказвае: “Пайшоў на х…, ублюдак!..” А вочы такія добрыя-добрыя…” (“А мог і ножыкам шахнуць”, — дадае мэмуарыст у іншым варыянце таго самага анэкдоту.)
Нешта падобнае прыгадваецца і ў сувязі з навачаснымі

мэмуарамі намэнклятурных работнікаў, змагароў “працоўнага”, “ідэалягічнага” ды гэбэшна-тэрарыстычнага фронту. Успаміны тыя выдаюцца за грошы сьціплых, у асноўным неназваных “спонсараў” і часам нават не трапляюць у вольны продаж: распаўсюджваюцца найперш сярод “сваіх” — як такі сабе гатунак посткамуністычнага самвыдаву. Зборнік успамінаў пра Шчарбіцкага, што выйшаў нядаўна да 85-годзьдзя апошняга камуністычнага намесьніка Ўкраіны, зьяўляецца ў пэўным сэнсе апатэозам гэтае камуністычнае агіяграфіі. Ад дзясяткаў падобных кніжак гэтая розьніцца не якімсьці асаблівым цынізмам, хлусьлівасьцю ці бессаромнасьцю, а толькі адной — але надзвычай істотнай — рысай. Гэта першая кніжка такога кшталту, надрукаваная за дзяржаўныя, то бок грамадзкія, грошы — на замову Дзяржаўнага камітэту інфармацыйнае палітыкі, тэлебачаньня і радыёвяшчаньня Ўкраіны ў рамках праграмы выпуску сацыяльна значных (sic!) выданьняў. Пра тое, хто складае і зацьвярджае гэтую таямнічую праграму, якія кніжкі зь яе ўжо пабачылі сьвет, дзе й калі абвяшчаўся тэндэр для выдаўцоў і каго, урэшце, ды на якіх умовах абралі, — можна было б пагутарыць асобна. Але паколькі непадкупнасьць украінскіх чыноўнікаў ёсьць пакуль што іх прыватнай справай, тымчасам як гіпэркарумпаванасьць даўно ўжо ёсьць справай міжнароднай, мы адкладзём складаную размову да лепшых часоў з надзеяй, што ўкраінская ўлада калісьці ўсё ж зробіцца празрыстай.

Замест гэтага абмяркуем тут праблему калі не прасьцейшую, дык відавочнейшую. Кніга ўспамінаў пра Шчарбіцкага пабачыла сьвет ня проста за грошы звычайных грамадзянаў, падаткаплатнікаў (у тым ліку і тых, што маюць падставы гэтага дабрадзея зьневажаць або ненавідзець). Яна сталася часткай шырэйшых дзяржаўных захадаў, скіраваных (зноў-такі за грошы згаданых грамадзянаў) на сьвяткаваньне 85-гадовага юбілею камуністычнага дзеяча, правядзеньне ў яго гонар памятных вечарынаў і навуковых канфэрэнцыяў, пераназываньне вуліцаў ды адкрыцьцё мэмарыяльных дошак, арганізацыю музэйных выставаў і здыманьне дакумэнтальных фільмаў, — згодна з пастановай Кабінэту Міністраў, якую падпісаў віцэ-прэм’ер па гуманітарных пытаньнях Дзьмітро Табачнік.

Лішне, відаць, тлумачыць, што Шчарбіцкі аніяк ня быў “выдатным дзеячом”, а тым больш — асобай, перад якой грамадзяне незалежнае Ўкраіны мусілі б паважліва схіляць галовы. Каб гэта зразумець, ня трэба нават апэляваць да думак і доляў дысыдэнтаў ці ахвяраў Чарнобылю, дастаткова ўважліва зірнуць на згадкі ягоных цалкам “ляяльных” паплечнікаў, кшталту Леаніда Краўчука: “Мне Шчарбіцкі заўжды казаў: “Памятай, мы тут палітыкі ня робім”. Ён пільна сачыў, каб нідзе ў дакумэнтах не праскочыла, што ЦК Кампартыі Ўкраіны распрацоўвае палітыку, не — толькі “падтрымлівае” ды “зьдзяйсьняе”. Украіна 340 гадоў ня мела сваёй палітыкі. Гэта сёньня я ўжо магу казаць пра ўкраінскую палітыку пачынаючы з 1991 году, разважаць пра адказнасьць лідэраў краіны ды ўрадавых чыноўнікаў за тыя або іншыя падзеі. А тады мы такой магчымасьці ня мелі”.

Іншы дасьведчаны апаратчык Юхім Лазебнік прызнаецца, што “доўгі час глядзеў на Шчарбіцкага зь непрыхаванай павагаю і думаў, што менавіта ён той чалавек, які здатны выказваць трывогі й боль украінскага народу… Але я памыліўся”. Шчарбіцкі, паводле сьведчаньняў Лазебніка, як скінулі Хрушчова, “пачаў выпраменьваць якуюсьці непрыязнасьць да ўсяго ўкраінскага”. Ён прынцыпова перастаў гаварыць па-ўкраінску (падаўшы недвухсэнсоўны прыклад усёй мясцовай намэнклятуры), прынцыпова пачаў замест тэрміну “ўкраінскі народ” ужываць “народ Украіны”, а пасьля зьмяшчэньня з пасады Шэлеста ў 1972 годзе ня толькі ня стрымліваў, а, наадварот, усяляк спрыяў палітычным рэпрэсіям ды ўсебаковай русіфікацыі Ўкраіны. У мэмуарнай вэрсіі Краўчука гэта выглядае так: “Уладзімер Васілевіч ставіўся да роднае мовы, мякка кажучы, ня дужа прыязна. Сам ён гаварыў выключна па-расейску, таму для ягоных падначаленых, незалежна ад нацыянальнасьці, гэтая мова рабілася моваю камунікацыі. А пра дакумэнты, справаздачы, выступы, даклады — няма чаго й казаць. За часам сакратарства Пятра Шэлеста ў многіх школах існавалі куточкі ўкраінскае мовы. Пасьля прыходу Шчарбіцкага тыя куточкі зьніклі, затое пачало зьяўляцца ўсё больш школаў, дзе на роднай мове выкладалі хіба толькі ўкраінскую літаратуру. Неяк мне ў рукі трапіла анкета першага сакратара, дзе слова “ўкраінец” у графе “нацыянальнасьць” было выпраўленае на “русский”.

Мімаходзь зазначым, што такія анкеты запаўняліся ўласнаручна, і перапісваньне “іншародцаў” на “русских” было ўвогуле пашыранаю зьявай у асяродзьдзі маларасійскай намэнклятуры — вось і Леанід Кучма, як толькі стаў у 1992 годзе прэм’ер-міністрам, змушаны быў перапісвацца назад з “русского” на “украинца”.

Леанід Краўчук у сваіх успамінах распавядае пацешную гісторыю пра тое, як аднаго разу памочнікі пераканалі Шчарбіцкага выступіць перад пісьменьнікамі па-ўкраінску — зважаючы, так бы мовіць, на спэцыфіку кантынгенту. Гэта было ўжо падчас перабудовы, і шмат каму падавалася, што такі жэст палепшыць адносіны між Кампартыяй Украіны ды “нацыянал-патрыятычна арыентаванымі” (у Краўчуковых тэрмінах) пісьменьніцкімі коламі. “Першы сакратар доўга вагаўся, аж нарэшце пагадзіўся. Некалькі работнікаў апарату падрыхтавалі тэкст, акуратна паставіўшы націскі. Нязвыклая мова Шчарбіцкаму давалася цяжка, збоку здавалася, што Ўладзімер Васілевіч прыкладае істотныя намаганьні, каб не перайсьці на звыклую для яго расейшчыну. Але адпаведнае ўражаньне на слухачоў той учынак усё адно зрабіў. Ды гэта была першая і апошняя праява “нацыянальнае сьвядомасьці”. Адразу пасьля паседжаньня кіраўнік ЦК, ледзь стрымліваючы гнеў, заявіў нам: “Ніколі больш не прапануйце мне падобнага”. Трохі памаўчаў і з націскам паўтарыў: “Ніколі!”
Уласна, усе немудрагелістыя аргумэнты на карысьць своеасаблівае “бэатыфікацыі” Шчарбіцкага як “выдатнага дзяржаўнага дзеяча” зводзяцца да дзьвюх тэзаў. Адна — што ён быў “моцным гаспадарнікам”, які ўсяляк дбаў пра сацыялістычнае будаўніцтва ўва Ўкраіне, дасягаючы на гэтай дзялянцы гучных посьпехаў. Другая — што ён быў добрым, прыстойным, сьціплым у асабістым жыцьці чалавекам, у адрозьненьне ад большасьці тагачасных намэнклятурнікаў — а пра сёньняшніх і гаворкі няма. Першую тэзу падмацоўваюць пералікам так званых “народнагаспадарчых” і “сацыяльна-культурных” аб’ектаў, збудаваных у часе яго амаль чвэрцьстагодзьдзевага кіраваньня ў Радзе Міністраў і ЦК КПУ. Другую пацьвярджаюць кранальныя ўспаміны вэтэранаў у ключы згаданай на пачатку показкі.
Абедзьве стратэгіі “бэатыфікацыі” Шчарбіцкага —

“дзяржаўніцкая” і “чалавечая” — разьлічаныя на наіўную сьвядомасьць постсавецкага абываценя, які ані ня думае, які характар, мэту і цану мела тое “сацыялістычнае будаўніцтва”, а тым больш не задумваецца пра спалучэньне ўсіх тых асабістых цнотаў Шчарбіцкага з злачынным характарам сыстэмы, якой ён аддана служыў і якую ў вялікай меры ўвасабляў.
Калі паплечнікі й спадкаемцы Шчарбіцкага цьвердзяць, што ён “у свой час нямала зрабіў для разьвіцьця краіны”, варта памятаць пра спэцыфіку таго “разьвіцьця” і тае “краіны”, зь якой маларос Шчарбіцкі сябе атаясамліваў. Безумоўна, як і кожны маскоўскі намесьнік, ён меў свае інтарэсы ў рэгіёне (найперш эканамічныя) і, як кожны васал, спалучаў у сабе паказное халуйства перад сюзэрэнам ды прыхаваную непрыязнасьць да яго.
Адна з паплечніц Шчарбіцкага Валянціна Шаўчэнка рашуча абвяргае сьцьверджаньні, што У.В. нібыта “не бараніў інтарэсаў Украіны ў Маскве, ня дбаў пра свой народ”. “Я не магу з гэтым пагадзіцца, бо ведаю, як нялёгка было адстойваць інтарэсы рэспублікі ў Палітбюро ЦК КПСС, на сэсіях Вярхоўнага Савету Саюзу ССР ды ў саюзным урадзе. Дарэчы, і нас, кіраўнікоў Украіны ўсіх узроўняў, У.В. вучыў і раіў нам, як лепей дзейнічаць”. З сказанага, зразумела, не вынікае, што Шчарбіцкі быў такім сабе “сабатажнікам”, які і сам змагаўся як мог з маскоўскім дыктатам, ды яшчэ й падначаленых пад’юджваў. Ягоныя паводзіны, у прынцыпе, нічым ня розьніліся ад мяккага “апартунізму” большасьці мясцовых кіраўнікоў позьнесавецкае эпохі — як рэспубліканскага, так і абласнога ды раённага ўзроўняў.

Перш чым называць Шчарбіцкага “выдатным дзеячом”, варта было б адказаць на пытаньне, а што ж ён, уласна, зрабіў такога, чаго на яго месцы не зрабіў бы любы іншы тагачасны намэнклятурнік; а галоўнае — чаго ён, насуперак ціску Масквы ды актуальным на той час палітычным абставінам, наважыўся не зрабіць. Калі казаць пра зробленае, дык тут гіпатэтычная розьніца між Шчарбіцкім і любым іншым маскоўскім намесьнікам ува Ўкраіне істотнай быць не магла, з увагі на той факт, што 90% прамысловасьці Ўкраіны падпарадкоўвалася непасрэдна маскоўскім міністэрствам (а ня Кіеву). Нават

нестратэгічныя аб'екты, кшталту дзіцячага мэдычнага комплексу ці палацу культуры, дазвалялася будаваць толькі з згоды Масквы. Можна, вядома, дапусьціць, што пры якім іншым кіраўніку ў Кіеве збудавалі б ня сто дзіцячых садкоў (як пры Шчарбіцкім), а толькі 88; паставілі б ува Ўкраіне ўдвая болей (ці ўдвая меней — невядома, як лепш!) доменных печаў ды атамных электрастанцыяў, — усё гэта зусім не зьмяняе прынцыпова экстэнсіўнага характару сацыялістычнае эканомікі зь яе вар'яцкай энэргаёмістасьцю, зьнішчэньнем навакольля, нізкай прадукцыйнасьцю працы, вартай жалю якасьцю тавараў і паталягічнай гіпэрмілітарызаванасьцю, зусім не супярэчыць яе каляніяльнай пэрыфэрыйнасьці й падпарадкаванасьці агульнасаюзнаму "Цэнтру".

Іншая рэч, што Шчарбіцкі, як і кожны шрубок сыстэмы, меў шанец нечага не зрабіць і тым самым, у адрозьненьне ад іншых шрубкоў, заслужыць калі не дараваньне і любоў, дык прынамсі разуменьне і павагу нашчадкаў. Ніводнага з такіх шанцаў Шчарбіцкі ня выкарыстаў — калі, вядома, ня браць пад увагу кур'ёзныя гісторыі з малочнымі парсючкамі, не адасланымі ў Маскву. Ніводнага разу — ні ў 1972—1973, ні ў 1977—1978 гадах — ён нават не спрабаваў хоць трохі скараціць сьпіс вызначаных кагэбістамі ахвяраў, зьмякчыць хвалю рэпрэсіяў, ганеньняў супраць украінскай інтэлігенцыі, затармазіць брутальную русіфікацыю, якую сам заахвочваў. І таксама ў красавіку 1986 году яму не хапіла ні мужнасьці, ні сумленьня выступіць у абарону народу і краіны, якія ён нібыта (на думку адданых агіёграфаў) лічыў "сваімі". Ён не абвясьціў пра катастрофу, нават не заклікаў насельніцтва да мінімальных мераў бясьпекі — як гэта на другі дзень зрабіў польскі (таксама, дарэчы, камуністычны) урад. Ён не адмовіўся ад ганебнай дэманстрацыі 1 траўня, хоць гаворка йшла не пра вайсковы бунт і нават не пра ідэалягічную нязгоду, а ўсяго толькі пра невыкананьне злачыннага загаду.

Многа хто дагэтуль лічыць, што Шчарбіцкі баяўся за ўласную скуру і таму не наважыўся выступіць супраць бязглуздых наказаў Масквы, нават калі вялося пра жыцьцё і здароўе мільёнаў яго суайчыньнікаў. Гэтая пераканаанасьць хутчэй паглыбляецца, чым аслабляецца тымі супярэчлівымі тлумачэньнямі паводзінаў Шчарбіцкага ў чарнобыльскія дні, прапанаванымі найбліжэйшымі сваякамі й паплечнікамі.

З аднаго боку, цьвердзяць яны, Шчарбіцкі ня меў поўнае інфармацыі і не ўяўляў рэальных маштабаў ды наступстваў катастрофы. А зь іншага — ён безвынікова дамагаўся ад Масквы дазволу эвакуяваць кіеўцаў, не зьбіраць першатравеньскай дэманстрацыі і, увогуле, дзейнічаць рашуча. У адным выпадку ўсе прыгадваюць, што і сям'я самога Шчарбіцкага, уключна з унукам, была на згаданай дэманстрацыі й эвакуявалася з Кіеву аж 12 траўня, у іншым — цытуюць пагрозу, нібыта выказаную Гарбачовым: "Калі сарвеш дэманстрацыю — выключым з партыі".

Простая людзкая лёгіка сьведчыць, што нейкае з двух тлумачэньняў паводзінаў Шчарбіцкага лішняе. Або ён сапраўды нічога ня ведаў і не ўяўляў — і тады ня мусіў бы нічога ад Масквы дамагацца; або ж ведаў дастаткова — і тады мусіў ратаваць людзей, незалежна ад згоды (ці нязгоды) Масквы. Але гэткая лёгіка спрацоўвае ў антрапацэнтрычным сьвеце, тады як Уладзімер Шчарбіцкі, нагадаем, жыў у сьвеце ідэацэнтрычным, дзе кіраўнікі-"дрывасекі" ніколі не лічыліся з "трэскамі", што ляцелі з-пад іхных сякераў, дзе абстрактная ідэя важыла непараўнальна болей за чалавечае жыцьцё і дзе выбаўленьне зь бяды асобных людзей было несувымерным з сапраўднай мэтай усіх камуністаў — уратаваньнем людзтва (ці, прынамсі, яго найлепшае, "праведнае" часткі, якую яны самі мусілі вызначыць і адсартаваць).

На фоне прагнасьці й разбэшчанасьці тагачаснай, а тым больш сёньняшняй "эліты" Ўладзімер Шчарбіцкі зь ягонымі 60 тысячамі савецкіх рублёў, назьбіраных за цэлае жыцьцё, выглядае сапраўды ледзь ня ўзорам камуністычнае высокамаральнасьці. А ўсё ж націск у апошнім словазлучэньні трэба ставіць на слове "камуністычнай" — гэты прыметнік вызначае, на маю думку, значна больш, чым назоўнік. Ён ня толькі дае адказ, чаму Шчарбіцкі не супрацьстаяў палітычным рэпрэсіям ды русіфікацыі Ўкраіны і чаму не зрабіў усяго, што мог і мусіў, пасьля чарнобыльскай аварыі. Ён вызначае таксама, чаму ўсе ягоныя асабістыя цноты так і ня сталі грамадзка значнай зьявай, застаўшыся чыста прыватнымі рысамі — прыблізна ў тым самым сэнсе, у якім засталіся чыста прыватнымі рысамі ўсе цноты нацысцкіх правадыроў. А сярод паплечнікаў Гітлера, як мы ведаем, таксама былі спагадлівыя бацькі й дзядулі, верныя мужы, аматары свойскіх жывёлін ды

фартэпіяннае музыкі (калі гэта, вядома, не супярэчыла генэральнай лініі іхнае партыі), ня схільныя да чаркі й мацюкоў, моцныя гаспадарнікі й шчырыя патрыёты сваёй айчыны, якія, няма сумневаў, жадалі дабра свайму народу. Іншая справа, што да іх народу не належалі ў адным выпадку габрэі ды цыганы, у іншым — "украінскія буржуазныя нацыяналісты" ды "клясавыя ворагі"; і адных, і другіх трэ было зьнішчыць у імя найвышэйшай, толькі "шчырым патрыётам" вядомай і імі манапалізаванай справядлівасьці.

2

Кожная ўлада, аднак, якой бы яна ні была "прагматычнай" ды "незакамплексаванай" (то бок вольнай ад маральных, нацыянальных ды іншых падобных комплексаў), патрабуе пэўнае легітымнасьці. Дзеля гэтага ёй даводзіцца ня толькі імітаваць "дэмакратычныя" інстытуцыі ды працэдуры, але й ствараць пэўныя сымбалі, гістарычныя і навачасныя, якія б ядналі насельніцтва калі не ў сьвядомых грамадзянаў (для алігархічнае ўлады гэта цалкам непажадана), дык прынамсі ў ляяльных падданых. Украінская дзяржава, што паўстала як юрыдычная спадкаемніца УССР і адначасова як "духоўная" спадкаемніца ранейшых украінскіх (ці протаўкраінскіх) протадзяржаваў — ад Кіеўскае Русі ды Галіцка-Валынскага каралеўства да Гетманшчыны і аж да УНР, — ад самага пачатку прымхліва яднала старыя сымбалі савецкіх часоў з старэйшымі дасавецкімі (і антысавецкімі), заснаванымі на гістарычнай мадэлі Грушэўскага.

Эклектыка сымбалічных рэпрэзэнтацыяў новае дзяржавы, што спачатку ўспрымалася як пераходная зьява, зрабілася з часам яе характэрнай, сутнаснай адзнакай — сымбалічным адбіткам "момантакратыі" — забесьпячэньня хвілінных патрэбаў посткамуністычнае алігархіі (утрыманьне ўлады і назапашваньне ўласнасьці) поруч з адсутнасьцю якога-любя стратэгічнага бачаньня разьвіцьця краіны — і адначасова адным з істотных сродкаў яе практычнага ажыцьцяўленьня. Пра асаблівасьці гэтага ажыцьцяўленьня напісана ўжо нямала, у тым ліку і аўтарам гэтых радкоў: у самых агульных рысах яно зводзіцца да эксплюатацыі камуністычна-таталітарнай ды савецка-каляніяльнай спадчыны й утрыманьня грамадзтва ў атамізаваным, падзеленым, дэзарыентаваным і адчужаным

неграмадзянскім стане. Менавіта ў адсутнасьці грамадзянскай салідарнасьці — супольных для ўсіх і кожнага нацыянальных сымбаляў ды ідэяў, супольнага бачаньня мінуўшчыны ды будучыні — уладная алігархія неспадзявана пабачыла спрыяльны грунт для ажыцьцяўленьня сваёй спэцыфічнай "момантакратычнай" палітыкі.

Зь дзьвюх магчымасьцяў разьвіцьця, якія на пачатку 90-х гадоў разгортваліся перад посткамуністычнай намэнклятурай усіх постсавецкіх краінаў, украінскія эліты не скарысталіся ніводнай: яны зусім ня здолелі трансфармаваць сябе ў добрапрыстойных цэнтрыстаў, кшталту літоўскіх, вугорскіх ці польскіх, выракшыся камуністычных і тым больш каляніяльных сымбаляў ды навучыўшыся больш-менш сумленна гуляць паводле эўрапейскіх лібэральна-дэмакратычных правілаў. Не наважылася намэнклятура пайсьці і на практычна поўную рэстаўрацыю савецка-каляніяльнае (ці імпэрскае) спадчыны паводле ўзору Беларусі й Расеі, кінуўшы просты выклік усім тым "недарэчным" эўрапейскім правілам. Украінскія эліты хутчэй інтуітыўна, чым сьвядома, намацалі "трэці шлях", што прадугледжваў імітацыю дэмакратычных зьменаў і адначасовую кансэрвацыю наяўнага, атрыманага ў спадчыну ад УССР статус-кво. Пра прычыны такога неймавернага выбару няма як казаць, бо трэ было б дакладна высьвятляць спэцыфіку ўкраінскага соцыюму, мясцовых (пост)камуністычных элітаў ды нацыянал-дэмакратычнае апазыцыі. Галоўнае тут тое, што вынікам гэтага "выбару" стала ўсебаковая дэградацыя ўкраінскай эканомікі, росквіт карупцыі, стагнацыя грамадзтва (цынічна рэпрэзэнтаваная як "стабільнасьць") ды міжнародная ізаляцыя дзяржавы, кіраўнікі якой год у год абяцаюць адно, а робяць іншае ("гуляюць не паводле правілаў, а з правіламі", як дасьціпна вызначыў сутнасьць украінскага "трэцяга шляху" Хаўер Саляна).

Зразумела, што тактыка "момантакратыі" (ні пра якую стратэгію тут ня йдзецца, беручы пад увагу саму сутнасьць рэжыму) не прадугледжвае ні пасьлядоўнае дэкамунізацыі, дэсаветызацыі й дэкалянізацыі краю (у тым ліку і на ўзроўні рэпрэзэнтацыйных сымбаляў), ні, наадварот, яго пасьлядоўнае рэсаветызацыі ці, тым больш, рэкамунізацыі й рэкалянізацыі. Увогуле ніякай пасьлядоўнасьці тут быць ня можа, бо сама прырода "момантакратыі", яе сутнасьць — гэта элемэнтарнае,

ледзь не фізіялягічнае рэагаваньне на непасрэдныя раздражняльнікі: такі сабе штодзённы гандаль — наданьне разнастайных канцэсіяў хаўрусьнікам, шантаж апазыцыянэраў, маніпуляваньне нявызначаным і дэзарыентаваным у масе сваёй насельніцтвам, якое і надалей сьлед трымаць у стане нявызначанасьці й дэзарыентаванасьці.

У гэтым кантэксьце ўшанаваньне Шчарбіцкага наўрад ці можна лічыць часткай шырэйшай агульнай стратэгіі, скіраванай на згортваньне “нацыяналізацыйных” праграмаў і разгортваньне саветызацыйных, каляніяльных, на выцясьненьне ўкраінскіх сымбаляў і рэстаўрацыю савецка-каляніяльных. Хутчэй за ўсё, ніякай прадуманае стратэгіі не існуе, хоць цалкам можа быць, што ўладная эліта ў сваёй ідэалягічнай аморфнасьці ды не абмежаванай ніякім здаровым сэнсам “шматвэктарнасьці” робіць цяпер чарговы ківок у бок бліжэйшага ёй тэрытарыяльнага, “крэольскага” патрыятызму ды менавіта “дзяржаўніцкай” (а не нацыянальнай) ідэалёгіі. Па вялікім рахунку, уласных сымбаляў украінскія “ўладцы” ня маюць, а дакладней, імі мусілі б быць які-небудзь Аль-Капонэ ці Брат-2 — словам, нешта такое, што пачапіць сабе на фасад яны, відаць, ня змогуць зь меркаваньняў асабістае добрапрыстойнасьці ды дзяржаўнае легітымнасьці. Што ж да Шчарбіцкага зь ягонай савецкай “волгай” ды рублёвай ашчадкніжкай, дык ён, вядома, ня ёсьць і ня можа быць уласным сымбалем сёньняшняй уладнай алігархіі, а таму безумоўна адпавядае ўсім “найвышэйшым” патрэбам і меркаваньням — як і Вячаслаў Чарнавіл, 65-гадовы квазіюбілей якога нядаўна адзначылі тыя самыя “ўладцы”, як і Міхайла Грушэўскі, цалкам ужо “ўладцамі” кананізаваны, як і гетман Мазэпа, фільм пра якога ўсё тыя ж “уладцы” прафінансавалі зь дзяржбюджэту, як і, урэшце, князі Ўладзімер ды Яраслаў Мудры, абачліва намаляваныя на ўкраінскіх банкнотах з казацкімі вусамі, а не “кацапскімі” бародамі. Шчарбіцкі ў гэтым кантэксьце хутчэй дапаўняе, чым руйнуе эклектычны “дзяржаўніцкі” іканастас, пабудаваны посткамуністычнай уладай. Іканастас, у які ўмантоўваюць і Шчарбіцкага, і Грушэўскага, і Героя Ўкраіны Чарнавіла, і Героя Ўкраіны Зьвягільскага, і пасьмяротнага кавалера Ордэна Яраслава Мудрага 5-й ступені Васіля Стуса, і ягонага

кагэбісцкага “адваката” Віктара Медзьведчука (Героя Ўкраіны, вядома, няма базару), — такі іканастас ня ёсьць ні ўкраінскім, ні “антыўкраінскім”; ён увогуле не зьяўляецца нацыянальным, то бок разьлічаным на пашану нацыянальна сьвядомых і салідарных грамадзянаў ды, адпаведна, узмацненьне ў іх грамадзянскай сьвядомасьці й салідарнасьці. Іканастас, які стварае посткамуністычная ўлада, ёсьць чыста дзяржаўніцкім, то бок ідалападобным, унутрана спустошаным, пазбытым зьместу, разьлічаным на сьляпое ўшанаваньне падданымі ды выхаваньне ў іх неграмадзянскай, атамізаванай сьвядомасьці пачуцьця нікчэмнасьці перад усёмагутным ірацыянальным дзяржаўным малохам.
Пра “пасьпяховасьць” гэтага экспэрымэнту сьведчаць вынікі сацыялягічных дасьледаваньняў. Ускосным наступствам алігархічнага “дзяржавабудаваньня” зьяўляецца дрымучы этатызм і патэрналізм закансэрваванага ўва Ўкраіне гома саветыкуса. Задаўшы нядаўна дзьвюм тысячам рэспандэнтаў пытаньне “Хто, паводле Канстытуцыі, зьяўляецца крыніцаю ўлады ўва Ўкраіне?”, дасьледчыкі з Цэнтру імя Разумкова атрымалі адказы: “Прэзыдэнт Украіны” — 31,2%, “Ня ведаю/цяжка адказаць” — 28,8%, “Народ Украіны” — 17,7%, “Вярхоўная Рада” — 15,1%, “Канстытуцыйны/Вярхоўны Суд” — 4,4%, “Кабінэт Міністраў” — 2,8%. Гэтыя адказы адлюстроўваюць ня толькі прававую непісьменнасьць і цемнату насельніцтва, успадкаваную ад савецкіх часоў, але й цалкам рэальны, асабісты досьвед узаемаадносінаў з роднай “дэмакратычнай” дзяржавай, набыты ўжо ў постсавецкае дзесяцігодзьдзе. На пытаньне “Каму рэальна належыць улада ўва Ўкраіне?” тыя самыя рэспандэнты адказалі так: “Прэзыдэнту Ўкраіны” — 53,3%, “Ня ведаю/цяжка адказаць” — 27,8%, “Вярхоўнай Радзе” — 25,1%, “Кабінэту Міністраў” — 11,4%, “Канстытуцыйнаму/Вярхоўнаму Суду” — 5,8%, “Народу Ўкраіны” — 3,5 (sic).

Тое, што ў абодвух выпадках на першым месцы апынуўся прэзыдэнт Украіны, шмат пра што гаворыць, як і тое, што другую па велічыні групу рэспандэнтаў складаюць людзі, якія ня вызначыліся з адказам. (Тым часам у многіх апытаньнях гэтая група зьяўляецца нават не другой, а першай.) Але самае характэрнае ў гэтай статыстыцы — тое сярэдняе ці нават

апошняе месца, якое адводзяць у адпаведных апытаннях рэспандэнты “народу Ўкраіны”, г.зн. самім сабе. Гэта, можна сказаць, і ёсьць галоўным вынікам алігархічнага дзяржаванацыябудаваньня ўва Ўкраіне, у кантэксьце якога афіцыйнае сьвяткаваньне “юбілею” Шчарбіцкага мае ня большае (але й ня меншае) значэньне, чым крывадушнае, чыста ўтылітарнае, “момантакратычнае” ўшанаваньне гэтай уладай Стуса або Чарнавіла ці герояў Крутаў*.

З культурна-антрапалягічнага пункту гледжаньня ўсе гэтыя падзеі, уключна зь сьпехам выдуманым юбілеем Шчарбіцкага, — акты чыста сымбалічныя: такое сабе пазначэньне падкантрольнае тэрыторыі — гэтак мядзьведзі абдзіраюць кіпцюрамі кару з дрэваў, сабакі значаць парканы, зграі лос-анджэласкіх падлеткаў малююць на сьценах мудрагелістыя графіці, зашыфроўваючы ў іх грозныя пасланьні супернікам зь іншых бандаў, а зладзеі ў законе зьяжджаюцца на пахаваньне чарговага хроснага бацькі, каб на сваіх “мэрсэдэсах” дэманстратыўна праехацца кавалькадай па ўвесь горад, натхнёна ціснучы на кляксоны. Зазвычай ніякага практычнага сэнсу ў гэтых і падобных актах няма, апрача аднаго: акрэсьліць сваю сымбалічную прастору, легітымізаваць (а дакладней — сакралізаваць, бо пра сапраўдную “легітымнасьць” тут ня йдзецца) сваё панаваньне на тых абшарах з дапамогай пэўных рытуальных, магічных дзеяньняў. Было б, аднак, памылкаю зводзіць усё гэтае абдзіраньне ды абсцыканьне палітычных парканаў да чыста сымбалічнага, рытуальнае дзеі. Улада рыхтуецца да прэзыдэнцкіх выбараў 2004 году, якіх зь вядомых усім прычынаў ня сьмее зрабіць датай і перамогі на якіх будзе дабівацца ўсімі магчымымі і немагчымымі сродкамі. Часткова нам ужо паказалі тыя сродкі ў 1999 ды 2002 гадах, часткова далі пачуць чароўную аўтэнтыку выканаўцаў на Мельнічэнкавых запісах. Ведаючы спэцыфічную “сілу” дзейнае ўлады, можна меркаваць, што гэта яшчэ далёка ня край даступных ёй “тэхналёгіяў”. Нават калі ўявіць малаімавернае — што ня хопіць уласных сабачых сыноў, — хопіць маскоўскіх.

Сьвяткаваньне “юбілею” Шчарбіцкага (як і гадавіны Пераяслаўскае рады, як і “Году Расеі ўва Ўкраіне”, як і шмат якіх іншых прапагандысцкіх карнавалаў, колькасьць якіх будзе расьці як лявіна ў наступныя паўтара году) акрэсьлівае ня

*** Круты — мястэчка ад Кіевам, каля якога 29 сьтудзеня 1918 г. адбылася бітва кіеўскіх студэнтаў зь бальшавікамі. Каля 300 студэнтаў загінула.**

толькі сымбалічную, але й цалкам рэальную тэрыторыю, дзе, на думку “паліттэхнолягаў”, жыве іхны патэнцыйны электарат, іхная галоўная надзея і апора, аб’ект іхнае шматгадовае прапагандысцкае апекі — homo soveticus. Ён сумуе бяз таннае кілбасы, стабільнасьці і сьвятога права нічога ня ведаць і ні за што не адказваць. Менавіта для яго будуць мігцець на тэлеэкранах настальгічныя “агеньчыкі” і “кавээны”, маршаваць “браты” і “мянты” з братняе Русі, “мачыць” ворагаў у сваіх пяціхвілінках нянавісьці адыёзныя тэлезмагары, будуць надрывацца “шансоны” і накладаць галавой за правы “прыгнечанай” расейскай мовы яе прафэсійныя абаронцы. Усё будзе як у 1994-м, толькі — з улікам памераў “абшчака” і паслужнога сьпісу “бацькоў” — нашмат больш цынічна, брутальна ды бессаромна.

Сьвяткаваньне “юбілею” Шчарбіцкага ды зьвязаныя з гэтым афіцыйныя захады — гэта, у прынцыпе, толькі кропля памыяў, у параўнаньні з тым акіянам, які выльецца на нашыя электаральныя галовы ў наступныя паўтара году. Прадуцэнты гэтых памыяў па-свойму маюць рацыю: трыццаць адсоткаў прыхільнікаў Юшчанкі — гэта яшчэ ня ўся Ўкраіна. Нашмат больш тых, што ня вызначыліся, што топкаюцца разгублена між звыклым мінулым і нязвыклай будучыняй, між Эўропай і Эўразіяй, між годным, але адказным жыцьцём і нікчэмным, але шчасьліва-бяздумным. Якраз за іх і йдзе асноўная барацьба, якраз іхныя стэрэатыпы, фобіі ды настальгійныя комплексы будзе распальваць дзяржаўная прапаганда, якая ўжо даўно ўсьвядоміла: падтрымліваць у чалавеку жывёльнае і рабскае нашмат прасьцей, чым выціскаць зь яго раба і выхоўваць грамадзяніна.

“Гома саветыкуса” не абразіш ні “юбілеем” Шчарбіцкага, ні помнікам Леніну на цэнтральнай плошчы, ні днём невядома якога “абаронца” невядома якой “айчыны”, ні нават цынічнай балбатнёй бандыцкіх “элітаў” на Мельнічэнкавых стужках. Магчыма, гэты люд і насамрэч заслугоўвае таго начальства, якое мае, і тае зладзейскай, занядбанай і ўсімі зьняважанай краіны, якую толькі й можна параўноўваць з “братнімі” ня менш “саўковымі” Расеяй і Беларусяй. А ўсё ж шкада тае меншасьці, тых трыццаці адсоткаў, якія прагнуць іншай Украіны і гатовыя за яе змагацца, а не гібець усё жыцьцё пад шчарбіцкімі-краўчукамі-кучмамі ды іншымі пэрсанажамі

нашага маларасійскага паноптыкуму.

3

Галоўная праблема, якая мусіла б стаць аб'ектам дыскусіяў (прынамсі ў інтэлектуальным асяродзьдзі) у сувязі з афіцыйным сьвяткаваньнем "юбілею" Шчарбіцкага і якая, на вялікі жаль, такім аб'ектам ня стала, — гэта праблема злачыннага характару камуністычнае сыстэмы, яе падабенства (і адрознасьці) ад нацызму, а адсюль — меры адказнасьці нацысцкіх і камуністычных правадыроў за злачынствы перад чалавецтвам. На Захадзе некалькі гадоў таму гарачую дыскусію з гэтае нагоды выклікала зьяўленьне фундамэнтальнай працы французскіх дасьледчыкаў «Чорная кніга камунізму. Злачынствы, тэрор, перасьледаваньні», але ўва Ўкраіне і яна ніяк не адбілася ні ў масавай, ні — што яшчэ горай — у спэцыяльнай літаратуры.

Імавернасьць такой рэакцыі да пэўнае меры спрагназаваў і ў вялікай меры патлумачыў у перадмове адзін з аўтараў Стэфан Куртуа: "«Кніга» зачапіла самы стрыжань праблемы — злачынства як сутнасьць камунізму. Спрабавала ацаніць камуністычную сыстэму паводле вынікаў яе дзейнасьці, дзясяткаў мільёнаў ахвяраў. Спрабавала адказаць, чаму ўсюды, дзе камунізм дасягнуў улады, засталіся мільёны дамавінаў. Некаторым гэта цяжка праглынуць".

«Чорная кніга камунізму» парушыла псыхалягічны камфорт многіх людзей, паказваючы, што "тэрор і масавае злачынства — гэта стрыжань камуністычнае сыстэмы", а ня нейкая яе мутацыя або, так бы мовіць, пабочны эфэкт "увогуле неблагога" праекту.

"«Чорная кніга» прыводзіць да высноваў пра паралелізм дзьвюх крывавых утопіяў, пра імавернасьць і магчымасьць, або нават абавязковасьць супастаўленьня двух таталітарызмаў XX стагодзьдзя, якія нарадзіліся з ідэнтычнае адмовы ад "буржуазнае" дэмакратыі, дэкалёгу правоў чалавека і грамадзяніна, з тае самае гульні на найгоршых чалавечых інстынктах — на нянавісьці і зайздрасьці, на помсьце і адплаце, хцівасьці і неталерантнасьці, на бязьлітасным зьнішчэньні праціўніка, сапраўднага і прыдуманага, з мэтай стварэньня "новага чалавека" любой цаной".

Зусім не ідэалізуючы заходніх дэмакратый, што, як піша

Стэфан Куртуа, “таксама чынілі жахлівае”, варта ўсё ж памятаць, што злачынства для іх “не было сутнасьцю кіраваньня дзяржавай”.
“Я сапраўды лічыў, — цьвердзіць Куртуа, — што пэўную частку злачынстваў, зьдзейсьненых камуністычнымі рэжымамі супраць людзей толькі празь іхнае паходжаньне, а не за іх дзеяньні, можна і трэба кваліфікаваць якраз так (як злачынствы супраць чалавецтва). Як яшчэ можна назваць тое, што Сталін і ягонае атачэньне пастанавілі вымарыць голадам некалькі мільёнаў украінскіх сялянаў — за тое, што яны былі “кулакамі”, то бок клясай, і ўкраінцамі, то бок народам? Ці тое, што цягнікамі сьмерці дэпартаваліся цэлыя этнічныя групы?”
Гісторык Яраслаў Грыцак падчас дыскусіі на старонках «Критики» вельмі дасьціпна адрэагаваў на пашыраны аргумэнт, згодна зь якім “камунізм можна ўявіць без ГУЛАГу, а нацызм бяз газавых камэраў — не” і таму, як сьцьвярджае Тоні Джут, “трэба разьмяжоўваць рэжымы, якія вынішчаюць людзей дзеля пэўнай перадвызначанай (гіпатэтычна шляхетнай) грамадзкай мэты, і рэжымы, для якіх зьнішчэньне людзей зьяўляецца самадастатковай мэтай”. Грыцак заўважае, што камунізм праіснаваў семдзесят гадоў, тады як нацызм — толькі дзесяць, а таму “цалкам магчыма, што пасьля Гітлеравай сьмерці ён выродзіўся б у нейкі мякчэйшы таталітарызм із сваім спарахнелым нацысцкім Брэжневым, а пасьля б дачакаўся перабудовачнага партайгеносэ Гарбачова. Ня ведаю, што б тады сталася з газавымі камэрамі. Затое мы добра ведаем гісторыю радзімы камунізму — Савецкага Саюзу — і можам засьведчыць, што без ГУЛАГу гэты рэжым хутка страціў бы галоўную апору і сэнс свайго існаваньня”.

Наіўна было б чакаць ад украінскіх алігархічных мас-мэдыяў сур’ёзнага абмеркаваньня гэтых праблемаў ці хоць бы згадкі пра іх маральны аспэкт — хоць “юбілей” Шчарбіцкага даваў для гэтага нібыта нядрэнную нагоду.
Яшчэ больш прыкра, што гэтыя праблемы зусім не абмяркоўваліся і ў інтэлектуальным асяродку (за адзінкавымі і, у прынцыпе, маргінальнымі выключэньнямі). Ад украінскіх інтэлектуалаў на дванаццатым годзе дзяржаўнае незалежнасьці хацелася б пачуць больш сур’ёзныя думкі пра сутнасьць дзяржавы, якую яны супольна з посткамуністычнай алігархіяй

будуюць, а таксама пра тое, ці можна ўвогуле што-небудзь людзкае збудаваць на аснове нераможанай савецка-камуністычнай спадчыны, акрамя таго алігархічна-дзяржаўнага монстра, які ёсьць. Варта было б ня толькі высьветліць, быў ці ня быў Шчарбіцкі зацятым русіфікатарам і зьнішчальнікам дысыдэнцтва (ці ж мала такіх Шчарбіцкіх было ўва ўкраінскай гісторыі?..), але й адказаць на нязручнейшыя — і адначасова істотнейшыя — пытаньні: як адзначэньне “юбілею” Шчарбіцкага суадносіцца зь сьвяткаваньнямі юбілеяў Алеся Ганчара ды іншых клясыкаў сацрэалізму, зь перавыданьнем іх шматтомнікаў, навязваньнем іх сумнеўных твораў навучальным праграмам, з публікацыямі разнастайных “Залатых імёнаў” з залатым цісьненьнем (пры непасрэдным удзеле нацыянал-дэмакратычных бонзаў), з пакорлівым вызнаньнем легітымнасьці савецкага (антыўкраінскага паводле самой сваёй сутнасьці) КГБ, а разам зь ім і легітымнасьці многіх іншых таталітарных інстытуцыяў, крыху падфарбаваных (як, напрыклад, так званыя “нацыянальныя” творчыя саюзы, ці акадэмія навук, ці “народныя” суды, ці яшчэ “народнейшыя” пракуратуры) або і кардынальна адрамантаваных (як, напрыклад, “Нацыянальная” прэмія імя Шаўчэнкі), — а таму аднолькава моцна ўмантаваных у наяўную палітычную сыстэму — кандова савецкую і аўтарытарную.

Усе спробы абмеркаваць акрэсьленыя тут праблемы пасьпяхова маргіналізуюцца, замоўчваюцца, выпіхваюцца ў дэвіянтную “напаўвар’яцкую”, “экстрэмісцкую” сфэру — і гэта ня толькі ў паноўным алігархічным дыскурсе, але і ў дыскурсе нібыта апазыцыйным, дэмакратычным. Праблема дэкамунізацыі й дэсаветызацыі інтэрпрэтуецца як банальны заклік да “суду над КПСС” і руйнаваньня помнікаў Леніну ды іншых таталітарных сымбаляў, а не як шырокая праграма маральнага ачышчэньня й інстытуцыйнага абнаўленьня грамадзтва.

Пакуль што ў апініятворчых інтэлектуальных асяродках пераважаюць іншыя падыходы, якія можна дзеля прыкладу праілюстраваць хоць бы нядаўнім аповедам акадэміка Івана Дзюбы пра яшчэ адну “залатацісьненую” сэрыю пад назваю «Бібліятэка Шаўчэнкаўскага камітэту». Як адзін з самых сумленных і эрудыяваных украінскіх інтэлектуалаў, Іван Дзюба, бясспрэчна, ведае, што далёка ня ўсе творы, адзначаныя Шаўчэнкаўскай узнагародай у таталітарныя часы,

заслугоўваюць перавыданьня. Ён прызнае, што “здараліся выпадкі, калі творы адзначаліся, на жаль, з каньюнктурных меркаваньняў, перамагаў заідэалягізаваны і запалітызаваны падыход”, былі творы, “якія сёньня папросту адыёзна гучаць, кампрамэтуюць высокую прэмію”. “Але, — перакананы ён, — гэта выключэньні, асноўная маса — гэта выдатныя творы літаратуры і мастацтва”.
Неперадузяты чытач мог бы заўважыць, што на самай справе ўсё было наадварот: толькі ў асобных выпадках творы ўзнагароджвалі *не* з каньюнктурных меркаваньняў, заідэалягізаваны і запалітызаваны падыход толькі гады ў рады не перамагаў, а *выдатныя* творы літаратуры і мастацтва былі хутчэй *выключэньнямі* ў таталітарнай Шаўчэнкаўскай бібліятэцы, чым *асноўнай масай*.

“Нейкія рэчы, самыя яскравыя і таленавітыя з таго, што адлюстроўвала намаганьні пэўнага пісьменьніка адпавядаць духу свайго часу, мы таксама будзем даваць, — кажа Іван Дзюба. — Вось, напрыклад, у кнігу Міколы Бажана мы, вядома, уключылі яго клясычныя рэчы — «Людина стоїть в зореноснім Кремлі…», «Клятва», бо гэта моцныя рэчы, у іх адбівалася эпоха. Хто б як ні ставіўся сёньня да таго, але ж гэтыя людзі былі часткаю жыцьця нашага грамадзтва”.
Заўважым, што гаворка йдзе не аб нейкай анталёгіі вершаў пра Сталіна ці, напрыклад, выставу таталітарнага мастацтва, дзе адпаведныя творы зьмешчаныя ў адпаведны кантэкст, адпаведна пракамэнтаваныя і “муміфікаваныя”, ператвораныя ў чыста музэйны артэфакт — дзякуючы папярэдне зьдзейсьненай пасьлядоўнай дэкамунізацыі (або дэнацыфікацыі) посттаталітарнага грамадзтва й выпрацоўцы ў яго эфэктыўнага імунітэту да таталітарнае прапаганды. Наадварот, гаворка йдзе пра своеасаблівую “бібліятэку шэдэўраў”, перавыданьне якіх, паводле словаў самога Дзюбы, “мусіць стацца сьведчаньнем таго, што яны вытрымалі выпрабаваньне часам (sic) і зьяўляюцца чыньнікам культурнага жыцьця і сёньня”. Што яшчэ горай — гэтыя шэдэўры адрасаваныя грамадзтву, якое не прайшло дэкамунізацыі, ня выдзерлася зь “бездані маразму”, як сказаў бы Ален Бэзансон, не пазбылася сваёй саўковасьці, сваіх унутраных таталітарных комплексаў. Ці можа такое грамадзтва паставіцца да

таталітарных “шэдэўраў” адстаронена, то бок ня проста як да “сваёй” гісторыі (“якою б яна ні была”), а як да эпізоду паталягічнага, вартага асуджэньня, пакаяньня ці, бадай, сарданічнае ўсьмешкі?

Аргумэнтацыя Дзюбы, незалежна ад яго суб’ектыўных намераў, абумоўленая, верагодна, шырынёю душы, а не папулярнейшымі ў гэткіх выпадках карпаратыўнымі інтарэсамі, тыпалягічна нічым, аднак, не адрозьніваецца ад чыста карпаратыўных (намэнклятурна-алігархічных) аргумэнтаў на карысьць захаваньня помнікаў Леніну й разнастайных камуністычных тапонімаў, адзначэньня савецкіх сьвятаў і ўшанаваньня партыйных правадыроў накшталт Шчарбіцкага — бо ўсе яны “былі часткаю жыцьця нашага грамадзтва”, “як бы хто сёньня да гэтага ні ставіўся”. І калі перасьпеў няшчасным Бажаном ці Тычынам сталінскіх прыдворных паэтаў трактаваць як “намаганьне адпавядаць духу свайго часу”, дык і якія-небудзь сучасныя паскудзтвы, кшталту тэлепраграм «Однако» або «Епіцентр», нам таксама давядзецца з часам кананізаваць — бо і ў іх “адбілася (на свой лад) эпоха”, дый рабілі іх людзі не бяз пэўнага таленту.

“Ёсьць адно агульнае правіла, — пісаў мудры Бэзансон, — калі табе даводзіцца процістаяць ідэалягічнаму рэжыму, дык першае, што ты мусіш зрабіць, гэта без усялякіх дыскусіяў адпрэчыць тое ўяўленьне пра рэальнасьць, якое ён хоча табе накінуць. Бо калі ты вызнаеш “частковую ісьціну”, ты прапаў”. Беспрынцыповасьць украінскіх інтэлектуалаў ня мае нічога супольнага з патрэбай грамадзкага дыялёгу і кампрамісу, паразуменьня і прымірэньня — складаным і балючым працэсам, празь які давялося прайсьці многім постаўтарытарным дзяржавам, уключна з Гішпаніяй і Чылі, на досьвед якіх сёньня многа хто спасылаецца. Паразуменьне й прымірэньне азначае ня толькі спыненьне “халоднай грамадзянскай вайны”, адмову ад асабістых рахункаў і спакусьлівага “паляваньня на вядзьмарак”. Гэты працэс прадугледжвае таксама публічнае асуджэньне мінулых злачынстваў і самой злачыннай сыстэмы, рашучую адмову ад скампрамэтаваных той сыстэмай практык ды інстытуцыяў, сумленнае пакаяньне ўсіх датычных і дараваньня для ўсіх, хто не заплямiў сябе злачынствамі супраць чалавецтва. Гаворка йдзе, сказаў бы Ален Бэзансон, пра *амністыю*, а не пра *амнэзію*.

Вядомая ўкраінская паэтка Ліна Кастэнка, абураная ў свой час балбатнёю калегаў-літаратараў пра тое, што “ўсе мы вінаватыя”, “усе мы служылі і прадаваліся, хто болей, хто меней”, выйшла ў знак пратэсту з Саюзу пісьменьнікаў, але гэты жэст практычна ня меў ніякага грамадзкага розгаласу. Украінская інтэлігенцыя, падобна, нават не зразумела, што здарылася: амаль усе мае спробы высьветліць у прыватных гутарках меру гэтага разуменьня сканчаліся больш або менш празрыстымі намёкамі суразмоўцаў на эмацыйную, скажам так, неўраўнаважанасьць пісьменьніцы ды на яе надмерную амбітнасьць. Падобна быў успрыняты і жэст Андруховіча, які дэманстратыўна адмовіўся ад намінаваньня на Шаўчэнкаўскую прэмію: ніхто не аналізаваў дэкляраваных ім прычынаў адмовы (нежаданьне легітымізаваць наяўную — антыкультурную і антыўкраінскую — уладу, прымаючы ад яе любыя ўзнагароды і вызнаючы тым самым, што яна мае права тыя ўзнагароды даваць), затое ўсе дружна і надзвычай зласьліва казалі пра Андруховічаву пыху і, вядома, пра тое, што яму “ўсё адно ніякая прэмія не сьвяціла”.

Падобна рэагавала нашая “інтэлектуальная” супольнасьць і на выступы Рыгора Грабовіча пра неператможаную савецкую спадчыну ў “нацыянальнай” Акадэміі навук, і на выхад вялікай групы літаратараў з крыптасавецкага “нацыянальнага” Саюзу пісьменьнікаў, і на публікацыі некалькіх аўтараў пра крыптасавецкія зьявы і тэндэнцыі на апошнім кангрэсе Міжнароднай асацыяцыі ўкраіністаў. Ніхто не абмяркоўваў пададзеных аргумэнтаў, затое ўсе дружна высьвятлялі, якія таемныя стымулы (хваравітыя амбіцыі, рэўнасьць, подкуп) рухалі аўтарамі. Гэта, уласна, і ёсьць “бездань маразму”, пра якую пісаў Бэзансон, — калі крытыкаў не цікавіць тэкст, то бок закранутыя ў ім праблемы, затое хваравіта цікавіць усё, што па-за тэкстам: пятая графа аўтара, знаходжаньне бацькоў на акупаванай тэрыторыі, сувязь прабабкі зь левымі эсэрамі, адсутнасьць дыплёму пра вышэйшую адукацыю, колькасьць чырвонцаў, атрыманых ад замежных выведак. Мы, як выявілася, дагэтуль жывём у сьвеце, дзе маральным ёсьць не праўдзівае, а мэтазгоднае; дзе па-сапраўднаму істотна ня тое, *што* сказана, а тое, *хто* сказаў і *навошта*. Рэакцыя ўкраінскае ўлады (і праўладных мас-мэдыяў) на Мельнічэнкавы запісы таксама

красамоўна і па-свойму заканамерна пацьвярджае гэтае правіла.
Пераканаўшыся, што ўлада ўва Ўкраіне сапраўды “моцная як ніколі” і што яе “спадкаемнасьць” забясьпечваецца належным чынам, можам адказаць нарэшце і на яшчэ адно балючае пытаньне, якое часта ўсплывае ў нашых інтэлектуальных дыскусіях апошняга часу. Гаворка йдзе пра ўсё больш вострае адчуваньне міжнароднае ізаляцыі Ўкраіны, усё больш безнадзейнае адставаньне ад “першага” і нават “другога” сьвету (які на нашых вачах робіцца “першым”) ды пра ўсё больш рэальную пэрспэктыву, акрэсьленую Андруховічам: “назаўжды застацца пры ўласнай другагатункавасьці, непаўнавартасьці, пасіўнай незадаволенасьці — па-за сучаснасьцю, па-за гісторыяй, па-за будучыняй і па-за вечнасьцю”.
Ня ўсе ўкраінскія заходнікі ўсьведамляюць, што Захад такі, які ёсьць (абыякавы, цынічны, эгаістычны, неадукаваны), аднак мае адну перавагу: ня мы яму патрэбныя, а ён нам. А таму і абражацца асабліва не выпадае: замест таго каб прыкласьці максымальныя намаганьні й пераканаць Захад, што мы не Расея, што мы іншыя, што мы, хоць і саветызаваныя-камунізаваныя, усё ж намагаемся гэты праклён зь сябе скінуць, украінскія “эліты” цягам дванаццаці гадоў пераконвала сьвет у цалкам супрацьлеглым: мы саўкі і нам гэта падабаецца, бо гэта наша мінулае, якога ня сьлед выракацца.
Раман Сальчанык нядаўна зрабіў своеасаблівае падсумаваньне інтэлектуальных дэбатаў у асяродзьдзі ўкраінскіх заходнікаў, нагадаўшы ўсім, што заходніх эўрапейцаў цікавіць ня толькі эканоміка (прыблізна аднолькава кульгавая зь іх пункту гледжаньня ўва ўсёй Усходняй Эўропе), а найперш — ідэнтычнасьць. Бо якраз ад яе, урэшце, залежыць здольнасьць (або няздольнасьць) нацыі засвоіць эўрапейскія каштоўнасьці, нарасьціць сацыяльны капітал, рэфармаваць палітыку ды эканоміку. Тым часам, піша Сальчанык, “украінскія кіраўнікі надзіва ўвішныя ў стварэньні (між усяго іншага) абсалютна непатрэбных бюракратычных структураў. У мінулым жніўні прэзыдэнт Кучма стварыў Дзяржаўную раду па пытаньнях эўрапейскае і эўраатлянтычнае інтэграцыі, якая пачала “функцыянаваць” у студзені. Таксама ў студзені ён стварыў Нацыянальны цэнтар па пытаньнях эўраатлянтычнае інтэграцыі

Ўкраіны на чале з колішнім дарадцам па пытаньнях нацыянальнае бясьпекі Ўладзімерам Гарбуліным… Адзінае, чаго спадар Кучма і ўся палітычная кляса, усе ўкраінскія паэты, мастакі й песьняры так і ня здолелі стварыць, — гэта ўкраінская нацыя".
Не здымаючы тут віны з "паэтаў, мастакоў і песьняроў" (асабліва тых, якія калябаруюць з рэжымам), усё ж заўважым, што згаданая "палітычная кляса", уласна, і не намагалася стварыць нацыю. Наадварот, усе яе "дзяржаўніцкія" намаганьні былі і ёсьць скіраванымі найперш на тое, каб маса саўковых "падданых" так і ня сталася сучаснай украінскай нацыяй, то бок супольнасьцю сувэрэнных грамадзянаў. Бо такія грамадзяне могуць раптам згадаць, што якраз яны — а не прэзыдэнт, ня ўрад і нават не парлямэнт — зьяўляюцца вярхоўнаю крыніцай улады ў гэтай гарапашнай краіне. І тады збудзецца найстрашнейшы сон Шчарбіцкага, Краўчука, Кучмы і ўсяе іх палітычнае клясы: мэгапраект "спадкаемнасьці ўлады", які яны зьдзяйсьнялі цягам васьмідзесяці гадоў, нарэшце завершыцца.

Пераклаў з скаротамі з украінскай Андрэй Скурко
паводле часопісу «Критика», № 5-6/2003.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Багуслаў Бакула Польскія беды на эўрапейскім парозе

БАГУСЛАЎ БАКУЛА — публіцыст, літаратуразнаўца, спэцыялізуецца на літаратурнай кампаратывістыцы. Прафэсар Познанскага ўніверсытэту імя Адама Міцкевіча.

1

Апошняе дзесяцігодзьдзе мінулага стагодзьдзя стала пераломным для дзесяцігодзьдзем адроджанай Польшчы. Такія супадзеньні заўжды здаюцца занадта абцяжаранымі сымболікай. А насамрэч? Із сколькімі марамі за гэтыя апошнія дзесяць гадоў нам давялося разьвітацца, колькі каштоўнасьцяў — былі для нас усякую вартасьць? Чаго мы, урэшце, дасягнулі? Для пачатку варта разгледзець дзьве справаздачы — своеасаблівыя дасьледаваньня грамадзкай думкі, апублікаваныя ў «Gazecie Wyborczej» ліпені 1999 году: яны характарызуюць мінулае дзесяцігодзьдзе лепей, чым шматтомныя аналізы. Асабліва цікавыя і адказы на анкету, у якой рэспандэнтаў, не прапануючы ім ніякіх варыянтаў адказу, пыталіся, што зьмянілася да лепшага за апошнія дзесяць гадоў. Апытаныя паставілі на першае месца ліквідацыю камуністычнае эканомікі ў яе найгоршых праявах, кшталту карткавай сыстэмы, чэргаў, сындрому дэфіцыту і забесьпячэньня — 42% рэспандэнтаў. На другім месцы апынуліся свабода слова, вольная прэса, ліквідацыя цэнзуры — 21%. А на трэцім — палітычныя свабоды, зьмена ладу, шматпартыйная сыстэма і інш.; гэта адзначылі 17% апытаных.

Artykuł pierwotnie opublikowany w „Historia i Krytyka” (2000).
Пераклад зроблены з выданьня: Słowacki i potomnych. Antologia polskich sądów o poecie. Wybór i opracowanie Jerzy Fabianowski. Wrocław 2000.

Вынікі вельмі паказальныя. Яны сьведчаць, якое вялікае значэньне — празь дзесяць гадоў пасьля перамогі на выбарах 1989 году — надавалі палякі свабодзе культуры, палічыўшы пераўтварэньні ў гэтай сфэры важнейшымі за зьмену палітычнай сыстэмы, хоць, мімаходам адзначым, 21% — гэта толькі пятая частка ўсіх варыянтаў, пазначаных у анкеце. Між тым, факт, што вольная культура як асабліва важкая каштоўнасьць займае месца між эканомікай і зьменай палітычнага ладу, прымушае прыняць банальную, зрэшты, тэзу пра залежнасьць культуры ад эканомікі й палітыкі — але з характэрнай адметнасьцю. Гэтым разам не палітыка вызначае межы свабоды слова, а якраз апошняя забясьпечвае палітычныя свабоды. У адказах на проста пастаўленае пытаньне — ці варта было зьмяняць палітычны лад? — ня ўсе палякі былі аднадушныя. У сакавіку 1994 году дадатны адказ далі толькі 60%, а ў чэрвені 1999 году — 72%. Гэта пазытыўны вынік, аднак ён сьведчыць, між іншага, і пра тое, што вялікая частка польскага грамадзтва не была перакананая ў істотнай вартасьці зьменаў. Пашырыўшы вынікі анкетаваньня на ўсё грамадзтва, можна сказаць, што, гіпатэтычна, з 38 мільёнаў палякаў толькі 22 мільёны 800 тысячаў цалкам прынялі пераўтварэньні, тады як 15 мільёнаў 299 тысячаў маглі гэтых зьменаў не прыняць. Гэта, безумоўна, вялізная лічба. На канец дзесяцігодзьдзя адназначных прыхільнікаў трансфармацыі было 27 мільёнаў — гэта, відаць, варта зьвязваць з тым, што дасягнула паўналецьця пакаленьне, сфармаванае ўва ўмовах III Рэчы Паспалітай. Аднак незадаволеных было таксама багата — больш за 10 мільёнаў грамадзянаў. У гістарычным 1981 годзе гэтулькі сама сяброў налічвала аб'яднаньне «Салідарнасьць». Апошняе дзесяцігодзьдзе, большасьцю цалкам ухваленае, для многіх сталася руйнаваньнем асноваў ранейшага жыцьця, часьцяком зьнішчэньнем таго, у што яны верылі, дэстабілізацыяй, крахам звыклай мадэлі сьвету. Трансфармацыя зруйнавала адзін з самых укаранелых у грамадзкай сьвядомасьці мітаў камуністычнай прапаганды — міт пра сацыяльную і эканамічную роўнасьць усіх грамадзянаў, а разам з тым і перакананьне, што напрацаваны прыбытак зьяўляецца ўласнасьцю ўсяго народу, а ня толькі асобных палітычных і эканамічных групаў. Пасьля таго ў грамадзтве пашырылася перакананасьць, што прыхаваны перападзел

народнае ўласнасьці, зьдзейсьнены цягам апошніх дзесяці гадоў, — жахлівая несправядлівасьць, а часам нават сапраўднае рабаўніцтва, што адбывалася пад маркаю трансфармацыяў і ўва ўмовах недасканалага заканадаўства. Нават прапанаваную пры канцы дзесяцігодзьдзя салідарызацыю праз прыватызацыю нацыянальнае маёмасьці палічылі — парадокс! — чарговым несправядлівым перападзелам, што не задавальняе грамадзкіх спадзяваньняў.
Скінуўшы ў 1989 годзе патрыятычны “плашч Конрада” і выявіўшы пад ім толькі грамадзкую голь, латаную сьвіту, мы пабачылі, у якой бурапене жывём і на якую нянавісьць здатныя ў бітве за матэрыяльныя выгады ці крохі з Круглага стала, — мы, яшчэ так нядаўна згуртаваныя гераічным мітам «Салідарнасьці».

2

Мы жывём у постсацыялістычнай дэмакратыі, прыкметнай рысай якой зьяўляецца намэнклятурны капіталізм у эканоміцы і патэрналізм скарасьпелых палітычных групаў, якія самазадаволена завуць сябе “палітычнаю клясай” (гэтым марксісцкім слэнгам карыстаюцца нават непахісныя лібэралы) або “палітычнаю элітай”. Займаючы высокае месца ў грамадзкай гіерархіі, яны ня тое каб “служаць грамадзтву”, а хутчэй, кажучы жаргонам тых колаў, вядуць “палітычную гульню”. У гэтай рыторыцы адчуваецца нейкая адчужанасьць, асабліва калі ўлічыць, што большая частка тае “эліты” існуе ўсяго некалькі гадоў і яшчэ не забясьпечыла сабе стабільнай грамадзкай, ня кажучы ўжо пра культурна-асьветную, базы, традыцыі. Сёньня тут можна казаць пра “намэнклятурны элітарызм”, паколькі большасьць трапляе ў “палітычную клясу” дзякуючы не асабістым якасьцям або выдатнай дзейнасьці, але дзякуючы прыналежнасьці да пэўнай палітычнай групы, што апанавала частку ўлады і разьмяркоўвае гэтую ўладу між сваімі. Гены камуністычнага мінулага выяўляюцца тут мацнейшымі за дэмакратычныя ўборы, што дэманструюцца публіцы. Бо ня ўсё, з чаго складалася сапраўдная сутнасьць сацыялізму, адышло ў нябыт. Засталася пэўная групавая мэнтальная інэрцыя, засталіся карупцыя ды папулізм, дзеці сацыялістычнай дэмакратыі, рэфлекс дамаганьня прывілеяў грамадзкімі й прафэсійнымі групамі ўплыву, палітызацыя

прафсаюзаў, партыйнае сэктанцтва, заскарузлы цэнтралізм насуперак адміністрацыйнай рэформе. Няшмат было тых, хто стаў перад судом за палітычныя правіны, у тым ліку за цяжкія злачынствы супраць народу. Маладая дэмакратыя выявілася сістэмай, што бароніць разнастайных злачынцаў лепей, чым звычайных грамадзянаў.

За апошнія дзесяць з гакам гадоў цалкам зьмяшаліся відавочныя, здавалася б, значэньні, сьцерліся адрозьненьні, што вызначалі “who is who”. Лібэралізм, асабліва з польскім абліччам, з самага пачатку моцна патыхаў XIX стагодзьдзем і быў скіраваны хутчэй на атавізмы, барацьбу за побыт, чым на стварэньне разумнай канцэпцыі кіраваньня. Ён натыкаўся на рэшткавыя зьявы гаспадарчых інстытуцыяў, што йшлі каранямі ў сацыялістычную эканоміку. Лібэралы ды правыя прагнулі ўсталяваць кантроль над усім грамадзкім працэсам, а левыя перасталі бараніць звычайных грамадзянаў, ледзьве толькі ўчулі пах грошай. Тады левыя ўклалі няпісанае, парадаксальнае пагадненьне зь лібэраламі й манэтарыстамі. Вынікам яго зьяўляецца так званая фіскалізацыя польскай эканомікі — акцэнт цяпер робіцца на тэхнічных элемэнтах стрыманьня інфляцыі ды на ўтрыманьні неапраўдана высокіх падаткаў. Дзіўнае спалучэньне манэтарызму, псэўдалібэралізму і псэўдасацыялізму пражылі амаль усе палітычныя віхуры ў Польшчы. На яго аснове паўстаў сыстэмны гібрыд, што пры канцы дзесяцігодзьдзя выпрацаваў мэханізмы стварэньня моцных гаспадарчых і палітычных структураў — *намэнклятурная дэмакратыя*. Гэты ўнутрана супярэчлівы тэрмін я ўжываю для пазначэньня сыстэмных формаў, якія, базуючыся на аўтарытарнай фармацыі, набылі вонкавыя рысы дэмакратыі. Яны ўсё яшчэ захоўваюць пэўныя рысы сапраўднага сацыялізму ў эканоміцы, праве, сыстэме палітычных рашэньняў, а найбольш — у практыках уладных колаў.

Прыкметай польскіх палітыкаў, што ствараюць гэтую намэнклятурную рэальнасьць, асабліва выхадцаў з «Салідарнасьці», зьяўляецца шалёная, амаль хваравітая амбіцыйнасьць і няздольнасьць рацыянальна выкладаць свае ідэі, а тыповай праявай палітычнага жыцьця — звады, буры ў шклянцы вады, сутычкі, экстрэмізм. Тым часам камуністычная намэнклятура не абцяжарана рыторыкай

і практыкай узаемнага супрацьстаяньня — дысцыплінаваная, яна дзейнічае, ня маючы маральных амбіцыяў, у рамках праверанай сыстэмы сувязяў, хаваючыся ў банках і назіральных радах прыватных, дзяржаўных ды зьмяшаных карпарацыяў. Адзінай яе мэтаю зьяўляецца ўдасканаленьне сыстэмы намэнклятурнае прыватызацыі, што вядзе да адваёвы страчанай прасторы рэальнае ўлады для сябе й свайго найбліжэйшага палітычнага атачэньня. І адных, і другіх падточвае ракавая пухліна, народжаная паяднаньнем палітычнага капіталізму і карупцыі.

3

Слова “эліта” цяпер гучыць крыху двухсэнсоўна — раней так называлі людзей, якія належалі да кола камуністычнае ўлады, а пасьля 1989 году — капіталістаў-скорабагацькаў і прадстаўнікоў новапаўсталых палітычных груповак. Сапраўдныя інтэлектуальныя і духоўныя эліты заняпалі: яны альбо ня здолелі прыстасавацца да агрэсіўнага стылю палітычнага жыцьця, альбо папросту не прымаюць яго. З каго складаюцца новыя эліты? Што трэба зрабіць, каб апынуцца ў эліце? У якой эліце?

Камуністычная намэнклятура закамуфлявалася на розных узроўнях грамадзкага жыцьця, найбліжэй да гаспадарчага і банкаўскага сэктараў ды самакіраваньня. Гэтыя групы, як і новапаўсталыя палітычна-бізнэсовыя суполкі, кіруюць краінай. Па сутнасьці, элітарызм у эўрапейскім разуменьні — зьвязаны з прыналежнасьцю да высокай культурнай традыцыі, паходжаньнем і высокім узроўнем асьветы, што забясьпечвае магчымасьць значнага ўплыву на грамадзкае жыцьцё, — гэтым групам пакуль што не пагражае. Зрэшты, тое самае тычыцца і іншых групаў, што фармуюцца ў выніку дзейнасьці палітычна-фінансавага лобінгу — гэтую сыстэму празвалі “рэспублікай сваіх людзей”, — якому падпарадкоўваюцца тым ці іншым чынам усе палітычныя сілы ў Польшчы. Вось, напрыклад, кіраўнік ураду, што мае імідж прагматыка і прыхільніка прафэсіяналізму, на пасаду начальніка дзяржаўнае страхавое агенцыі прызначае невука, які ў зьзяньні юпітэраў збайдаваў гэтую скрайне неабходную сацыяльную інстытуцыю. Міністры зьмяняюцца, нібыта марыянэткі, з скандалам адыходзяць ад справаў скампрамэтаваныя. Урадавыя кааліцыі змушаныя

бараніць прывілеі палітычных партыяў. Грамадзтва здаецца неабавязковым, а часам і лішнім дадаткам да дзяржавы, што ўяўляецца выключна як групоўка палітычнай і эканамічнай намэнклятуры. Дзяржаўны бюджэт губляе мільёны дзякуючы "радаснай творчасьці" гэтых групаў. За памылкі даўно ўжо нікога не выклікаюць у суд, бо перад ім давялося б паставіць усю новую "Рэч Паспалітую".

Чаму ж дэмакратычнае вызваленьне мае такія сумныя наступствы, чаму новая сыстэма — моцна абапертая на старую — падгнівае? Адной з шматлікіх прычынаў зьяўляецца так званая "філязофія тлустае рыскі". Яна пазначае адмову судзіць людзей і групоўкі, што пасьля 1945 году калябаравалі з камуністамі, і забараняць ім дзейнічаць у новай сыстэме. Яна пазначае таксама перамешваньне старога ладу з новым. Вынікам іх суіснаваньня сталася выкарыстаньне спэцслужбаў для палітычнага шантажу, размываньне крытэраў маральнае ацэнкі асобы палітыка, прававы хаос, карупцыя, мафіёзнасьць, вялізныя эканамічныя страты. Няўзброеным вокам відаць, чым скончыцца тое сьціраньне мяжы між дабром і злом: у палітыцы, у мэдыях, на вуліцы. Вось яно, узьдзеяньне ўкарэненага ў сьвядомасьці многіх палітычных групаў і асобных палітыкаў маральнага рэлятывізму.

Пад прыкрыцьцём практыкі "тлустае рыскі" намэнклятура перафармавалася і сфармавала групы, што прадстаўляюць яе ўва ўладзе Рэчы Паспалітай, групы, якія цяпер называюць "элітамі". На ўскрайку гэтае фармацыі існуюць палітычныя групкі, што выйшлі з «Салідарнасьці», — часта яны пераймаюць манеру вядзеньня гульні, а часам нават стыль мысьленьня, характэрны для польскага палітыкуму, ці то намэнклятурнага капіталізму. Зрэшты, сёньня частка апазыцыйнае эліты 70—80-х гадоў ня толькі адкрыта супрацоўнічае з посткамуністычнай намэнклятурай, але нават усталёўвае зь ёй цесныя таварыскія адносіны, заціраючы тым самым прынцыповыя гістарычныя падзелы, цудоўна легітымізуе посткамуністычную ўладу на маральным узроўні.

У абсягу палітычнае ўлады Польшча выразна падзяляецца на Варшаву і ўсё астатняе. Варшава, як цэнтар мэнэджмэнту і кіраваньня, вядзе палітыку нэгатыўнае сэлекцыі кадраў. Толькі на першы погляд няясна, чаму ўладныя групы, праводзячы рэформы, пасьля 1989 году не стварылі (калі

ў гэтым была вострая гістарычная неабходнасьць) некалькі цэнтраў, дзе рыхтавалі б высакаклясных мэнэджэраў. Гэтыя групы найперш зацікаўленыя ў замацаваньні вынікаў падзелу здабычы і зусім ня хочуць аддаваць кавалак улады камусьці, хто не належыць да сыстэмы, што ўжо крышталізавалася. Ні для кога не сакрэт, што частку ўлады хапанулі сямейныя кланы, і яна перадаецца ад бацькі да сына, ад маці да дачкі ці яшчэ неяк гэнак. Маладое пакаленьне “эліты” гойсае па варшаўскіх і ўжо эўрапейскіх салёнах, чаруе публіку ў тэлеперадачах, рыхтуючыся да наступнага скоку ў будучыню. Яно пачуваецца цалкам бясьпечна, бо мае за плячыма густую сетку сувязяў; каб арыентавацца ўва ўсім гэтым, патрэбныя ня столькі паліталягічныя веды, колькі абазнанасьць у камуністычнай la belle époque, інфармаванасьць у пытаньні эканамічных сувязяў, а таксама здольнасьць функцыянаваць у лябірынце назіральных радаў, агенцыяў, фундацыяў і камітэтаў. Большая частка грамадзтва не разумее і не ўспрымае драпежніцкае мадэлі, якую стварылі польскія лібэралы й камуністы на прынцыпе “хто дужэйшы, той і мае рацыю”. Маруднасьць пераменаў у нас тлумачыцца супрацівам грамадзтва, а гэты супраціў — беднасьцю й неадукаванасьцю. Абедзьве зьявы ёсьць вынікам знаходжаньня пры ўладзе пасьля 1989 году палітычных групаў, што цалкам адчужаныя ад жыцьця найбяднейшых слаёў грамадзтва, але пасьпяхова маніпулююць страхамі і надзеямі палякаў, валодаючы такім моцным сродкам узьдзеяньня, як тэлебачаньне.

Думаю, гэтая сытуацыя ўплывае ня толькі на звычайнага грамадзяніна, які пачуваецца нічога ня вартай пешкай па-за шахматнай дошкай палітычнай і эканамічнай гульні. Яна адбіваецца і на сьвядомасьці польскай культуры, на жыцьці вышэйшай школы, на стане сярэдняй і пачатковай школы. Яна ўплывае на якасьць польскага мастацтва. Ужо няма традыцыйнага для яго кірунку, засяроджанага на сацыяльнай праблематыцы — кіно маральнага непакою. Маралісцкую паэзію цішком высьмейваюць за сувязь зь нібыта непатрэбным эпосе гвалтоўнай мадэрнізацыі кансэрватыўным павучаньнем, падсалоджаным сыропам салідарнасьці. Можна нават згадаць, калі менавіта пачалася гэтая эпоха — ад вельмі знамянальнага фільму «Сабакі» (1992) Уладзімежа Пасікоўскага і ад “кар’еры”

зьвязаных з гэтым фільмам палітычных і культурных зьяваў. Назавем іх, паводле Альжбеты Маравец, “люмпэн-пралетарскай мастацкай сьвядомасьцю”.
Вядома, тое, што эліты ня могуць кіраваць краінай, а большасьць грамадзянаў — людзі бяз волі, яшчэ не азначае, што ўсё ўжо зусім дрэнна. Паўзучай інэрцыі сыстэмы супрацьстаяць розум і энэргія польскай інтэлігенцыі. Менавіта дзякуючы апошняй можна было гаварыць пра посьпех і нават пра польскі шлях да капіталізму. Але цяпер гэтага ўжо замала. Адолець адрыў ад Заходняй Эўропы можа толькі інтэлігент, што разумее працэсы заходняе эканомікі, ведае замежныя мовы, арыентуецца ў палітычных мэханізмах, структурных асаблівасьцях эўрапейскіх і сусьветных гандлю і права. Новая постаць у нашым грамадзкім пэйзажы — магчыма, больш жорсткая, менш зацыкленая на тэме нешчасьлівай долі бацькаўшчыны, рашуча скіраваная ўперад.
Сэктар дзяржаўных прадпрыемстваў дагэтуль застаецца асноўнаю сфэрай эканомікі. Такім чынам, мы, як і раней, сядзім у напаўкамуністычнай сыстэме з усімі створанымі гэтым гібрыдам эканамічнымі, сацыяльнымі, палітычнымі й культурнымі ўмовамі. Яны выклікалі да жыцьця агідную злаякасную пухліну — усяўладную карупцыю. Капіталізм паўстаў у Польшчы як вынік прысабечаньня большай часткі нацыянальнага багацьця колішняй сацыялістычнай намэнклятурай, што ўжо не патрабуе ніякай уяўнай палітычнай улады, затое мае рэальную ўладу, распараджаючыся грашыма ў банках, засядаючы ў канцэрнах ды назіральных радах.

4

Атрыбутамі дэмакратыі, на якія палякі ўскладалі найбольшыя спадзяваньні напярэдадні зьмены ладу, быў сойм, фармаваны шляхам свабодных выбараў, што рэпрэзэнтуе свабоду самавызначэньня народу; упаўнаважаны па грамадзянскіх правох, што мусіць абараняць фундамэнтальныя прынцыпы свабоды чалавека; а таксама прэзыдэнт, што ад імя ўсіх нас прамаўляе да сусьветнай супольнасьці. Цягам апошніх дзесяці гадоў гэтыя сымбалі свабоды, на якіх з гонарам пісалася слова «Салідарнасьць», выявіліся вельмі й вельмі неадназначнымі. Пераломнае дзесяцігодзьдзе сваёй апошняй грымасай паказвае нам гамбровічаўскую міну, дэмаскуе нашае “апупеньне”,

нясталасьць. Дэмакратычныя інстытуцыі ахопленыя зьмястоўнаю пустэчай, яны дэманструюць выключна фармальны мэханізм свайго функцыянаваньня, іх перасталі атаясамліваць з каштоўнасьцямі, якія калісьці былі закладзеныя ў падмурак гэтых інстытуцыяў.
На пачатку мінулага дзесяцігодзьдзя візытоўкай польскай нованароджанай дэмакратыі стаўся нечуваны раней фэномэн — упаўнаважаны па грамадзянскіх правох. Пакуль справаю апекавалася прафэсарка Эва Лэнтоўска зь яе велізарным шармам і дарам пераканаьня, грамадзянскія правы былі ўлюбёнай тэмаю на тэлебачаньні, і ўсе мелі ад гэтага безумоўную карысьць. У сярэдзіне дзесяцігодзьдзя іншы ўпаўнаважаны, распачаўшы змаганьне за прэзыдэнцкую пасаду, імгненна занядбаў свае абавязкі, пасьпеўшы, аднак, выказваньнем сваіх палітычных поглядаў кінуць цень на ўсю інстытуцыю, якой шмат хто цалкам давяраў. Ягоны наступнік у такіх абставінах мог зрабіць толькі адно — зьнікнуць з мэдыяў і заняцца выключна назіраньнем за парушэньнямі грамадзянскіх правоў у Польшчы. Цяпер ён, нарэшце, дбаў пра свае прафэсійныя абавязкі, а не пра будучую палітычную кар'еру, але рабіў гэта так пасьпяхова, што грамадзкая думка пазбылася штодзённае інфармацыі пра дзейнасьць гэтае ўстановы. Такім чынам, інстытуцыя, якая мусіла выконваць важную маральную ролю ў адроджанай дзяржаве, зрабілася яшчэ адным хадатайнікам.
Польскі парлямэнт распачаў сваю гістарычную дзейнасьць у атмасфэры грамадзкае эўфарыі. Гэты "дамоўны", як яго называюць, сойм зрабіў магчымым правядзеньне хаатычнай лібэральнай гаспадарчай рэформы, але адначасова пад яго прыкрыцьцём павырасталі зубы намэнклятурнае дэмакратыі й сфармаваўся так званы палітычны капіталізм. Пры канцы дзесяцігодзьдзя прэса выкрыла безьліч скандальных фактаў карупцыі. Мэдыі ды хто-ніхто з парлямэнтароў сьцьвярджаюць, што ў польскім сойме за мільён даляраў можна купіць закон. На сёньня сойм зьяўляецца польскай палітычнай праблемай нумар адзін. Ня маючы народнага даверу, ён ня можа плённа функцыянаваць. Адкрыта гаворыцца пра недарэчнасьць сэнату — інстытуцыі, што кантралюе дзейнасьць сойму — пра фатальны парадак галасаваньня, які перадусім служыць інтарэсам некалькіх найбольшых партыяў, адкрываючы ім

дарогу да карупцыйных адносінаў.
У першыя гады польскае незалежнасьці самай непапулярнай асобай быў прэзыдэнт. У канцы дзесяцігодзьдзя прэзыдэнт зрабіўся самай папулярнай асобай. Вядома, ня той самы. Абодва дзяржаўныя мужы, якія, згодна з вынікамі апытаньняў, “найбольш паўплывалі на палітыку ў апошнім дзесяцігодзьдзі”, зьяўляюцца ўзорамі двух тыповых прадуктаў ПНР. Першы — рабоча-сялянскае клясы, якая выйшла на першы плян дзякуючы сацыялістычнай індустрыялізацыі ды час ад часу бунтавалася, узрушаючы сыстэму і прымушаючы яе зьмяняцца. Другі — прадстаўнік дробнага мяшчанства, розныя інтэлігенцкія ўломкі якога запаланілі партыйныя камітэты, арганізацыі, інстытуты, асьветныя ўстановы, зрабіўшыся таксама асноваю тонкай, але заўважнай праслойкі дробных бізнэсоўцаў. Дробнамяшчанскі слой — грамадзкая база Польскай аб’яднанай рабочай партыі — у 70—80-я гады стварыла ў ПНР даміноўны тып культуры. Гэтыя дзьве грамадзкія клясы не заўжды дзейнічалі ў згодзе, але вызначальна паўплывалі на найноўшую гісторыю. Рабоча-сялянская, дарма што пад яе штандарамі пачыналіся перамены, зазнала відавочную паразу адначасова з асабістай палітычнай няўдачай колішняга лідэра «Салідарнасьці». Ён ня змог утрымаць і павялічыць эканамічныя ды грамадзкія прывілеі — наадварот, страціў амаль усё, што меў дагэтуль, да чаго добра спрычыніліся прафсаюзнае аб’яднаньне «Салідарнасьць» і створаныя на яго аснове сойм ды ўрад. Рыторыка была яшчэ прафсаюзьніцкай, пра абарону “народных інтарэсаў”, але практыка мусіла сутыкнуць грамадзкія чаканьні з гістарычным заданьнем стварэньня капіталістычнай эканомікі. «Салідарнасьць» не змагла таксама спарадзіць лідэра, што меў бы шырокую грамадзкую падтрымку і быў бы здатны ўлагодзіць амбіцыі ды ўзаемныя рахункі меншых правадыроў. І сёньня яна плаціць за гэта стратаю даверу большасьці палякаў.
Прадстаўнік посткамуністычнае партыі ня меў такіх праблемаў. Пасьля развалу ПАРП ён годна вытрымаў ролю рэфарматара польскае лявіцы, якога крыўдзяць агрэсіўныя і непамяркоўныя правыя. У тым, што ён быў ані вельмі чыстым у палітычным сэнсе, ані дасканалым маральна, таксама была свая мудрасьць: ці хто з нас можа пахваліцца тым, што зьяўляецца ідэальным узорам для іншых? Заўважныя хібы гэтага палітыка —

лёзунгавая пальшчызна, што часам патыхала партыйным стылем мяжы 80—90-х гадоў, палітычныя праколы і недатрыманьне добрага тону — хоць і высьвечваюць ягонае палітычнае карэньне, але аказваюцца больш зразумелымі й даравальнымі за мэтафарычна фармуляваныя велічныя канцэпцыі ды рэзкасьць яго найбольшага ў першай палове дзесяцігодзьдзя канкурэнта родам з «Салідарнасьці».
Бо намэнклятурнік прэзэнтуе гладкі, неакрэсьлены дробнамяшчанскі стыль культуры, што так выяўна характарызуе Саюз левых дэмакратаў (СЛД) і выклікае сымпатыю ў мільёнаў прамысловых і сельскіх працаўнікоў, а таксама ў той часткі інтэлігенцыі, якая дасягнула грамадзкага посьпеху за камуністамі.

Паразу Леха Валэнсы выклікала памылковае, хоць і гераічнае рашэньне раскалоць, не зважаючы на крыкі знэрваванага электарату і палітычнай базы, штучны фронт «Салідарнасьці», каб зьявіліся ўмовы для стварэньня мноства партыяў ды арганізацыяў некамуністычнага характару, выклікаць творчае напружаньне. Валэнса паводзіўся нязграбна, сьмяшыў, абураў, правакаваў непрыязную рэакцыю, аднак дасягаў сваёй мэты. Прымушаў дзейнічаць, піхаў наперад нават тых дзеячоў жніўня-80, якія асабіста яго ненавідзелі. Рабіў гэта коштам сваёй палітычнай кар'еры.
Канкурэнт-пераможца ўмела выкарыстоўваў узыходныя паветраныя плыні. Не падымаўся вышэй за ўзровень, ухвалены таварышамі, каб забясьпечыць сабе трывалую палітычную базу. Ён быў іх закладнікам і адначасова палітычнай візытоўкаю. Першы яго тэрмін характарызуецца поўнай адсутнасьцю заканадаўчай дзейнасьці. Затое ён пасьпяхова блякаваў рэформы там, дзе яны маглі мець відавочны посьпех і актывізаваць прыхільнікаў палітычнае канкурэнцыі. Выявілася, што польскае грамадзтва не адпавядае хрэстаматыйным і тэарэтычным уяўленьням пра трансфармацыю. Яно прагне не рэвалюцыі, а эвалюцыйных зьменаў, што ня цалкам адмаўляюць ПНР. З пункту гледжаньня грамадзкае псыхалёгіі гэта цалкам зразумела. Тыя, хто гэтага не засвоіў, і надалей будуць зазнаваць паразы.
Наш самы папулярны палітык амаль без супярэчнасьцяў умее паяднаць рысы посттаталітарнай намэнклятурнай дэмакратыі

ды культуры з новымі ідэямі. Ён узорна ўвасабляе ідэю пра моц ПНР у польскай сьвядомасьці, пра значнасьць намэнклятуры ў грамадзка-палітычнай сыстэме III Рэчы Паспалітай, а таксама пра грамадзкія сымпатыі да таго коніка, якога гэтая намэнклятура — за нашыя грошы — выкінула на пачатку мінулага дзесяцігодзьдзя. Яго добразычлівы патэрналізм выгадна адрозьніваецца ад гістэрычнага стылю многіх правых палітыкаў, хаваючы пад сабой лібэральную драпежнасьць і амбіцыі.

Пераможца прэзыдэнцкіх выбараў 2000 году і яго атачэньне — гэта і ёсьць падмурак “тлустае рыскі”. Але адказваць за “рыску” мусяць і людзі з процілеглага боку. Тыя, што некалі зьдзейсьнілі гістарычныя трансфармацыі й дазволілі бяскарна трансфармавацца намэнклятуры. Пэўна, усе палякі.

У сярэдзіне другога тэрміну прэзыдэнт пачынае разбудоўваць сваю палітычную пазыцыю ў двух новых кірунках, выклікаючы занепакоенасьць сваёй ранейшай палітычнай базы. Ён узмацняе міжнародны імідж, выразна даючы зразумець, што ахвотна заняў бы якоесьці годнае месца ў структурах NATO, Эўрапейскага Зьвязу, — і вось ужо чуюцца развагі пра яго шанцы зрабіцца генэральным сакратаром NATO. Калі б такое сапраўды адбылося, гэта быў бы посьпех і асабіста Квасьнеўскага як палітыка, і Польшчы. Цалкам неспадзяваным зьяўляецца другі кірунак. Усё выразьней вымалёўваецца поле канфлікту Квасьнеўскага з кансэрватыўным крылом СЛД. Урэшце гэта можа нават скончыцца ўтварэньнем новай палітычнай фармацыі на чале з Квасьнеўскім, здольнай згуртаваць рэфарматарскія плыні ў СЛД з плынямі памяркоўнымі, сацыял-дэмакратычнымі, у якія ўвайшлі б сябры Уніі Свабоды, што цяпер зусім страціла ўплыў, хоць у свой час была падмуркам польскай трансфармацыі. Посьпех гэтай ініцыятывы залежыць ад таго, у якой меры Квасьнеўскі здолее пазбыцца свайго апаратніцкага іміджу і выявіцца палітыкам эўрапейскага фармату. Суархітэктарам гэтага заплянаванага хаўрусу зьяўляецца колішні дысыдэнт Адам Міхнік, адзін зь лідэраў апазыцыі 70—80-х гадоў, а цяпер — галоўны рэдактар самага масавага штодзённага выданьня «Gazeta Wyborcza». Гэтыя палітыкі прылюдна дэманструюць сваю ўзаемную сымпатыю, гартуюцца ў агні скандальнае справы, зьвязанай з барацьбой за дамінаваньне на польскім рынку мас-

мэдыяў, асабліва тэлебачаньня. Найбольшая штодзённая газэта Польшчы і тэлестанцыя, за валоданьне якой змагаецца група Міхніка, разам з палітычным уплывам Квасьнеўскага ствараюць істотную пагрозу для манаполіі СЛД.

5

У 2001 годзе скончыўся важны пэрыяд у сучаснай гісторыі Польшчы: можна казаць пра пахаваньне палітычнай канструкцыі «Выбарчая Акцыя Салідарнасьць» («АВС») і пра адмову польскага грамадзтва ад канцэпцыі зьменаў, прапанаваных правымі й партыямі, вытворнымі ад «Салідарнасьці». Сумным завяршэньнем гэтага пэрыяду сталіся тры падзеі, што ў выніку склаліся ў вобраз, поўны цёмных фарбаў і атмасфэры няпэўнасьці.

Першая — гэта згадка ў кнізе Яна Гроса «Суседзі» гісторыі мястэчка Ядвабнае, дзе жыхары-палякі вынішчылі сваіх суседзяў-жыдоў. Дыскусія вакол гэтай кніжкі сталася сымбалем зьменаў, што адбываюцца ў польскай мадэлі нацыянальнай ідэнтычнасьці і ў гістарычнай сьвядомасьці палякаў. Палякі пасьля доўгай дыскусіі й адмаўленьняў, што даносіліся пераважна з асяродзьдзя правіцы, узялі на сваё сумленьне цяжар ядвабенскай трагедыі. Тым самым наважыліся на балючы, але крайне неабходны акт замены ранейшай гераічна-мартыралягічнай парадыгмы, што складала самую сутнасьць ідэалізаванае нацыянальнае ідэнтычнасьці. Эмацыйную ідэалізацыю паволі замяняе адважнае, хоць і балючае, усьведамленьне невідавочнага, неадназначнага досьведу, у якім палякі не былі толькі ахвярамі камунізму ці фашызму. Рахунак калектыўнага сумленьня ад гэтага моманту зрабіўся даўжэйшым, але яно мае цяпер на адзін грэх забыцьця менеў. За пэрыяд ад 1989 году, ад пачатку пераўтварэньняў у краінах Усходняй Эўропы, гэты крок можна лічыць самым адважным. Ахвотных паўтарыць яго сярод суседзяў Польшчы пакуль што не відаць.

Стыхійныя бедзтвы, дагэтуль бачаныя толькі ў тэлевізары, сталіся для Польшчы новым грамадзкім досьведам 90-х гадоў. Паводкі выклікалі эканамічную крызу, якую паглыбіла гаспадарчая няздатнасьць уладных элітаў, але выявілі таксама нечуваную згуртаванасьць палякаў перад пагрозаю небясьпекі. Можна сказаць, што польскае грамадзтва, падзеленае

палітыкамі й трансфармацыяй, зноў, як заўжды, яднала бяда. Трэцяй важнай падзеяй сталася параза правых і кампрамэтацыя палітыкі ўраду «АВС» на выбарах у верасьні 2001 году. Польскае грамадзтва, заўжды салідарнае ў сытуацыях небясьпекі, адвярнулася цяпер ад «Салідарнасьці», дагэтуль найбольшай рэфарматарскай сілы. Урадавую кааліцыю «АВС», што, праводзячы складаныя рэформы, вяла Польшчу празь цяжкі пэрыяд зьменаў, пакаралі поўным выцясьненьнем на палітычны край. Гэта сьведчыць, што нічога вечнага не бывае, што б ні думалі польскія палітыкі наконт гэтага.
Варта, аднак, адзначыць рашучасьць рэформаў, распачатых у 1998 годзе «АВС». Гэта ўсё ж былі захады, скіраваныя ў XXI стагодзьдзе. Яны не ўдаліся, аднак ідэяў, лепшых, чым тагачасныя рэформа адміністрацыйнага падзелу, рэформы сыстэмаў асьветы, аховы здароўя і сацыяльнае абароны, няма і сёньня. Палітычная смута, выкліканая правымі, зачапіла ня толькі іх саміх, ледзьве ня зьнішчыўшы ўшчэнт колькі груповак, але ўдарыла і па самаадчуваньні ўсяго грамадзтва, якое да выбараў у верасьні 2001 году падыходзіла моцна абцяжаранае нявырашанымі грамадзкімі й эканамічнымі праблемамі ды зь сьлядамі траўмаў у такой далікатнай сфэры, як калектыўная ідэнтычнасьць.

6

Слабасьць «АВС» і папулізм камуністаў, якія любой цаной рваліся да ўлады, падахвоцілі іншыя групоўкі да беспрэцэдэнтнай перадвыбарнай рыторыкі. Значную падтрымку, апроч Саюзу левых дэмакратаў, забясьпечыла сабе «Самаабарона» — партыя, што йшла пад надзвычай рэтраграднымі, антыэўрапейскімі, папулісцкімі лёзунгамі. Іх лідэр Анджэй Лепэр, які ня раз даводзіў, што супраць яго закон бясьсільны, ледзь не дасягнуў, паводле колькасьці набраных галасоў, месца другога палітыка ў Польшчы пасьля прэзыдэнта. Ён ненадоўга атрымаў пасаду віцэ-маршалка сойму, здабыў значную папулярнасьць у мэдыях, але ўсё згубіў праз прымітыўныя палітычныя скандалы.
Посьпех посткамуністаў і адыход у нябыт «АВС» і Уніі Свабоды для Польшчы значылі адкладаньне на потым найважнейшых рашэньняў. Посткамуністы, вядома, у барацьбе за ўладу ня маюць сабе роўных. Аднак, выяўляецца, здабыўшы яе, ня

ведаюць, што зь ёй рабіць. Таму краіну ахоплівае хваляваньне, як у 1993—1999 гадох, а ўлада стварае бачнасьць дзейнасьці, згортваючы ўжо запушчаныя палітычныя і гаспадарчыя працэсы, узмацняе ролю дзяржавы, што выклікае павелічэньне падаткаў, фарсуе экстэнсіўнае эканамічнае разьвіцьцё.
Разам з выхадам на палітычную сцэну «Самаабароны» ажылі варожыя культуры, эўрапеізацыі, лібэралізму антыінтэлігенцкія настроі. Выбары-2001 былі катаклізмам, што агаліў бяздарнасьць палітычных элітаў, іх залежнасьць ад вялікага капіталу, нястачу харызматычных лідэраў, страх і нежаданьне грамадзтва браць удзел у прапанаванай партыямі палітычнай гульні.

7

Часта даводзіцца чуць думку, што першыя гады трэцяга тысячагодзьдзя былі для Польшчы часам страчаных ілюзіяў амаль ува ўсіх сфэрах грамадзкага жыцьця. Пэрыяд гэты адзначаны бюджэтным крызысам ды зьніжэньнем тэмпу прыросту вытворчасьці да аднаго працэнту, хаосам у асьвеце і распадам культуры, зьяўленьнем трохмільённай арміі беспрацоўных, урэшце, палітычным заняпадам пажнівеньскай кааліцыі, што кіравала ў 1997—2001 гадох.
Нястомна крытыкуючы папярэднікаў, малюючы чорны сцэнар разьвіцьця падзеяў у эканоміцы, посткамуністы ледзьве ня выклікалі ў грамадзтве паніку. Яны заблякавалі рэформу школьніцтва, якая ўтварыла хаос у асьветнай палітыцы, што й без таго кульгала, аддалі кантроль за польскімі нафтавымі трубаправодамі даўнім контрагентам Расеі й карэнным чынам зьмянілі сыстэму грамадзкіх службаў: цяпер урадавая адміністрацыя цалкам залежыць ад палітычных рашэньняў і намагаецца абмежаваць сувэрэннасьць адзінай незалежнай ад іх структуры — Рады фінансавай палітыкі. У сфэры грамадзкіх каштоўнасьцяў, насуперак ачышчальнай ядвабенскай кампаніі, назіраецца дэградацыя этасу «Салідарнасьці». Відаць, хтосьці з колішніх лідэраў апазыцыі, сёньня заможных і надзвычайна ўплывовых, лічыць магчымым братацца з колішнімі апаратчыкамі й прыцясьняльнікамі. Цягам некалькіх апошніх гадоў у краіне вядзецца спрэчка пра ацэнку камуністычнай Польшчы і пра ролю, якую ў ёй выконвалі некаторыя сёньняшнія ўплывовыя асобы. Посткамуністы закансэрвавалі

мінулае, увёўшы пэўныя папраўкі ў закон пра люстрацыю, і ў найбліжэйшыя гады тут наўрад ці ўдасца штосьці зьмяніць. З палітычнага пункту гледжаньня Польшча здаецца згусткам цалкам супярэчлівых, процілеглых тэндэнцыяў. Посткамуністы перамаглі на выбарах, здабыўшы трохі больш за 40% галасоў, пры тым, што ўсяго галасавала каля сарака адсоткаў выбарцаў. Большасьць, што пратэставала маўчаньнем, надалей робіцца непрадказальнай сілаю, якой улада панічна баіцца, асабліва, калі адбываюцца такія падзеі, як рэфэрэндум пра ўваход у Эўрапейскі Зьвяз.

8

Становішча культуры на парозе XXI стагодзьдзя зьяўляецца досыць дзіўным. Штодзённая прэса, каляровыя выданьні й штомесячнікі, за выняткам некалькіх назоваў, належаць іншаземцам. Польшчу залівае велічэзная хваля літаратурнай папсы. Шалёны рост цэнаў на кніжкі выклікаў ня менш хуткае зьніжэньне чытацкае актыўнасьці, заняпад бібліятэкаў; насельніцтва купляе ў некалькі разоў меней кніжак, чым у камуністычныя часы, хоць выбар папросту ўражвае. Усё ж Польшча па-ранейшаму застаецца найбольшым кніжным рынкам ува Ўсходняй Эўропе.

Выразна заўважная палярызацыя інтэлектуальных элітаў: іхная разьяднанасьць, абмежаваньне выключна службовымі функцыямі, заняпад інтэлігенцкіх групаў — галоўнага спажыўца культурных дабротаў.

Інтэлігенты ўжо ня хочуць быць інтэлігентамі, бо гэтая грамадзкая група сёньня страціла свой колішні прэстыж, а традыцыя, здаецца, болей шкодзіць, чым дапамагае. Частка інтэлектуальных элітаў перастала займацца нацыянальнай культураю, бо бачыць у ёй толькі лішні баляст. Затое ўвайшлі ў моду постмадэрнізм, дэканструкцыя і г.д. Тут гадуецца своеасаблівы адчужаны амэрыканізм над Віслай. Самыя масавыя духоўныя патрэбы зьведзеныя ў Польшчы да банальнае забаўкі; «Гары Потэр» задавальняе значна лепш, чым «Пан Тадэвуш». Але, нягледзячы на гэта, характэрнай рысаю сучаснае польскае культуры зьяўляецца асьветны бум, зьяўленьне сотняў новых дзяржаўных і прыватных ВНУ і — як вынік — заўважны няўзброеным вокам прагрэс тысячаў маладзёнаў, што гавораць на замежных мовах, вандруюць па

сьвеце, едуць на Захад па яшчэ лепшую адукацыю. Гэтая армія павінна зьмяніць сваю краіну і напэўна гэта зробіць.

9

Палякі апынуліся ў ціскach нялёгкіх праблемаў. Яны хочуць у Эўропу, але коштам, нашмат меншым за той, што выстаўляе Брусэль. Патрабаваньні Эўрапейскага Зьвязу б'юць па нацыянальных амбіцыях, паказваючы, як далёка Польшчы нават да слабаразьвітых сяброў супольнасьці. Яна малая, бедная, несамастойная краіна зь вялізнай унутранай запазычанасьцю. Беднасьць і невялікія (прынамсі, у найбліжэйшы час) шанцы яе адолець робяцца аргумэнтам на карысьць самаізаляцыі. Некаторым прасьцей занурыцца ў нацыянальны аўтызм, высьвятляць пытаньне вышэйшасьці этнічнага чыньніку ў адносінах да падазронае глябалізацыі, страшыць нямецкай, расейскай, амэрыканскай, эўрапейскай пагрозай, чым брацца за рэфармаваньне эканомікі, за аднаўленьне заскарузлага нацыянальнага канону, за закладаньне новых падвалінаў культуры. На фоне эўрапейскага рацыяналізму падаецца, што некаторыя праявы польскіх калектыўных паводзінаў прывандравалі з ранейшых эпохаў — асабліва каталіцкая рэлігійнасьць, збудаваная на прынцыпах нэапаганскага, па сутнасьці, «Радыё Марыя» (радыёстанцыя, што трансьлюе рэлігійны, псэўдамэтафізычны сэканд-генд, абаперты на нацыяналізм, народную рэлігійнасьць і фрустрацыйныя настроі грамадзтва). Многія палякі (каля 40%) не жадаюць мець грамадзянства ў аб'яднанай Эўропе — магчыма, пабойваюцца страціць толькі-толькі здабытую сувэрэннасьць. Правыя групоўкі, разам з часткай касьцёлу, баючыся страціць свой уплыў пасьля далучэньня да эўрапейскай супольнасьці, выкарыстоўваюць гэты патрыятычна-аўтысцкі комплекс, спароджаны пачуцьцём непаўнавартасьці, эканамічнай боязьзю, недахопам адукацыі, няведаньнем замежных моваў, расчараваньнем у кіраўнічых групах, што вырашаюць лёс краіны.

Час, аднак, патрабуе іншага. Сьвету пагражае нацыяналізм, эгаізм нацыяў, што валодаюць запасамі сыравіны, тэрарызм, экалягічныя бедзтвы. Малыя нацыі Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы ўжо ня змогуць спадзявацца на вялікіх гэтага сьвету. Яны мусяць перастаць марыць пра веліч і дабрабыт, што ім

належаць у якасьці маральнай кампэнсацыі. Надышоў час цяжкай працы. А дэнацыяналізацыя ні ў Заходняй, ні ўва Ўсходняй Эўропе не пагражае нікому, хто сам гэтага не захоча. Між 1791-м і 2001-м гадамі Польшча была сувэрэннай толькі трыццаць гадоў. Да слабасьці дзяржаўніцкіх традыцыяў дадаецца дзейнасьць шматлікіх палітычных групаў, зь якой добра бачная іх ступень адданасьці дзяржаве, яе пэўнай каштоўнасьці. Польскія “эліты” бяз жалю пагаджаюцца на абмежаваньне польскага сувэрэнітэту ў абмен на мандат, што дазволіць швэндацца па эўрапейскіх салёнах, і на датацыі, што часткова зьменшаць адказнасьць за стан эканомікі. Для пэўных палітычных групаў эўрапейская супольнасьць зьяўляецца раем новых магчымасьцяў, для звычайнага паляка — невядомым і небясьпечным клопатам. Бо нацыянальны патрыятызм — гэта адно, а ўменьне кіраваць уласнай будучыняй і, урэшце, дзяржавай — зусім іншае. Палякам нашмат лепей удаецца вэрбальны патрыятызм, апазыцыя, гуртаваньне ў надзвычайных сытуацыях. У той самы час палякі ахвотна скардзяцца на ўласную дзяржаву ў эўрапейскі суд, ня вераць у мясцовую юстыцыю. Дзяржаву як найвышэйшую нацыянальную і грамадзкую каштоўнасьць сёньняшнія палякі ацэньваюць скептычна — што не адмаўляе нацыяналізму, патрыятызму, моцнае прывязанасьці да нацыянальнае сымболікі. Вырашыць гэтую супярэчнасьць нібыта можа дэмакратычны багаты Эўрапейскі Зьвяз: ён усталюе арганізацыйныя рамкі, змусіць працаваць адміністрацыю, акрэсьліць правы, адначасова дазваляючы махаць нацыянальным штандарам, праяўляць сувэрэннасьць, даплачваць сялянам, рабочым, лекарам, настаўнікам, аптэкарам… Штосьці возьме, штосьці адбярэ… Зрэшты, да канца невядома, што менавіта… паколькі грамадзтва не да канца праінфармаванае пра дэталі перамоваў. Праэўрапейскасьць і эўраскептыцызм утвараюць у грамадзкай сьвядомасьці палякаў канглямэрат, зь якога пакуль што не паўстае ніякай трывалай, вызначальнай тэндэнцыі. Здаецца, у 2004—2005 гадох Польшча стане-такі сябрам ЭЗ. Яе чакаюць цяжкія выпрабаваньні і вялізная праца. Найперш краіна мусіць прайсьці этап унутранае самаправеркі — нацыянальны рэфэрэндум па гэтым пытаньні. Сёньня за ўваход у Зьвяз выказаліся 60% грамадзянаў. Амаль столькі сама грамадзянаў прагаласавалі ў 1989 годзе за зьмену грамадзкага

ладу. Такім чынам, каля 15 мільёнаў грамадзянаў абыякавыя або выказваюцца супраць — такая колькасьць эўраскептыкаў можа выклікаць сур'ёзныя грамадзкія канфлікты ды перанесьці іх у Эўразьвяз. У Брусэлі гэта разумеюць. Адначасова ўзрастаюць унутраныя канфлікты ў партыі ўлады, а таксама дыстанцыя між ёй і лягерам прэзыдэнта Квасьнеўскага. Магчыма, посткамуністы, што болей за ўсё шануюць уладу, захаваюць уяўнае адзінства да рэфэрэндуму 2003 году. Але верагодным зьяўляецца таксама сцэнар новых парлямэнцкіх выбараў у 2003 годзе. Партыя ўлады, занятая падзелам гэтай улады на ўсё драбнейшыя кавалкі, больш і больш адмяжоўваецца ад грамадзтва, губляючы ўплыў на разьвіцьцё падзеяў у краіне і саступаючы папулісцкім групоўкам. Гэта можа ўскладніць працэс, посьпех якога дае Польшчы гістарычны шанец, і калі яна яго змарнуе — застанецца на тым самым месцы, зь якога цягам двухсот гадоў прагнула зрушыцца.

Пераклаў з украінскай Андрэй Скурко
паводле часопісу «Критика» №5/2003 (загаловак у арыгінале «Польські клопоти на европейському порозі»)

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Яанна Такарска-Бакір Польшча як хворы чалавек Эўропы

Ядвабнае, “постпамяць” і гісторыкі

ЯАННА ТАКАРСКА-БАКІР (нар. у 1958 у Варшаве) — супрацоўніца Інстытуту этналёгіі й культурнай антрапалёгіі Варшаўскага ўнівэрсытэту. Упершыню эсэ было апублікавана сёлета ў венскім часопісе «Transit» (© Transit. Europäische Revue Nr.25, 2003; © Eurozine, www.eurozine.com адкуль і перадрукоўваецца з ласкавай згоды

Гэты артыкул тычыцца польскае спрэчкі вакол кнігі Яна Томаша Гроса «Суседзі» (2000). Ён спрабуе ўпісаць ахоўныя мэханізмы, якія выявіліся падчас яе, ува ўнівэрсальны эўрапейскі кантэкст пасьляваеннай дыскусіі пра будучыню. Кантэкст гэты дваісты. З аднаго боку, яго стварае супольны для ўсіх эўрапейцаў, хоць і нераўнамерна разьмеркаваны ды па-рознаму ўсьвядомлены, комплекс віны за Галакост[1]. З іншага боку, гэты кантэкст фармуе эўрапейская культурная традыцыя, мову якой мы ўжываем для развагаў аб гэнай віне. Як і трэ было чакаць, у выпадку ядвабнаўскіх дэбатаў, падобна як у выпадку аналягічнае дыскусіі ў Нямеччыне ці Францыі, мова вызначальных размоваў і ўзровень вызначэньня рашэньняў абумоўліваліся не рэлігіяй (у Польшчы нібыта гэткай моцнай),

а навукай. Да яе, да мовы гістарычных навук, адсылаюць іншыя ідыялекты (улучна з касьцельным), якія гучаць ў спрэчцы. Гэта было не выпадкова. Насуперак рупліва падтрымліванай ілюзіі акурат навука, а не рэлігія ёсьць lingua franca польскай палітыкі, грамадзкага жыцьця, бізнэсу і забаўляльнай індустрыі. Гэткія рэаліі, бо пры ўсёй вонкавай моцы каталіцызму Польшча сёньня перажывае стан глыбокай духоўнай няпэўнасьці.

Тым большая адказнасьць кладзецца на гісторыкаў. У сваім артыкуле мы зоймемся тымі аспэктамі іх мовы — а дакладней вузка польскія, — якія ў часе дыскусіі вакол Ядвабнага не дазволілі гісторыкам ажыцьцявіць поўнае пераасэнсаваньне мінулага. Польская гістарыяграфія, захавальніца польскай нацыянальнай тоеснасьці за часоў няволі, гістарыяграфія, напоўненая мартыралягічнымі сантымэнтамі, уцісканая ў сталінскіх камуністах цэнзурай, рэдка ідзе на рызыку і выконвае ролю, што ставіць перад ёй дэмакратычны грамадзкі дыялёг. Тым часам, як даводзіў Юрген Габэрмас у пару «Historikerstreit» у Нямеччыне, падмацаваная гісторыкамі "дакладная, крытычна вывераная памяць пра падзеі, якія адыгрывалі вызначальную ролю ў калектыўным мінулым, ёсьць важным элемэнтам палітыкі. Больш за тое, дакладная, крытычна вывераная захоўвае сувязь з працэсам актыўнага забыцьця мінулага, што зьяўляецца не альтэрнатываю памятаньню, але яго частка элемэнтам), дае дазвол мінуламу адысьці" (цытуецца D, P.96)[2]. Да выкананьня такое ролі найлепш падрыхтаваны гісторыкі. Яе значэньне расьце, у меру таго як у эўрапейскіх дэбатах узрастае ірацыянальны элемэнт. Іх рэгулярная масавасьць, выразная храналёгія, нязьменны падзелі сьведчаць пра наяўны ў іх элемэнт міту, які патрабуе разгляду[3].

рэдакцыі і аўтаркі.

[1] **Daniel R. Schwartz. Imagining the Holocaust. New York, 1999. S.8—9.**

[2] **Зіхчасным ці ціхім, ці тым, што ствараў сэнс, ці ўспрыманае ўспрымальнае гістарычнае мінулае, — частка дзеля самаразумеласьці. Хаця гэтую гісторыю скажаюць. Мы казалі, што ЗША, Вялікабрытанія і Францыя перамаглі ў вайне, але ж фактычна Францыя была**

пераможаная
і саўдзельнічала
ў Галакосьце.
Спатрэбіліся
дзесяцігодзьдзі,
каб
французы
пераасэнсавалі
гэты
досьвед
і зразумелі,
што толькі
параўнальна
нешматлікія
партызаны
супрацьстаялі
ўраду
Вішы, які
ажыцьцяўляў
дэпартацыі
габрэяў
у адпаведнасьці
з нацысцкімі
дырэктывамі.
Пасьля мы
даведаліся
пра ролю
Швайцарыі
ў экспрапрыяцыі
габрэйскіх
грошай,
а таксама
ў адмыванъні
экспрапрыяваных
нямецкіх
грошай
і захоўваньні
нацысцкай
маёмасьці
ў часы

вайны. Урэшце, праз 50 гадоў французскія ваенныя злачынцы, кшталту Марыса Папона, былі прыцягнутыя да суду. (…) У Францыі пасьля перамогі саюзьнікаў 300 000 калябарантаў былі арыштаваныя і 7037 расстраляныя. Але наступныя 25 гадоў доўжылася маўчаньне. Перш чым надышоў пэрыяд пераасэнсаваньня пасьля вайны мінулі 25 гадоў".

[2] D.LaCapra. Writing History,

Writing Trauma (далей — D). The Johns Hopkins University Press, Baltimore and London, 2001.

Храналёгія гэтых дыскусіяў наступная. Звычайна спачатку зьяўляецца фільм (такі, як «Галакост» Клёда Лянзмана ці «Суседзі» Агнешкі Арнольд), кніга («Добраахвотныя катаньні Гітлера» Даніэля Гальдгагена ці «Суседзі» Яна Томаша Гроса) ці выстава («Злачынствы Вэрмахту» Гамбурскага інстытуту сацыяльных дасьледаваньняў). Фільм, кніга ці выстава выклікаюць правакацыю, асьвятляючы пэўныя факты з надзвычайнай сьмеласьцю. Часам высновы грунтуюцца на памылковай перадумовах (напрыклад, расісцкія ноткі ў канцэпцыі Гальдгагена аб “прыроджаным” антысэмітызьме немцаў) ці надзвычай няпэўнай або памылковай інтэрпрэтацыі фактаў (як у выпадку выставы «Злачынствы Вэрмахту», дзе замоўчваўся шэраг здымкаў масавых забойстваў, учыненых Чырвонай арміяй, а таксама — што недаравальна з польскага (Танкал, гледжаньня — замоўчваўся размах злачынстваў Вэрмахту ў 1939—1940 гадах[4]). Фактаграфічныя памылкі раздражняюць гісторыкаў, частка якіх любой цаной спрабуе скампраметнаваць тэму (у дыскусіі пра Ядвабнае гучэлі аргумэнты пра “непрафэсіяналізм” ці “прадпрыемства Галакост”), што, як, не ўдаецца, бо грамадзкасьць вельмі хоча ў справе разабрацца. Разгараецца дыскусія, да яе далучаюцца людзі культуры і інтэлектуалы. У Нямеччыне найбольш характэрнай стала, кантэксьце была прамова Юргена Габэрмаса аб “праўдзівасьці і маральнай сіле” кнігі Гальдгагена як “крыніцы істотных імпульсаў для грамадзкай сьвядомасьці”[5]. Выступы інтэлектуалаў канчаткова выводзяць з раўнавагі гісторыкаў, і яны абражана замаўкаюць.

[3] “Сутнасьць і праўдзівасьць кнігі Гітлераўскія катаньні” Даніэля Гальдгагена” // Дарэмнасьць супраціву: Нямецкая культура і вэрмахт. Сьвятлана Алексіевіч, Васіль Быкаў, Юрген Габэрмас і інш. Пераклад з нямецкай. Мінск: Логвінаў, 2004. С. 7—18.

[4] Walter Benjamin. Gesammelte Schriften, Band V. Das Passagen-Werk, wyd. R. Tiedemann, Frankfurt am Main, 1982. S. 178.

[4] Гл. спавешчаньне З.Краснадэмбскага ў: W.Pięciak. Niemiecka pamięć. Współczesne spory w Niemczech o miejsce III Rzeszy w historii, polityce i tożsamości (1989—2001). Kraków, 2002 (далей — WP). S.301 і далей.

[5] Фрагмэнты віншаваньня Габэрмасам Гальдгагена з нагоды ўручэньня яму Прэміі Дэмакратыі

месячнікам «Blätter für deutsche und internationale Politik», цыт. паводле: WP, S.131.

У сувязі з тым, што дэбаты, пра якія вядзецца гаворка, паводле азначэньня ўтрымліваюць элемэнт крытыкі традыцыйнай гістарыяграфіі, нэрвовая рэакцыя гісторыкаў зразумелая. Горш, калі іх галасы выяўляюць поўнае неразуменьне таго, што такое грамадзкі дыскурс і якую ролю ў ім адыгрываюць як яны самі, з аднаго боку, так і мы, іх чытачы, — зь іншага боку.

Скуль узьнікаюць жарсьці ў гэтай спрэчцы? У тым, што адны прымаюць за гістэрычны эпіфэномэн, пабочны прадукт “траўма-бізнэсу” ды ідэалягічных маніпуляцыяў, іншыя схільныя бачыць ні больш ні менш толькі “праяву сакральнага” (D, P.23)[6]. Яны ўсьлед за Вальтэрам Бэньямінам тлумачаць, што масавыя фэномэны бываюць там, дзе ў нашым дэсакралізаваным сьвеце хаваецца мітычнае. Ня ўчора стала вядома й тое, што міт зьяўляецца ў працэсе вяртаньня і паўтарэньня. Увогуле ня йдзецца пра рэабілітацыю міту як крыніцы праўды. Гаворка пра тое, што небясьпечна пагарджаць мітамі (фашызм, нацызм, камунізм, антысэмітызм і т.д.). Тут ня досыць, як рабіў Імануэль Кант, “асьцерагацца благіх сноў”. Благія сны трэба распазнаваць.

Калі праз шэсьцьдзесят гадоў пасьля вайны ў нейкай краіне імгненна разыходзіцца ўвесь наклад выдадзенай у элітарным выдавецтве кнігі, што апавядае, як у стадоле спалілі каціка (Грос), калі ў нейкай іншай краіне насельніцтва разьюшваецца кнігі, што забаўляюць чытача сцэнамі карнавальнае жорсткасьці й прыпісваюць чытачам штосьці кшталту “нямецкага антысэмітызму” (Гальдгаген), — словам, калі з спазьненьнем на некалькі дзесяцігодзьдзяў дзесьці выбухае якоесьці посттраўматычнае расстройства, дасьледчык грамадзтва павінен двойчы падумаць, перш чым пакінуць па-за ўвагай гэткую зьяву.

6 Тлумачэньне сэнсу тае фармулёўкі маёрным Ёкасцій не сьмяяўся б на Бэньяміна, толькі непасрэдна на Фройда.

“Посттраўматычная культура”

Што хаваецца за трагедыяй, якая не адступае ўжо шэсьцьдзесят гадоў, за зьявай, якая, бы навязьлівы сон, захоплівае ўсё новыя і новыя сцэны, хоць акторы даўно ўжо пакінулі тэатар? Чаму адбываецца так, што “час мінае, вайна і зьнішчэньні аддаляюцца, але мёртвыя ўсё бліжэйшыя і бліжэйшыя да нас”[7]? Як так можа быць, што за паўстагодзьдзя не загаіліся раны? На гэтае пытаньне ніхто не адкажа паасобку. Тут трэба “браць, не пытаючы, хто дае”. Сацыёляг павінен цікаваць псыхоляга, антраполяг — філёзафа, літаратуразнаўца — гісторыка. І наадварот.

У катэгорыі “постпамяці”[8], зь якой я хацела б пачаць свой уласны адказ на пастаўленыя пытаньні, знаходзіць адлюстраваньне кожная з гэтых навук, а таксама сьвет, у якім ужо ўсё не такое, як раньш было. Сёньняшняя памяць — гэта ўжо ня памяць. “Постпамяць, — тлумачыць свой тэрмін Марыяна Гірш, — гэта асаблівасьць досьведу тых, хто гадаваўся на аповедах пра падзеі, што адбываліся зь іх народам. Іхныя ўласныя ўспаміны саступілі месца гісторыям ранейшых пакаленьняў, сфармаваных у траўматычных умовах, якія ніколі не былі да канца ні зразуметымі, ні ўзноўленымі”. Зьяўленьне постпамяці зразумелае ў сем’ях, абцяжараных траўматычным мінулым. Але чаму яна вырываецца за кола непасрэдна закранутых ім? Чаму, насуперак старому пераканьню ізаляцыі “заражаных няшчасьцем”, выліваецца за межы госьпісаў ды псыхіятрычных установаў і ўплывае ня толькі на індывідаў, але й на цэлыя грамадзтвы? Найвыразьнейшая рыса гэтае зьявы — перамяшчэньне: яна мае месца ў паралельных, сымбалічных прасторы і часе — у іншым месцы і з значным спазьненьнем адносна падзеяў, да якіх яна адсылае. Тым, што насамрэч прыводзіць яе ў рух, зьяўляецца паступовы адыход “сапраўдных” ахвяраў траўмы. Масавасьць постпамяці, яе шматгалоснасьць, фэномэны ў духу Вількамірскага (чалавека, які дасканала, хоць і невядома навошта, ужывіў у сябе чужую траўму (D, P.207—209)), а таксама такія зьявы, як Галакост у амэрыканскім грамадзкім жыцьці[9], сьведчаць, што ў гульню ўступае асаблівая мітатворчая стыхія. Гэта памяць надмернная і прыўлашчаная, памяць не на сваім месцы, і таму таксама — зусім як гістарызм у Ніцшэвых «Нясвоечасовых разважаньнях» — яна ня можа памерці сваёй сьмерцю. Постпамяць хутчэй выбухне,

[7] **K.Hamprechts, WP, S.146.**

[8] **M.Hirsch. Family Frames: Photography, Narrative and Postmemory. Harvard University Press, Cambridge, 1997. S.22.**

Пашыраю тую катэгорыю Гірш, ужытую найперш

чым адыдзе ў нябыт, а аднавіўшыся пасьля выбуху, дзе сваю сызыфаву, par excellence мітычную працу. Гэтая зьява выдатна ўпісваецца ў кантэкст “посттраўматычнай культуры”[10], што бурліва разьвіваецца ад канца 1980-х гадоў як рэакцыя на ранейшую гераічную “культуру маўчаньня”. Зьдзіўляючы здольнасьцю паядноўваць зацыкленасьць на мінулым з куртатай гістарычнай сьвядомасьцю[11], посттраўматычная культура канцэнтруецца вакол цэнтральнай траўмы, застарэлай і выцесьненай, якая неўспадзеўкі ўмяшаецца і паддае рэвізіі ўсю навакольную рэчаіснасьць. Гэтая ўтварэньне ня хоча загойвацца, яно хутчэй знаходзіць задавальненьне ў маніякальным сузіраньні незагоеных ранаў. Траўма робіцца яе фэтышам, маскай “чагосьці іншага”, таямніцай, якой сама культура не ўсьведамляе і ня можа іншым чынам раскрыць.

для апісаньня ўсыхічнага стану дзяцей — ахвяраў Галакосту. Так кразумецца постпамяць была б зьявай з зарагу “псаўдамарфозаў” пра якія ў «Зьмярканьні Захаду» пісаў Шпэнглер.

[9] Гл.: P.Novick. Holocaust in American Life.

Houghton Mifflin, Boston, 1999. Чарльз Мэер слушна заўважыў, што амэрыканцы маюць у Вашынгтоне свой Музэй Галакосту, ня маючы ані музэю вынішчэньня індзейцаў, ані музэю рабства мурынаў. Гл.: D, P.171—172.

10

Крытычнае абмеркаваньне гэтых праблемаў можна знайсьці ў працах Kirby Farell. Post-Traumatic Culture: Injury and Interpretation in Nineties. John

Hopkins University, Baltimore 1998; і таксама R.Leys. Trauma: A Genealogy Chicago U.P. Chicago, 2000.

[11] A.Van den Braembussche. The Silenced Past. On the Nature of Historical Taboos (далей — SP) // W.Wrzosek (red.). Świat historii. Prace z metodologii historii i historii historiografii dedykowane Jerzemu Topolskiemu z okazji siedemdziesięcioleg urodzin. Poznań, 1998. S.98.

“Дом, у якім я не хачу болей жыць”

Адною зь некалькіх мэтафараў, да якіх зьвяртаюцца дасьледнікі

гэтае дзіўнае траўмы, зьяўляецца мэтафара “шкілетаў у шафе” ці “дому з зданямі”. “Духі мінулага, — тлумачыць яе Дамінік Лякапра, аўтар грунтоўнай кнігі пра посттраўматычную культуру, — гэта сюжэты, якія дакучаюць нам; якія праз парушэньні ў сымбалічным парадку, нястачу рытуалаў ці сьмяротныя выпадкі, трансгрэсійныя і незразумелыя настолькі, ажно цяжка ці ўвогуле немагчыма насіць па іх жалобу, бесьцялесна блукаюць па нашым посттраўматычным сьвеце. На добры лад ніхто, ніводная асоба ці група, ня можа мець на іх манаполіі. Калі яны наведваюць чыйсьці дом (народ, групу), дык непакояць усіх, хто там ёсьць, нават тых, хто трапіцца выпадкова” (D, P.215).

Лякапра належыць да тых, хто на посттраўматычную культуру глядзіць падазрона. Крытыка злоўжываньняў ёю — (casus Вількамірскага, casus Гальдгагена-“расыста”, casus Лянзмана-помсьніка, які наўмысна высьмейвае сваіх нацыстоўскіх суразмоўцаў[12], і casus фальшаваньняў (элемэнты “выратавальнага кічу” ў «Сьпісе Шындлера» С.Сьпілбэрга, у «Корчаку» А.Вайды і ў «Жыцьці цудоўным» Р.Бэніні), усьведамленьне маны, што вынікае з надмернага болю і добрых намераў[13] альбо, наадварот, з апатыі ды надмернай асьцярожнасьці, няведаньня посттраўматычнай культурай “меры” (пачынаючы ад некантраляванай ідэнтыфікацыі з ахвяраю, празь іншыя разнавіднасьці “пераносу” і “замяшчэньня”, аж да паўторнага прычыненьня ахвяры псыхічных пашкоджаньняў) — гэта і ёсьць зыходны пункт ягоных разважаньняў. Крытыцызм што да зьявы адначасна выступае прычынай, дзеля якой Лякапра лічыць, што якраз гісторыкі прызначаны прадухіляць сваімі сьведчаньнямі эксцэсы “дэнатуралізаванай” постпамяці.

Але гэтая “прызначанасьць” не безумоўная. “Мэтай гістарычнага разуменьня, — піша Лякапра, — зьяўляецца не толькі карысны з прафэсійнага пункту гледжаньня спосаб фіксацыі мінулага, але і фармаваньне крытычнай, дакладнай і ўсім даступнай памяці пра значныя падзеі, якія сталіся часткай грамадзкага цэлага. Зь імі зьвязаны цяжкі, каста невыканальны абавязак хоць бы сымбалічна, пасьмяротна вярнуць ахвярам годнасьць, адабраную ў іх іхнымі забойцамі. Гістарычны дыскурс тут часткова ангажуецца ў сам працэс аплакваньня і падрыхтоўкі хаўтураў, а на справе —

[12] C.Lanzman. Shoah. Przeł. M.Bieńczyk. Kosza lin, 1993. S.67 i 117 nn.

у дзейнасьць, якая ёсьць істотнай часткай пераасэнсаваньня мінулага” (D, P.95). Бо з дапамогай гісторыкаў “дакладная, крытычная “праца памяці” захоўвае сувязь з працэсам актыўнага забыцьця мінулага, дае дазвол мінуламу адысьці, — каб грамадзкая энэргія, зьвязаная з выцясьненьнем кампаніі, магла ўрэшце вызваліцца.

Калі пагадзіцца з пазыцыяй Лякапра наконт абавязкаў дасьледнікаў мінулага, аргумэнт зламыснасьці, недавучанасьці й пагоні за сэнсацыяй у высьвятленьні прычынаў падзеньня даверу да традыцыйных гісторыкаў[14] трэба ўважаць такім сама аблудным, як і зьвядзеньне “посттраўматычнай культуры” да цынічнага “прадпрыемства Галакост”. Адказ на пытаньне, чаму большасьць сёньняшняга грамадзтва масава адкідае “сур’ёзную” гістарыяграфію, быў бы ў яе сьвятле наступны: грамадзтва не давярае гістарыяграфіі, бо гістарыяграфія не паклапацілася пра “крытычна выверaную і ўсім даступную памяць” і ўжо напэўна ня вызвалілася ад ролі галашэньніцы. У кнігах Гроса і Гальдгагена людзі шукаюць таго, чаго не знаходзяць у іншых: маральнага кіслароду, які вызваляецца, калі закранаюцца пытаньні, на якія няма адказу.

[13] Ел.: **A. Bikont. Ja, Szmul Wasersztajn – Gazeta Wyborcza. 12.07.2002.**

Табу ля крыніцаў

“Чаму дасьледнік (а таксама любы іншы чалавек) замест таго, каб канфрантаваць з уплывам, які — у цесным зьвязку зь ягонай ідэнтычнасьцю — аказвае на яго мінулае, намагаецца гэты ўплыў праігнараваць? Пашыраны погляд, зафіксаваны ў прымаўцы “чаго вочы ня бачаць, таго сэрцу ня шкода” (альбо “невядомае ня шкодзіць”[15]), моцна розьніцца ад меркаваньняў псыхолягаў, якія сьледам за стваральнікам псыхааналізу паўтараюць, што псыхічныя субстанцыі несьмяротныя, таму што іх выцясьненьне ня толькі не азначае іх выдаленьня, але фармуе яшчэ глыбейшую, яшчэ больш складаную залежнасьць ад іх. Якраз пра гэта гаворыцца ў «Няздольнасьці да жалю» Аляксандра і Маргарэты Мічэрліхаў, дасьледаваньні аб неадольнай нямецкай любові да моцных людзей. А таксама ў рэфлексіі Даніэля Кон-Бэндыта і Герда Кенэна[16] пра тое, што левы тэрарызм 60-х у Нямеччыне быў рэакцыяй на схаваную памяць пра гітлераўскае мінулае.

Гістарычная траўма, якая была адмоўленая зь якіхсьці прычын, выклікае дзьве паталягічныя зьявы. Звонку, сярод маладзейшага пакаленьня, зьяўляецца ўзгаданая ўжо постпамяць, ля крыніцаў якой бясьпечна разьлягаецца тэрыторыя гістарычных табу[17]. Гістарычныя табу ўзьнікаюць

[14] Гл. яе характарыстыку ў разьдзеле: Ці прыглушаная адчувальнасьць гісторыкаў?

[15] Гл. на гэтую тэму: J.Appleby, L.Hunt і M.Jacob. Telling the Truth About History (далей — TTH). Norton Publ. New York—London, 1994. P.307.

[16] G.Koenen. Das rote Jahrzehnt. Köln, 2001.

вакол сьлядоў гісторыі, палічаных некалі за траўматы “псыхічнае раўнавагі ці ідэнтычнасьці”, а ў сувязі з загнаных глыбока ў падсьвядомасьць (SP, P.101). Сі адмаўленьня кнігі Гроса (а яшчэ раней — артыкулу Ціча «Чорныя карты Паўстаньня») можна патлумачы іншага, і парушэньнем гэных табу. У дэбатах пра Я выступілі ўсе чатыры роды зьвязаных зь імі абаро стратэгіяў:

— адмаўленьне, што выклікае наўмыснае, ідэалягічн выцясьненьне[18];

— несьвядомае выцясьненьне[19];

— выцясьненьне кагнітыўнага тыпу[20];

— выцясьненьне мітычнага тыпу[21].

Найбольш выразным было апошняе з памянёнага — падмацаванае цьверджаньнем Томаша Стжэмбаша, разьню ў Ядвабным зьдзейсьнілі “23 выдадкі й калябарацыю”, зь лягічнай высновай, што любы, хто зьдзяйсьняе такое злачынства, паводле азначэньня робіцца вылюдкам чынам народ, зь якога ён паходзіць, застаецца незалеж “Тэорыю падонкаў” таксама, відавочна, можна пашы польскую калябарацыю — зьяву, якая заслугоўвае тыпа ў першую чаргу. Падобную функцыю мелі і натужна падмацаваныя фактамі[22] пошукі прысутнасьці немцаў у мястэчку 10 ліпеня 1941 году.

Ход далейшых развагаў Томаша Стжэмбаша, цьверд што антысэміцкія настроі ў Ядвабным былі вынікам супрацоўніцтва мясцовых жыдоў з НКВД падчас сав акупацыі, знаходзяцца між мітычным і кагнітыўным выцясьненьня[23]. Гэтаксама як і ў спробах кампрамэта Гроса як “сацыёляга”, выкрыцьця Шмуйлы Васэрштайна “агента польскага КГБ”[24], ён ставіў за мэту зьменшыць пазнавальны дысананс між тым, што вядома пра ўлас мінулае (разьня польскімі рукамі), і тым, што народ, у сябе (палякі ня рэжуць; яны здольныя забіваць, толькі абараняючыся, хоць саміх іх ня раз нішчылі), гэтаксама і ў сувязі з тым, ці хацелася б пра тое мінулае памята ў Ядвабным як крывавая помста калябарантам, што апраўдвае разьню; нельга верыць “сацыёлягам” і “аг Катэгорыяй несьвядомага выцясьненьня ў кантэксьце пра Ядвабнае прасякнуўся і жывіўся апошнія шэсьць

17 Тэорыю гістарычных табу я запазычыла ў Антона Ван дэн Брэмбусшэ (Antoon Van den Braembussche), SP, S.103.

18 Прыкладам, нрбнедзеным Бартонам, Ван дэн Брэмбусшэ, зьяўляюцца публікацыі палітарных рэжымаў, а таксама вядомае з французкай нацыі “тэадкі” пра Ціна Людовіка XVI ці забаве Рэвалюцыі (кіл.: M. Ozouf. La Fête révolutionnaire: 1789–1799. Paris, 1976).

дзесяцігодзьдзяў зьбіральны пэрсанаж — гісторыкі, якія, вывучаючы рэгіён Ломжы, не цікавіліся тэмаю разьня ў Ядвабным, Радзівілаве ці Вансошы, пакуль ня выйшлі Агнешкі Арнольд і кніга Гроса. Падобнае адценьне аргумэнту з рэпэртуару несьвядомага выцясьненьня часу пераходзіць у выцясьненьне кагнітыўнае) можа таксама параўнальная панарама габрэйскіх пагромаў у эўрапейскіх краінах, выкладзеная ў апошняй кнізе Шароты[25]. Дзякуючы ёй удаецца крыху зьмякчыць разьні ў Ядвабным, зьмясьціўшы яе ў кантэкст тыпоскіх злачынстваў, арганізаваных нацыстамі.

Да тае самае катэгорыі замоўчваньня можна таксама аднесьці іншы аргумэнт назіральніка, што падаецца ў размове з журналістамі «Tygodnika Powszechnego»: “Я ня пэўны, ці падтрымка Лігі польскіх сем’яў на апошніх выбарах ня была ў нейкай меры пратэставай рэакцыяй на дэбаты вакол Ядвабнага”, — кажа прафэсар Шарота[26]. Хоць той аргумэнт і сфармуляваны ex post, але мае такую ж нарматыўную (прагнастычную?) сілу, як прымаўка “памалу едучы, заедзеш”, што ўпарта вяртаецца[27] ў польскі й сусьвятны дыскурс пра габрэяў. Яго імплікацыяй зьяўляецца перад фурыямі міжнацыянальнае варажнечы. Разгледжаны ў псыхааналітычных катэгорыях — Фройд пісаў, што парушэньне табу “павінна быць сурова пакаранае альбо выкупленае ўсімі членамі грамадзтва, раз ужо яны яго датрымлівацца”[28], — яна можа прывесьці да думкі, ня ў сувязі зь ня дужа складным, неадназначным абвінавачаньнем Яна Гроса вынікі ягонага блюзьнерства («Суседзі») на вачах кідаюць цень на ўсю Нацыю (у ролі фуры выступаюць польскіх сем’яў).

Апошні тып замоўчваньня, найменш цікавы, мы знойдзем у тэкстах гісторыкаў, якія друкуюцца ў газэце «Nasz Dziennik». Для іх справа Ядвабнага — гэта “фальшаваньне гісторыі” і “падрыхтоўчыя акцыі” перад “патрабаваньнямі ад нашага” найбольшае ў сьвеце кампэнсацыі за габрэйскую маёмасьць. Зь імі салідарызуецца частка гіерархаў каталіцкага Касьцёлу, якія, кшталту біскупа Ломжынскага Стафанака, сьцьвярджаюць, што прычынаю абвінавачаньняў зьяўляюцца маёмасныя прэтэнзіі габрэяў. Такія галасы не заслугоўвалі б увагі, ня тое нюанс, што яны адсылаюць да старога міту пра

[19] **Прыклад Яна дэн Брэмбусшэ: адсьвяткаваньне 1000-годзьдзя нацыянальнай ідэнтычнасьці**

Пытаньня здраднай сусьветнай вайны ўзьнікаюць надсьвядомага адмаўленьня мінулага.

[20] **Ян дэн Брэмбусшэ дадае тут дзьвюцікавыя прыклады Перакананы ў японскіх падручніках гісторыі ўзьнікшы ў 1980-я ня ўпершыню ў Нямеччыне ў 1987 годзе: Калі пад “ўтаймаваньнем” Хвалюючых выродканых акупацыяй, цывілізацыйнае прасельніцтва**

“жыдоўскую хцівасьць” і “жыдоўскую змову”, гістарычнымі канкрэтызацыямі якога бывалі зьвінавачаньні жыдоў у атручваньні студняў, апаганьваньні аплатак і рытуальных забойствах. Гэты шматаблічны міт абуджаўся кожны раз, калі здаралася штосьці, што парушала пачуцьцё бясьпекі, носьбітаў, і мог правакаваць гвалт (Кельцы, 1946). Чатыры згаданыя вышэй тыпы замоўчваньня складаюць важную, але параўнальна малапрадстаўнічую паталёгію мысьленьня, прэзэнтаванага польскімі гісторыкамі ў часе ядвабнасьці дэбатаў. Больш масавай, небясьпечнай і адначасова непрыметнай была пазыцыя “прафэсійнае апатыі”, якая стаяла большасьць дасьледнікаў, што бралі слова ў дзяцей. Прычыны апатыі, вельмі складаныя, карэняцца ў надрукоўным сьветапоглядзе гэтае групы і выяўляюцца ў гіпэртрафаванай датрыманьні спэцыфічна зразуметых прынцыпаў прафэсіяналізму. Ім таксама будзе прысьвечаная частка гэтага тэксту.

страціла ўад сабою кантроль і пачала страляць, японскія салдаты ныя, каго забілі, у тым ліку жанчын і дзяцей”. Другі фінал зьвязаны з кан. мітам Масады, які шырока выкарыстоўваецца ў стварэньні ізраільскай нацыянальнай ідэнтычнасьці. Самазабойчы фінал міту, які моцна супярэчыць духу юдаізму, перароблены ў забойства, учыненае рымлянамі. Гл.: N.Ben-Yehuda. The Masada Myth. Madison, Wisconsin,

1995.

[21] Тут два прыклады: т.зв. дарчая грамата Канстантына, г.зн. падробка часоў Каралінгаў, што легітымізавала папскае права на Ватыканскую дзяржаву (паводле: J. Le Goff. History and Memory. New York, 1992. S.191), а таксама некалькі мітаў з новае гісторыі Нямеччыны: міт аблогі, якая нібыта змусіла Нямеччыну да І сусьветнай вайны, Dolchstosslegende (міт, што параза

Нямеччыны ў першай сусьветнай вайне была выкліканая рэвалюцыяй. — Рэд.) і Diktatlegende (міт, што прыход Гітлера да ўлады быў спрычынены кабальнымі ўмовамі Вэрсальскага міру. — Рэд.).

[22] Гл.: Prok. R.J.Ignatiew. Komunikat o końcowych ustaleniach śledztwa w sprawie udziału w zabójstwach obywateli polskich narodowości żydowskiej w Jedwabnem, 10 lipca 1941 r. // Gazeta Wyborcza. 10.07.2002.

23 “у нядаўняй “спрэчцы гісторыкаў” ува ўжытым для адмаўленьня ўнікальнасьці Галакосту […] параўнаньні нацысцкіх лягераў сьмерці з сталінскім ГУЛАГам некаторыя крытыкі ўгледзелі нараджэньне гістарычнага міту. Чыстым мітам гэтыя крытыкі палічылі ня толькі цьверджаньне, што зьнішчэньне мільёнаў эўрапейскіх жыдоў, зьмешчанае ўва ўнівэрсальнай пэрспэктыве і тым

самым рэлятывізаванае (трэцяя стратэгія замірэньня зь мінулым!), не зьяўляецца нічым выключным, але і погляд, што Галакост быў справакаваны маштабнымі бальшавіцкімі рэпрэсіямі 1930-х і мусіць успрымацца як непасрэдная рэакцыя на небясьпеку “азіяцкага” зьнішчэньня, якое могуць зьдзейсьніць бальшавікі”, Van den Braembussche, SP, S.110. Да тае самае катэгорыі выцясьненьня належаць

некаторыя нямецкія рэакцыі на польскую цікавасьць да разьні ў Ядвабным. Вось, да прыкладу, падзагаловак «Die Disskussion über das Massaker in Jedwabne verletzt den Mythos der Polen als Volk der Opfer [Дыскусія вакол разьні ў Ядвабным адмаўляе міт пра палякаў як пра народ-ахвяру]», які да замоўленага тэксту пра Ядвабнае дадала рэдакцыя FAZ (гл.: J.Tokarska-Bakir. Vergangenheit, die nicht

vergehen will // Frankfurter Allgemeine Zeitung. 2.05.2001).

[24] Гл.: A.Bikont. Ja, Szmul Wasersztajn // Gazeta Wyborcza. 12.07.2002.

[25] T.Szarota. Pogromy antyżydowskie w Europie w latach 1939—1941. Warszawa, 2000.

[26] Jedwabne bez stereotypów (далей — JBS). Z prof. Tomaszem Szarotą rozmawiają Agnieszka Sabor i Marek Zając // Tygodnik Powszechny. 2002. №17.

[27] Тут

згаданы тэкст Романа Бугая “Prawda historyczna a interes materialny” ў «Gazecie Wyborczej», 6.01.2001, а раней два характэрныя тэксты: Joszua Trachtenberg, прадмова да Diabel i Zydzi. Gdynia, 1997. S.11; гл. таксама выступ П.Ясяніцы ў сакавіку 1968, цыт. у: K.Jeleński. “Hańba” czy wstyd? // G.Pomian. Wizja Polaki na łamach «Kultury» 1947—1976. T.II. S.137. Lublin, 1999.

Польшча як хворы чалавек Эўропы

Паводле клясычнага азначэньня, траўма выклікае

[28] S.Freud.

расшчапленьне “афэкту”, г.зн. перажываньняў, і “рэпрэзэнтацыі”, г.зн. пазнавальных здольнасьцяў. “Страціўшы арыентацыю, чалавек перажывае штосьці, чаго ня можа сабе ўявіць, і адначасова, здранцьвелы, намагаецца ўявіць сабе штосьці, чаго ня можа перажыць”[29]. Аналізуючы ход дэбатаў вакол кніг Гальдгагена і Гроса, цяжка не падумаць ўражаньню, што грамадзтва і гісторыкі — гэта два разьдзеленыя аспэкты аднаго хворага на постпамяць чалавека, аспэкты, якія дакладна падзялілі між сабою “перажываньне” і “пазнаньне”: адчувала грамадзтва, а пазнавалі, з сьпіскаў, гісторыкі.

Якая траўма хаваецца ў постпамяці гэтага “чалавека”? Недастаткова сказаць, што гэта сканцэнтраваная траўма вайны, якая ахоплівае некалькі гадоў перад яе пачаткам і некалькі дзесяцігодзьдзяў пасьля яе сканчэньня. Гэтая траўма ёсьць па сутнасьці сукупнасьцю траўмаў, а постпамяць “гэтага чалавека” ёсьць па сутнасьці некалькімі ўзаемна варожымі, хоць цесна між сабою зьнітаванымі, памяцямі.

Мы маем тут, з аднаго боку, жыдоўскую памяць пра нарастаньне антысэмітызму перад вайной, пра трагедыю польскіх жыдоў, асымільваных і неасымільваных, пасьлявых у гета як народам, які яны абралі, так і “народам абраным”, таксама ня скорым тады на своечасовую дапамогу. Дадайце Галакост і вяртаньне на гістарычную радзіму, рашэньне якое не далося лёгка.

Зь іншага боку, мы маем ня менш складанае ўяўленьне пра сябе як пра “ахвяраў здрады”. З гэтага боку сьпіс ахвяраў даўжэйшы, а вінаватыя менш схільныя каяцца. У сьпісе ворагаў немцаў і саветаў, ёсьць таксама найбліжэйшыя саюзьнікі Польшчы ў верасьні 39-га і з пары Ялты; саюзьнікі гістарычна пасіўна згадзіліся ня толькі з сталінскай акупацыяй Усходняй Эўропы, але, як даводзіць гісторыя, прынялі і “катынскую трагедыю”, чынна яе падтрымліваючы. Можна спрачацца, ці жыды, што якраз у той момант зьявіліся ў сьпісе здраднікаў (найперш у 1939 годзе, калі “хлебам і сольлю віталі бальшавікоў”, а потым як “жыдакамуна” і “каты з спэцслужбаў”), вінаватыя тут найбольш. Рэзкасьць, зь якой іх абвінавачваюць, падказвае, што за абвінавачаньнямі на іх адрас могуць стаяць і іншыя, несувымерна большыя крыўды, выказаць якія складаней. Уражвае сымэтрыя між згаданымі тут “дзьвюма памяцямі”

Totem and Tabu: The Standard Edition of the Complete Psychological Works of Sigmund Freud. Vol. 13. London, 1958. S.33.

29 D, P.42.

Параўнайце, напр., аповед пра трох герояў Дальнобойнай Галакост», Мардэхая Падхлебніка (с.19) і Шэймана Срэбніка (с.113); гл. Chapman, Shoah.

і “дзьвюма праўдамі” ды іх зьдзеклівым адмаўленьнем. Калі першую зь іх прыніжае і мабілізуе “асьвенцімская хлусьня”, другую раніць і натхняе “брахня катынская”.
У спрэчцы вакол «Суседзяў» гэтыя асобныя памяці сутыкнуліся міжсобку і пачалі выцясьняць адна адну, пасьля чаго кожная пачала гучна дамагацца для сябе выключнасьці. “Чалавек”, усярэдзіне якога адбылося сутыкненьне, захварэў, а хвароба яго выявілася ў згаданым ужо расшчапленьні “перажываньня” і “пазнаньня”, цяпер падзеленых так асновасяжна, што першае цалкам апынулася на баку грамадзтва, а другое — гісторыкаў. Паколькі грамадзтва падчас дыскусіі вакол Ядвабнага збольшага атаясамлівала сябе то з ахвярамі, то з катамі, пазыцыя прафэсійных гісторыкаў нагадвала згаданае раней посттраўматычнае здранцьвеньне.

Калі гэтае параўнаньне спрэчкі вакол Ядвабнага з траўмаванай псыхікай чалавека працягнуць яшчэ далей і запытацца пра магчымасьць тэрапіі пацыента, то папраўка, безумоўна, будзе залежаць ад падбору лекаў, што могуць, з аднаго боку, вывесьці яго з здранцьвеньня, а зь іншага — навучыць крытыцызму.
Калі б мы раптам уявілі сабе нейкі іншы, лепшы сьвет, такімі лекамі магло б быць тое, пра што нават згадка ў кантэксьце актуальнага гістарычнага дыскурсу гучыць як жарт: эмпатыя, спагада[30].
Адзначым найперш, чым ня ёсьць такая эмпатыя. Яна ня ёсьць поўнай ідэнтыфікацыяй, такой сабе безумоўнай “сымпатыяй”, пры якой, якімі б высакароднымі ні былі яе намеры, другі бок звычайна губляецца і яго месца займае сам мэдык-сымпатык, які несьвядома прысабечвае чужы голас і атрыбуты.
У адрозьненьне ад такой “сымпатыі”, эмпатыя была б суадчуваньнем, у якім ніхто не выступаў бы ў ролі лекара, а лячэльным прэпаратам, пакліканым склейваць траўмаванае расшчапленьне, былі б уважлівасьць і павага, а таксама ўсьведамленьне таго, што чыйсьці непамысны досьвед ня будзе нашым. Ня будучы мэханічным кампрамісам, эмпатыя мела б шанец замірыць абодва бакі спрэчкі, не нівэлюючы іх пры гэтым[31]. Якраз такім мог бы быць happy end пост-замісьці. Дзякуючы пасярэдніцтву эмпатыі, эмоцыі грамадзтва і пазнаньне гісторыкаў маглі б ізноў спалучыцца. Грамадзтва ўзбагацілася б “крытычнай, дакладнай і ўсім даступнай

[30] “У сваіх пастулятах я выпадку “пісаньня праўмы”, так і “замісьціньня праўмы” Лякадзра спасылаецца

памяцьцю”, а гісторыкі атрымалі б страчаную адчуваньне. На жаль, гучыць гэта як вядомы фрагмэнт Псальмаў (“Вернасьць і мілата сустрэнуцца, справядлівасьць і мір пацалуюцца”, Пс.84: 11), і, напэўна, гэта надзвычайна ажыцьцявіць.

(D, P.40) на паняцьце эміратыі ў значэньні “гетэрапатычнай ідэнтыфікацыі”, у дэталях апрацаванае Каяй Сільвэрман (Kaja Silverman) у працы *The Treshold of the Visible World, Routledge*, New York 1996.

31 “У дачыненьні да гістарычнай траўмы і яе прэзэнтацыі, — піша Лякапра, — галоўнае значэньне мае падзел на ахвяраў, катаў і сьведак. “Ахвяра” —

гэта катэгорыя не псыхалягічная, а грамадзкая, палітычная і этычная” (D, P.79).

Замоўчваньне (голасу) ахвяраў

Гэта зьвязана найперш зь сілай уяўленьняў пра тое, чым павінна быць гістарычнае дасьледаваньне. Погляд, што “гісторык найперш мусіць быць крытычным інтэлектуалам”, што “разгляд прэтэнзіяў на праўду (гістарычных крыніцаў) зьяўляецца абвязковай, але недастатковай для гістарыяграфіі ўмовай”, ня кажучы пра тое, што пошуку праўды мусяць спадарожнічаць “спагадныя, адпаведныя зьяве разуменьне і дыялягічнае ўжываньне мовы” (D, XII), у Польшчы можа абуджаць хутчэй усьмешку, чым зацікаўленьне. Дасьледнік робіць вялікія мэтадычныя намаганьні, каб *ня ведаць таго*, што ведае, і ня чуць таго, што чуе. Яму ўдасца “ўтаймаваць” уласную адчувальнасьць толькі тады, калі ён з усяе сілы будзе намагацца выканаць патрабаваньні сваёй прафэсіі. Прыкладам можа быць павучальны тэкст Анджэя Пачкоўскага пад назвай «Спрэчка вакол «Суседзяў». Спроба папярэдняй тыпалёгіі»[32]. Гэтая тыпалёгія вызначае чатыры асноўныя пазыцыі, вакол якіх круцілася леташняя дыскусія над кнігай Гроса. Яна складзеная бездакорна — у тым сэнсе, у якім гэтае азначэньне функцыянуе ўва ўяўленьнях пра дасьледаваньне гісторыі, і паказвае, што дасьледнік не выяўляе эмоцыяў. Погляды аўтара, аднаго з найбуйнейшых гісторыкаў сучаснасьці, у ёй цалкам незаўважныя. Непрыкметнасьць неяк перадаецца і самому пытаньню, аб якім ідзе спрэчка. Паколькі пра яго гаворыцца так, каб не было відаць месца, адкуль даносіцца голас, па сутнасьці невядома, чаго дэбаты тычацца: ёсьць там нейкія палякі, нейкія жыды, немцы, а таксама іх матывы, аднак нішто не названае па імені. Дасьледнік толькі раз наважыўся сказаць штосьці ад сябе — гэтая папраўка тычыцца… паходжаньня аўтара «Суседзяў». Такі выпадак з правілаў, што кіруюць дадзеным тэкстам, здаецца абмоўкай, але — як здараецца з абмоўкамі — зьяўляецца яго абсалютнай

[32] **A. Paczkowski. Debata wokół**

заслугай (meritum).
У польскім грамадзкім дыскурсе інфармацыя пра тое, што хтосьці габрэй, доўга адыгрывала вялізную ролю (пасля апошняга дасьледаваньня на тэму габрэяў, ажыцьцёўленага CBOS — «Centrum Badania Opinii Społecznej», «Цэнтр вывучэньня грамадзкай думкі»). Анджэй Пачкоўскі, Гроса, як у свой час арцыбіскуп Гацлоўскі — Тадэвуша Мазавецкага, паводзіць сябе згодна з прынцыпамі гэтага дыскурсу. Я не зьбіраюся прыпісваць яму благіх намераў. Я хачу толькі паказаць, што, круці ні круці, нават самы стрыманы гісторык залежыць ад грамадзкіх умоўнасьцяў, і тым больш, чым больш ён запярэчвае гэта.

“Sąsiadów”. Próba wystąpienia z polonii // Rzeczpospolita. 24.08.2001.

Падобнае адмаўленьне цікава асьвятляецца ў памянёнай кнізе Дамініка Лякапра. Мэтай самацэнзуры, заўважнай у працах гісторыкаў фармалісцкай або пазытывісцкай школы, ёсьць, на ягоную думку, “адмаўленьне ўзьдзеяньня, якое — згодна з прынцыпам перанясеньня — дасьледаваная праблема магла б аказваць на актуальную сытуацыю дасьледніка” (D, P.78). У клясычным фройдаўскім разуменьні перанясеньне выражаецца звычайна ў паўтарэньні ці аднаўленьні ўва ўласным дыскурсе працэсаў, якія адбываюцца ў абсягу прадмету дасьледаваньня. Як бы ненатуральна гэта ні гучала для нашага нязвыклага да псыхааналізу вуха, у гістарыяграфіі працэсы перанясеньня ідуць як між дасьледнікамі, так і між дасьледнікамі й гістарычнымі пэрсанажамі ды працэсамі, што дзеяліся ў мінулым. На пэўным узроўні — гэтыя словы адносяцца, напрыклад, да судовых экспэртаў і гісторыкаў — “існуе тэндэнцыя да паўтарэньня траўмы, і, калі не адбудзецца вочнай стаўкі, гэтая траўма будзе вяртацца выпадкова і некантралявана, як тое, што выцесьненае і расшчэпленае” (D, P.143). Гэтая зьява дзеецца заўсёды, і сьвядомасьці яна непадуладная. Праблема ня ў тым, што яна дзеецца, але ў тым, як ёй супрацьстаяць (D, P.36).

У абсягу гістарычных табу чалавечая псыхіка выяўляе проста тэлепатычную пагарду да дыстанцыяў і бар’ераў сьвядомасьці. Усе мінулыя сытуацыі яна трактуе як аднолькава цяперашнія, прычым у тым большай ступені, чым гвалтоўней іх выцясьнялі[33]. У аповедах нават найбольш адстароненых гісторыкаў Галакосту штохвіліны разносіцца рэха аналізаваных

жудасьцяў, зьяўляюцца словы, ацэнкі і алюзіі, якія прыблукалі *адтуль*[34]. Гісторык удзельнічае ў гэтых сэансах, выступаючы наперамену ў дзьвюх ролях: то як сьведка, якога мучаюць згрызоты сумленьня (і які намагаецца іх пазбыцца; гэтага служаць чатыры стратэгіі змаганьня з гістарычнымі забабонамі), то як віноўнік зла, дэман ці забаўка ў руках “гістарычнае непазьбежнасьці”. Нават калі — што бывае рэдка — ён ідэнтыфікуе сябе з ахвярамі, прагнучы пазьбегчы абвінавачаньняў у неаб’ектыўнасьці (цікава, што, тоячы голас ахвярам, гісторык робіцца “небесстароньнім”), ён не рашаецца ні пагадзіцца з гэтым, ні прызнацца ў ім, бо непаказаныя ў яго аповедзе пункты гледжаньня правяцца на ўсё новыя экраны постпамяці і машына міту працуе поўную магутнасьць.

Зрэшты, замоўчваньне голасу ахвяраў ёсьць, на думку Лякапра, паталёгіяй зразумелых ахоўных мэханізмаў, якія пастаянна ўжываюцца гісторыкамі. Гэтыя мэханізмы адыгрываюць важную ролю, баронячы асабістую тэрыторыю дасьледніка ад шокаў, якія можа выклікаць кантакт з гістарычнымі субстанцыяў, перад якімі ён ня можа ўстояць. Калі, аднак, працэс набліжэньня да мяжы такой “стойкасьці” ня будзе своечасова ўсьвядомлены, ён набывае характар пагружэньня, пераходзіць у “суцішваньне” ахвяраў і іншыя нараты ў тэхнікі, пра якія — ніжэй.

Замоўчваньне голасу ахвяраў зьяўляецца ня толькі найгрубейшым рысай гістарыяграфіі, але і par force правасудзьдзя. Гэта выразна праглядаецца ў пасьляваенным судзе над зьдзейсьнікамі зь Ядвабнага, пра які Анджэй Жаплінскі казаў: “...па ўвогуле (на ім) няма (...), няма прозьвішчаў і імёнаў людзей. Нават калі ў залі суду прысутнічае пацярпелы, не разглядае пацярпелым”[35]. За “бесстароннасьць” і “памкненьне да поўнае аб’ектыўнасьці” прыходзіцца плаціць. Цягам гэтага працэсу “замоўчваньне голасу ахвяраў” пражыло значнае, ня толькі моўнае спрашчэньне, зрабіўшыся ўласна папросту “замоўчваньнем ахвяраў”. Анджэй Жаплінскі пісаў: “Эксгумацыя не праводзілася. У гэтым працэсе не бралі ахвяраў. Злачынства палягала толькі ў тым, што жыхары Ядвабнага і ваколіцаў выгналі жыдоў на рынак і таму іх вартавалі. У прысудзе спаленьне жыдоў не фігуруе”[36].

[33] **Sarah Gensburger. Totem and Taboo: Dzieci ocalałe z Holokaustu. s. 85: “Усмоктаньні, — піша Фрэйд, — механізм бартаньня вынятуркануты цуслоўных субстанцыяў, якія адыгрываюць важную ролі, бо тое, што ў прасторы знаходзіцца найдалей, ніякае цікасьці ахоўнае адзінаўным актам самадоцкасьці”.**

[34] **Лякапра аналізаваў гэтае сыстаньне ў сьвятле добрай, але выключна адстароненай**

працы: Raul Hilberg. The Destruction of the European Jews.

35 Ciszej nad tą zbrodnią. Rozmowa

Piotra Lipińskiego z Andrzejem Rzeplinskim // Gazeta Wyborcza. 20—21.07.2002.

Замоўчваньне (голасу) ахвяраў, асабліва калі яны належаць да нацыянальнае меншасьці, — прыкмета ня толькі польскае гістарыяграфіі. Кансэрватыўныя гістарычныя школы, сфармаваныя яшчэ ў XIX стагодзьдзі ў Нямеччыне і іншых эўрапейскіх краінах, зацікаўленыя ў станаўленьні да ўмацаваньні нацыянальнае ідэнтычнасьці, таксама не давалі ім слова. Толькі фігуры маштабу Вальтэра Бэньяміна на важкаго крытыкаваць ідэнтыфікацыю гісторыка з мацнейшым. У нашумелым тэксьце «Пра паняцьце гісторыі» Бэньямін пісаў: “Да каго фактычна прыслухоўваецца прадстаўнік гісторыі? (...) Да пераможцы. (...) Няма такога дакумэнту культуры, які ня быў адначасова дакумэнтам барбарства. А паколькі кам дакумэнт ня вольны ад барбарства, дык ня вольны ад гэтага і працэс перадачы, падчас якога ён пераходзіць з адных рук у другія”[37].

[36] Тамсама.

[37] S.Friedenlander. Nazi Germany and the Jews: The Years of Persecution, 1933—1949. Harper Collins, New York, 1997, s.2: “Іхныя [пыхн ахвяраў] сьведчаньні неабходныя, калі мы хочам зразумець мінулае. Бо зь іх дапамогай высьвятляецца,

Ходзячы па барах, гісторыі не напішаш

Лякапра заўважаў, што ў той самай ступені, у якой гісторык адмаўляе факт перанясеньня і аспрэчвае “афэктыўны, эмпатычны кампанэнт у разуменьні”, ён будзе пярэчыць меркаваньню, што ў адносінах да мінулага ён сам адыгрывае ролю сьведкі (D, P.97). Тым больш неахвотна ён будзе ўцягвацца ў гэтую ролю, правакуючы, зьбіраючы і ўдзельнічаючы ў стварэньні вусных сьведчаньняў.

што тады людзі ведалі і пра што былі ў стане даведацца. Гэтыя сьведчаньні адбіваюць як праніклівасьць, так і поўнае асьляпленьне людзей, якія сутыкнуліся з новай, невымоўна жахлівай рэчаіснасьцю. Толькі сталая прысутнасьць ахвяраў… немінучая ў гістарычным сэнсе, зьмяшчае дзеяньні нацыстаў у поўную пэрспэктыву”.
38
W.Benjamin. O pojęciu historii. Przeł. K.Krzemieniowa // Anioł historii /

Як даводзіць цытаванае ніжэй выказваньне, прычыну таго, што польскія гісторыкі так доўга пагарджалі вуснымі сьведчаньнямі, тлумачыць спэцыфічнае ўяўленьне пісьменнікаў аб прафэсіяналізьме: “Грос ня можа зразумець, — казаў Томаш Шарота, — чаму ніхто раней не займаўся Ядвабным — маўляў, варта было толькі зьезьдзіць, зайсьці ў бар і пагутарыць зь людзьмі. На гэта адкажу: ходзячы па барах, гісторыі не напішаш. Гэта якраз праблема прафэсіяналізму” (JBS).

Red. H.Orłowski. Pozorni, 1996. S.417.

Бязь цяжкасьці можна рэканструяваць прычыны агіды дасьледніка да барнай “oral history”. Кожны, хто “хадзіў па барах”, ведае, што мы ўдзельнічаем ува ўзьнікненьні вуснага сьведчаньня ў нашмат большай ступені, чым гэта дапускаюць агульнапрынятыя мэтады дасьледаваньня. Бо кожная размова, нават такая яе асаблівая форма, як допыт ці іспыт (ня кажучы ўжо пра размову за гарэлкай), раскрывае абодвух суразмоўцаў, таму гісторыкі ўдзельнічаюць у ёй неахвотна. Нельга збудаваць дасьледаваньня толькі на гэтым, але высакамернае адкіданьне самой магчымасьці пазнаёміцца з тым, пра што гавораць людзі ў піўніцы, і тым самым — з свабодна выражанай самасьвядомасьцю групы, нельга патлумачыць рацыянальна. Кшыштаф Чыжэўскі казаў мне, што ў паваеннай Югаславіі існуе выказваньне “чаршыя зна”, што можна перакласьці “гэтак гавораць на рынку”. Каб належна ацаніць чаршыю, ня трэба быць нават этнографам, дастаткова чытаць дэтэктывы.

Той, хто размаўляе з ахвярай злачынства, самім злачынцам або сьведкам, мае нашмат меншыя шанцы выйсьці з размовы нязьмененым, чым той, хто ў цішы архіваў чытае напісаныя ад трэцяе асобы пратаколы допытаў. Той, хто ўвогуле слухае, хоцькі-няхоцькі дазнаецца, якое вялікае значэньне мае тое, як зададзеныя пытаньні, а адгэтуль ужо недалёка да таго, каб улавіць і ацаніць “афэктыўны, эмпатычны кампанэнт у разуменьні”. Добра прадуманымі пытаньнямі можна выцягнуць з суразмоўцы пэўныя зьвесткі, але так жа сама можна няўдалымі пытаньнямі перашкодзіць яму выгаварыцца, асабліва калі прадмет гаворкі выклікае псыхалягічны дыскамфорт. Ілюстрацыяй могуць быць словы Леана Керэса, прэзыдэнта Інстытуту нацыянальнай памяці: “Уласны прафэсійны досьвед дазваляе мне сьцьвярджаць, што гатоўнасьць сьведак распавядаць залежыць у вялікай меры ад асобы таго, хто зьбірае іх сьведчаньні”[38]. Хто ня ставіць перад

сабой пэўных пытаньняў, не атрымае і адказу на іх.

Ці прыглушана адчувальнасьць гісторыкаў?

Якое дачыненьне ўсё гэта мае да прафэсійнае самасьвядомасьці дасьледнікаў мінулага? Цьверджаньне Гейдэна Ўайта, што гісторыкі-прафэсіяналы ўяўляюць сабой “экстрэмальны прыклад прыглушанай адчувальнасьці”, у Польшчы доўга лічылася дурніной, якой ня варта тлуміць сабе галаву[39]. Калі, аднак, прыняць барбарскую ідэю, што на сьвеце ёсьць рэчы, якія не падпадаюць пад кантроль нашае сьвядомасьці, і што падпарадкаваць іх мы зможам толькі тады, калі захочам зь імі сутыкнуцца, у правакацыйным цьверджаньні Ўайта можна было б знайсьці характарыстыку, зь якой, па даўжэйшай рэфлексіі, згадзіўся б не адзін зацікаўлены.

Становішча гістарычных навук у сёньняшнім сьвеце Дамінік Лякапра падае ў выглядзе кантынууму, што мае з аднаго боку полюс радыкальных канструктывістаў (Г.Уайт ці Ф.Энкерсьміт), прыхільнікаў якіх у Польшчы няма, а зь іншага боку — назіцьця “самадастатковай” (self-sufficient research model), або “самавытлумачальнай” гістарыяграфіі, да якой належыць мноства польскіх дасьледнікаў мінулага. Другому з гэтых полюсаў — назавём яго для спрашчэньня “пазытывісцкім” — аўтар прыпісвае пяць характэрных уласьцівасьцяў:

— рэзкае разьмежаваньне (якое набывае форму апазыцыі) аб’екта і суб’екта дасьледаваньня;
— схільнасьць да атаесамленьня аб’ектыўнасьці з аб’ектывізмам;
— атаесамленьне гістарычнага разуменьня з тлумачэньнем прычын;
— адмаўленьне перанясеньня (г.зн. узьдзеяньня апошніх здарэньняў на ўласную сытуацыю гісторыка, як дасьледніцкую, так і асабістую), а таксама магчымасьці ўплыву дасьледніка на прадмет дасьледаваньня;
— адмаўленьне ці мінімалізацыя значэньня дыялёгу з тым, што дасьледуецца, г.зн. “сытуацыі, пры якой іншы будзе надзелены голасам ці пэрспэктываю, што можа пашырыць веды пра назіральніка і нават паставіць яго пад сумнеў, праблематызуючы яго дасьледчыя падыходы, эмацыйныя прыхільнасьці і ўласьцівыя яму вартасьці” (D, P.5).

Я ўжо прыгадвала пра гіпотэзу Лякапра, што

[39] **L.Kieres.Wstęp do: J.Żakowski. Beważ pamięci. Dz. cyt. S.5. Гл. таксама: Ciszej nad tą zbrodnią. Rozmowa Piotra Lipińskiego z Andrzejem Rzeplińskim o powojennym procesie sprawców masakry w Jedwabnem // Gazeta Wyborcza. 20—21.07.2002.**

антырэфлексійнасьць, мэтадалягічная стрыманасьць і дыстанцыяваньне, уласьцівыя традыцыйнай гістарыяграфіі, узьнікаюць ад боязі траўмы, зь якой вымушаны сутыкацца дасьледнік. Як лекар завязвае перад апэрацыяй хвартух, так і гісторык надзявае на сябе кальчугу, якая аберагае ягоную асабістую прастору ад пранікненьня пагрозьлівых сэнсаў (D, P.40). Атрыбутам такога падыходу будзе імкненьне да максымальнага аб'ектывізму, што выяўляецца ў:
— апрадмечваньні таго, што дасьледуецца, каб адсунуць яго на максымальную адлегласьць (табуяваньне мовы, несьвядомае перайманьне мовы злачынцаў[40]);
— замоўчваньні голасу ахвяраў (у гэтым кантэксьце ў спрэчцы пра Ядвабнае іх мова была названая "мовай няшчасьця"[41]);
— аддаваньні перавагі "самадастатковым" сьведчаньням, пакінутым зламысьнікамі (як гарачкавы пошук у архівах Людвігсбургу фільму, нібыта паказанага гітлераўцамі ў Ядвабным, а таксама сьлядоў дзейнасьці там "каманды Шапэра", Біркнэра ці якой-кольвек іншай каманды), канцэнтрацыі на зламысьніках.
Насоўваецца пытаньне: якія шанцы на аб'ектыўнасьць мае дасьледнік, які, зрабіўшы гэткі — аб'ектывісцкі — адбор крыніцаў, сьвядома ідзе на ізаляцыю ня менш як ад паловы рэчаіснасьці? І яшчэ пытаньне: калі б дасьледнік так своечасова ня выключыў "адчувальнасьці", ці быў бы ён сапраўды задаволены несьвядомай повязьзю, што ўтвараецца — дзякуючы прапорцыі дапушчаных да маўленьня галасоў — між ім і ягонымі чытачамі з аднаго боку ды віноўнікамі з другога.

40 Гл.: M. Ptaszyński. **Historycy na stos? Polemika z Joanną Tokarską-Bakir // Krytyka Polityczna. 2002. №1.**

41 **Характэрнай зьявай**

з гэтага шэрагу зьяўляецца шматкроць крытыкаванае перайманьне гісторыкамі тэрміналёгіі табуяванае мовы злачынцаў (пра гэта пісаў Павал Шапіра ўва ўступе да кнігі Анкі Групінскай Po kole. Rozmowy z żołnierzami getta warszawskiego. Warszawa, 1999. S.10). Дарма што гісторыкі Галакосту ўсьведамляюць дэпэрсаналізавана гэтае мовы (“…у псыхалягічн пляне ключом да ўсёй апэрацыі [перавозкі жыдоў у канцлягеры чыгункай] было ніколі

не называць таго, што робіцца”, — піша Рауль Гілбэрг у запісе фільму Лянзмана «Галакост» (гл. с.149); а таксама фрагмэнты аповедаў ахвяраў Галакосту Моткі Зайдля ды Іцхака Дугіна (тамсама, с.24); а таксама цытаваны на с.115 рапарт, што тычыўся разьмяшчэньня людзей у газавых камэрах), мова іх уласных працаў моцна прыпадабняецца да прадмету дасьледаваньня (пра мову

фундамэнтальнае працы Гілбэрга The Destruction of the European Jews. Holmes & Meier, New York, 1985 — гл.: D, P.100, 112 etc.), чаму спрыяюць назначаныя тут прафэсійныя настановы. Гл. таксама: S.Friedlander. Memory, History and Extermination of Jews of Europe. Indiana University Press, Bloomington, 1993. S.130—134.

Сьмерць гераічная і не

Пра цану прыглушэньня адчувальнасьці, а таксама пра тое, што “вяртаньне выцесьненага” тычыцца нават самых сумленных дасьледнікаў, няхай засьведчыць адзін вымоўны прыклад, узяты з размовы Яцака Жакоўскага і Томаша Шароты. Гаворка пачалася цьверджаньнем Жакоўскага: “Вельмі цяжка ўявіць, але ў асэнсаваньні росту тэрору і страху можа шмат даць той факт, што ў першыя дні вайны — яшчэ да таго, як прыехала Гестапа,

42 J.Żakowski, Rewanż pamięci. Warszawa 2000. S.133. Гл. таксама D, P.100.

— ня толькі палякі пасіўна назіралі злачынствы супраць жыдоў. Сякія-такія жыды таксама”. Адказ Томаша Шароты: “Не вазьмуся гэтага сьцьвярджаць. Можна, вядома, спаслацца на нэгатыўныя стэрэатыпы. (...) Але стэрэатыпы ніколі не растлумачваюць гісторыі, яны часта яе фальсіфікуюць. Так ці іначай цяжка зразумець — і Грос у сваёй кнізе не спрабуе растлумачыць гэтага — як 1500 здаровых, у росквіце сілаў людзей, якіх вяла на сьмерць меней чым сотня ўзброеных толькі каламі злачынцаў, не спрабавалі ні бараніцца, ні нават уцякаць”. І далей: “У кнізе Гроса апісаная сытуацыя, што можа крыху прасьвятліць гэтую тайну. Гэта гісторыя жыда Міхала Курапатвы — фурмана, які за саветамі хаваў у сябе польскага афіцэра. Перад брамаю стадолы хтосьці выцягнуў яго з натоўпу, каб уратаваць яму жыцьцё. Але фурман выбраў сьмерць разам з усімі. Грос параўноўвае рашэньне Курапатвы з учынкам Януша Корчака, не падаючы фразы, якую, паводле сьведчаньняў відавочцаў, Курапатва тым часам сказаў: “Куды рабін пойдзе, туды і я пайду”. Гэтыя словы таксама варта ўлічыць, калі мы хочам зразумець фэномэн Ядвабнага”[42]. Томаш Шарота намагаецца тут намовіць нас, што, “каб зразумець фэномэн Ядвабнага”, трэба ўлічыць, па-першае, што і самі жыды спрычыніліся да таго, што іх загінула так многа, па-другое, што ня трэба параўноўваць учынку Міхала Курапатвы з выбарам Януша Корчака, бо той, хто ідзе за рабінам, не заслугоўвае такога параўнаньня. У сваёй інтэрпрэтацыі “фэномэну Ядвабнага” Томаш Шарота ідзе сьледам за тымі, хто — часам ад подласьці, часьцей з-за ілюзіі да сябе саміх — зь незапомных часоў вінаваціць і стыгматызуе ахвяраў. Падобныя абвінавачаньні раз-пораз чуліся ў нашай хрысьціянскай традыцыі, традыцыі людзей, якія ніколі не бывалі ахвярамі. Выштурхоўваючы іх, разьмяжоўваючы сьмерць гераічную і негераічную, нашы суайчыньнікі тым самым выштурхоўвалі саміх сябе, “ўласныя гістарычныя трагедыі, і несьвядома паўтаралі жэст прыгнёту, якім некалі прыкрывалі гета і Катастрофу. Дрэнь спрабавалі пад такі “прымус паўтарэньня” падпадаюць сёньняшнія гісторыкі.

Шмат гадоў таму Маўрыцы Гандэльсман наклаў на жыдоў-сведніка “абавязак усёведаньня”, раіў яму займацца інтраспекцыяй, а “псыхалёгію і лёгіку” ўжываць для мэтадалягічнага аналізу

112 etc.

43 Гл. таксама: A. Bikont, J. Szczęsny, Wielki strach, „Gazeta Wyborcza. 12.07.2002: Гэтыя праблемы, якімі некалі змагаліся многія жыды пасьляваеннай Польшчы, Гарадок 44.

Сёньня “абавязак усёведаньня” дзесьці загубіўся, “інтраспэкцыя” зьведзеная да здаровага сэнсу, а таксама на псыхалягічныя праўды і стэрэатыпы гісторык уведвае куй перш з уласнага досьведу, не беручы ў рукі ані кніг Лякарыса, кусіць Сандэра Л.Гілмана, выдатнага дасьледніка стэрэатыпаў. Нема дзіва, што з пазыцыі дасьледніка ён пераходзіць на пазыцыю інфарматара.

Сама памятаю такую дыскусію з адным з маіх дзядзькоў у Ізраілі — не магла зразумець, як можна лічыць чымсьці нявартым сьмерць без супраціву, калі йдзеш паміраць, абдымаючы сваю маці ці дзіця”.

44

M.Handelsman. Historyka. Zasady metodologii i teorii poznania historycznego. Warszawa, 1928. S. 1, 21, 34.

Клюб гісторыкаў

Уяўленьні гісторыкаў пра тое, што такое добрасумленнасьць у іх дысцыпліне, раз-пораз натыкаюцца на тое, што Ганс-Георг Гадамэр называў самымі падступнымі з прымхаў, — на ілюзіі нэўтральнасьці пазнаньня. Яны зьяўляюцца фактарам, дзеля

якога дасьледнік падпадае пад узьдзеяньне як уплывовых гістарычных табу, так і асабістых забабонаў і стэрэатыпаў, якія ў выніку паддаюць іх спакусе цынізму. Уяўная нэўтральнасьць, якая палягае ў здушэньні таго, што мы насамрэч думаем і адчуваем, выклікае напад з засады: забабоны вяртаюцца, толькі мацнейшыя, а сілы, з дапамогаю якіх можна было б іх распазнаць, пайшлі на маскаваньне й рацыяналізацыю поглядаў, ад якіх мы ня можам адмовіцца. Эўрапейская філязофская традыцыя добра ведае пра гэтую пагрозу і акрэсьлівае яе як vis a tergo — удар з найменш спадзяванага боку. Менавіта пад яго ўплывам рэкамэндаваная Тацытам пазыцыя sine ira atque studio ператвараецца ў сваю ўласную супярэчнасьць — у адмову ад крытыцызму і напаўсьвядомую рацыяналізацыю ня-праўды.

У Польшчы гісторык мае незвычайную сілу. Яго можна параўнаць зь вешчуном, старажытнагабрэйскім прарокам (Юзаф Чапскі). Адказнасьць польскага гісторыка сапраўды вялікая.

Гэта той, каму даверaны скарб ідэнтычнасьці, хто пакліканы пранесьці яго скрозь хаос, зьберагчы. Каб гэты скарб ня зьбрыў дзе проч, мала яго добра схаваць. Закапаныя грошы буцьвеюць, валюта абясцэньваецца, мэталёвыя часткі біжутэрыі пакрывае ржа. Нашыя гісторыкі так рэдка пераглядаюць дэпазыт, што я ўжо пасьпела зьняверыцца, каб пры маім жыцьці хтосьці зь іх на гэта наважыўся. І нават на думку мне не прыйшло, што яны могуць ня толькі адмовіцца ад гістарычных табу, але паставіць пад сумнеў сам "прынцып замоўчваньня" ("zasadę dyskrecji"), абавязковы ў іхным клюбе. У межах гэтага прынцыпу прызнаньне, што падзеі, пра якія піша дасьледнік, робяць на яго ўражаньне — трывожаць, турбуюць, перасьледуюць, схіляюць да адмаўленьня ад тэмы або, барані Божа, да зьмяненьня мэтадалёгіі — зьяўляецца чымсьці немагчымым паводле азначэньня. Не, гэтак робяць толькі сацыёлягі і кабеты, бо сацыёляг розьніцца ад гісторыка гэтаксама, як жанчына ад мужчыны.

Заслуга Яна Гроса ў тым, што ён меў адвагу засьведчыць, якую ролю ў вызваленьні досьведу, замкнёнага ў постпамяці, адыгрывае сёньня гісторык, і дзеля гэтага ён зрабіў усё, што мог. За гэта яго можна выключыць з клюбу гісторыкаў, але ня

45 Ед.: B. Schott. Wiosna Narodów

зьмяніць клюбныя правілы.
Што да правілаў, то дадам яшчэ, што прынцып замоўчвання (“пра нас саміх лепей памаўчым”) спачатку зьявіўся ня ў прозе як вымога арыстакратычнай этыкі, а не буржуазнага savoir vivre. Яго функцыяй была барацьба з нарцысізмам, а не пазьбяганьне рызыкі і не замоўчваньне таго, што ляжыць у думках ці на сумленьні. У двух апошніх выпадках ён супярэчыў бы вышэйшаму за яго прынцыпу праўдзівасьці часам у буржуазнай вэрсіі гэтага прынцыпу за гонар быць лічыцца тое, што этыка папярэдніх эпох лічыла ганьбаю замоўчваньне таго, што насамрэч думаеш і кім зьяўляешся. У спалучэньні з ідэалёгіяй пазытывізму зразуметы таксама прынцып замоўчваньня стаўся сапраўднай атрутай для думкі, кажучы пра цела. Моцнае разьмежаваньне “адчуваньня” і “пазнаньня” — гэта якраз яго справа.

Я ня раз ужо чула, што яго выкрылі як “прадукт мужчынскае аскетычнае традыцыі”, праяву “прагненьня выйсьці ў пошуках праўды за рамкі цела[45]”. Але я ніколі дагэтуль з такой сілаю не ўсьведамляла, як ён адбіваецца на сувязі між свабодай і ведай. Як той, хто ў пошуках праўды “выйшаў за рамкі цела”, можа спатыкнуцца аб чыесьці парэшткі і зусім іх пры тым не заўважыць. І як, трымаючыся нормы прафэсійнага здранцьвеньня, ён ператварае гісторыю ў “аповед вар’ята — голасны, крыклівы, але пазбаўлены сэнсу”. Калі ў сьвеце, дзе пануе гэткае бачаньне гісторыі, зьяўляецца кніга, такая, як «Суседзі», а сьледам за ёй —“посттраўматычнае расстройства”, гэты факт варта лічыць не праявай хваробы, але адзнакай здароўя і нават “доказам існаваньня” — у значэньні, пра якое піша Ганна Краль.

Пераклаў з польскай Андрэй Скурко

Anyway.
A Feminist Respons to Gadamer’s Hermeneutics / Gadamer and Hermeneutics / Edited by Hugh J. Silverman. New York, 1991. S. 203

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]

Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (29) – 2003**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
Літ
Літ
Літ

У нашым родным занядбаным краі,
У наш пануры і бурлівы час?
Ці хопіць ёй адвечных калыханак,
Баравіковых нерушаў,
Рамонкаў,
І ластавак у вечаровым небе,
І ранішніх туманаў над ракой?
Ці зведае яна людскую ласку,
І шчырую сяброўскую спагаду,
І чыстае шчаслівае каханне,
І здрадай не азмрочаную веру,
І гонар за пакутны свой народ?
Ці здолее яна
Хлусню адрынуць,
Ператрываць нястачу і бяссілле,
Узняцца над бядою і адчаем
І неспрыяльны лёс перамагчы?..
Я так хачу,
Каб,
Калі прыйдзе час
Мне з ёю назаўсёды развітацца,
Яна сказала мне спакойна:
“Дзед,
Ты за мяне зусім-зусім не бойся,
І за братоў маіх,
Тваіх унукаў,
І за матулю нашу Беларусь.
Мы не дадзім нікому пахаваць
Ні нашу мову,
Ні дзяржаву нашу.
І ўсе твае няздзейсненыя мары
Мы зробім явай…”
Літасцівы Бог,
Дапамажы да гэткае пары
Дажыць
І ёй,
І мне,
І Беларусі!..
5.09.2003 г.
* * *

Хрыпнуць палітыкі,
Не паспяваюць аддыхвацца журналісты,
Папярэджваючы,
Раячы,
Пагражаючы:
“Будзьце пільныя!
Вакол ворагі —
За спіною,
За вуглом,
За мяжою,
За акіянам.
Аберагайце
Свае сакрэты,
Сваё багацце,
Сваіх начальнікаў!..”
Слухаю гэткае кожны дзень —
І міжволі пачынаю трывожыцца:
А што,
Калі і да мяне
Крадзецца нейкі бязлітасны вораг?
Хаця
Што ў мяне за сакрэты —
Пенсія,
Якой хапае толькі на хлеб і на лекі,
Вясёлае свавольства ўнукаў,
Пісьмы самотных сяброў?..
Ну а багацце?
Так, яно ёсць:
Паліцы разумных кніжак.
Толькі каму яны патрэбныя
Не тое што за акіянам,
А нават у кабінетах мясцовых начальнікаў,
Бо ўсе ж яны —
Па-беларуску?..
Аберагаць начальства?
Навошта?
Яно ад мяне так далёка,
І нічога добрага мне не зрабіла,
І, здаецца, проста не любіць мяне…
Так што няма ніякіх падстаў для трывогі.

А вось жа
Сядаю ў трамвай
І пачынаю па баках азірацца:
Дзе тут мой замаскаваны вораг?
Гэтая цётка,
Што над клункамі дрэмле?
Гэты хлопец,
Што чытае замусолены дэтэктыў?
Гэты міліцыянт,
Што абыякава пазірае ў акно?
Ці, можа, кіроўца шыкоўнай машыны,
Што імкліва прамчалася па вуліцы?..
І на мяне, здаецца, той-сёй паглядае скоса.
Можа, думае,
Што я — дыверсант, закінуты з-за акіяна,
Або вопытны злодзей,
Што цікуе за кашалькамі,
Ці хітры чыноўнік,
Які з кожнага патрабуе хабар?..
Прывярзецца ж такое!
Я ўсміхнуўся збянтэжана.
І, о божа,
У адказ мне ўсміхнуліся
Заклапочаная цётка,
Цыбаты хлопец,
Кіроўца шыкоўнай машыны
І нават суровы міліцыянт.
Значыць,
Яны, як і я,
Хочуць шукаць сяброў —
За спіной,
За вуглом,
За мяжою,
За акіянам.
Значыць, няпраўда,
Што ворагі —
Вакол нас…
І весела пагрукатаў трамвай
Каля важных офісаў,
Каля крамаў,

Каля рэдакцый,
Каля дзіцячых садкоў,
Перапоўнены
Згодай,
Даверлівасцю
І спакоем…
* * *

Змрок загусцеў за акном
І праз хмары прабілася зорка,
Калі я патушыў лямпу
І залез пад цёплую коўдру.
Стома сплывала патроху з плячэй.
Пад падушку хаваліся думкі.
Вейкі салодка зліпаліся.
З пальцаў выслізгвала тонкая нітка дзённых турбот.
Сон ужо плыў нада мною
Ласкавай смугою
І ўсё ніжэй апускаўся…
І раптам
Нехта ў шыбіну грукнуў
Настойліва і нечакана.
Я падхапіўся спалохана:
Хто гэта —
Злодзей?
П'яны сусед?
Ці начная галодная птушка?
Ці разгайданая ветрам
Галінка засохлага бэзу?..
Як ні ўглядаўся,
Нічога
Не змог за акном разгадаць —
Ні адзінокага дрэва,
Ні постаці чорнай,
Ні ценю.
Лёг супакоены,
Так і не ўцяміўшы добра,
Ці гэта праўда было,
Ці прыснілася толькі.
Але,

Як сон мяне мройна пачаў закалыхваць,
Зноў нехта грукнуў у шыбу
Настойліва і неадступна.
Злосна ўсхапіўся я з ложка
І крыкнуў у цемру,
Нібыта ў твар ненавісны
Нахабнаму госцю:
— Хто там?!
І ціха ў адказ даляцела
Нясмелае, сумнае слова:
— Трывога.
І прашаптала яшчэ
Ці ледзь чутна прашамацела:
— Я ўсё па свеце хаджу
І прашуся ў спакойную хату,
Каб каля шчасця пагрэцца,
Прылегчы ў закутку
І ні аб чым не прасіць…
Я пайшоў адчыняць свае дзверы
І запрасіў яе ў хату:
— Заходзь.
Табе знойдзецца месца.
Можам святло запаліць.
Можам разам на лаўцы прысесці,
Паспавядацца
Ці моўчкі паслухаць начное зацішша…
— Дзякуй, —
Яна непрыкметна парог мой пераступіла
І прымасцілася сціпла на ўскраечку ложка.
— Я прытамілася.
Сёння далёка не кожны
Дзверы даверліва мне адчыняе.
Баяцца
Вока чужога, дыхання чужога,
Турботы.
Я ж не хачу дабаўляць ні спалоху, ні злосці.
Я толькі проста напомніць хачу,
Што на свеце
Ёсць і бяздомныя,
Ёсць і самотныя людзі,

Ёсць і няўдаліцы,
Ёсць і сіроты…
Доўга яна яшчэ нешта шаптала,
Ды ўрэшце заціхла.
Так і не змог ужо болей заснуць,
Хоць у шыбу ніхто не пагрукаў…
Спіце спакойна, суседзі:
Трывога
Сёння начуе ў мяне…
* * *

Адключыў тэлевізар,
Выключыў радыё,
Выкінуў на сметнік газеты.
І ажно захлынуўся
Ад цішыні і разняволенасці.
Слухаю перашэпты асенніх клёнаў.
Пераміргваюся з вячэрнімі зоркамі.
Ляжу сабе на канапе,
Успамінаю дзяцінства
І разважаю аб вечнасці жыцця.
А яшчэ магу ўзяць з паліцы томік Купалы
І чытаць,
Напаўняючыся асалодай і здзіўленнем.
І магу гуляць з унукам
Ці напісаць нарэшце лісты сябрам
У Варшаву і Прагу…
Божа,
Як гэта здорава,
Калі з экрану на цябе не кідаюцца з нажом ці пісталетам,
Калі радыё
Не аглушае цябе
Віскам безгалосай пяюхі,
А газеты
Не агітуюць за чарговага выратавальніка нацыі!..
Як гэта, аказваецца, добра —
Быць проста дзедам,
Гаспадаром у сваёй хаце,
Мужам мілай заклапочанай жонкі,
Яшчэ зусім не старым чалавекам,

Які можа сабе дазволіць
Доўга глядзець услед смяшлівым даўганогім дзяўчаткам!..
І так мінае дзень, другі.
Спакайнее свет,
Суседзі робяцца лагаднейшымі,
А вецер — ласкавейшым.
Вечары не псуюць настрою,
І ўспамінаюцца даўнія, амаль забытыя песні…
Але ўжо нешта
Зусім няўлоўнае
Крадзецца тайна ў душу,
Няўклюдна варушыцца там
І нясмела пачынае падаваць голас,
Як птушанятка,
Што выкулілася з гнязда
На мяккую траву
І вельмі хоча назад,
Пад калючы, шумлівы вецер,
Бліжэй да бялёсых аблокаў
І зыркага сонца…
І я не зразумеў спачатку,
Куды паступова знікае ўзрушэнне,
Чаму затуманьваецца радасць,
Чаго не хапае мне ў гэтай задумлівай, засяроджанай цішыні.
Гэта гняце мяне,
Раздражняе,
Робіцца нуднай пакутай…
Пакуль
Не уключаю тэлевізар,
Не лаўлю знаёмую радыёстанцыю,
Не бяру ў рукі стос свежых газет…
Ну вось —
Я зноў у вар’яцкім, праклятым,
Прывычным свеце,
З якога амаль вырваўся…
* * *

Спярша
Сустракаюцца вочы.
Пасля

Сустракаюцца рукі.
Пазней
Сустракаюцца вусны.
І толькі
Калі сустракаюцца душы —
Нарэшце
Прыходзіць каханне.

[image]
[image]

№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Людка Сільнова
Месяц на востраве Патас
Нізка вершаў

Дарога

Зьмілуйся, лёс круты!..
Белых бяроз бінты.
Возера цёмны круг.
Колаў бясконцы рух.
Вежы пастоў ДАІ.
Соснаў ствалы ў гаі.
Елак калючы дрот.
Ластавак хуткі лёт.

Санаторскія клюмбы

Я тут
Упершыню.
Ня кветкі —
Алея агню.
Чырвоны,
Аранжавы, жоўты...
Ваякі
Ў зялёных ботах!

Горда
Трымаюць галоўкі
Кветкі, гвардзейцы,
Сяброўкі.

Белыя бардзюры

Бардзюраў
Вясельны вэлюм.
Усё тут
Акрэсьлена белым.
Дарогі,
Сьцяжыны і клюмбы —
Ўсё белым,
Нардычным і любым.
І — вобразы:
Афіцэры,
Войска, агляд,
Піянеры...
Сьціскаецца сэрца:
“Радзіма!..
Паўсюдна і вечна.
Адзіна”.

Музыка соснаў

Грае
На ўсходзе сонца
Вецер
На арфах соснаў.
Медныя струны
Гаю
Шчыпле,
Перабірае...
Я дабрыду
Да арфаў —
Соснаў ствалы
Пакратаць.
Струны?

А ці — пэргамін?..
Продкаў маіх
Тэстамэнт.

Старое войска

(Верш, напісаны пасьля наведаньня пітнога бювэту)

Гаючай вады напіся,
Салёнай, бы сьлёзы зямлі, —
І сокалам узьніміся
Агледзець дамкі і палі.
Заблытайся ў лябірынце,
Сівых калідорах вятроў,
Бяз тонкай сярэбранай ніці
(Зь якое Бог лёсаў наплёў).
І выйдзі адтуль — героем,
Заўсёдных часоў ваяром...
Ты войска дагоніш — старое,
Як мора, як сонца і гром.
Нас — кожнага — вабіць Тайна
І непадуладны прастор,
І возера чара, і дайна,
Калені і грудзі гор.

Чарадзейная вада

Ляжу сабе
Ў гаючай ваньне,
Крышталяў поўнай
Мінэральных.
Каб менш чуваць
Было мне болю
Ў жыцьці,
Мяне паклалі ў солі.
Бывайце,
Гора і бяда!
Ля горла —
Хрумсткая вада.

Я пазяхну,
Нібыта айсбэрг...
Імгненьне — у дрымоце...
Авэрс...
Дыхнулі сьцюжаю
Багі.
Затрапяталі
Берагі!
...Культура
Выйшла — ўся! — з вады:
Крыніца.
Акіян. Ільды.

На востраве Патас*

1.

Іх поўна на востраве Патас,
Язычніцкіх словаў шурпатых!
Прыкуты да ўласнага болю,
Бывае, рыкае — такое!
Як чорнае сонца! Як коні
Ў чырвонай пене пагоні!
Вайна, хоць за вокнамі — мір:
Гімнастыка, ванны, кефір...

2.

Як словы губляюць свой патас,
Свой “шолам” на востраве Патас!
Гляджу на іх кволыя грудзі:
Яны — тыя ж хворыя людзі...
Вы, бітваў былых ваяры!
Дзе грозныя вашы шнуры?
Дзе вершаў каваных радкі?
Ін’екцыі, ваты шматкі...

*** Востраў Патас (грэц. pathos — боль, пакута) — востраў Болю. Паэтычнае вызначэньне лекавай установы.**

Натуральная школа

Вартуе закон яліна.
Красуе ў сонцы рабіна.

Косы пляце вярба.
Ў ветры зьвініць сасна...
У кожнае — свая роля,
Свая гераічная доля.
І тут маё гасьцяваньне —
Няволя, а ці — заданьне?
Вітаю вас, дрэвы, сёстры,
У час мэталічны, востры!
Сонца барвяны бык
Сьпеліць ахвярны рык.
Вартуе закон яліна...

Муха

Мо ты мне зьвінела над вухам
У ранішнім сонечным сьне,
Маленькая, шэрая муха,
Сьпявала, будзіла мяне?
А зараз, як вецер няўмольна
Аблокамі сонца закрыў,
Абрус з павуціньня павольна
Ў бясьсільлі трасеш — ці ня ты?
Маленькая, шэрая муха...
Сьпявала, будзіла мяне...
Зьвінела паэткай над вухам
У ранішнім сонечным сьне...
І сэрца рванецца! — з аблогі,
Зь вязьніцы, няшчасьця, бо сплёў
Павук павуціньне дарогі
І кінуў на гольчаты дол.

Павуціньне дарог

Між соснаў пасьцелены сініх
Асфальтавы чорны абрус.
Ня вузел дарог — павуціньне,
Дзіравы карункавы круг.
Ён блішча на восеньскім сонцы,
Абліты нядаўнім дажджом.

Аўтобусу, рэйсавай пчолцы —
Паўзьці і гундосіць гудком...
Стаіліся збоку дарогі
Машыны — адна і яшчэ...
Крадзецца Павук шасьціногі,
А час, нібы мёд, не цячэ...

Душа і пастух

І ўбачыла
неба ў аблоках,
Нібыта ў авечках,
у сьне...
Маланкай
пастух адзінокі
Ў празрысты разрыў
сьлізгане!
І там,
на каменнай прыступцы,
На купцы
зямлі над вадой
Авечку ён знойдзе,
прытуліць
І возьме
на неба з сабой.
Умомант
закрыецца вечка
І ўніз
панясецца вядро,
Бляшанае,
з вадкасьцю млечнай, —
У студню...
І выгукне Гром!

Верасы,
або Экскурсія

Кранаюць душу верасы
Колерам бэзава-шэрым.

Ня падчаркі пышнай красы —
Героі: спадарства і сэры.
Па лесе іду скрозь туман,
Сьцяжынай за кімсьці ступаю —
Як рыцарскі даўні раман
Кісейнай паненкай чытаю.
Высока пад неба ўстаюць
Старонкі празрыстае Кнігі —
І ціха дадолу ідуць...
І птушак — трывожныя крыкі.
Героі мінулых часоў
Хаваюцца, скачуць і б'юцца,
І пасмы рудых валасоў
На смурных кустах застаюцца.
Мужчынам закон — ваяваць
І зьведаць мэтал і каханьне...
Галінкі сухія хрумсьцяць,
Як літары слоў, пад нагамі.
Ляжыць неадпраўлены ліст —
Сасновай кары скрутак вузкі.
Чарніцы, як кроплі крыві —
Варожай! — запэцкаюць рукі...
Ля возера экскурсавод
Сабраў нас усіх, быццам варту,
Паданьняў прывёў карагод,
Схіліў над уяўнаю картай.
Уроссып! Пайшлі хто куды.
Зьбіралі суніцы жанчыны.
А хлопцы ля самай вады
Спрачаліся: "Ёсьць!.." — "Немагчыма!.."
Магістар, паклаўшы на рот
Далоні (бы чару ці кола),
Як быццам у туравы рог,
Паклікаў усіх адмыслова...
І зноўку ў дарогу, у шлях
За сонцам, здароўем і сілай!..
А сэрца маё ў верасах
Знайшло свой салярыс і вырай.

Ластаўкі ля маёй лёджыі на дзявятым паверсе

Ластаўкі, ластаўкі,
Шчабятушкі!
Знакі агню! Засланкі
Ў нябеснае печы
(у хмарах — кужэльных пялюшках!)...
Ластаўкі, ластаўкі! Зноўку лятаеце
Каля маёй лёджыі, а ці лодкі,
Ладзьдзі ўжо гатовае — да адчайнага
Паэтычнага падарожжа...
Ластаўкі! Сёньня вы гучна шчабечаце,
Ірвецеся ў Сіняга неба Бязмоўе,
Сабакамі Джэка Лёндана брэшаце —
З кнігі, што ў шлях забяру з сабой я.
Ластаўкі, ластаўкі! Радкі пачатыя,
Рытмы пачутыя і падхопленыя...
Вы — сапраўдныя правакатаркі,
У сьвет закінутыя, непадробныя!

Жнівень—верасень 2003
Берасьце—Патас

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/01/21**

[image]
A R C H E
П а ч а т а к
№ 6 (29) – 2003
[image]
[image]

[image]
[image] [image] [image]
Эўропы
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

Нік Кейв
І ўбачыла асьліца анёла

НІК КЕЙВ (нар. у 1957 у Аўстраліі) — арыгінальны рок-музыка, а таксама драматург і пісьменьнік. У 1980 г. з сваім першым гуртом «The Birthday Party» пераехаў у Лёндан, а потым у Заходні Бэрлін. Там ён пачаў пісаць свой раман «І ўбачыла асьліца анёла», апублікаваны у 1989 г. Уступную

23 І ўбачыла асьліца анёла Гасподняга, які стаяў на дарозе з аголеным мечам у руцэ, і збочыла асьліца з дарогі, і пайшла на поле; а Валаам пачаў біць асьліцу, каб вярнуць яе на дарогу.
24 І стаў анёл Гасподні на вузкай дарозе, паміж вінаграднікамі, *дзе* з аднаго боку сьцяна і з другога боку сьцяна.
25 Асьліца, убачыўшы анёла Гасподняга, прыціснулася да сьцяны і прыціснула нагу Валаама да сьцяны; і ён зноў пачаў біць яе.
26 Анёл Гасподні зноў перайшоў і стаў у цесным месцы, дзе не было куды збочыць, ні налева, ні направа.
27 Асьліца, убачыўшы анёла Гасподняга, легла пад Валаамам. І запалаў гнеў Валаама, і пачаў ён біць асьліцу кіем.
28 І разамкнуў Гасподзь вусны асьліцы, і яна сказала Валааму: што я табе зрабіла, што ты б’еш мяне вось ужо трэці раз?
29 Валаам сказаў асьліцы: за тое, што ты паглумілася зь мяне; калі б у мяне ў руцэ быў меч, дык я цяпер ужо забіў бы цябе.
30 А асьліца сказала Валааму: ці ня я твая асьліца, на якой ты езьдзіў з пачатку да гэтага дня? ці мела я звычку так рабіць з табою? Ён сказаў: не.

31 І адкрыў Гасподзь вочы Валааму, і ўбачыў ён анёла Гасподняга, які стаяў на дарозе з аголеным мечам у руцы, і пакланіўся, і ўпаў на аблічча сваё.
(Лікі, 22*)

Тры бліскучыя браты-груганы, дзюбатыя, хвастатыя, кружляюць, наразаюць кругі ў сырым трывожным нябе, пакідаюць лётныя змрочныя колы на густых пухлінах д'яцтва. Дагэтуль празрыстае і блакітнае скляпеньне над даліной сьпі, далібог, *раве*. Сьсюль, дзе я ляжу, хмары здаюцца мохам; яны выплёўваюць вялізарных безаблічных зьвяроў, і гэныя карчуцца і мруць гэнак, угары.

А груганы ўсё лётаюць, усё кружляюць, толькі цяпер бліжэй — цяпер бліжэй — цяпер бліжэй да мяне.

Гэтыя хітрыя птахі — птушкі сьмерці. Яны цікуюць мяне ўсё жыцьцё. І толькі цяпер я магу прывабіць іх. Сваімі зрэнкамі. Па-мойму, я чы не прыпамінаю, як сьпіцца на гэтым мяккім цёплым коле гразі, бо рытмы майго цела адмяніліся. Але. Бяззубы рот гэтай магілы засмоктвае мяне; я падаю ў гэтую багну, у гэтую яму — хоць я й баюся замачыць сваю руку-забойцу. Папраўдзе, покуль я гэта кажу, два груганы сочаць мае вочы, а гэныя вочы — як шпурнутыя на падлогу манэткі, а груганы кружляюць і ждуць. Тым часам аблокі дыму курчацца і мруць угары; і я бачу, што ўжо цямнее і што я зьнік ужо на чвэрць, чы амаль на чвэрць; і мяне засмоктвае ўсё глыбей.

частку гэтай гісторыі пра нямога хлопца, які жыве сярод вад'яцтва й нянавісьці, мы прапануем вашай увазе.

*** Пераклад Васіля Сёмухі.**

Там, унізе! О, далінка!
Два зьбітыя калены зямлі падымаюцца й агаляюцца, і між імі ўтвараецца складка. І во мы рухаемся ўніз па яе шурпатым міжножжы, дзе на хісткіх схілах пад цяжарам густой лазы прыгінаюцца дрэвы. Некаторыя зь іх зьвісаюць у даліну пад небясьпечным вуглом, іх патрывожаныя карані вылазяць з глебы на схілах, бо яны пакутуюць ад паўзучага цяжару, які і падтрымлівае, і зьвязвае, і навальваецца, нібы сусьвет, на іх галіны. Гэты навіслы апоўзень, гэтыя дрэвы сплеценыя міжсобку, прыкутыя да зямлі лазой.
Вандруючы з поўдня на поўнач — за лётам гругана, мы рушым галоўнай дарогай, што бяжыць у плоскім жываце даліны. Адсюль, з вышыні, дарога нагадвае стужку, і мы праводзім позіркам першыя з сотняў гектараў трысьнягу, што тлее ўнізе. Сёньня першы вечар сэзоннага “падпалу”, важная і надта ж сьвяточная падзея для даліны Юкулор, калі ўсе жыхары

выходзяць на палеткі паназіраць, як сьцяна агню зрывае з трысьнягу непатрэбную лістоту, яго “сьмецьце”. Але сёньня тут, на начных загонах, — дзіўная цішыня: мокрыя мяхі ды кіі-зьмеябоі ляжаць параскіданыя абы-як; яскі агню і шэры попел моўчкі плывуць над зямлёй на крылах павольнага ветру. Цукровая фабрыка распаўзлася ўздоўж усходняга боку даліны, за мілю ад места. Можна чуць роўнае бурчаньне матораў. Ваганэткі — некаторыя пустыя, а некаторыя крыху загружаныя — стаяць на рэйках, бы забытыя.

Ляцім далей наперад, над самім местам, дзе ржавыя рыфленыя дахі гуртуюцца ўсё шчыльней і дзе мы можам убачыць дзіцячую пляцоўку, будынак суду і мэмарыял плошчы.

Там унізе, пасярэдзіне плошчы, у самым сэрцы даліны, разломваецца і бурыцца пад ударамі трох мэханічных молатаў мармуровы склеп, у якім ляжаць мошчы прарока.

Купка апранутых у чорнае людзей у жалобе, збольшага жанчынаў, назірае, як руйнуюць помнік. Паглядзіце, як яны выюць і скрыгочуць зубамі! І паглядзіце на велічнага мармуровага анёла: ягоны твар захоўвае сьвяты спакой, адна рука высока ўзьнятая, трымае пазалочаны серп; няўжо анёла таксама збураць?

І далей, праз гэтую мітусьню, праз навальнічнае сэрца места, дзе жанчыны смуткуюць, нібы на хаўтурах, разагараючы сваё гора так, што ўласнаруч зьбітыя грудзі чарнеюць, а на костачках кулакоў выступае кроў. Зірнеце, як яны абмахваюць вуліцы сваімі дзікімі чорнымі рухамі, скручваюць у кулаках складкі гаматнае апраткі ў здрыготах маленьняў пад трагічныя ўсхліпы.

Адсюль зьверху яны выглядаюць індычкамі.

Зробім кола над гэтымі стварэньнямі смутку, а потым — далей над местам, над купкамі вагончыкаў, у якіх ля ўзножжа рухавых палёў жывуць секары трысьнягу. Тут, у гэтую цёмную пару, засталіся толькі іхныя жонкі і спалоханыя дзеці. Стоячы каля вокнаў, выпускаючы на шыбы здані свайго духу, яны слухаюць, як маторы — а дзе маторы, там і іх мужчыны — з рыкам рухаюцца на поўнач, а потым сьціхаюць сярод шоргату і трэску палёў.

Але рушым далей. Ляцім наперад. Ці вы ўжо стаміліся, браты? Рушым за дарогай на Мэйн, пакуль трысьнёг рэзка ня спыніцца, утыркнуўшыся ў голы паркан з калючым дротам, за чатыры

мілі ад места, за дзьве мілі ад паўночнага ўезду ў даліну. Тут можна пабачыць пікапы, грузавікі і трактары, якія падымаюць коканы чырвонага пылу, збочыўшы з галоўнай дарогі ў напрамку закурэлых фанэрных халупаў. Тут жывуць выгнанцы, бадзягі, набрыдзь вакольная.
Самотная халупа на гары сьмецьця гарыць а гарыць, рыгаючы пурпуровым дымам у трывожнае паветра.
Хоць крылы ўжо стаміліся — яшчэ крыху далей.
За халупай зямля вільгатнее, дрыгвянее, і з балота падымаецца купка расьлінаў — высокія дрэвы, народжаныя ў балотным прыгоне, вылезьлі з паўзучага пырніку і бадзякоў і накінулі на свае драўляныя плечы шаты кручанай лазы.
Тут мы спускаемся ніжэй, даем нырца, бо гэта каралеўства багны. Плывучы над балотам, мы бачым ланцуг паходняў, якія міргаюць пад цёмнай павалокай, рухаючыся да сярэдзіны балотнага круга вузкай істужкай сьвятла.
У самым сэрцы багны — невялічкая пляцоўка, круглая, бы талерка. Унутры гэтай пляцоўкі, як кола ў коле, круг чорнай дрыгвы, ад якой падымаецца пара; круг дастаткова вялікі, каб паглынуць быка. Але стоп! Ляцім! Кружляйма! Глядзіце, хто ляжыць на паверхні гразі, скурчаны, нібы немаўля! Глядзіце, як ягоныя косьці выпінаюцца з-пад скуры. Як ягоныя рэбры мякка рухаюцца ад кожнага ягонага подыху. Глядзіце, ён амаль голы. І глядзіце, ён зусім нерухомы.
Акрамя гэтага вока.
Яно круціцца ў вачніцы, нібы рыбінае, і гіпнатызуе нас. Мы заміраем і даем круга.

Тым ранкам, калі яны нараджаліся, першым з улоньня вырваўся ягоны брат, і гэты адзіны сьцьвярджальны акт нібы стварыў супрацьлеглую інэрцыю ў ягоным далейшым жыцьці. Эўкрыд, тады яшчэ безымянны, ухапіўся за братавы ногі й пляснуўся ў сьвет ува ўсёй славе няпрошанага госьця. Паўдзённае сонца круцілася ў небе, як расплаўленая жалязяка, грукаючы па прасмоленых дошках, зь якіх былі зьбітыя сьцены, па блясе, якою халупа была крытая. За сталом у хатцы, у атачэньні хітрамудрых самаробных прыладаў — змацаваных спружынаў ды сталі — сядзеў Татулька. Ад невыноснай сьпякоты зь яго ліўся пот; ён змазваў свае пасткі й марна спрабаваў абараніць вушы ад жончынага трызьненьня. Тая

сп’яну дзіка раўла, распластаўшыся на заднім сядзеньні згарэлага «Шэўрале». Гэтая машына — гонар сьметніку — стаяла на цаглінах за халупай, нібы здаравязнае ракавіньне, якое з агідай адкінуў нейкі волат.
Там між родавых сутаргаў ягоная вечна п’яная сяброўка жыцьця праклінала той цуд, што набракаў і варушыўся ў яе ў жываце. Смокчучы пляшку з уласнаручна выгнаным пойлам «Белы Ісус», яна разгойдвала «Шэўрале» і стагнала, крычала, крычала і стагнала “Та! Та-а! Та-ат-ка!”, пакуль не пачула, як дзьверы халупы двойчы грукнулі. Тады яна разьвіталася з раніцай і згубіла прытомнасьць.
“Была надта бухая, каб тужыцца”, — неяк потым сказаў Эўкрыду Татулька. Выцягнуўшы выпіўку зь ейных зацятых абдымкаў — бо нават непрытомная, жонка ўсё чаплялася й чаплялася за бухло, — Татка асьцярожна разьбіў пляшку аб іржавы бампэр машыны.
Паклікаўшы на дапамогу ў якасьці павітухі інтуіцыю і падрыхтаваўшы для рэзаньня вялікі кавалак шкла, ён разьвёў ногі сваёй непрытомнай жонкі-парадзіхі і лінуў ёй на срамоцьце самагону. І вось пасьля шэрагу бацькавых праклёнаў, сярод гудзеньня летняй жамяры, пад небам, дзе вісела сонца і не было ніводнай аблачынкі, з жудасным крыкам і патокам сікаў, навонкі вываліліся два сьлінявыя пакункі.
“А божачкі! Два!” — ускрыкнуў Татка, але адзін зь іх хутка памёр.

Унутры халупы на стале стаялі побач дзьве скрыні з-пад садавіны, засьцеленыя газэтай. Пасткі на зьвяроў Татулька перанёс і разьвесіў на сьцены.
Дзьве скрыні, і ў кожнай — па немаўляці. Татка зазірнуў усярэдзіну.
Ніводнае дзіцё ані піскнула; абодва даволі спакойна ляжалі на сьпінах, голенькія, як белы дзень, з расплюшчанымі вачыма, што ўвесь час блукалі. Татка выцягнуў абгрызены аловак з кішэні штаноў і, прыжмурыўшыся, нахіліўся да малых ды накрэсьліў на сьценцы скрыні зь першынцам «№1»; потым, пасьлінявіўшы кончык алоўка, «№2» — на скрыні, дзе ляжаў Эўкрыд. Потым ён зрабіў крок назад і пачаў па чарзе разглядаць малых, а тыя ахвотна адказвалі яму тым самым. Дзіўныя былі ў іх вочы — абрысамі яны нагадвалі мігдаль,

з крыху набрынялымі павекамі і амаль бязь вейкаў, блакітныя, але такія бляклыя, што колер амаль межаваў з ружовым, пільныя, старанныя, яны не спыняліся ні на хвілю — яны кружлялі, загадкавыя вочы-заблуканцы кружлялі і падрыгвалі ў бязбровых вачніцах.
Маленькі Эўкрыд кашлянуў, коратка і рэзка, ягоны цацачны ружовы язычок лізнуў вусны, а потым зноўку схаваўся. І, нібыта чакаў сыгналу і пазнаў яго ў Эўкрыдавым нясьмелым кахіканьні, сьмелы першынец заплюшчыў вочы і праваліўся ў сон, зь якога ўжо так і не прачнуўся.

“Бывай, браце”, — сказаў я сабе, калі ён сыходзіў прочкі, і цэлую хвіліну я думаў, што мне таксама капцы — настолькі блядзкім холадам патхнула ад ягонага паміраньня.
Потым празь мёртвую ноч данёсься шалёны гармідар, ад гэтай сучкі, маёй маці, Матулькі. Яна выдавала найдзічэйшыя, блюзьнерскія клёны, нібы дрыстала матамі, і адначасова лупіла па дзьвярох «Шэўрале», але гучней за ўсё чулася: “Дзе-е-е маё-о-о бухло-о-о!”
“Дзе-е-е маё-о-о бухло-о-о!!”

Татулька замацаваў мне лыткі і тулава нейкімі стужкамі, што трапілі яму пад руку, прымусіўшы мяне захоўваць гарызантальнае становішча ў маёй скрыні — у маёй калысцы, — але мяне грызла неадольная патрэба паназіраць, што мой брат зьбіраецца рабіць цяпер, калі ён так зьнянацку скочыў у Вечнасьць. Таму я адважыўся падняць галаву, у надзеі хаця б на момант убачыць ягоны вобраз.
Мяне выпхнулі ў Жыцьцё без папярэджаньня, кінулі за борт з гэтай п’янай сыраквашы цяжарнасьці — о гэтая ўтульнасьць, дзе мы плавалі б і плавалі! — і я быў цяпер пакінуты сабе, яшчэ не ачуняўшы ад траўмы народзінаў, — натуральна, што маё разуменьне гэтай апошняй Таямніцы, як вы самі можаце здагадацца, не грунтавалася на багатай інфармацыі. То бок скуль я мог ведаць, як па-сьвінску Сьмерць была падобная менавіта да сьмерці?
У любым разе, колькі я ні рваўся й ні цягнуў шыі, мае путы ня слаблі — не-а, зусім ня слаблі, і ўрэшце я кінуў усялякую надзею. Задыхаўшыся й змучыўшы сябе бясплённай працай, я ляжаў і думаў — думаў пра свайго сьвятога брата ў суседняй

скрыні з-пад садавіны, думаў: як жа ён, нахер, трапіць на Нябёсы, калі яму хаця б напалову гэтак жа цяжка, як мне, высьлізнуцца з сваіх путаў?
Але я здолеў вызваліць адну ручку за час сваёй першай, вялікай, бясплённай і ўрэшце злавеснай барацьбы — і малюпусенькай костачкай я прастукаў пасланьне, карыстаючыся сыстэмай стукаў, грукаў ды паўзаў, якую мы з братам распрацавалі, калі плавалі ў мяккім цурчаньні ўлоньня.
Не- -Забывайся- -Свайго- -Брата- -Адкажы
Але брат не адказаў. Я прастукаў другі раз, дадаўшы напрыканцы *Калі ласка*, але ён ізноў не адказаў. *Калі ласка.* Не губляючы рашучасьці, я распавёў яму пра Жыцьцё й запытаўся, ці не надала яму раптам Сьмерць нейкіх чарадзейных сілаў. Мае сыгналы зрабіліся настойлівыя й бязладныя. Бясплённыя стукі гучалі пуста і самотна, завісаючы без адказу над маёй скрыняй.
Жыцьцё- -Дрэнь- -Пекла- -Ці- -Можаш- -Ты- -Лятаць- -Бля- -Бляха- -Памажы
Нарэшце я набраўся моцы і зьбітым, вільготным ад сьлёзаў кулачком прастукаў апошняе пасланьне па сьценцы сваёй скрыні.

Спусьцілася ноч — цяпер я гэта ведаю, — аднак, лежачы ў сваіх путах, згублены ў сваёй самоце, назіраючы з усё большым страхам за тым, як дзённае сьвятло ператвараецца ў сутоньне, запаўняючыся вычварнай музыкай цемры — крыкамі соваў, няспынным скавытаньнем, хапатлівымі крокамі ды выцьцём, ад якога халаднела кроў, — я падумаў, што сьвету гамон.

Распачаўся Судны Дзень, але я мог толькі ляжаць — і больш нічога ня мог рабіць. Во я акурат і ляжаў — ляжаў там, даючы цемры паглынаць мяне, пакуль я чакаў на Ягоны Суд, на маланкі і галасы, навальніцы, землятрусы і вялікія пошасьці. Мой сьвет павольна задыхаўся ў дамавіне страху і цёмных ценяў. Калі я ўжо ня бачыў нічога, акрамя густога змроку, я пачуў, як нехта злавесным крокам — цяжкім і няроўным — падняўся на ганак і спыніўся ля дзьвярэй.
Я сьцяўся ад страху ў сваёй скрыні.
Дзьверы з жудасным віскатам расхінуліся, бразнула клямка,

пачулася гучнае: “Ябаныя дзьверы!” Потым — выбух белага сьвятла, ляскат-грукат дзьвярэй, жудасная адрыжка — і ў пакой увалілася мая маці, ня гледзячы навокал, пратупала і зьнікла празь іншы ўваход.
Адзіная голая лямпачка зьвісала з столі проста над маёй скрыняй. Лямпачка падрыгвала, горача, бессаромна й гіпнатычна, а я ляжаў на сьпіне й назіраў, усё больш злуючы, як натоўп начное жамяры кружляў вакол яе, утвараючы клублівае і гудзючае сузор’е. Я бездапаможна глядзеў, як больш-менш штохвілінна нейкая занадта жвавая мошка, матылёк ці муха білася аб сьмяротную лямпачку, перапальваючы ў попел свае крылцы й лапкі. Іхныя марныя палёты сканчаліся балючым спускам і нязьменным прызямленьнем у скрыню, дзе ляжаў я. Маю калыску засьмецілі вусякі з ампутаванымі крылцамі — яны круціліся, дохлі жахлівай сьмерцю; апошняя агонія кожнага зь іх адбывалася ўва ўсёй сваёй крыклівай жудасьці проста перад маімі вачыма, і тут яны ўрэшце сустракалі канец сваіх дзён, пазбаўленыя жыцьця — мёртвыя, як халодны камень.
Тады я даведаўся, чаму мой аплаканы брат-нябожчык выглядаў такім прыгнечаным. У ім не засталося Жыцьця. Толькі Сьмерць.

Ну а потым вярнуўся дзень. Набрынялае сонца зараўло з усходу тлустымі гукамі масьляністага сьвятла, абудзіўшы ўсю даліну сваім залацістым шумам.
Два круганы гыкалі й кракалі ў небе. Дзесьці на пагорку завыў дзікі сабака. Я пачуў цвырканьне галодных куранятаў. Недзе побач у адчаі роў мул. Чуваць было дурное шчабятаньне жаўрука. Рупліва гулі пчолы.
Здавалася, увесь сьвет вакол мяне патрабаваў увагі. Аднекуль з чэрава даліны даносіліся гукі званоў. Крумкала трысьняговая жаба. Гула муха. Сыгналіла машына, выяжджаючы на галоўную дарогу.
Здавалася, увесь сьвет вакол мяне патрабаваў, каб пра яго паклапаціліся. Быў час паклапаціцца пра куранятаў і птушанятаў, цялятаў і казьлятаў, ягнятаў, парасятаў і немаўлятаў.
Мне была дзіка патрэбная ўвага. Далібог. Мне было жудасна патрэбная ежа. Маё цела жадала падтрымаць свае жыцьцёвыя сілы. Як доўга мне давядзецца чакаць? Вы ведаеце? Я хіба не

казаў, што *я пізьдзец як жраць хачу*?
Я падумваў наконт таго, каб зьесьці пару засмажаных вусякоў, што ляжалі ў мяне на пузе... але не...
Замест гэтага я вырашыў нарабіць шуму — абудзіць увагу маіх гадавальнікаў так, як гэта робяць усе забытыя галодныя дзеці, — таму я набраў у лёгкія паветра й завыў, завыў, закрычаў, завіскацеў, зароў, выгукаючы такія рэчы, як *“Карміце мяне!”*, ды *“Есьці!”*, ды *“Цыцу!”*, і ўвесь гэты час я дрыгаўся і тоўк нагамі, спрабуючы вырвацца з путаў, якія так хітра наладзіў Татулька — вядомы майстар на розныя пасткі, — і кожны рывок майго дзіцячага цельца толькі зацягваў путы яшчэ крыху шчыльней, скоўваючы мае рухі яшчэ болей, таму празь нейкую хвіліну маё маленькае буянства было абмежаванае сцыканьнем азадку, дзікім вярчэньнем вачыма, высалопліваньнем языка і, натуральна, гурбой словаў. Як жа яны зьляталі ў мяне зь языка! Як яны выплёскваліся з маіх вуснаў — вялікія жудасныя словы з самай глыбіні майго чэрава — *“Карміце мяне!”*, *“О Сьмерць! Няўжо я мушу галадаць?”* і *“Сукі, накарміце мяне зара’ жа!”* — і, разумееце — *вы ведаеце што?* — нягледзячы на ўсе мае крыкі ды лямант — усё мае выцьцё ды ныцьцё — увесь мой жывёльны рык і дрыстаньне, і каціныя сьпевы, — нягледзячы на *ўсё* — вы ведаеце *што?*
Не пачулася ні гуку, ні піску — ані з маёй скрыні, ані з майго сувою.
Так, не пачулася ні гуку, ні піску.
Гэтае адкрыцьцё зьбіла мяне з панталыку. Я адчуваў сябе падманутым. Надураным.
Адчуваў сябе самотным.
Адзінай вольнай рукой я абдзёр газэту, якая высьцілала сьценкі маёй скрыні. Скачуліўшы паперу ў шарыкі, я пачаў яе смактаць, размочваючы яе, а потым глынаў.
Празь нейкі час я здолеў заглушыць голад гэтай мізэрнай пажывай. На поўны жывот я глыбока пазяхнуў і вярнуўся думкамі да свайго брата, які ляжаў у суседняй скрыні. Зноўку пазяхнуўшы, гэтым разам яшчэ глыбей, я заплюшчыў вочы і, засынаючы, падумаў: чы быў мой брат таксама нямы?
“Мусі, я ніколі ўжо дакладна не даведаюся”, — памятаю, што гэтая думка была ў маёй галаве, калі сон абгортваў мяне.
“Мусі, ніколі ўжо дакладна не даведаюся”.
Я прысьніў свайго брата й сябе разам на Нябёсах; мы сядзелі на

цёплых мяккіх аблоках. Ён кранаў струны сваёй залатой арфы, і кроплі срэбных гукаў падалі на мае цела. Мы лыбіліся.
Брат скончыў іграць і падняўся ў паветра. З набраклых венаў на яго чорных крылах сачыла гразкая сьлізь. Ён пацёр валасатыя ногі і надзеў арфу, якая ператварылася ў вянец, сабе на галаву. Я спрабаваў ляцець, але ў мяне яшчэ не было крылаў, толькі белае безвалосае цела лічынкі — я быў бездапаможны, лежачы на сьпіне — на сьпіне. Мой брат паказаў на мяне пальцам і закрычаў: *“Злодзей!!”, “Ідзі ад мяне!!”, “Ідзі ад мяне!!”, “Ідзі ад мяне-е-е!!!”* Потым я ўбачыў, што Нябёсы зрабіліся чырвоныя і багністыя і што я павольна плыву, паварочваючыся штораз, калі чую падвойны ўдар: *“Бум-бум… Бум-бум… Бум-бум… Бум-бум…”* — нібы сэрца.

Я прачнуўся.
Мой бацька схіліўся над мной, як крывы кій. На ягоным шэрым твары два бляклыя вочкі кружлялі ў сваіх вачніцах.
Татулька прысеў, трымаючы ў руках міску ды батон.
Я смактаў лусту размочанага ў малацэ хлеба, якую Татулька мне даў. Яна была цёплая і салодкая.
Татулькавы пальцы пахлі дзёгцем і шмаравілам для пастак.
Спаталіўшы голад, я заткнуў рот і павярнуў галаву ўбок. Болей я ня мог трываць гэтага едкага хімічнага паху.
Бацька падняўся.
Я ўбачыў, што сядзеў ён на перагорнутай скрыні з-пад садавіны!
Я пашукаў вачыма свайго брата. Мой брат зьнік! І скрыня зьнікла! Побач з імной на яе месцы стаяла мэталёвая пастка на зьвяроў, пакуртая чорнай тлустай змазкай. Сківіцы пазяхалі! Спружыны курчыліся! Зубы прагнулі крыві!
Я адвёў погляд, у галаве шумела кроў. Далібог.
Татулька выходзіў з хаты. На ягоным левым плячы ляжала доўгая рыдлёўка. Менавіта тады я скмеціў ягоную сівую галаву, напаўпрыкрытыя валасамі шнары й дзірку на месцы аднаго з вушэй.
У руках ён трымаў скрыню з-пад абутку, перавязаную шпагатам. На ёй было накрэсьлена «№1».
З ангельскай пераклаў Аляксей Знаткевіч
паводле: Nick Cave. *And the Ass Saw the Angel.* — Penguin Books, 1990.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Аляксей Бацюкоў
Міты поўначы Магілева

АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ (нар. у 1977) — пісьменьнік, эсэіст. Выкладае філязофію ў Магілёўскім дзяржаўным тэхналягічным унівэрсытэце. Апошняя публікацыя ў ARCHE — артыкул «Штурханьне ўбок» (№1-2003).

На поўначы Магілева канчаецца зямля. Тут у рэках цяжкія воды, лес падыходзіць да самых дамоў і засьціць сонца. У людзей на поўначы Магілева чорныя зубы.
За вакзалам жыла вялікая сям'я, у жонкі было дрэннае вока. Вяртаючыся дамоў, муж шторазу наракаў на яе абы за што і некалькі разоў біў. Аднойчы жонка вынула сваё дрэннае вока і на яго месца паставіла добрае вока свайго старэйшага сына. Гэтым вечарам муж не чапаў яе і мірна лёг спаць. Наступным днём яна ўзяла вока сваёй дачкі і муж, не заўважыўшы падмены, добра паставіўся да жанчыны. Трэцім днём яна памянялася вокам з малодшым сынам, але той таемна падклаў дрэннае вока ў талерку бацькі. Пабачыўшы яго, мужчына зразумеў, што дарэмна біў жонку.

Сой-Сой — маленькі хлопчык з вуліцы Кірава — выкупаўся ў кар'еры, але пакінуў на пяску свой мокры сьлед. Суседзкі кот сеў у гэты сьлед, ператварыўся ў Сой-Соя і прыйшоў да яго дамоў. Маці заўважыла, што хлопчык худзее і чарнее, а праз скуру яго прабіваецца густая поўсьць, і пачала націраць яго настоем дубу. Але несапраўдны Сой-Сой пачарнеў яшчэ больш і выпусьціў з-пад вопраткі свой хвост. Маці здагадалася, хто

перад ёй, паклаўшы на галаву жывёлы зялёны лісток — на твары адразу вырасьлі вусы. Яна сказала: “І дзіця маё хворае, але маніёкі трэба перш налупіць”. Кот схапіў яе за руку і закрычаў: “Я хачу маніёкі. Пакармі мяне, а іначай увап’юся ў тваю скуру кіпцюрамі”. Аднак маці адсекла нажом яму хвост, і кот ледзьве ўцёк у расчыненыя дзьверы. Хвост ператварыўся ў рой мух, яны ўсе сталі лётаць па пакоях і загінулі толькі пад зіму.

Мужчына ішоў уздоўж будоўлі і кашлянуў. Лайдак, які ішоў побач, перахапіў гэты кашаль, так што мужчына хутка пачаў задыхацца і памёр, а яго цела зацьвіло.

Адзін чалавек па плячо ўклаў руку ў воды Дняпра. Раптам плыня зьнесла руку, а чалавек застаўся на беразе.

Адзін міліцыянт сасьніў, што на вялікай паляне бандыт закапаў шмат грошай. Ён прачнуўся і закрычаў жонцы:
— Жонка, рыхтуйся мяне сустракаць. Зараз я вярнуся дамоў багатым.
Міліцыянт апрануў сваю форму і пабег на паляну. Там ён пачаў капаць зямлю, выкапаў нямецкую бомбу і ўзарваўся. Бандыт сядзеў у хмызах і доўга рагатаў.

Вядома, што старыя жанчыны часам палююць на малых дзетак, асабліва калі пачынаюцца халады. Ужываць дзетак ім бывае неабходна, каб набрацца сілаў да наступнага лета. Так, адна бабулька стаілася блізу дзіцячага садка і ўжо была выскачыла з свайго сховішча, каб скрасьці самотную дзяўчынку на ўскрайку пляцоўкі, як раптам наляцелі круганы і задзяўблі бабульку.

Другі міліцыянт сабраўся лавіць рыбу. Ён сядзеў з вудай на беразе і сьпяваў вясёлую песеньку: “Ум-ла-ла-ла! Ум-ла-ла-ла! Мае доўгія валасы і тоўстыя ногі падабаюцца жанчынам!” Тут з вады паказалася голая прыгожая дзяўчына. Яна паклікала міліцыянта да сябе. Той адклаў вуду, зайшоў у раку і абняў дзяўчыну, надумляючы, дзе зь ёю легчы. Аднак яна моцна схапіла яго рукамі і ледзьве не зацягнула за сабой на дно. Міліцыянт вырваўся, толькі рыбіна луска засталася на яго

вопратцы, пераліваючыся белым, шэрым і чорным колерамі. З таго часу міліцыянты на поўначы Магілева ходзяць у плямістай форме.

[image]
[image]

№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Даніла Жукоўскі
Ідзі і глядзі

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ — публіцыст, крытык літаратуры, сталы аўтар «ARCHE». У мінулым нумары часопісу апублікаваў эсэ «Ерусалімскі лёс». Робіць на гарадзенскай гуце.

— Той дом на пагорку… Якога ён колеру?
Энн спачатку паглядзела, пасля адказала:
— З гэтага боку ён белы.

Р.Э.Хайнлайн
Чужынец у краіне чужых

1

Некалі ў Амерыцы сябры Згуртавання амерыканскіх фантастаў дзеля забавы склалі спіс ураду Злучаных Штатаў, нарадзіўшы пасады калегам па пяру. Прэзідэнтам быў “абраны” Р.Э.Хайнлайн — выбар, з якім пагодзіцца кожны, знаёмы з творамі Вялікага Майстра амерыканскай фантастыкі. Хайнлайн заўсёды ведаў, што будзе па-амерыканску, а што не, — і апантана сцвярджаў першае й ганьбаваў другое. Канфуцый Новага Свету…

Згуляйма нашымі, так бы мовіць, фігурамі: Адам Глобус — галоўны банкір, Андрэй Федарэнка — міністр асветы, Вінцэсь Мудроў — амбудсмен, Славамір Адамовіч — лідэр правай фракцыі ў парламенце, на якога збіраюць кампрамат усе беларускія журналісты, Юры Станкевіч — прэм’ер Ураду Народнага Даверу, якому народ аніякага даверу не ахвяроўваў, але ад працы якога, магчыма, будзе-такі нейкая карысць…

Цяжэй знайсці пасаду Ўладзіміру Арлову, які “парадаваў” апавяданнем «Маша і мядзведзі» (ARCHE №1, 2002): зануpаны ў псіхалагічнай багне комплексаў, ягоны лірычны герой выпадае з канкрэтнага сацыяльнага часу і прасторы. Дзе ж тая «Незалежнасць — гэта…»!

На дзяржаўную службу беларускіх пісьменнікаў лягчэй было б уладкаваць у Рэчы Паспалітай XVI—XVIII стагоддзяў. (Хто такі Караткевіч? Гетман вяліка-літоўскі.) Кашталяны, старасты, ваяводы — пажыццёвыя пасады, якія давалі не столькі абавязкі, колькі грошы ды значныя палітычныя ролі. Бо амерыканская гульня са складам віртуальнага ўраду застанецца, вядомая справа, забавай, а пытанне, ад чыйго імя гучыць публічнае выказванне (тэкст, фільм, спектакль, артыкул), дзе будуе аўтар свой назіральны пункт, як сочыць за рэчаіснасцю, з якой ступенню шчырасці й асэнсавання падае свае назіранні публіцы, — для Беларусі больш чым актуальнае. Можна нават казаць пра імператыў сацыяльнага пазіцыянавання апавядальніка.

2

Людзі чуйна ставяцца да неадпаведнасці зместу і формы выказвання свайму ўяўленню пра таго, хто гаворыць: вунымся гэтаму з маленства і ўсё жыццё. Вучоная фраза ў вуснах чалавека малакультурнага выклікае ўсмешку, інтэлігент, які спрабуе гаварыць “проста”, не да месца ўжываючы нізкія моўныя абароты, — грэблівасць. Нас бянтэжыць прагматызм святароў, дражняць прамовы спрытных кар’ерыстаў і несумленных дзялкоў. Апавядальнік — інфармацыйная крыніца, а стаўленне да інфармацыі залежыць не толькі ад яе зместу, але й ад таго, адкуль яна паходзіць.

Не гэтак страшна тое, што апавядальнік у беларускіх літаратурных тэкстах рэкрутуецца з вузкага дыяпазону сацыяльных тыпаў, як тое, што яго імавернасць вельмі часта робіцца ахвяраю аўтарскіх звычак. Дысананс паміж роляй крыніцы інфармацыі і аўтарытэтнасцю апавядальніка ў вачах чытача даўно зрабіўся праблемай літаратуры і нават публіцыстыкі.

Асабліва цяжка даюцца рысы асобаў інтэлігентных (а інтэлігент застаецца і патэнцыйным, і сапраўдным чытачом беларускіх твораў). Неабгрунтаванае ўжыванне дыялектызмаў,

[1] Гісторык і электроншчык ствараюць камп’ютарную імітацыю машыны часу, і падчас эксперыменту з удзелам высокапастаўлена чыноўніка, а раней сталінскага карніка, адбываецца сустрэча апошняга са сваёй ахвярай і расплата.

прымітыўны інструментарый апісанняў, няведанне асаблівасцяў гаворкі й паводзінаў згубна ўплываюць на пераканаўчасць твору. Зміцер Падбярэзкі сапсаваў добрую задуму[1] няведаннем стылю паводзінаў маладых вучоных мусіць, ніколі з імі не сустракаўся, не бачыў позіркаў, поўных гонару за ўласную геніяльнасць, не чуў захаплення сваёй навукай у кожным слове. У выніку — схема замест аповеду, хаця ягонаму пяру наагул не адмовіш у дакладнасці і вобразнасці.

http://www.bdg.minsk.by/culture/literature/zmit/praga.shtml

Асабліва ж не шанцуе на апісанні тэлеперсонам. Няма нічога прасцейшага, чым назваць дыктарку мажнай цёткай, а тэлевядучага папулярнага шоў — дзецюком у шыкоўным гарнітуры. Інтэлігент, калі перадача падабаецца, не ўбачыць у тэлевізары “цётак” і “дзецюкоў”. Чалавек на экране выкліча паблажлівасць ці раздражненне (з адпаведнымі вясковымі асацыяцыямі), калі будзе выразна супярэчыць канцэпцыі перадачы, але хібы яшчэ трэба апісаць, каб чытач пра іх даведаўся.

Перанос асаблівасцяў успрымання заможнасці і высокай культуры, уласцівых маладому небагатаму правінцыялу, на самаўпэўненых, няблага адукаваных, бітых жыццём прадстаўнікоў сталічнага сярэдняга класу, ужыванне пекені вясковага побыту ў апісаннях гарадскога жыцця працуе на вобраз нахабніка-чужынца, які са сваімі вульгарнымі ўяўленнямі лезе не ў сваё кола. Правінцыялізм яшчэ можна дараваць, а як быць з шырынёй кругагляду? Чалавеку з вышэйшай адукацыяй, выпрацаванымі поглядамі на права ўласнасці, палітыку, рэлігію, гісторыю, мастацтва прыемней мець за партнёра-суразмоўніка чалавека адпаведнага ўзроўню, а не разумніка-самавука, які не чытаў нічога па-за школьнай праграмай і не цікавіцца нічым, апрача спосабаў вырошчвання бульбы, адкорму парсючкоў і ачысткі самагону. Калі госць заўважае назвы кніжак на паліцах і часопісу на століку, памятае імёны ўлюбёных выканаўцаў сваіх знаёмых, то нельга чакаць, што ён будзе ў захапленні ад суразмоўніка, які падрабязна распавядае адно пра колер мэблі, колькасць выпітага ды стан тых, хто гэта выпіў.

Вось і ў гістарычных творах коле вока тая ж пралетарызацыя апавядальніка — недарэчная тым больш, што змест грунтуецца

[2] **Сялучына. 1991. №2. С.106–107.**

[3] **Маладасць. 2003. №4–6.**

пераважна на крыніцах, якія адлюстроўваюць погляды вышэйшых слаёў грамадства. У недалёкім мінулым да таго схілялі ідэалагічныя патрабаванні — згадайма «Песню пра зубра» ў перакладзе Язэпа Семяжона: Вітаўт не “з верай глыбокай даваў служкам царкоўным дары”, а “адвальваў з угоддзяў на скупа”[2]. Сёння гэта ўжо толькі дрэнная звычка. Спроба Алеся Наварыча спалучыць у рамане «Літоўскі воўк»[3] макра- і мікрагісторыю і вытлумачыць першую з дапамогай апошняй выявілася не надта ўдалай менавіта таму, што аўтару не хапіла ведання сацыяльных адносін, сацыяльна абгрунтаваных асаблівасцяў менталітэту, фактуры асабістых лёсаў, няважных для гісторыкаў, заклапочаных дзяржавамі і нацыямі, але неабходных для мастацкага тэксту. Аўтар у дадатак свядома абыходзіць ключавыя падзеі паўстання 1863 году, спрабуючы паказаць фон — “хваляванне грамадскай думкі”, — не кранаючы асяродкі “вялікай палітыкі”. Героям, аднак, не стае індывідуальнасці, бо, не маючы дастаткова фактычнага матэрыялу, пісьменнік залішне залежыць ад схемаў і інтэрпрэтацый крыніцаў, якія засяроджваліся якраз-такі на вызначальных падзеях і буйных дзеячах, асвятляючы паўстанне з якога заўгодна гледзішча, толькі не з гледзішча жыхароў палескае глушэчы. І — самае галоўнае — гэтыя крыніцы вызначаюцца занадта высокай ступенню абагульнення, каб на іх аснове пераканаўча абгрунтаваць паводзіны асобных жыхароў далёкай перыферыі імперыі. Раман Наварыча ў чарговы раз пацвердзіў, што беларуская шляхта для большасці беларускіх літаратараў — з’ява зусім невядомая.

Рэканструкцыя ментальнасці найніжэйшых грамадскіх слаёў таксама патрабуе вялізных высілкаў, і стэрэатыпы пралетарызацыі звычайна ёсць або праявай празмернай фантазіі, або сведамым фальшаваннем, даведзеным да абсурду. Немагчыма без усмешкі чытаць шмат якія месцы ў творах пра Скарыну, героям якіх абсалютна незнаёмыя саслоўныя межы. Сёння пралетарызацыя што апавядальнікаў, што герояў гістарычных твораў — прыкмета слабой падрыхтоўкі аўтара. Але й моц звычкі адыгрывае сваю ролю: нават Вольга Іпатава ў «Альгердавай дзідзе»[4] піша пра князёў, іхнія інтрыгі і закалоты, цалкам падпарадкаваўшыся легендзе, якая мае ўсе рысы простанароднага падання: поўна магіі, але няма

атрыбутаў светапогляду феадалаў (веры ў сваё дадзенае ад нараджэння прызначэнне кіраваць, прагі асабістае славы і г.д.). Пісьменніца глядзіць на сваіх герояў вачыма смердаў эпохі, нашмат пазнейшай за пару дзеяння, для іх Альгерды і Яўнуты — асобы казачныя, незразумелыя, велічныя — і больш нічога. Ейны апавядальнік прасякнуты прымхамі і забабонамі, фактычныя ж веды пра падзеі ў княскім асяроддзі дайшлі да яго праз плёткі княскіх служак, памяць бацькоў і дзядоў, да яго нараджэння стаўшы “песняй у народзе”. Погляд чалавека асвечанага (на меру эпохі), знаёмага з рэаліямі вялікай палітыкі, у «Альгердавай дзідзе» ледзь адчувальны. Хаця, праўду кажучы, усе гэтыя недахопы блякнуць перад сапраўднай энцыклапедыяй памылак — “кінашэдэўрам” «Настасся Слуцкая», дзе з мікраскопам немагчыма адшукаць праявы княскае годнасці, арыстакратычнага выхавання ці прыдворнай цырыманіяльнасці. Асабліва ўражвае сцэна суду і пакарання выкрытага здрадніка — друцкага *князя*, якога невялікі натоўп слуцкіх месцічаў хапае і цягне на кол. Але мо гэтага толькі й заслугоўвае князь, які кажа даверанай асобе: “Мы, простая шляхта...”?

Чалавек робіць выбар “маё — не маё” амаль несвядома, на падставе пабежнага пошуку агульных культурных каштоўнасцяў, адзнакаў разумення (зусім не абавязкова ўжывання) суразмоўцам ці аўтарам кодаў пэўнае субкультуры. Для тэкстаў кшталту «Машы і мядзведзяў», «Цывілізацыі Заходняга будызму» ці «Адарка і пацукі»[5] гэтае тэставанне інтэлігентным чытачом дасць адмоўны вынік раней, чым паўстане пытанне пра мастацкі ўзровень тэксту — зусім неабавязкова нізкі.

Мне ўжо чуюцца пратэсты: адсутнасць інтэлігенцкага погляду — апошняе, у чым можна абвінаваціць пісьменніка Ігара Бабкова. Сапраўды, не менш адштурхоўвае снабізм і прэтэнцыёзнасць, спалучаныя з нулявым узроўнем сацыяльнай ангажаванасці. Іншы раз можна на хвілю забыцца, што галоўнае ў літаратуры — роздум пра чалавека, і аддацца фармальным прыгожасцям, самавыяўленню, асалодзе ад чыстае творчасці, слоўнай алхіміі — але не назаўсёды. Словы, словы, словы, іх кшталт і парадак, гармонія паміж імі — не найважнейшае, гэткі падыход выклікаў пагарду яшчэ ў знакамітага героя Шэкспіра. Слова — гліна літаратуры,

з якой робіцца посуд, але ані ў якім разе не змесціва гэтага посуду. Аўтар мусіць запоўніць яго *думкамі* пра чалавека — і соцыюм. Бо, як той казаў, жывучы ў грамадстве, ад яго не схаваешся. І героя свайго не схаваеш.

5

«Цывілізацыя Заходняга будызму» Ігара Бабкова была апублікаваная на http://www.litara.net/, «Адарка і пацукі» Паўла Місько — у «Крыніцы» №7-2001. Апошні твор апісвае трагедыю старой вясковай кабеты на фоне дэградацыі беларускай вёскі. Пацукі прынеслі

Адарцы скарб, і праз гэта яна дазналася пра маральнае падзенне сваіх аднавяскоўцаў і ўласнага сына, страціла ўсё, чым жыла.

3

Беларускае грамадства больш не параўнальна аднародны маналіт, як за савецкім часам. Расслаенне набірае моц і хуткасць, і сацыяльны статус усё больш вызначальна ўплывае на светапогляд асобы. Погляды людзей больш не абмяжоўвае адзіная дазволеная ідэалогія, улада не так пільна сочыць, каб сацыяльная няроўнасць не занадта выяўлялася ў штодзённым жыцці. У савецкай літаратуры назіралася тэндэнцыя абмяжоўваць сацыяльныя адрозненні вышынёй культурнага ўзроўню, чым выдатна падкрэслівалася адзінства савецкага народу. Ва ўмовах усё больш вострых сацыяльных падзелаў паводзіны й шкала каштоўнасцяў людзей, іхнія настроі, звычкі, стэрэатыпы й эмацыйныя рэакцыі — складнікі літаратурнага вобразу — больш не змяшчаюцца ў пракруставым ложы гэткай “маналітнасці”.

Надзея Садзікава крыху парадаксальна падае гэта як страту глебы пад паняткам рэальнасці[6]. Не адмаўляючы ейнае рацыі ў шырокім разуменні праблемы, варта пазначыць прыватнейшы, але нашмат рацыянальнейшы механізм дэзарыентацыі — памнажэнне суб’ектыўных варыянтаў рэчаіснасці з прычыны ўсё большага разыходжання сацыяльных пазіцый. Шыкоўны аўтамабіль, дарагая вопратка, абед у дарагім рэстаране ацэньваюцца па-рознаму тым, хто можа гэта сабе дазволіць, і тым, хто не можа, а таксама ў залежнасці ад прычынаў, па якіх памянёныя даброты знаходзяцца ў полі

дасягальнасці або не. Гэтаксама праца за 200 долараў на месяц для аднаго — вяршыня мараў, для іншага — непрыемны ўспамін працоўнага мінулага або знак прыналежнасці да кола няўдачнікаў.

Цяга да містыфікацыі грамадскіх з’яваў, адзначаная Садоўскай, цалкам зразумелая: гэта змяншае напружанне ў грамадстве. Чым менш рэальным для сярэдняга грамадзяніна будзе чалавек, які заробіць 40 мільёнаў долараў, зняўшы ў дрэнным кінафільме, тым лепш. Персоны тыпу Гейтса ці Курнікавай проста не маюць права на існаванне ў рэальным жыцці, занадта бо падкрэсліваюць яго несправядлівасць, і іх неабходна пераводзіць у катэгорыю прывідаў.

У дачыненні да супербагатых гэта мае сэнс, але што з тымі, хто яшчэ не зарабіў (і ніколі не заробіць) свайго першага мільёна? Гэта значная частка нашых суайчыннікаў і сучаснікаў. Што адчувае чалавек, зарабіўшы ў 30 разоў болей, чым год таму? Як прызвычайваецца да свайго новага статусу, мяняе погляды на людзей і навакольны свет? Мне вядомая адна сур’ёзная спроба адказаць па-беларуску на не са столі ўзятыя пытанні, зробленая Леанідам Мараковым, рамантыкам і песняром пары першапачатковага назапашвання капіталу. Маракоў ідэалізуе прадпрымальнікаў і прадпрымальнасць — але свядома і непрыхавана. Наўрад ці ягоныя тэксты можна лічыць узорам бесстароннасці, але яны прывабліваюць асаблівасцямі аўтарскага гледзішча. Беларускі дом сёння мае сцены, пафарбаваныя ў розны колер. Варта абысці і агледзець яго з усіх бакоў.

Праблема адаптацыі мастацкага зроку да новых жыццёвых рэалій паўстае перад усімі без выключэння пісьменнікамі. Ці паспяхова яе вырашае канкрэтны творца, залежыць не толькі і не столькі ад ягонага таленту, але ад вастрыні адчування грамадскай сітуацыі, здольнасці заўважаць і аналізаваць грамадскія феномены.

4

Дакладнае пазіцыянаванне — умова неабходная, але не дастатковая. Апавядальнік лучыць два светы: свой “унутраны” і чытацкі. Асаблівая жыццёвая сітуацыя гераіні Алены Брава[7] — жонкі студэнта-кубінца, якая разам з ім, ужо інжынерам, прыязджае на Кубу, а потым уцякае адтуль з маленькаю

дачкою, выключная культурная рознасць з новым асяроддзем зрабілі магчымым тое, што мала каму ўдавалася на айчыннай глебе: ці не кожны апісаны ў аповесці прыватны выпадак за сабою аўтарскія сацыяльныя абагульненні. Чытаючы яе, мы не з экзатычнай краінай, а з анатоміяй таталітарнага грамадства, сціпла, асцярожна, старанна трымаючыся канкрэтных рэалій і фактаў, але на ўзроўні, які прымушае згадваць Оруэлаўскі «1984». З дробязяў нішчымнага кубінскага жыцця — бясконцых чэргаў, тлумных дэманстрацый, паўсюднага дэфіцыту, палітычнага фанатызму — паўстае пазнавальны для нас, якія не зусім забылі савецкія часы, малюнак.

А мазаіка жаночых гісторый Евы Вежнавец у «Гаючай нянавісці»[8] адлюстроўвае хіба што анатомію фемінісцкае душы, якая з апошніх сілаў імкнецца адпрэчыцца ад рэчаіснасці. Калі ў кожным эпізодзе «Каменданцкага часу...» можна ўгледзець апісанне пэўнае з'явы, то ў не менш насычаным рэаліямі тэксце «Гаючай нянавісці» бачацца хутчэй абрысы міфалагічнай свядомасці: жанчына моцная і добрая, мужык слабенькі й сапсуты. І ніводнае спробы зрабіць першы крок цвярозага аналізу — пашукаць адказ на пытанне «Qui prodest?». Менавіта "каму на карысць", а не знакамітыя "хто вінаваты" і "што рабіць", ёсць пачаткам сумленнага даследавання.

Каб спалучыць дэталізацыю й абагульненне, даводзіцца адначасна "быць" у дакладна акрэсленым пункце сацыяльнае прасторы і аглядаць яго звонку, дамагаючыся вычарпальнасці, імкнуцца, каб асобны факт рабіўся тлумачэннем іншых. У аповесці Андрэя Федарэнкі «Нічые» прысутнічае погляд нашага сучасніка, псіхолага, гісторыка — і паспалітага ўдзельніка падзеяў, які бачыць толькі тое, што бачыць сваім вокам. Штохвіліны нагадваючы пра гістарычную дыстанцыю, аўтар асэнсоўвае гісторыю Слуцкага паўстання. Аб'ектыўнасці не спрыяе прорва часу, якая аддзяляе нас ад падзеяў, як у аповесці Алены Брава аддзяляе геаграфічная аддаленасць. Але ў «Нічыіх» адчуваецца недахоп дакладнасці бачання і адстароненасць аўтара выглядае часам штучнай. Гэта мо таму, што піша ён пра Беларусь: абагульненні на айчыннай глебе рабіць цяжэй — больш інфармацыі (за дэталямі губляецца агульнае) і больш адказнасці (кожны можа не

7 **Каменданцкі час** // **Маладосць. 2003. №3.**

8 **АРКНЕ. 2003. №2(285)**

пагадзіцца й выказаць сваё меркаванне — гэта ж вам не Куба заморская). А да таго ж — менш звычкі.

Выдатны прыклад грэблівага стаўлення да сацыяльнага аналізу — спрэчка паміж Нілам Гілевічам і Міколам Аўрамчыкам пра аўтарства «Сказу пра Лысую Гару». Слухаючы і чытаючы разважанні апошняга пра “смяхоцце”, “раёшнік” і да т.п., я спачатку падумаў быў, што Аўрамчык не тое што не пісаў — не чытаў паэмы. Але прэтэндэнт нядбала цытуе славутыя радкі з раздзелу пра час, век і эпоху, і робіцца зразумелым: для яго гэта — капрыз суаўтара, дагэтуль незразумелы. Падрабязнасці кожнага дачнага дамка — во гэта цымус!..
У старажытным кітайскім пейзажы існавала правіла злучаць у адным малюнку два гледзішчы: слімака і птушкі. Нечага падобнага — разнастайнасці пры захаванні суцэльнасці — прагне душа падчас чытання нашых празаікаў. Але ў беларускага пісьменніка сціплы асартымент гледзішчаў і яшчэ сціплейшае жаданне надаць высновам закончаную форму, як гэта зрабіў Гілевіч (прынамсі ў гэтым прэтэндэнты згодныя) у апошнім раздзеле «Сказу...». Адно вока ў беларускага літаратара звычайна вясковае — паводле паходжання і традыцыі, другое філалагічнае — паводле традыцыі і адукацыі, а трэцяе, магічнае, якое й павінна забяспечыць творчай асобе дадатковыя магчымасці, надзейна схавана пад тоўстай і непразрыстай лобнай косткай і глядзіць пераважна ў нутро пісьменніцкай свядомасці.
Магчыма, зірнуўшы вачыма звычайнага інжынера, настаўніка, прадаўца з міні-рынку на план новага апавядання пра тое, што вось, маўляў, я, сярэдняга ўзросту і неакрэсленага, але неклапатлівага занятку індывідуум ішоў па неназванай вуліцы ды меў выпадак без дай прычыны займець гэтакі меланхалічны настрой, за што дзякую Авалакітэшвары, Амітабху, Бадхідхарму ды Акудовічу Валянціну, — ён раптам зразумее, што ёсць тэмы цікавейшыя.
Магчыма, нехта ўбачыць дэтэктыўную фабулу, узіраючыся ў пустыя цёмныя вокны недабудаванага катэджу, ці сюжэт фантастычнага раману ў прамовах апантанага славянафіла. Мала што можа здарыцца. Адно ведаю пэўна: калі нехта ўгледзіцца ў душы сучаснікаў, то, прасвяціўшы іх рэнтгенам з розных сацыяльных ракурсаў, не знойдзе там стымулаў для

чарговага надрыўнага апавядання пра сумны лёс знаёмага бамжа з вышэйшай адукацыяй ці знаёмай жа прастытуткі з валасатымі нагамі. Надрыву хапае. Ён лёгка родзіцца ў розумах і душах, замглёных штодзённымі высілкамі і недахопам дакладнай, разумна, па-сяброўску арганізаванай (user-friendly, кажуць па-ангельску) інфармацыі. Яго сыцяць дэмагагічныя пасажы афіцыйных СМІ і безадказна-адстароненыя “аналітычныя матэрыялы” неафіцыйных.

5

Не без віны тут, на мой погляд, літаратурная крытыка. Замала ўвагі надае яна менавіта асаблівасцям сацыяльнага самаўсведамлення і пазіцыянавання аўтара, засяроджваючыся на пытаннях тэхнікі і стылю, повязяў з мастацкімі плынямі і г.д. Між тым аналіз творчасці Івана Шамякіна, шамякінскай візіі савецкага жыцця быў бы больш цікавы і павучальны, чым самі тэксты пісьменніка.

Узаеміны творцы і соцыюму прыдаліся б для вырашэння нават чыста літаратурных загадак. Найбольш перспектыўны кірунак — Адам Глобус, носьбіт нетыповага для беларускага пісьменства патрыцыянскага светапогляду. Ён паўстае са старонак сваіх тэкстаў арыстакратам, які з усіх сітуацый выходзіць з чыстым сумленнем (у сэнсе адсутнасці маральных пакутаў) і чыстымі рукамі (у сэнсе адсутнасці даведзеных злачынстваў). Бруд не ліпне да патрыцыя, пачуццё ўласнай лепшасці дапамагае ў перыпетыях жыцця. “Тэма прыгажосці, ці, дакладней, аўтарскага самалюбавання, — скразная тэма зборніка. Яна праяўляецца на самых розных узроўнях, канстатуе Ганна Кісліцына ў рэцэнзіі на кнігу «Брасланаўскія стыгмата»[9]. — Удачлівы злодзей, добры плывец, які выпырне з любой сітуацыі, — адзін з некалькіх іміджаў апавядальніка... Гэта не проста эгацэнтрызм, а ўсвядомленая прыналежнасць да касты, якая лічыць свае капрызы важнейшымі за жыццёвыя патрэбы іншых.

Вымоўней нават за ўласную творчасць Глобуса сведчыць пра гэта публікацыя дзённікаў бацькі, Вячаслава Адамчыка, — учынак змушае згадаць біблейнае паданне пра сыноў Ноя[10]. Але пыхлівы нарцысізм і маральны рэлятывізм Глобусам не прапагандуюцца — гэта прыдатна для яго (з прычыны ягонае выключнасці), а не для “масаў”. Прызнанні кшталту “Па сваёй

[9] **Ловы ветру** // www.litara.net

[10] **“І бачыў Хам, бацька Ханаанаў, сарамату бацькі свайго і, выйшаўшы, расказаў...” Быццё 9:22.**

прыродзе я злодзей, самы натуральны, ад нараджэння” падкрэсліваюць непрызнанне аўтарам/апавядальнікам нашага права выносіць прысуд ягоным учынкам, у той час як сваё права судзіць іншых ён згадвае да абсурду часта і настойліва (у апавяданні «Аўтапартрэт з разбітым носам» Глобус выказвае спадзяванне, што, апынуўшыся на тым свеце, ён зможа працаваць у пекле, дапамагаючы чарцям караць грэшнікаў). Патрыцыянская пазіцыя не толькі стварыла аўтару паўскандальны імідж, пра які згадвае Г.Кісліцына. Вобраз арыстакрата, вымушанага “пакінуць родавы замак” дзеля будзённай (і паводле азначэння бруднай) справы зарабляння грошай, упалага анёла між грэшных людзей надае ягоным пісанням неабходную арыгінальнасць, без якое “показкі былых каханак”, гісторыі пра “дробныя падзеі свайго жыцця”, пра “жаданне вымкнуцца са свету матэрыяльных і сацыяльных “чарупінаў”, стаць у цэнтры рэчаў, дакрануцца да восі быцця” (усё пазначэнні Кісліцынай з артыкулу «Ловы ветру») наўрад ці выклікалі б тую непадробную цікавасць, якую няварта тлумачыць адно фінансавымі магчымасцямі Адамчыка-малодшага.

Калі для Адама Глобуса адмысловая сацыяльная самаідэнтыфікацыя зрабілася падвалінай літаратурнага поспеху, самавызначэнне Марыі Вайцяшонак (зборнік «Сад нявіннасці»[11]), супярэчліва ўплывае на яе творчасць. Паходжанне з рэпрэсаваных польскіх каланістаў служыць крыніцай натхнення і маральнай моцы, але роля спадчынніцы светлых традыцый незваротна зніклага абшарніцтва жорстка канфліктуе з бачаннем жыцця, якое дыктуе пісьменніцы ейны характар, яе, выбачайце высокае слова, душа.

11

Вайцяшонак Марыя. Сад нявіннасці. Мінск, 2002.

У «Садзе нявіннасці» нельга абмінуць паэтычныя апісанні месца дзеяння. Яны гучаць як урыўкі з патаемнае навукі пра таямніцы сусвету, аскепкі веды, дадзенай вышнімі сіламі абдоранай аўтарцы. Навакольны свет паўстае поўным унутранага напружання, глыбокага таямнічага сэнсу. Але мора паэзіі, пасярод якога апынаецца чытач, “ступіўшы” ў гэты тэкст, нагадвае ваду ранняй паводкі — пад ёю, халоднаю, вірліва-каламутнаю, жывою, хаваецца некрануты цяплом слізкі і падступны лёд сумных жыццёвых гісторый. Карыстаючыся ўласным вобразам пісьменніцы, нібы сухая навальніца грыміць над прагнай да вады зямлёй, душыць набрынялым ад чакання залевы паветрам, але нават самаму цярпліваму не падорыць палёгкі — літаратурная чара Тантала.

Аўтарка, або яе alter ego — галоўная гераіня, нават у самых кранальных сцэнах застаецца па-над натоўпам. Псіхалагічная шчыліна паміж імі шкодзіць глыбіні псіхалагічных партрэтаў вясковых жанчын, якім пісьменніца прысвяціла большасць апавяданняў зборніка, і зводзіць на нішто лірычны запал паэтычных апісанняў. Жыццё сялянак у навелах Вайцяшонак праходзіць пад дыктат двух словаў, якія аўтарка ўжывае ці не ў кожным апавяданні: “труднаваць” і “пільніца”, што, поруч з неўладкаванасцю асабістага жыцця, робіць іх хадзячымі ілюстрацыямі да Эклезіяста. “Якая карысць чалавеку ад усёй працы ягонай, якую ён робіць пад сонцам?” Труднуюць і змагаюцца з пільніцай дзень пры дні й ноччу таксама, але навошта — няма адказу.

Малюючы, як выціскаецца чалавечае з гэтых гаротніц, аўтарка адмовіла ім у здольнасці заўважаць нават жыццёвы поспех уласных дзяцей. Не дзіўна — бо сама яна параўноўвае гэтыя сялянскія хаты з поўнымі клецямі ды шалёна прыбытковыя фірмы-аднадзёнкі з тым, сапраўдным жыццём, калі абшарнік “аўтаматычна” меў і багацце, і высокі сацыяльны статус. Параўнанне патаемнае, і тым лягчэй яго рабіць, што ўсё страчана незваротна, упрыгожана светлым вэлюмам

пакутніцтва і збавеннаю імглою часу.
У выніку саступак асабістым сацыяльным ілюзіям губляецца дакладнасць бачання. У Вайцяшонак, як падаецца, не адна, а некалькі душаў. Ейная anima бачыць усё аскепкамі цэлага, часткамі сусветнай душы, імкнецца да паяднання раз'яднанага, а manes, што высочвае прывіды мінулага ў здзічэлым парку ды на руінах маёнтку, кажа, гледзячы на людзей навокал: "Гэта не мае, чужыя". Старажытныя рымляне ўважалі, што па смерці чалавека anima ідзе на неба, а manes — у апраметную...
У выпадку з Адамам Глобусам ягоная індывідуальнасць прыцьмявае рэаліі навакольнага жыцця, але не скажае іх — патрыцыянскі цынізм звычайна ідзе поруч з цвярозым бачаннем і разуменнем жыцця. Унутраны канфлікт падвоенае душы, саманятоеснасць мастацкай індывідуальнасці ў выпадку Вайцяшонак выліваюцца на паперу светабачаннем, дзе пакута выступае мераю працы, любові («Ханна-Мурза»), таленту мастака («Дом на пагорку»), гістарычнай памяці і маральнага абавязку («Трыпціх»). Калі б апантаны сваёй місіяй паслядоўнік Бадхідхармы скіраваўся на Беларусь, каб пасеяць на гэтай зямлі адзіна правільнае вучэнне Буды, для ілюстрацыі Першай Высокай Ісціны "жыццё ёсць пакута" яму хапіла б навелаў з «Саду нявіннасці».
Часцей, аднак, беларускія пісьменнікі пакутуюць на нашмат трывіяльнейшы комплекс зацюканага жыццём шэрага інтэлігента (пераважна ў першым пакаленні і вясковага паходжання), для якога грэбаванне сацыяльным аналізам ёсць адно перайманнем пазіцыі інтэлігенцкае эліты, ангажаванай у палітычныя працэсы. Адметнай рысаю публічных выступаў гэтых дзеячоў ёсць паслядоўная адмова ад адказу на пытанне "Qui prodest?".

6

Нягледзячы на вонкавую маскіроўку, мы жывём у эпоху дэканструкцыі патэрналісцкае дзяржавы савецкага ўзору, і працэдура выконваецца кіроўнай элітай краіны мэтанакіравана, паслядоўна, планамерна. У "мяккай" беларускай мадэлі ліквідацыя савецкага патэрналізму, характэрнаю рысаю якога было імкненне да захавання адноснае роўнасці, распадаецца на тры прапановы для трох пакаленняў: старэйшаму — сацыяльныя гарантыі за

[12] Дубавец Сяргей. Расслоены «Напалеон» // Наша Ніва. 2002. 22 сакавіка.

палітычную лаяльнасць, сярэдняму, працаздольнаму й актыўнаму, — адносная свабода эканамічнае ініцыятывы за адмову ад утрыманскіх спадзяванняў і палітычных амбіцыяў, малодшаму, якое не мае выбару, — мінімізацыя сацыяльных перспектываў праз свядомае змяншэнне ўзроўню бясплатнае агульнадаступнае адукацыі.
Эліта інтэлігенцыі (пра што можна меркаваць па публіцыстыцы, палітычных заявах і літаратуры) старанна адмаўляецца заўважаць, якое грамадства фармуецца на Беларусі, упарта абыходзіць маўчаннем характэрныя з'явы, што выдаюць намеры будаўнікоў (тое, што будаўніцтва ідзе не стыхійна, сумневу не выклікае). Самая відавочная прычына замоўчвання — шмат хто бярэ ў гэтай будоўлі ўдзел. І мае ад таго выгады, пра якія раней не мог нават марыць. Ці спадзяецца займець. Карацей кажучы, сацыяльны эгаізм.
Гэтак можна растлумачыць, чаму газеты (і не толькі дзяржаўныя) маўчаць пра скарачэнне сацыяльных выдаткаў з дзяржбюджэту пры захаванні ўзроўню ападаткавання, пра ўмацаванне ўсёпранікальнае сістэмы карупцыі і кліенталізму, нават пра відавочную для кожнага, хаця б крышку знаёмага з настроямі ніжэйшага звяна дзяржаўнага апарату, альтэрнатыву для наменклатуры ў сумнеўнай дыхатаміі "незалежнасць—Расея" — ролю каланіяльнае адміністрацыі, якая цалкам задаволіць амбіцыі абсалютнай большасці насельнікаў выканкамаўскіх кабінетаў і ніяк не пагражае іхняму дабрабыту. Замест абмеркавання гэтых тэмаў лёгка адшукаць гэткія пасажы:

Тым часам сістэма ўлады — ад міністра да мытніка ... сям-там пераймаецца сваёй прыроднай уласцівасцю — дзяржаўным, а то й нацыянальным інтарэсам[12].
Справа зусім не ў тым, ці ёсць насамрэч прыклады гэткіх паводзінаў беларускага чынавенства, а ў абагульненні. Калі б тое была "прыродная ўласцівасць" дзяржаўнага апарату, слова "карупцыя" не існавала б, а Крымінальны кодэкс скараціўся б на некалькі артыкулаў. Чалавек з досведам выдавецкае працы, набытым за перабудовачных часоў, наўрад ці можа быць нагэтулькі наіўны. Палітычны публіцыст не можа не ўсведамляць, што гэтая "прыродная ўласцівасць" рэалізуецца з вялікімі цяжкасцямі толькі ў добра арганізаваным

дэмакратычным грамадстве з моцнай грамадзянскай супольнасцю.
Канчатковы дыягназ можна ставіць, прааналізаваўшы мастацкую літаратуру — форму грамадскага самаасэнсавання, яшчэ больш аддаленую ад “злобы дня”. Калі ў літаратуры навідавоку неахвота прыглядацца да відочных кожнаму наведвальніку міні-рынку працэсаў, затое буяюць хваласпевы духоўнасці і элітарызму, значыць, дзякуючы сваёй цынічнай мімікрыі і эгаізму яе стваральнікі ўжо не ў стане асэнсоўваць рэчаіснасць на ўзроўні, які апраўдваў бы іхняе існаванне. Інтэлігенцыя пазбаўляецца, па-польску кажучы, racji bytu. Карыстаючыся трапным выразам Ганны Кісліцынай, у герою-апавядальніку вельмі ўжо часта складана не пазнаць аўтара. Сёння ў акулярах на носе пісьменніка часцей за ўсё два тыпы шкельцаў: першы размывае рэчаіснасць, надаючы прыемную недакладнасць і святлістыя арэолы абрысам рэчаў, — у фатаграфіі гэта дасягаецца “мяккарысавальным аб’ектывам”; другі — люстраны, і мастак слова бачыць адно зрэнкі ўласных вачэй.

7

Нашы пісьменнікі, а шырэй — значная група гуманітарнай інтэлігенцыі — культывуюць два заганныя тыпы паводзінаў, якія лагічна дапаўняюць адзін аднаго: нежаданне ўзняцца да культурнага ўзроўню патэнцыйнага чытача і нежаданне знізіцца з эмпірэяў чыстага мастацтва да балючых для чытача праблем. Адпаведна, чытач, а шырэй — грамадства — са сваімі густамі і клопатамі апынаюцца перад чорнай дзіркай творчага эгаізму, якая паглынае рэсурсы, але не дазваляе пабачыць інфармацыйны прадукт, не стварае адпаведнага аўдыторыі суразмоўніка з гледзішча агульных для абодвух бакоў культурных каштоўнасцяў.
Беларускі пісьменнік не жадае лішні раз зірнуць грамадству ў твар, і ў чымсьці я з ім згодны. Твар не з прыемных. Але, у адрозненне ад чалавечага, ён мае здольнасць змяняцца да лепшага ў вельмі істотнай ступені. Даўно прыйшоў час дакладней вызначыць, што мы разумеем пад нацыянальнай свядомасцю. Мераю нацыянальнае свядомасці інтэлігента, ці, як хто хоча, інтэлектуала, можа быць тое, наколькі шчыра і старанна ён імкнецца вытлумачыць грамадству ягоныя,

грамадства, праблемы. Калі напускае туману — блізка да нуля, нават калі за мову. Калі хаваецца за надрыўнымі апісаннямі прыватных выпадкаў, але пазбягае абагульненняў і не называе прычынаў, гэта толькі на градус болей, нават калі ў абарону помнікаў архітэктуры. Калі імкнецца гаварыць прыемнае аўдыторыі або выкладае адно са шматлікіх бачанняў праблемы, не згадваючы пра іншае, — ізноў нуль, нават калі пра экалогію і Чарнобыль.

Вернемся да амерыканскай гульні ў віртуальнае фармаванне ўраду. Навуковая фантастыка ў ЗША выконвала й выконвае функцыі сацыяльнай футуралогіі, і гэтую яе функцыю амерыканскае грамадства сустракае з задавальненнем — дастаткова зірнуць у спіс твораў, прэміяваных найпрэстыжнейшымі галіновымі прэміямі «Hugo» і «Nebula»: адзначаюцца творы з выразным сацыяльным гучаннем. Паўтарыць амерыканскую гульню з беларускімі гульцамі цяжка. У нас не пра кожнага з палітыкаў скажаш, якая ў яго пазіцыя (паспрабуйце самі, узяўшы пенсійную рэформу, прыватызацыю, знешнюю палітыку і падатковую сістэму). Гэта вынік, з аднаго боку, адсутнасці традыцыі незалежнага ад улады сацыяльнага аналізу, а з другога — цягі да містыфікацыі грамадскіх адносінаў, уласцівай шырокім колам людзей.

А менавіта пісьменнікі маглі б паказаць прыклад
у пераадоленні абедзвюх шкодных звычак, атрыманых
у спадчыну ад эпохі навуковага камунізму й марксісцкай
палітэканоміі, бо яны збольшага незаангажаваныя
ў палітычныя гульні з аднаго боку і прафесійна ўважлівыя да
праблемаў чалавечай асобы — з другога. Нават сёння
ў літаратурных творах лягчэй знайсці прыклады цвярозага
і адказнага падыходу да рэальнасці, да таго ж не абцяжараныя
палітычнай кан'юнктурнасцю, якая гэтак замінае больш
палітызаваным публіцыстычным тэкстам.

Але мо я патрабую ад пісьменнікаў занадта шмат: хто яны такія, каб дамагацца ад іх амаль немагчымага? Адказ просты: задача сапраўды, кажучы па-ленінску, архіскладаная і архіцяжкая, але магчымага патрабуюць ад палітыкаў. Аднак палітыкі прэтэндуюць на ўдзел у сапраўдным урадзе, а не на месца ў спісе, складзеным фантастамі, на кіраванне грамадствам звонку, а не на ролю ягонае самасвядомасці.

(Яны, дарэчы, адзіныя, хто ў нас дбае пра сацыяльнае пазіцыянаванне.) Мастацтва магчымага — іхні занятак. Наўрад ці такое абмежаванне тычыцца людзей творчых. Творы мастацтва ўплываюць на людзей не горш за палітычныя партыі, і для гэтага ім не трэба здабываць большасць галасоў на выбарах. Хочацца звярнуцца да мастакоў слова з лозунгам парыжскіх студэнтаў 1968 году: “Будзьма рэалістамі — патрабуйма немагчымага!” Студэнты-бунтаўшчыкі кідалі гэтыя словы палітыкам (яшчэ адзін прыклад містыфікацыі сацыяльных дачыненняў), і тую іхнюю памылку шматкроць паўтарылі выбаршчыкі па ўсім свеце. Час нарэшце звярнуцца да адрасата, які мае ад Бога здольнасці выканаць гэткае патрабаванне. Але ў нашай сітуацыі лепшай падаецца старажытнейшая фармулёўка. “Ідзі і глядзі!” — было загадана ап. Яну. Не беручы на сябе смеласць загадваць, нагадаю: пабачыў ён (у рэшце рэшт) Нябесны Ерусалім.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Андрэй Екадумаў Разбор палётаў беларускай думкі

АНДРЭЙ ЕКАДУМАЎ (нар. у 1973 у Менску) — філёзаф, сацыёляг. Адзін з аўтараў аналітычных працаў «Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі» і «Беларусь: сцэнары рэформаў», што пабачылі сьвет сёлета.

Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня. Санкт-Пецярбург: Невский простор, 2003. — 496 с.

На інтэлектуальных прадуктах, выраблены у Беларусі, ляжыць закляцьце двайнога стандарту. Вельмі часта такі твор можна:

1) зганіць за дрымучы правінцыялізм, другаснасьць, бязглузьдзіцу, непісьменнасьць, неарыгінальнасьць, чыстую дурноту і гэтак далей, і гэтак далей (зачэпка для таго, каб пакпіць зь “мясцовай вузкалобасьці і мысьлеблудзтва”, заўсёды знойдзецца);

2) пахваліць за адзін толькі факт зьяўленьня на роўным-голым беларускім месцы, дзе спрадвеку мала што расло.

Варыянт 1) цудоўна разыгрываецца, варта толькі параўнаць айчыннае мысьленьне з замежным, сутыкнуць ілбамі беларускага “думаньніка” і французскага (нямецкага, амэрыканскага і інш.) карыфэя. І паглядзець, у каго лоб аказаўся мацнейшы.

Зразумела, крытыкі, абазнаныя ў заходніх традыцыях і новых павевах (альбо тыя, хто пра іх хаця б чуў), паставяць на шырокі лоб інтэлектуала з Захаду. І будуць мець рацыю. Гэта як

у пытаньні, хто лепшы — Сарбона ці БДУ.
Вось толькі нешта не відаць сарбонскіх карыфэяў у нашых дзяржаўных і недзяржаўных універсытэтах. Што да валадароў універсытэцкіх розумаў на захад ад былога сацлягеру — скажэце дзякуй, калі хаця б вымавяць такое дзіўнае слова: “Беларусь”. Таму што Дэрыду, будзь ён хаця б Дарыда, Беларусь — што Мамаю дэканструкцыя.

Першы сьвет з сваім перадавым дыскурсам і катэгарыяльным апаратам — у туманнай далечы, за даляглядамі беларускай сьвядомасьці. Нам яшчэ некалькі пакаленьняў засвойваць іх досьвед, філязофскі апарат, ад самога Арыстотэля ўспадкаваны, набірацца розуму. Ніхто па-за межамі Беларусі, апроч хіба што нашых экс-суграмадзянаў ды вялікіх аматараў экзотыкі, абдумваць беларускія праблемы на мове філязофіі ня будзе. Давядзецца самім. Выбар небагаты — ці сваімі сьціплымі разумовымі высілкамі ўрабляць мясцовы грунт, ці эміграваць да Дэрыдоў зь Ліятарамі.
Працэс станаўленьня беларускага постімпэрскага дыскурсу выразна бачны на прыкладах, сабраных у “Анталёгіі”. Але пра гэта крыху пазьней.
Ёсьць яшчэ варыянт 2).
У адрозьненьне ад першага, ён пераадольвае паралюш волі да мысьленьня і дзеяньня на тутэйшай неўрадлівай глебе. Але затое варыянт 2) небясьпечны арыстакратызмам на памыйніцы. Лёзунг-загад “На табе роднае — і любі!” (“Купляй сваё”, “Добра, таму што беларускае”) ужо многіх адвярнуў ад патрэбы “думаць Беларусь”. Некаторыя інтэлектуальныя стравы атручваюць розум.
Вось два варыянты ацэнкі беларускага інтэлектуальнага прадукту. Заўсёды ёсьць рызыка зваліцца не ў адну, дык у другую яміну. Аб’ектыўна, ці, дзеля постмадэрновай нямоднасьці “аб’ектывізму”, — адэкватна ацаніць “зробленае ў Беларусі” ня так і проста. Сытуацыя з падваеньнем ацэнкавай шкалы — беларуская ўнівэрсальная. Прынамсі, у сфэры таго самага беларускага мысьленьня, што ўзяліся паказаць зьбіральнікі «Анталёгіі».
Задача ў іх, жорстка абмежаваных колькасьцю старонак і друкаваных знакаў, была ня самая ўдзячная. Патрабавалася адабраць зь беларускай інтэлектуальнай кунсткамэры тэксты,

якія больш-менш выразна паказваюць публіцы дынаміку “беларускага мысьленьня” за 12 гадоў. Так складальнікі ўжо загадзя паставілі сябе пад удар прадузятай крытыкі. Кшталту: “А дзе Глёбус?! А чаму Бембель?!” ці “А чаму ў вас Глёбус бяз шапкі?!”.

Стопрацэнтна надзейных крытэраў адбору беларускіх тэкстаў наша крытыка прапанаваць ня можа. Затое падстава для незадавальненьня заўсёды пад рукой. У складальнікаў жа была задача — паказаць беларускую думку, якая яна зь сябе была і стала за гады незалежнасьці. І тут, у прынцыпе, істотныя не канкрэтныя аўтары самі па сабе, а праблемы і тэндэнцыі, паказаныя ў тэкстах.

У ацэнцы «Анталёгіі» шмат залежыць ад таго, што менавіта крытыкуем — канкрэтныя артыкулы ці ўсё выданьне цалкам. Калі беларускае паходжаньне і беларуская праблематыка — галоўныя вартасьці тэксту, калі катэгарыяльны апарат і навыкі мысьленьня ня цягнуць на элемэнтарную пісьменнасьць — варыянт 1) артыкулу забясьпечаны.

Але ацэньваць «Анталёгію» цалкам — ня тое самае, што канкрэтны артыкул або некалькі іх на выбар. Яна не прэтэндуе быць зборнікам рэцэптаў для выратаваньня айчыны ад расейскамоўнай пагрозы ці ўзорам дасягненьняў беларускай думкі ў межах СНД. Якое мысьленьне, такія і тэксты. Гэта не “Рэклямны праспэкт сучаснага беларускага мысьленьня”. І калі ў «Анталёгію» патрапілі, мякка кажучы, кур’ёзныя артыкулы, то ці варта люстра дакараць? Вось такое спарадзіла беларуская думка 1990-х, вось такое і друкуем.

Каб ня стаць чарговым зборам твораў пра ўсё запар па-беларуску, «Анталёгіі» патрабаваліся артыкулы, што задаюць кантэкст прачытаньня астатніх. Прасьцей, прынцып у выбары аўтараў — “не адзін, дык другі”, абы паказваў “думку беларускую”, — павінен ужывацца абмежавана. Патрэбен сама меней адзін артыкул, што задае кантэкст для прачытаньня-тлумачэньня ўсёй анталёгіі, каб аўтарскія развагі ўзору 1990 году не ўспрымаліся як пункт гледжаньня складальнікаў у 2003-м.

У «Анталёгіі сучаснага беларускага мысьленьня» такіх артыкулаў, на маю думку, тры. Гэта «Трансфармацыя беларускай нацыянальнай ідэі» Алеся Чобата ў разьдзеле «Эйдас», «Крэольства й праблема нацыянальна-культурнай

самаідэнтыфікацыі» Ўладзімера Абушэнкі ў «Лёгасе» і «Культура сьмецьця і сьмецьце культуры» Максіма Жбанкова ў «Топасе». Яны й зьвязваюць анталёгію ў адзінае цэлае.

У артыкуле Алеся Чобата — разгромная крытыка нацыяналістычнага міту пра вялікую беларускую культуру. Артыкул гэты карысны. Вымушае сур'ёзна задумацца над "прапіснымі ісьцінамі" нацыяналістычнага міту. Сур'ёзна аспрэчваецца тэза пра Вялікае Княства Літоўскае як духоўную радзіму беларускай нацыі, пераасэнсоўваецца роля імпэрскіх ідэалёгій. Таксама падрабязна разьбіраецца фармаваньне нацыянальнай ідэі ўсьлед за распадам СССР і абвяшчэньнем незалежнасьці. Адзначаецца духоўная нясьпеласьць беларускіх элітаў, даіндустрыйны патэрналізм пасьля індустрыялізацыі і іншыя нашыя культурныя болькі.
Артыкул Максіма Жбанкова ў «Топасе» прысьвечаны болей постсавецкай беларускай культуры. Яна ў Жбанкова апісаная як трэшавая — гэтакі савок-у-постмадэрне. Тут таксама крытыка беларускага шляху ў Эўропу, аналіз узаемінаў закансэрваваных узораў савецкага афіцыёзу і афіцыёзам жа спароджанага андэрграўнду. Максім Жбанкоў прапануе цікавае тлумачэньне і другаснасьці беларускага культурнага прадукту, і патрэбы ў ін'екцыях расейскага маскульту, і фатальнага правалу нацыяналістычнага культуртрэгерства. Таго самага, што выраджаецца ў арыстакратызм, — калі не на памыйніцы, то на балоце.
Цяпер пра «Крэольства й праблему нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі» Ўладзімера Абушэнкі ў разьдзеле «Лёгас». Нарэшце ў беларускамоўным выданьні выразна вымавілі тое, што даўно лунала ў паветры. Праблема постсавецкай беларускай ідэнтычнасьці ня зводзіцца да моўнай. Далёка ня ўсе расейскамоўныя ў Беларусі ідэнтыфікуюць сябе абавязкова з расейцамі ці "несьвядомымі манкуртамі". Акурат ільвіная доля такіх "несьвядомых" усьведамляе сябе беларусамі. Гэтая вялізная доля насельніцтва вельмі дваіста ставіцца да Расеі і яе культуры, а таксама дваіста ацэньвае свой "родны кут", што й дае падставу апісваць іх ідэнтычнасьць як спэцыфічна крэольскую, посткаляніяльную.
Наша культура пасьля распаду СССР шмат у чым усё яшчэ застаецца каляніяльнай. Тут рэшткі аўтахтоннай культуры

шчыльна зьнітаваныя з прынесенымі з усходу і даўно ўжо засвоенымі практыкамі. Цяпер расейскае ўжо нібыта і не чужое, але ўсё адно *не сваё*. Сытуацыя такога падваеньня — прыкмета крэалізаванай сьвядомасьці. Уладзімер Абушэнка падрабязна разглядае станаўленьне нацыянальнай ідэнтычнасьці насельнікаў былых гішпанскіх калёніяў. Там, дзе ўзьнікае неабходнасьць у самаідэнтыфікацыі не па правілах, навязаных мэтраполіяй, дзе моўны і дзяржаўны нацыяналізм не разьвіліся, можа рэалізавацца варыянт крэольскага нацыяналізму. Артыкул Абушэнкі добры тым, што прапануе адмовіцца ад жорсткай апазыцыі свае—чужыя, якая расколвае беларускую культуру на моўна-субкультурныя гета.
Усе тры артыкулы — крытыка пройдзенага і падказка для будучыні. Акурат іх варта вылучыць як цэнтральныя ў «Анталёгіі» з гледзішча ахопу праблемаў (і беларускі кантэкст захавалі, і сусьветнага не згубілі) у сытуацыі канфлікту інтэлектуальных практык падчас культурнага разрыву і цывілізацыйнага адставаньня. Такі набор праблемаў задае адзінства «Анталёгіі».

Астатнія публікацыі ў зьвязцы з гэтымі трыма ці то наагул не пра Беларусь, ці то зьяўляюцца ўзорамі беларускіх лістоў да сябе з субкультурнага гета і ўспрымаюцца як камэнтары, удакладненьні, тлумачэньні, наглядныя прыклады нашага постсавецкага дыскурсу.
«Рацыянальны нацыяналізм» Сяргея Дубаўца, пэўна, можа прэтэндаваць на ролю галоўнага кур'ёзу ў «Анталёгіі». На ягоным прыкладзе выяўляецца вельмі балючая для беларускіх адраджэнцаў праблема — нястача навыкаў аналітычнага мысьленьня, дый катэгарыяльнага мысьленьня наагул. Каб выказаць думкі, ім часьцяком не стае словаў. Мова не адпавядае ўзроўню праблемы. Чытаеш — нібыта назіраеш спробы вытлумачыць абстрактнае на пальцах.
Але давайце цяпер паглядзім на год напісаньня артыкулу: 1990.
Во так. Няшмат жа тады народу, у 1990-м, магло гэтак паразважаць, выкарыстоўваючы панятак "дыскурс", удосталь пагаманіць-папісаць пра мадэрнізмы і постструктуралізмы. У БДУ толькі стваралі філязафічна-эканамічны факультэт.
А вось тэкст Макса Шчура датаваны 2002 годам. Можна

супаставіць з «Рацыянальным нацыяналізмам» 1990-га і вызначыць, як эвалюцыянавала думка беларуская.
Ці параўнаем рэфэратыўны артыкул Юрася Залоскі «Сутнасьць і падставы рэлігіі» 2001-га з напісаным праз год артыкулам «Пол, кляса, нацыя і постсавецкая рэструктурызацыя» Алены Гапавай. Ю.Залоска — выпускнік Варшаўскай праваслаўнай духоўнай сэмінарыі, А.Гапава — дырэктарка Цэнтру гендэрных дасьледаваньняў ЭГУ ў Менску. Узважым праваслаўна-рэлігійныя заклікі супраць фэмінісцкай крытыкі. Чытач не такі ўжо і дурны, высновы зробіць сам.
Падборка тэкстаў у «Анталёгіі» акурат дае такую мажлівасьць — супастаўленьня ідэяў і дыскурсаў міжсобку. Ад чаго і да чаго прыйшла беларуская думка за тузін гадоў, пачынаючы ад Дэклярацыі аб сувэрэнітэце? З «Анталёгіі» відаць — не была тая Дэклярацыя забясьпечаная ні эйдасамі, ні лёгасамі. Філязофскае асэнсаваньне беларускіх праблемаў, якое павінна было б апярэджваць набыцьцё незалежнасьці, ішло сьледам за яе набыцьцём.
І тэкст Марыны Мажэйкі, унівэрсытэцкай, “акадэмічнай” аўтаркі, дзе Беларусь наагул не фігуруе, зусім ня лішні ў анталёгіі. Але ён дае нам ключык да разгадкі гэтай вялікай таямніцы — чаму праваліўся беларускі нацыяналізм мяжы 1980—90-х. Замест аджылых тэарэтычных канструкцыяў афіцыйная эліта ўзброілася нязграбнымі ідэалягемамі і мітамі (пра вялікую беларускую культуру і г.д.). І пацярпела палітычнае фіяска.
Беларускі досьвед давядзецца абдумваць нам жа, тым, хто Беларусь насяляе. На суд чытача «Анталёгіі» выносяцца матэрыяльныя сьведчаньні гэтага працэсу беларускага мысьленьня — тэксты беларускіх аўтараў. Іх прачытаньне можа стаць крытычным разборам палётаў думкі над зязюліным гняздом. Але пры гэтым можна ацэньваць тэксты «Анталёгіі» й іначай — акурат як ілюстрацыю працэсу засваеньня філязофскай культуры, зьмяненьня пастаноўкі праблемаў, пошуку адказаў на пытаньні, зададзеныя па-беларуску.
Матэрыялы «Анталёгіі» гавораць, што з 1990 да 2002 г. у беларускамоўнай інтэлектуальнай супольнасьці пазначыліся сякія-такія тэндэнцыі. Бінарныя апазыцыі нацыяналістычнага дыскурсу выявіліся празьмерна жорсткімі для культурнай сытуацыі 90-х. У выніку «Анталёгія сучаснага беларускага

мысьленьня» прапануе ўдакладніць кірункі разьвіцьця беларускай ідэнтычнасьці.

Пастскрыптум

Пад канец не ўтрымацца ад пажаданьня складальнікам наступных такоўскіх выданьняў. Тэхнічнае выкананьне праекту таксама рэч сур'ёзная. Таму няблага было б, каб 123-х, 124-х старонак было ня больш за адну на асобнік кнігі, а публікацыі, датаваныя 1999 годам, ня мелі спасылак на падзеі году 2000.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/01/21**

[image]
A R C H E
П а ч а т а к
№ 6 (29) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image] [image] [image]
[image] [image] [image]
[image] [image] [image]
[image] [image] [image]

Вершы на ўсход ад Эўропы
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Янка Трацяк
Анталёгія бяз духу

Насустрач Духу: Анталогія беларускай хрысціянскай паэзіі / Уклад. і прадм. І.Чароты. — Менск: Ураджай, 2001

1

Я мог бы стаць сьвятым, цудатворцам. Але я стаў літаратарам.

Леон Блюа.

Складальнік анталёгіі адначасна зьяўляецца аўтарам прадмовы да яе і камэнтароў. У прадмове, зноў жа, аўтар выступае ў трох іпастасях: тэарэтык паэзіі, гісторык літаратуры, абаронца праваслаўя. Нічога ў гэтым крыклівага няма. Усё заканчваецца прафэсійнасьці, бо справу маем ня толькі з паэзіяй, але і асэнсаваньнем літаратуры праз кантэкст хрысьціянскага сьветаўспрыманьня. Але ўжо ў прадмове Іван Чароты піша:

Паэтычная творчасць — паводле азначэння! — уяўляе сабою значна большае, запраграмаванае на зваротную сувязь з Тварцом, г.зн. памкненне да Бога, набліжэнне да Яго, вяртанне падабенства з Вобразам Яго. Блажэнны Аўгусцін у свой час адзначыў, што праз музыку мы пазнаём Тварца. Абапіраючыся на яго мудрае меркаванне, нам свае развагі можна ўдакладніць так: і прызначэнне паэзіі — у тым, каб пазнаваць Тварца, каб

ЯНКА ТРАЦЯК (нар. 1956 у вёсцы Труханава Смаргонскага раёну) — культуроляг. Скончыў Гарадзенскі дзяржаўны ўнівэрсытэт (1985 г.). Апошняя публікацыя — артыкул «З духоўнай спадчыны беларускага каталіцкага духавенства міжваеннага пэрыяду» (Беларускі гістарычны зборнік, Беласток, №18).

вызнаваць Любоў, Ісціну, Харство, Сумленне, каб сцвярджаць духоўнасць, каб напамінаць грэшнаму чалавеку пра Неба, а ў жыцці зямным падтрымліваць сілы стваральныя і супрацьстаяць сілам разбуральным.
Можна было б згадзіцца з такім высокім азначэньнем ролі паэзіі, калі б не адчуваньне нейкай спрошчанасьці. Такое азначэньне больш адпавядае мастацтву ўвогуле, чым паэзіі, але калі б яно было ўжытае ў іншым кантэксьце, дык мо не выглядала б такім дыскусійным, як тут. Шлях, які прапануе кожнаму паэту Іван Чарота, здаецца, больш прымальны для манаха, чым для паэта. Што будзе з паэзіяй, калі творчую інтуіцыю, пачуцьцё, эмацыйнасьць, экспрэсію і ўвогуле ўсё, што зьвязана з творчым працэсам, мы падпарадкуем такому вузкарэлігійнаму сьветасузіраньню? Нічога кепскага няма ў тым, калі будзе і такая паэзія, якой яе хоча бачыць І.Чарота. Але быць такой яна можа толькі ў супрацьстаўленьні, як і сьцьвярджэньне ідэй Дабра, Справядлівасьці, Любові, Харства. У гэтым сэнс працягу чалавечага існаваньня, але не эсхаталягічны сэнс. Ацаніць сьвятло можна па-сапраўднаму тады, калі ведаеш, што такое цемра (хаця і банальна, але пераканаўча).

Дарэчы, наконт цемры: *“Д’ябал можа рабіць многія рэчы. Але д’ябал ня можа тварыць паэзію. Ён можа папсаваць паэта, але ён ня можа стварыць паэта… Д’ябал можа выць, але не было чуваць, каб ён сьпяваў”* (Фрэнсыс Томпсан). Калі ж прызначэньне паэзіі будзем бачыць у тым, каб “*у жыцьці зямным падтрымліваць сілы стваральныя і супрацьстаяць сілам разбуральным*”, што само па сабе зьяўляецца прэрагатывай духавенства, але не паэзіі, прыйдзем да таго (а можа, ужо і прыйшлі), што зь літаратуры зробім служанку тым сілам, якія будуць успрымацца як стваральныя. Гэтыя ж сілы сёньня могуць быць адны, а заўтра — другія. Сёньня можа быць адна спэкуляцыя Хрыстовымі ідэаламі, а заўтра — другая. То мы абвінавачваем Вялікага Інквізытара ў Каталіцкай Царкве (Ф.Дастаеўскі), то — у Праваслаўнай (М.Бярдзяеў). Усё залежыць ад той канфэсіі, якая бліжэйшая да ўлады, — адсюль і сілы (у гэтым сэнсе можна гаварыць пра спэцыфічны беларускі фактар). Сапраўдная мастацкая літаратура павінна быць убаку ад гэтых “разборак”. Бо калі кінецца ў тую ці іншую

крайнасьць — можа загубіць сябе “папсутасьцю”, бо спакуса ўладаю найбліжэй стаіць да гэтага.
Хрысьціянскія ідэалы могуць быць узорам для кожнага грэшніка, у тым ліку і для паэта. Яны могуць быць арыенцірам праз усё жыцьцё і праз усю творчасьць, але паэту неабавязкова быць сьвятаром, а яго паэзіі — казаньнем, агіткай для няверных паганцаў, іншаверцаў, атэістаў. Аспэкт увасабленьня хрысьціянскай паэзіі таксама можа быць розны: ад шчырай споведзі і пакаяньня блуднага сына, грэшніка да чыстага царкоўнага патасу і ўсхваленьня ідэалу Хрыста. Яшчэ можна гаварыць пра містычную паэзію як пра адзін зь відаў. Мы бачым узоры высокай паэзіі ў Старым і Новым Запаветах. Паэзія звычайна там, дзе Слова набывае Сэнс, Праўдзівасьць, Любоў, Веру, Прыгажосьць, Сілу. Апошняе (Сіла) — як вынік гармоніі папярэдніх якасьцяў. І калі мы з такімі крытэрамі будзем падыходзіць да нашай творчасьці, дык ня столькі ўжо важна, пра што мы будзем пісаць: пра блудную авечку альбо пра Хрыста. І ня трэба баяцца, калі штосьці пачварна-ганебнае ўсхваліцца з вуснаў мадэрнова-хворага пііта і ўзвысіцца ў мастацкім слове. Нічога, апрача фальшу і падробкі, хай нават і добрай якасьці, у пііта ня выйдзе. І ці варта царкоўнымі канонамі заціскаць і абмяжоўваць паэзію?! Калі ж паэт прыслухаецца да Чароты, то яму нічога не застаецца, як толькі пасьпешліва рыфмаваць усьлед за казаньнямі папа ў царкве. Для літаратара можа быць толькі адзін канон — мастацкае Слова, ад якога зыходзяць натхняльныя імпульсы радасьці жыцьця і радасьці тварэньня — тое, што можа зыходзіць толькі ад Творцы. І гэтага дастаткова, каб быць творцам (ад слова *poietas*) і быць аўтарам (*autor* — пашыраю).

2

Словам, Беларускі народ, будучы раздвоены рэлігійна, духова, мусіць шукаць адзінства, мусіць шукаць сваёй рэлігійнай і нацыянальнай сынтэзы…
… Адзінства гэта належа прадусім праводзіць у плошчы гарманійнага нацыянальнага і рэлігійнага сужыцьця Беларусаў каталікоў і праваслаўных…
… У нашых узаемных адносінах павінны больш зварочваць увагі на тое, што нас луча ў хрысьціянстве, чым на тое, што нас дзеліць.

Адам Станкевіч
Разумныя парады даваў вялікі беларускі мысьляр
XX стагодзьдзя. Паслухаем, што ж нам гаворыць Іван Чарота:

З многага, што недапушчальна абмінаць у нашых развагах, асаблівае значэнне мае хрысціянскасць народнага светапогляду, інакш кажучы — народнае хрысціянства беларусаў, глыбока і шматстайна адлюстраванае вуснай народнай творчасцю, уключаючы, найперш, паэзію … А пры падыходзе аб'ектыўным, які падразумявае, натуральна, і крытычнасць, мы маем поўнае права і гонар паўтарыць услед за Ф.М.Дастаеўскім: "Усе народныя пачаткі ў нас, па існасці сваёй, выйшлі з Праваслаўя.
Цяжка зразумець, які сэнс укладае аўтар у панятак "*народнае хрысьціянства беларусаў*. Але "*пры падыходзе аб'ектыўным*" трэба ведаць, што "*ўсе народныя пачаткі ў нас*" пайшлі ад паганства — этнічнай культуры дахрысьціянскага пэрыяду. Трансфармацыя хрысьціянскай ідэі ў народнай сьведамасьці перакрыжавалася зь сьведамасьцю паганскай і надоўга застыла ў часе. Больш аб'ектыўна было б гаварыць пра іх сынтэз ня толькі ў дачыненьні да народных пачаткаў, але і да народнай сьведамасьці. Магчыма, "народнае хрысьціянства беларусаў" — гэта і ёсьць сынтэз паганства і праваслаўя? Ці гэта — традыцыйнае, прымітыўна-ваяўнічае атаясамленьне сябе з праваслаўем? Урэшце, можна згадзіцца зь меркаваньнем Ф.Дастаеўскага, што "*ўсе народныя пачаткі ў нас, па існасьці сваёй, выйшлі з Праваслаўя*". У тым і справа, што яны выйшлі і засталіся па-за Праваслаўем. Але пры чым тут Дастаеўскі? Можа, І.Чарота хацеў сказаць пра ўплывы Праваслаўнай царквы на фармаваньне беларускай нацыянальнай культуры — тады яму варта было б зьвярнуцца да Адама Станкевіча:

*…Галоўным дзейнікам культурнага разросту й разьвіцьця Беларускага народу, вобак зь іншымі, была хрысьціянская рэлігія, была Праваслаўная царква. Так, хрысьціянства, як даўней, было ў Беларускім народзе й цяпер (XVI ст.***— *Аўт.***) галоўным сродкам маральнай і грамадзкай супольнасьці, сродкам яднаньня беларускага народу.*
Але, відаць, Іван Чарота прынцыпова не чытае тых беларускіх аўтараў, якія не належаць да яго канфэсіі, што, дарэчы,

пацьвярджаецца ня толькі прадмовай, але і падборкай твораў. Між тым, чытаем далей:

Дапускаем, што такое сцвярджэнне ў некага можа выклікаць папрок: маўляў, нашто размяжоўваць народ паводле веравызнання, вылучаючы адных праваслаўных. Але тут няма падстаў для папрокаў, а тым больш для крыўды. У сказаным — не больш і не менш толькі сведчанне ісціны і гістарычнай праўды, а яшчэ хіба што папярэджанне наконт небяспекі стану, пры якім належыць забыцца, што ўся наша спрадвечная існасць вымаўлялася не інакш як праз духоўных падзвіжнікаў, угоднікаў Божых.

Калі б аўтар быў яшчэ езуітам, можна было б зразумець такі падыход, хаця, здаецца, езуітам далёка да І.Чароты. Згадваецца "*сведчанне ісціны і гістарычнай праўды, а яшчэ папярэджанне…*". Той факт, што ў кожнага сваё сьведчаньне і свая праўда, гаворыць пра тое, якія мы далёкія ад сапраўднай праўды. Але чытаем далей:

Мы як народ у часе і прасторы сцвярджаліся святымі, што праззялі ў зямлі Беларускай, — Еўфрасіней Полацкай, Кірылам Тураўскім, Антоніем, Іаанам, Еўстафіем Віленскімі, Аўрааміем Смаленскім, Елісеем Лаўрышаўскім, Юліяніяй Альшанскай, Сафіяй Слуцкай, Афанасіем Брэсцкім, Гаўрыілам Беластоцкім, Георгіем Магілёўскім, Іаанам Кармянскім, новамучанікамі… Калі не імі, тады кім?

Мы ж, як народ адметны, самабытны, з уласнай псыхікай, сьведамасьцю, мэнтальнасьцю, характарам, сьцьвярджаліся ў часе і прасторы ня толькі тымі сьвятымі, да якіх апялюе Чарота, але яшчэ і Язафатам Кунцэвічам, Андрэем Баболем, сьв. Казімерам… Бо вельмі вялікі сумнеў бярэ наконт таго, што існасьць і сьвядомасьць нашых прарокаў (можна іх яшчэ назваць патрыярхамі і апосталамі беларускага нацыянальнага адраджэньня) Ф.Багушэвіча, Б.Эпімах-Шыпілы, Янкі Купалы, В.Ластоўскага, братоў Луцкевічаў і шмат-шмат каго іншых сьцьвярджалася праз уяўленьне духоўных падзьвіжнікаў, якіх пералічыў Чарота (апрача Кірылы Тураўскага і Эўфрасіньні Полацкай). Ня верыцца ў тое, што К.Каліноўскі, альбо Ф.Багушэвіч, ці Янка Купала захапляліся і натхняліся (сьцьвярджаліся ў прасторы і часе) дзейнасьцю Апанаса

Берасьцейскага. А вось той факт, што сьвяты Баболя быў для Янкі Купалы прыкладам сьвятасьці, мужнасьці, чалавечнасьці, сьцьвярджаецца паэмай самога паэты “Сьвяты Андрэй Баболя” (у анталёгіі адсутнічае).

Можна і трэба гаварыць пра духоўную пераемнасьць, і лепш, як сказаў Іван Чарота, ня скажаш: “*Калі няма працягу, тады знікае пераемнасць, абрываецца традыцыя, а гэта значыць разбураецца этнадухоўная прастора ўвогуле — разбураецца намі, тымі, хто спыніў працяг і пераемнасць*”. Але ў зразуменьні чаротаўскага кантэксту пераемнасьці можна гаварыць і пра насельніцтва Пскова, Курску, Ноўгараду і г.д. на ўсход, бо ўсе вышэйзгаданыя сьвятыя ня розьняцца сваёй сьведамасьцю ад іншых сьвятых Расейскай Праваслаўнай Царквы (РПЦ), гэтак жа, як Барыс і Глеб альбо Аляксандар Неўскі ў Беларусі. Ёсьць і яшчэ адна пераемнасьць: Іван Грозны, Аляксей Міхайлавіч, Пётар Першы, Кацярына II, Суворaў, Мураўёў Вешальнік, Ленін, Сталін… Але пры чым тут яны? А можа, і пры тым, што “*ў нас народныя пачаткі выходзяць з Праваслаўя*”…

Бокам выходзяць.

Адтуль недзе, з чаротаў, выплываюць тэндэнцыі ў абвінавачаньні і асуджэньні тых, хто думае трохі ня так. А напачатку, як гістарычна-абумоўленая заканамернасьць, ставяцца дзіцячыя пытаньні, кшталту “хто лепшы?” альбо “хто першы?”. Нічога ў гэтых пытаньнях няма ад хрысьціянства, затое вельмі шмат ёсьць ад надуманага самім духавенствам: і праваслаўным, і каталіцкім, а яшчэ больш — ад палітыканаў. Але пры чым тут паэзія?

Адам Станкевіч імкнуўся давесьці, што кожная хрысьціянская канфэсія ў роўнай ступені спрычынілася да гістарычнага лёсу беларускага народу, да разьвіцьця яго духоўных якасьцяў і ўвасабленьня духоўных каштоўнасьцяў. І ці трэба акцэнтаваць увагу на тым, хто больш зрабіў дзеля гэтага: праваслаўныя Эўфрасіньня Полацкая і Кірыла Тураўскі, ці каталік Францішак Скарына, ці пратэстанты Сымон Будны і Васіль Цяпінскі, ці ўніяты Іпаці Пацей і Язафат Кунцэвіч, ці тыя сьвятыя, якія празьзялі ў зямлі беларускай, ці тыя беларусы-каталікі XIX стагодзьдзя, дзякуючы якім быў закладзены трывалы фундамэнт беларускай нацыянальнай ідэі і дзякуючы чаму мы існуём у сьвеце як самабытны народ.

3

…Навука Хрыста зрабіла на яго толькі фармальны ўплыў: селянін нізашто ня сядзе за стол, ня вымавіўшы пацеры, але вымаўленых пацераў ён не разумее.

Вінцэсь Каратынскі

Чаму духавенства не сфармавала чыстага, трывалага і ўстойлівага хрысьціянскага сьветапагляду — трошкі іншая тэма, але варта адцеміць, што гэта, хутчэй за ўсё, было вынікам прыманьня і шырэньня хрысьціянства не паводле духоўных патрэбаў, а, хутчэй за ўсё, паводле сацыяльна-палітычнага фактару, які, магчыма, ня меў нічога супольнага, апрача вонкавага абраду, з хрысьціянствам. Пазьней дзяржаўна-палітычнае панаваньне некаторых канфэсій (інакш нельга разглядаць адзінства мэтаў і мэтадаў супрацоўніцтва з уладамі), міжканфэсійны супрацоўніцтва і барацьба за ўплывы нічога ня мелі супольнага з хрысьціянскім ідэалам, апрача злоўжываньня і выкарыстаньня самога ідэалу дзеля сваіх патрэбаў. У такой барацьбе, якая ніколі не заціхала ў Беларусі, заўсёды дамінаваў дзяржаўна-канфэсійны інтэрас, але не хрысьціянскі. Любоў да бліжняга трактавалася як любоў да князя, пана, памешчыка, урадоўца, цара-бацюшкі і прадстаўнікоў духавенства. Часам здаецца, што хрысьціянствам, як тым фігавым лістком, прыкрывалі сваё брыдоцтва выканаўцы ролі кесара і тыя, хто славіў кесара і служыў яму. І ня кожны кесар і служылы мог падзяліцца з Богам, вызначыць крытэры Богавага і кесаравага. На службе кесараў у Беларусі стаяла і духавенства, толькі з той розьніцай, што калі да кесара былі бліжэйшымі прадстаўнікі адной канфэсіі, дык прадстаўнікі другой былі бліжэйшымі да народу, і наадварот, — усё залежала ад канкрэтнай палітычнай сытуацыі. А калі яшчэ згадаць чужароднасьць духоўных іерархаў, панаваньне чужамоўя ў рэлігійнай сфэры, падмену культурна-этнічных каштоўнасьцяў, у чым было задзеяна і каталіцкае, і праваслаўнае духавенства, дык з сумам прыходзіцца адзначаць, што беларусы былі і ёсьць самай непісьменнаю нацыяй у Эўропе. Адсюль шматлікія нашы беды, адсюль і наша нацыянальная непаўнавартасьць — сьведамая і нясьведамая. Беларусам больш уласьцівая стыхійная

рэлігійнасьць, інтуіцыйна-містычнае ўспрыманьне і асэнсаваньне хрысьціянства; уласьцівы свой погляд на Бога, на канфэсіі й іх барацьбу, на сьвятароў, угоднікаў, сьвятых — магчыма, гэта і ёсьць тое, што І.Чарота называе “*народным хрысьціянствам*”, але яно не абмяжоўваецца толькі адной канфэсіяй. У сувязі з гэтым глыбокай хрысьціянскай перакананасьці ад беларусаў патрабаваць ня варта.
Але, можа быць, дзякуючы такому супраціву і барацьбе выкрышталізоўвалася і мацнела беларуская душа. Інакш які ў гэтым сэнс?

4

Варта літаратуры адкрыцца грамадзтву ці, імаверней, быць нявольна зацягнутай у яго, як яна робіцца прадметам барацьбы інтарэсаў…

Генрых Бёль
Паводле зьместу многіх твораў, якія ўключаныя ў анталёгію, няцяжка прасачыць гэтую барацьбу інтарэсаў. А зь іх насычанасьці ў анталёгіі складваецца ўражаньне, што такая барацьба для складальніка зьяўляецца больш важнай, чым сама хрысьціянская ідэя, а творы такога кшталту аўтар прадмовы вельмі ўдала спрабуе ўвесьці ў кантэкст хрысьціянскай паэзіі. Шмат у прадмове і тэкстах спрэчнага, яшчэ больш аднабокасьці.
Так, разглядаючы верш «Мая малітва», І.Чарота дакарае Янку Купалу ў тым, што ён моліцца абы-каму, але толькі ня Госпаду Ісусу Хрысту, Сьвятой Тройцы, сьвятым. Можна зразумець паэта і лірычнага героя, які ўспрымае існасьць і прыгажосьць сусьвету душою і пакланяецца яму як тварэньню Божаму. Можна было б гаварыць і пра нейкія паганскія матывы… можна было б, калі б не ў другім творы, як гэта сьцьвярджае І.Чарота, а менавіта ў гэтым вершы Янка Купала не канкрэтызаваў свой аб’ект пакланеньня:

Малюся я небу, зямлі і прастору,
Магутнаму Богу — Усясьвету малюся,
Ва ўсякай прыгодзе, ва ўсякую пору
За родны загон Беларусі.
Што гэта: няўважлівасьць з боку аўтара прадмовы ці штосьці

іншае?..
Дык вось, паводле такой мэтоды, *“давяраючыся зноў-такі арыентацыі па назвах, возьмем верш “На біблейныя матывы (З псалму 78)”,* і вось што піша І.Чарота: *“Прачытаўшы яго, цяжка пазбавіцца ад недаўмення: нашто было паэту, скарыстоўваючы такія загаловак і падзагаловак, настолькі адыходзіць ад жанру псалмаспеваў па сутнасці; чаму сапраўдны змест псалма гэтак рызыкоўна, мякка кажучы, мяняецца?..”*
Цікавае, мякка кажучы, прачытаньне твору. А вось што ў гэтым жа вершы ўбачыла Ірына Багдановіч: *“Мастацкая думка Купалы ў перадачы духу і энергіі біблейскага тэксту здзіўляе сваёй дакладнасцю, урачысты купалаўскі рытм адпавядае ўзвышанай трагічнасці біблейскай фразы: <…> Аднак у Купалы адчувальна прысутнічаюць свае гістарычныя каардынаты. Яго Іерусалім — гэта Беларусь, божы народ — гэта беларускі народ, панявольны драпежнымі суседзямі (“язычнікамі”), якія “нябожна паганьбілі нас”* (Багдановіч І. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага Адраджэння. — Менск, 2001).
А вось як зразумеў І.Чарота яшчэ адзін верш Янкі Купалы: *“Не менш пытанняў таго самага характару з’яўляецца і пры знаёмстве з вершам «Вялікдзень», у якім на рэвалюцыйны лад пераасэнсавана Свята Свят і ўсяленская радасць з нагоды Уваскрэсення Хрыста заменена змагарска-правадырскімі заклікамі”*. І каб сьцьвердзіць свае высновы, І.Чарота вырывае з кантэксту і цытуе некалькі радкоў: *“Наперад па шчасце! Хай злое ўсё дрогне…”*. У Купалы ідзе лягічная завершанасьць: *“Вясна ўжо на свеце, — Хрыстос Уваскрос!”*.

Можна зразумець Івана Чароту: вызначыць “*хрысьціянскую духоўнасьць*” толькі “*па назвах вершаў*” вельмі цяжка. Назвы, як бачым, падводзяць і Янку Купалу, і Янку Чароту. І нялёгка тут разабрацца, што да чаго: калі ў вершах Янкі Купалы была “хрысьціянская духоўнасьць”, трэба было б яе і сьцьвярджаць; калі яе не было, тады навошта было чапаць Янку Купалу, тым больш што ў прадмове аўтар папярэджваў і абяцаў не кранаць *“іншыя сферы”*.
Але, відаць, не падабаецца каталік Янка Купала праваслаўнаму артадоксу ад літаратуры, не падабаецца, і ўсё тут. І яму — як, дарэчы, і савецкім літаратуразнаўцам — вельмі важна

падкрэсьліць атэізм Янкі Купалы. А таму і нядзіўна, чаго толькі ён ні знаходзіць у творчасьці паэта: *“Не што іншае як апантанасць ідэяй пераўладкавання свету ўвасабляецца таксама ў вершы «Цару неба й зямлі», прычым якраз супярэчнасцямі гэтай ідэі абумоўлены папрок Богу”*. Яно дык, можа, і нядрэнна, што Чарота бачыць паэта ў вобразе такога магутнага Дэміюрга, але ўсё значна прасьцей: *“Вярні нам Бацькаўшчыну нашу, Божа, // калі Ты цар і неба, і зямлі”*.
Неаднойчы прыходзілася сутыкацца з такою зьявай, як няўважлівае прачытаньне літаратуразнаўцамі твораў Янкі Купалы. Не зьяўляецца выключэньнем і І.Чарота, які таксама не зьвярнуў увагі на ўстойлівую і абарончую трактоўку Янкам Купалам вобразу самога Ісуса Хрыста. Для сьцьверджаньня сваёй пазыцыі паэт выкарыстоўвае адпаведную сымболіку крыжа. Сустракаецца яна ў многіх вершах паэта: «Крыжы», «Сядзь тут пад крыжам», а чаго варты для зразуменьня яго сьветапогляду адзін толькі радок: “Пад крыжам бацькавым сканаць” («Прыстаў я жыць»), альбо:

Цень пры цені, над ценьмі той крыж у крыві,
Чорны крыж, як бы змора лунае ў высі,
Як бы змора вісіць… Стогн адно: не даві!
Не губі, да Хрыста сьцежку дай, данясі!..
«У бяссонную ноч».

Гэтыя радкі паэт, напэўна, адрасаваў бы крытыку XXI стагодзьдзя Івану Чароту, якому не было калі пачытаць клясыка і генія беларускай літаратуры Янку Купалу, а што ўжо гаварыць пра астатніх…
Дарэчы, пра астатніх!.. З такой жа нехрысьціянскай непрымірымасьцю ставіцца І.Чарота і да іншых вядомых паэтаў. Вось як ён прачытаў верш Цёткі «Скрыпка»: *“Паэтка бярэцца не больш не менш усталёўваць нейкі “новы алтар”, а “пры алтары тым” — “галасіць”, “склікаць”, “суседзяў весяліць”… Усё гэта, на ўспрыманне хрысціяніна, проста блюзнерства, кашчунства”*.
Нішто так ня ўражвае, як гэтая цытата доктара філялягічных навукаў і пераглумача паэтычных твораў. Але І.Чарота выступае ня толькі як літаратурны крытык, але як і судзьдзя. Голас судзьдзі набірае імпэт і моц, калі ён згадвае пра багаборчыя матывы і богаадступніцтва (прыводзім тэкст цалкам, каб не было прэтэнзій у няправільным яго

зразуменьні):

Паўторым, калі не адкрытую багаборчасць… дык богаадступніцтва беларуская літаратура пачала выяўляць досыць часта… Можна ўспомніць, напрыклад, артыкул Антона Луцкевіча «Бунт проці Бога», у якім гэта адзначалася на прыкладах творчасці Кастуся Каліноўскага, Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы і нават Казіміра Сваяка (ксяндза Канстанціна Стаповіча). Наступнікі згаданых, як вядома, "бунтавалі проці Бога" ўсё больш і больш — адно блюзнерства Крапівы чаго вартае! — апантана клічучы ў "светлую будучыню". Да чаго ж прыклікалі, прывялі? На сённяшні дзень да таго, што канчаткова размыты адрозненні высокага і нізкага, дабра і зла, хараства і пачварнасці, вечнага і мінучага, што дзеці і ўнукі нашы выхоўваюцца на злабадзённых лозунгах альбо на ўведзеных у ранг вышэйшай мудрасці пустых жартах розных джэнтльменаў загадзя купленай удачы, нейкіх клубачоў, вясёлых напаказ і вынаходлівых у здзеклівасці… Не варта рабіць выгляд, пэўна ж, быццам бы ва ўсім гэтым няма віны "агітатараў, гарланаў, главароў" і вышэйзгаданых "бунтароў", якія доўгі час выдавалі за духоўнае тое, што разбурала верай і традыцыяй усталяваныя арыенціры…
Дык вось хто ўва ўсім вінаваты: Кастусь Каліноўскі і нават Казімер Сваяк.

Ад такіх заяваў, высноваў робіцца няёмка, быццам прысутнічаеш пры ўкрыжаваньні. Рэч ня ў тым, што чуецца голас Вялікага Інквізытара паводле М.Бярдзяева, і ня ў тым, што праваслаўны мараліст далёка не хрысьціянскімі меркамі судзіць і абвінавачвае гонар нацыянальнай літаратуры, — няёмка ад таго, што такія чароты імкнуцца перапісаць гісторыю беларускай літаратуры на свой праваслаўна-расейскі капыл. І ў такой гісторыі калі й будзе месца В.Дуніну-Марцінкевічу, К.Каліноўскаму, Ф.Багушэвічу, Я.Купалу, Цётцы, К.Сваяку, дык тое, якое рыхтуе ім І.Чарота, — незайздроснае месца.
Але чытаем далей:

А вось народныя вершы і песні хрысціянскага зместу, роўна, як і творы, народжаныя талентамі такіх угоднікаў Хрыстовых, як свяціцель Кірыл, епіскап Тураўскі альбо прападобнамучанік

Афанасій (Філіповіч), ігумен Брэсцкі, знікнуць без следу не маглі, бо імкненне да Бога, духоўнасці было і застаецца самай важнай і самай натуральнай праявай сутнасці чалавека.
Няўжо беларусам-праваслаўным больш і ганарыцца няма кім, як толькі Апанасам Філіповічам? Крыўдна за беларускую хрысьціянскую паэзію паводле І.Чароты. Крыўдна ад таго, што пранёсься над ёю падзел на прымальную і непрымальную (угодную і няўгодную), а літаратура, дарэчы, як і гісторыя Беларусі, робіцца зьявай дзяржаўна-канфэсійнай прыналежнасьці.

5

Бо ўсё ён сказаў, як з-пад Пінску зімою
Дайшоў да Масквы, да сівога Крамля:
“О цар, мы — браты, я прыйшоў за табою —
Кліча цябе Беларусі зямля!”

Алег Лойка
«Балада пра Філіповіча»
Але, *“каб не быць галаслоўнымі, звернемся да канкрэтных аўтараў і канкрэтна ўзятых твораў, якія прыцягваюць да сябе ўвагу адпаведнымі назвамі”* і, дадамо, ня толькі назвамі, але і сваім зьместам.
У разьдзеле «З вуснай народнай творчасці» і «Богагласнікаў» пададзеныя ў асноўным калядныя і вялікодныя тэмы. Народ сьпяваў і сьпявае бяз розьніцы веравызнаньняў такія песьні, як «Неба і Зямля», «Нова радасьць стала», «Вялік Сьвяты Дзень» («Хрыстос Уваскрос») і інш. Шэраг песьняў прысьвечаныя Багародзіцы і, у прыватнасьці, пэўнаму культу яе, а менавіта: Жыровіцкай, Холмскай, Лясьнянскай, Пухлаўскай (рэч зразумелая, усё праваслаўным). Між тым, а. Леў Гарошка налічваў больш чым 50 вядомых культаў Багародзіцы на этнічнай тэрыторыі Беларусі. І кожнай зь іх былі прысьвечаныя свае песьні-гімны. Многія зь іх не захаваліся, але некаторыя народныя творы, у тым ліку найбольш папулярныя — да Маці Божай Будслаўскай, Вастрабрамскай, Бялыніцкай, Менскай — няцяжка адшукаць. Але і тут складальнік абмяжоўваецца выбраным паводле ўласнага густу: прыводзіць адзін твор «Да Жыровіцкай іконы Багародзіцы», адзін «Гімн да Пухлаўскай іконы Божай Маці», два творы, якія прысьвечаныя Холмскай

Багародзіцы («Пречистая Дево, Мати Руськаго краю», «Пречистая Дево, Мати Холмския Руси»), два — Лясьнянскай Багародзіцы («Спевайте, люди, кто жие на свете…», «Чудотворной иконе Божией Матери Леснянской»). Цяжка сказаць, чым выкліканая такая пільная ўвага менавіта да гэтых абразоў. Здаецца, ні адзін, ні другі культ Багародзіцы не каранаваныя на “Ўладарку Беларускага народу”, дый творы, якія падае Чарота, не на мове беларускай. Дарэчы, зьвернемся да тэкстаў і прывядзём колькі цытатаў: *“Когда нашу Русь Святую громил страшный враг…”* — вось так, паводле І.Чароты, сьпяваў просты беларускі народ у гонар Холмскай Багародзіцы недзе пад Менскам і Полацкам. А вось як сьпявалі беларусы ў Бельскім павеце: *“В Лесной нам её объявила, о Марие! Руський народ полюбила, аллилуя!”*. І гэта ўсё чытач павінен успрымаць як узоры беларускай хрысьціянскай паэзіі. А вось народнай псальмы «Матачка Божая» (мэлёдыя а. Фабіяна Абрантовіча) у кнізе, укладзенай у выдавецтве «Ўраджай», вы ня знойдзеце:

Матачка Божая, Матачка Добрая,
Бедныя дзеці, мы клічам Цябе;
Песьняй пакорнаю мольбы складаючы,
Сэрцы свае аддаём мы Табе.
Нас, сваіх дзетак, што ў Цябе просяцца,
Матачка Добрая, Ты пашкадуй;
Ласкай аджыўчаю Бога Прадвечнага,
Матачка Божая, нас абдаруй…

Ці не таму і не крануў, што няма ў ім “рускага начала”, а ёсьць толькі агульначалавечае… А яшчэ ў гэтым ёсьць сапраўдная народная паэзія; а яшчэ гэтую песьню спяваюць, у большасьці, беларусы каталікі і ўніяты — а таму, відаць, і няма яе ў чаротаўскай анталёгіі.

Цікавы разьдзел у анталёгіі пад назовам «Псалтыр» у вершаваных перакладах”. Не зусім зразумела, пра якія пераклады ідзе гутарка? Можа, пра «Псалтыр» у вершаваных пераказах, варыяцыях, інтэрпрэтацыях? Калі б было так, то не было б патрэбы ў вельмі спрэчным жанравым удакладненьні, кшталту “перастварыў”, “пераклаў” (калі гутарка пра творы Язэпа Германовіча, то ён рабіў вершаваныя пераказы, а не

пераклады), “перасьпяваў”. Дарэчы, тэму гэтую мог пашырыць Янка Золак, у яго ёсьць цудоўныя інтэрпрэтацыі псальмаў «Песьні Ўзыходжаньня». Калі чытаеш анталёгію далей, узьнікае пытаньне: ці ўкладальнік сам не разумее, што такое Псальмы, ці тут нейкая недарэчная тэхнічная памылка? Цяжка зразумець, як у разьдзел «Псалтыр» (пра што сьведчыць надпіс на кожнай старонцы) трапілі «Пахвала Эўфрасіньні Полацкай» Кірылы Тураўскага, альбо ананімны твор «Нагробак отцу Афанасию Филиповичу…», альбо «Пролог о Преподобной матери Ефросинии» Сімяона Полацкага, альбо твор з «Загараўскага зборніка» ананімнага аўтара? Тое, што яны трапілі ў «Псалтыр», — гэта яшчэ палова бяды, але давайце прыслухаемся да таго, што гавораць аўтары «Псалтыра» у чаротаўскай «Анталогіі хрысціянскай паэзіі»:

Звитяжай же зрайцов первей уніатов,
препозитов также и их номинатов…
Поткужи всех противников и их ради,
абы большей чинили гневу и здрады…
Пришол той час разделена з проклятыми…
Афанасій Брэсцкі (Філіповіч)
Альбо:

“Российских деля стран украшения…
Просвети землю белороссийскую”
Симеон Полоцкий
Вось такі «Псалтыр» выходзіць у Чароты. І дарэмна нехта думаў, што «Псалтыр» напісаў юдэйскі цар Давід задоўга да таго, як зьявіліся “праклятыя ўніяты” і “Восточныя Церковъ”. Увогуле, паводле чаротаўскай анталогіі выходзіць, што Давід у “*вершаваным перакладзе Сімяона Полацкага*” ўжо ставіў пытаньні наконт “Российских стран украшения…” і аб *“земле белороссийскай*”. А яшчэ згадваецца бедны Янка Купала з сваімі спробамі “На біблійныя матывы (З псалму 78)” у прачытаньні І.Чароты: *“Прачытаўшы яго, цяжка пазбавіцца ад недаўмення…*” І калі гэта не тэхнічная памылка (будзем лічыць, што нашкодзілі ўніяты), то цяжка сказаць, колькі попелу трэба высыпаць на галаву ўкладальніку за такія выкрунтасы ў дачыненьні да «Псалтыра», каб Давід мог дараваць такі кантэкст. Другая справа, калі ўкладальнік меў на ўвазе

псальму як жанр рэлігійнай лірыкі, тады трэба было так і назваць разьдзел — «“Псалтыр” і псальмы», што давала б магчымасьці шырокай інтэрпрэтацыі і твору, і жанру.

Размытыя крытэры хрысьціянскай паэзіі з прадмовы аўтара адэкватна расплываюцца ў тэкстах паводле канфэсійнай праблематыкі. Прадмовы магло б і зусім ня быць. Зь вялікім сумам прыходзіцца адцеміць таксама, што хрысьціянская паэзія ў анталёгіі разбаўленая біблійна-рэлігійным ды канфэсійна-праваслаўным вінэгрэтам і каля-паэтычнай матывацыяй вакол яго. Інакш чым можна растлумачыць наяўнасьць шматлікіх твораў у анталёгіі, якія нічога супольнага ня маюць з хрысьціянскай паэзіяй і ўвогуле з хрысьціянскім ідэалам: «Св. Афанасій Брэсцкі (Філіповіч)», «Нагробок отцу Афанасию Филиповичу, игумену берестескому, в року 1648 зешлому», «О лжепастырёх» (ананімны аўтар). У гэтых творах, з чым можна пагадзіцца, ёсьць канфэсійныя праблемы, якія перададзеныя ў вершаванай форме, а паэзія, і тым больш хрысьціянская, — гэта, пэўна, штосьці большае, чым усхваляць дзеяслоўнай рыфмай “пракляцьце уніі”. Дарэчы, канфэсійныя праблемы (праблемы РПЦ альбо Праваслаўя) дамінуюць у многіх вершах, і ў большасьці гэтых вершаў нічога няма супольнага з хрысьціянскай паэзіяй, да прыкладу:

Каб з унею праклятаю змірыцца,
З прадаўцамі, што ганьбяць запавет?
Не, ойча, ні за што!
Лепш не радзіцца на божы свет.
Міхась Рудкоўскі «Смерць Афанасія Філіповіча».

Справа, зразумела, не ў Філіповічу. Не хацелася б кранаць гэтую тэму, але сёньня, відавочна, вельмі хочацца некаму весьці канфэсійную гутарку а-ля Філіповіч і на ўзроўні Чароты. Толькі не стасуецца гэта ўсё з сапраўдным хрысьціянствам, зь яго любоўю да бліжняга, зь яго даравальнасьцю і міралюбствам. Не стасуецца гэта і з сапраўдным мастацтвам. Нічога ня мае супольнага з хрысьціянскай паэзіяй эпіграф: *“Каталіцызм дапамагае апалячваць беларусаў”*. Пра гэта звычайна пішуць гісторыкі альбо палітыкі, але не паэты. Калі ж аўтар убачыў аб’ект паэзіі (яго права — выбіраць аб’ект) у тым, што *“Але ў касцёл прыйшоўшы памаліцца, // Я, проша пана,*

мушу быць паляк”, дык ён, у першую чаргу, павінен быць аб’ектыўным: кім ён мусіць быць тады ў праваслаўнай царкве — не чуваць нешта там беларускае мовы і беларускага духу, як і не відаць падтрымкі гэтай царквой беларускасьці, але гэты факт ня стаў чамусьці аб’ектам “паэзіі”. Увогуле, прычым тут паэзія?
У літаратурныя анталёгіі трапляюць звычайна самыя лепшыя творы, якія прайшлі выпрабаваньне часам і апрабацыю крытыкай. А тут цяжка зразумець, якімі крытэрамі альбо выгадамі кіраваўся складальнік, калі ў анталёгіі хрысьціянскай паэзіі надрукаваў графаманскія вершаваныя практыкаваньні Міхаіла Шэлехава «Малітва» (відаць, паводле назвы). Тое самае можна сказаць і пра вершыкі Анатоля Кудласевіча «Паэт спяваў, а людзі ў крамы йшлі», «Мроя Кіцежа».

З другога боку, некаторыя цудоўныя мастацкія тэксты прыцягваюцца ў анталёгію “за вушы”, бо хрысьціянская аргумэнтацыя ў іх або адсутнічае, або матывуецца толькі вонкавым фонам: Кандрат Лейка «Апошнія хвіліны», Максім Багдановіч «Перапісчык», Янка Сіпакоў «…Іду звычайнаю сцяжынай», Уладзімер Мархель «І іду між ацішэлых дрэў», Васіль Жуковіч «Кніга», Надзея Артымовіч «Ікона» (і тут, відаць, “паводле назвы”, бо для паэткі “Бельск — ікона, малітва, сон, жыццё”, а не ікона Дэісуса, Багародзіцы, Апанаса Філіповіча), Анатоля Сыса «Маналог Апанаса Філіповіча»… (Складваецца ўражаньне, што рыхтавалася ня столькі анталёгія хрысьціянскай паэзіі, колькі анталёгія твораў, якія прысьвечаныя Філіповічу!)
Пакуючы зьмест, каб анталёгія выглядала паважна, складальнік выкарыстаў многія творы з сумнеўнай паэзіяй — інакш, дзе паэзія падмяняецца апісаньнем біблійна-хрысьціянскіх матываў, і ня больш. Хутчэй за ўсё, такія творы пісаліся для дзяцей альбо мелі іншае прызначэньне і не зь віны аўтараў трапілі ў чаротаўскую анталёгію хрысьціянскай паэзіі, без прэтэнзіі на такую ролю: Віктар Швед «Хадзіла па сяле звязда», Васіль Зуёнак «…Хадзіла вярба»… Шмат, дарэчы, у кнізе розных “хаджэньняў” то сьцяжынкамі, то між дрэў, то вярба… як нейкі зборны вобраз блуканьняў на шляху да хрысьціянскай паэзіі і аўтараў, і ўкладальніка.
Ня лепшая падборка вершаў Алега Бембеля (Зьніча). І яна

быццам сабраная не дзеля сапраўдных каштоўнасьцяў паэзіі, а дзеля таго, каб падкрэсьліць:

Жыве Святая Імператрыца!..
Жыве Саборны Дух Царкоўны!..
Жывуць Саборныя Каноны!..
Жыве пад Богам асіянны
Народ Царкоўны Праваслаўны.
“Царква”

Так і хочацца крыкнуць наўздагон Бембелю “Жыве Беларусь!”, але згадваецца бедны Янка Купала ў прачытаньні І.Чароты: *“Усяленская радасць з нагоды Уваскрасення заменена змагарска-правадырскімі заклікамі…”* Зьніч пісаў свой верш з нагоды Сьвята Тройцы, але, паводле Чароты, аднаму можна, другому — не. А калі прыбегнуць да мэтаду чаротаўскага прачытаньня паэтычных твораў, так і хочацца запярэчыць паэту: чаму Сьвятая Імпэратрыца, а не, скажам, Багародзіца? Ці ўсё ж такі Бембель меў на ўвазе імпэратрыцу?.. Але, балазе, ведаем мы гэтых імпэратрыц. І калі так, Багародзіца можа толькі пакрыўдаваць за такое цынічнае блюзьнерства. Бо прыгадваецца расейская “папса”: “Гуляй, шальная імпэратрыца…”.

Анталёгію беларускай хрысьціянскай паэзіі варта было б выдаць толькі дзеля таго, каб у ёй можна было б надрукаваць верш Зьніча «Хрыстос і Айчына»:

Раскрыжаваньне кат завершыў…
аблашчыў кужаль кроў Жыцьця…
так: Плашчаніца — гэта Першы
мой Бел-Чырвоны-Белы Сьцяг!

Альбо «Гімн Уваскрасеньню»:

Дзесяць стагодзьдзяў справа Хрыстова
На Беларусі крывавіць у сэрцах.
Дзесяць стагодзьдзяў мусіць нанова
Біцца зь нячыстым у паняверцы.
Хто з нас адважыцца — сёньня і людна —
Выйсьці на плошчу і перахрысьціцца? —
Хто бараніць ад глумленьня — паўсюдна! —

Імя сьвятое не забаіцца...
Людцы, над процьмаю самазьнішчэньня
Ўславім Хрыста, што за нас пакараны!
Кожны далучыцца да ўваскрашэньня...
Кожны — пакліканы...
Кожны — абраны...
Вось дзе яны — узоры сапраўднай хрысьціянскай паэзіі! І якія ўзоры! Бачыць сваю Айчыну ў Хрысьце і праз Хрыста… Бачыць асобу ў сьцьверджаньні гэтых высокіх ідэалаў… Хіба ж гэта не крытэры хрысьціянскай паэзіі?! Але такіх твораў у анталёгіі акурат і няма.

6

Ня я пяю — народ Божы.

Уладзіслаў Сыракомля
Тым ня менш (калі хтосьці ўсё ж такі захоча даведацца, што такое сапраўдная хрысьціянская паэзія, паводле гэтай анталёгіі), трэба аддаць належнае, — ёсьць узоры і ў анталёгіі, якія адпавядаюць высокім крытэрам. Да такіх твораў можна аднесьці «Дай, добры Божа, зару і сонца бачыць» (Язэп Германовіч), «Хрыстос Васкрос» (Янка Купала), «Цемень» (Максім Багдановіч), падборку вершаў Натальлі Арсеньневай, а таксама творы Янкі Золака, Ларысы Геніюш, Майсея Сяднёва, Міхася Кавыля, Валянціна Лукшы, Рыгора Барадуліна, Сяргея Законьнікава, Марыі Баравік, Таісы Бондар, Галіны Каржанеўскай, Яўгеніі Мальчэўскай, Алеся Сьпіцына.
Ёсьць і іншыя творы, вартыя анталёгіі хрысьціянскай паэзіі, але яны засталіся па-за ўвагаю ўкладальніка. Лічым сваім абавязкам згадаць толькі некаторыя моманты.
Найперш, анталёгіі моцна не стае духоўнай паэзіі XVI—XVIII стагодзьдзяў, таго самага хрэстаматыйнага ўніяцкага гімну «О, мой Божа! Веру табе!», зь якога пачыналася знакамітая «Беларуская хрэстаматыя» Эпімах-Шыпілы і факт распаўсюджанасьці якога адлюстраваны ў «Вечарніцах» Дуніна-Марцінкевіча. Да гэтага ж гімну А.Рагоўскі напісаў музыку, і ён выконваўся ў многіх каталіцкіх храмах.
Усю адказнасьць за хрысьціянскую паэзію XIX стагодзьдзя ўкладальнік узваліў на Францішка Багушэвіча. Кепска, што ўкладальнік не зьвярнуўся да такіх дасьледнікаў, як Генадзь

Кісялёў, Кастусь Цьвірка, Адам Мальдзіс, Уладзімер Мархель, дзякуючы якім была адкрытая беларуская літаратура, а ў больш шырокім сэнсе — беларуская культура XIX стагодзьдзя. Калі б зьвярнуўся да іх, дык не пераблытаў бы Янкі Лучыны з Уладзіславам Сыракомлем. А яшчэ, магчыма, палічыў бы патрэбным уключыць у анталёгію цікавы твор Арцёма Вярыгі-Дарэўскага «Гімн да іконы цудатворнай Багародзіцы Бялыніцкай над Дняпром» ці верш Зафіі Манькоўскай «Беларуская малітва»:

Гулялі ветры па нашым полі
І сапсавалі наш ураджай,
І няма шчасьця, і няма долі.
Божа, наш Бацька, хлеба нам дай!
Дай нам здароўя, шчыру ахвоту,
Калі з сахою пойдзем араць.
Ты бачыш цяжку нашу работу,
Дай жа пажытку зь яе прыждаць!

Можна падыскутаваць наконт паэтычнае тэхнікі, але ўва ўсякім разе, твор гэты ня горшы за многія вершы, прапанаваныя ў анталёгіі. А калі яшчэ згадаць, што гэта адзін зь першых беларускіх паэтычных твораў у жанры малітвы (як вядома, жанр стаў пазьней вельмі папулярным і распаўсюджаным у беларускай лірыцы — можна сабраць цэлую анталёгію вершаў (гімнаў-малітваў), дык публікацыя яго ў анталёгіі была б апраўданай і патрэбнай.

Нельга не згадаць у гэтым кантэксьце Вікенція Дуніна-Марцінкевіча:

Што ты добры к нам бясконца,
Знаем гэта праз прарока,
Ты для нас уся апока,
Сын Твой верных абаронца —
Праз яго благаслаўленьне
Нам даруй і дай збаўленьне.

«Малітва на памінальны дзень»

А яшчэ ёсьць у Дуніна-Марцінкевіча цудоўны твор «Дзіця і маці» — чым не хрысьціянская паэзія?

Думаю, што вельмі патрэбным будзе знаёмства літаратара-ўкладальніка яшчэ з адным паэтам, публіцыстам, празаікам,

творчасьць якога не зьяўляецца закрытаю тэмай ані ў школах, ані на філялягічных факультэтах. Напачатку прывядзём яго цытату, якая, здаецца, арганічна ўпісваецца ў кантэкст нашай гутаркі: “Высакародная мэта — праўдзівая, а што праўдзівае, тое прыгожае ў мастацкім сэнсе, гэта значыць, можа быць прадметам мастацтва. Так разумеючы задачы мастацтва, мы ні ў якім разе не падпарадкуем яго маральнасьці, бо маральнасьць у звычайным яе значэньні абапіраецца, як вядома, на пачуцьці і звычаі, якія самі маюць патрэбу ў падначаленьні розуму… Мастацтва павінна кіравацца праўдай, змагацца за справу вечна жывой праўды, бо ў процілеглым выпадку, як зьява бяз мэты ці з часовай мэтай, яно зробіцца абыякавым для грамадзтва”. Гэтыя праройскія словы належаць Вінцэнту Каратынскаму. І наконт крытэраў эстэтычнага і “вечна жывой праўды” адказ трэба шукаць у творах, можа быць, аднаго з найбольшых беларускіх хрысьціянскіх паэтаў, якога І.Чарота ня ведае, а таму і ня згадвае ў анталёгіі. Прывядзём некалькі прыкладаў, у якіх найбольш важныя прынцыпы хрысьціянскай маралі “палюбі Бога свайго” і “палюбі бліжняга свайго” (чым не крытэр для вызначэньня хрысьціянскай паэзіі) аўтар вельмі ўдала ўводзіць у кантэкст мастацтва:

Дух адзін лучыць гоні сусьвету,
Зваць яго Любасьць; сьветлая мара…
У квецені буйнай, бегах плянэтных
Дух той спазнае, дух жыцьцядарны.
…….
Любасьць, як будзе ў сэрцах супольнай
Да Сям’і, Краю, Люду плянэты,
Зь ёй як зямля ўся станецца вольнай —
Бог загасьцюе ў лучнасьці сьвету…
«Любасьць»
Альбо:

Як бывала ў час прыгожы,
Калі Бог хадзіў між намі:
Рукі, ногі твае, Божа,
Расцалоўваў бы я, можа,
І заліў бы іх сьлязамі.

Свой бы гнеў Ты не абрушыў,
Даў бы зьведаць вольнай волі:
Міласьць нам зьяднала душы!
Што той долі, долі, долі!
Ох, ці толькі пан дазволіць?
«Пасьля сватаньня»
Здаецца, да гэтых тэкстаў не патрэбныя камэнтары. Застаецца толькі параіць І.Чароту пачытаць В.Каратынскага, каб лепш зразумець, што ўяўляе сабой беларуская хрысьціянская паэзія. А таксама Ўладзіслава Сыракомлю.

Ня я пяю — народ Божы
Даў мне ў песьні лад прыгожы,
Бо на сэрцы маю путы
І з народам імі скуты.
«Ня я пяю — народ Божы»,
пераклаў Янка Лучына
А яшчэ ў Сыракомлі ёсьць напісанае па-беларуску:

Эй, згіне вораг, як Бог нам паможа
За нашу крыўду, за горкі наш жаль.
Запяём песьню: “Хваліць цябе, Божа!”
Лягчэй будзе сэрцу, як згіне маскаль.
«Добрыя весьці».
Калі друкуецца творчасьць Апанаса Філіповіча, мо трэба даваць месца й Сыракомлю?!

Калі ж ізноў сур’ёзна, дык у анталёгію варта было ўключыць і Янку Лучыну, і Каруся Каганца, чые вершы друкаваліся ў «Хрысьціянскай думцы» (1993, №2). Але для заснавальніка беларускай духоўнай паэзіі Каганца не знайшлося месца ў чаротаўскай анталёгіі.
Што да ХХ стагодзьдзя, дык абмяжуемся заўвагай, што перад укладальнікам была магчымасьць якаснага адбору твораў хрысьціянскай тэматыкі, балазе такіх твораў у параўнаньні з папярэднімі пэрыядамі значна больш.
А як ён уклаў безумоўна патрэбную кнігу — хай гэта будзе на яго сумленьні.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 6 (29) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Анатоль Сідарэвіч Убоства тэорыі

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ — гісторык, публіцыст, сталы аўтар «ARCHE». Сёлета пад яго рэдакцыяй у выдавецтве «Беларускі кнігазбор» выйшлі выбраныя творы Антона Луцкевіча «Да гісторыі беларускага руху».

Л.Н.Сечко. Социал-демократическая альтернатива. — Менск: Веды, 2001.
Станислав Шушкевич. Неокоммунизм в Беларуси: идеология, практика, перспективы. — Смоленск: Скиф, 2002.

У сучасным кніжным моры практычна няма працаў беларускіх аўтараў, прысьвечаных гісторыі, тэорыі і праграматыцы сацыялізму і камунізму. Што такія распрацоўкі патрэбныя, няма спрэчак, асабліва беручы пад увагу эксплюатаную цяперашнім рэжымам тэрміналёгіі, якою карыстаюцца дэмакратычныя сацыялісты: “рынкавы сацыялізм”, “сацыяльная дзяржава” і г.д. Што маюць супрацьпаставіць гэтаму сацыял-дэмакраты? Кнігі праф. Леаніда Сечкі і чальца-карэспандэнта НАН Станіслава Шушкевіча павінны былі б прыцягнуць увагу адмыслоўцаў ужо хаця б таму, што іх пісалі старшыня Сацыял-дэмакратычнай партыі народнай згоды і старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады. Натуральна чакаць, што ў гэтых творах выкладзеныя крэда лідэраў партыяў, іх погляды на праблемы сацыялізму. Урэшце, пішучы такія кнігі, лідэры партыяў проста ці ўскосна выказваюць прэтэнзіі на званьне тэарэтыкаў, знаўцаў прадмету.

Вось з гэтым — зь веданьнем прадмету — і ёсьць праблемы.

Напрыклад, з брашуры Л.Сечкі мы можам даведацца, што ў 1904 г. была заснаваная Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада і што яна карысталася вялікай папулярнасьцю сярод працоўных Заходняй Беларусі. Уславіўшы такім чынам і Беларускую сацыялістычную грамаду, і Беларускую сялянска-работніцкую грамаду, Сечка хацеў высьцебаць сваіх цяперашніх апанэнтаў, але прадэманстраваў няведаньне гісторыі сацыял-дэмакратычнае праграматыкі. Калі б ён пагартаў праграмы Швэдзкае СДРП (1989) і СДП Нямеччыны (1990), дык убачыў бы, што складальнікі праграмы "старое" БСДГ дбайна вучыліся ў швэдаў і асабліва ў немцаў, і не сьцьвярджаў бы, што яны сьпісвалі праграму БНФ. У 1992 г., калі БСДГ прымала сваю праграму, мелася толькі праграма руху БНФ. Праграма зьявілася на сьвет у 1993 г. І калі гэта здарылася, кожны мог убачыць, што фронтаўцы пазычылі ў БСДГ разьдзел пра сацыяльную палітыку. Вялікія фрагмэнты праграмы БСДГ былі перанесеныя і ў праграму Беларускае партыі працы.

Мала таго: праграма БСДГ легла ў аснову праграмы Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народнай грамады), сустаршынём якое некалькі месяцаў быў Л.Сечка. Галасуючы за гэтую праграму, ён у 1996 г. ня бачыў яе "бээнэфаўства". Так складваюцца справы зь веданьнем прадмету ў Л.Сечкі. Ягонае ж саматужнае — без уліку дасягненьняў сучаснае сацыялістычнае думкі — тэарэтызаваньне наводзіць сум. Што датычыць працы С.Шушкевіча, дык у самой яе назьве — «Нэакамунізм у Беларусі» — ужо ўтрымліваецца клубок праблемаў. Па-першае, які зьмест укладае аўтар у панятак "камунізм"? Па-другое, якая гістарычная форма камунізму — бальшавізм, мааізм і г.д. — узнаўляецца ў Беларусі? Па-трэцяе, як разглядаюцца камунізм і нэакамунізм у Беларусі: як тэорыя, рух, мэта ці рэжым?

У кнізе ёсьць параграф «Вызначэньні». Аўтар цытуе дэфініцыю камунізму з праграмы КПСС (1961). І адразу ж дапускае некарэктны ў навуковай і больш прыдатны ў публіцыстычна-прапагандысцкай працы выраз: "Далей у Праграме, як тады было прынята, гаварылася, што камунізм, які ўзводзіцца савецкім народам, — гэта фактычны рай на зямлі..." Потым ідзе цытата з тае ж праграмы, у якой мы не знаходзім слова

“рай”, затое знаходзім пастуляты камунізму: пераадоленьне адрозьненьняў паміж горадам і вёскай, супярэчнасьцяў паміж разумовай і фізычнай працай, гарманічныя адносіны паміж асобаю і грамадзтвам, бясклясавае грамадзтва... “Адкінуўшы патэтыку, усхваленьні, патас”, С.Шушкевіч прапануе чытачам кароткую дэфініцыю камунізму, якая “атрымала прызнаньне палітолягаў і заняла месца ў энцыкляпэдычных слоўніках і даведніках апошняга часу”, не называючы, што праўда, гэтых слоўнікаў і даведнікаў. Увага, вось яно, новае слова навукі: “Камунізм — адна з вэрсіяў грамадзкага ідэалу, што базуецца на міце пра ўсеагульную роўнасьць людзей на аснове поўнага багацьця”. Да гэтае куртатае дэфініцыі можна дадаць яшчэ дзясятак гэткіх жа куртатых, а плёну ня будзе ніякага, бо з падручнікаў лёгікі вядома, што найбольш цяжка вызначыць аксіялягічныя паняцьці (а ідэалы камунізму — грамадзкія вартасьці). Гэта разумелі і складальнікі праграмы КПСС, а таму ўжылі ня ўласна дэфініцыю, а хутчэй апісаньне камунізму. Далей С.Шушкевіч робіць гістарычны экскурс і спрабуе ўпэўніць нас, што “зыходнае навуковае абгрунтаваньне ідэі камунізму імкнуліся даць К.Маркс і Ф.Энгельс”. Такім чынам, аўтар прызнае існаваньне навуковага камунізму. (Вось дзе блытаніна: Энгельс пісаў пра сацыялізм як навуку, а бальшавікі прыдумалі навуковы камунізм.) Мы ж, адмаўляючы магчымасьць навуковага сацыялізму (і камунізму), скажам — усьлед за Антоніё Лябрыёлам і Эдуардам Бэрнштайнам, — што Маркс і Энгельс стварылі тэорыю крытычнага сацыялізму (і камунізму). І дадамо, што ідэалы грамадзкае ўласнасьці на сродкі вытворчасьці, усеагульнае роўнасьці людзей, бясклясавага грамадзтва, эмансыпацыі жанчынаў, пераадоленьня адрозьненьняў паміж вёскай і горадам, разумовай і фізычнай працаю, самі паняткі “сацыялізм” і “камунізм” выпрацаваныя да Маркса і Энгельса. Маркс і Энгельс крытычна прааналізавалі ранейшыя дасягненьні сацыялістычнае і камуністычнае думкі ды зьвялі іх у не зусім завершаную сыстэму.

Паставіўшы знак роўнасьці паміж марксізмам і камунізмам, С.Шушкевіч цытуе расейскага акадэміка Аляксандра Якаўлева: “...марксізм-ленінізм — гэта не навука, а публіцыстыка — людажэрчая і самаедзкая”.

Стоп! Пра што гаворка, панове? Пра марксізм ці пра марксізм-ленінізм? Вось гэтак у працы С.Шушкевіча дапускаецца яшчэ адна падмена паняткаў. Яна, мусіць, вынікае з таго, што аўтар, выхаваны ў савецкай ВНУ, ня бачыць адрозьненьня паміж вучэньнем Маркса і Леніна. Калі б ён прачытаў і выкарыстаў у сваёй працы трохтамовае дасьледаваньне Лешака Калакоўскага «Główne nurty marksizmu» (у Нацыянальнай бібліятэцы маецца) ці кнігу таго ж А.Якаўлева «Омут памяти» (2001), то зразумеў бы: марксізм-ленінізм ня тоесны марксізму. Акадэмік Якаўлеў, між іншым, пісаў: "...я і цяпер адкідаю для сябе ролю нейкага абвінаваўцы Маркса"; "Мы прызвычаіліся да формулы «марксізм-ленінізм». Але ў ёй няма адзінага зьместу. Такога адзінага вучэньня няма. У значнай меры гэта розныя паняткі. Марксізм — адна з культуралягічных канцэпцыяў XIX стагодзьдзя, якіх было нямала. Ленінізм — паліталягічная канструкцыя, на аснове якой узьнік бальшавізм..."; "Ленін быў пасьлядоўным рэвізіяністам. Марксізм быў для яго адно шырмаю для палітычнай дэмагогіі".
Атаясаміўшы марксізм і камунізм, потым марксізм і марксізм-ленінізм, С.Шушкевіч у параграфе «Асновы ідэалёгіі камунізму» атаясамлівае камунізм і сацыялізм. Наагул, у аўтара выбудоўваецца бальшавіцкая схема: марксізм — марксізм-ленінізм — навуковы сацыялізм (камунізм). Іншым плыням і адценьням марксісцкае, сацыялістычнае і камуністычнае думкі месца ў гэтай схеме няма. І гэта вельмі дзіўна, калі мець на ўвазе, што аўтар кнігі — сацыял-дэмакрат. У сувязі з гэтым кідаецца ў вочы, што ў сьпісе літаратуры няма твораў сацыялістычных крытыкаў камунізму: Карла Каўцкага, Вілі Бранта, Інгвара Карлсана ці нашага Антона Луцкевіча.

Недахопам кнігі С.Шушкевіча зьяўляецца і тое, што ён крытыкуе камунізм, сацыялізм, марксізм і марксізм-ленінізм не самастойна, не аналізуючы адпаведных першакрыніцаў, а, як правіла, спасылаючыся на кагосьці, але і гэтага кагосьці, як, напрыклад, Міхаіла Бакуніна, ён цытуе пры дапамозе пасярэдніка. Уражвае некрытычнасьць аўтара. Вось ён бярэ на веру і нам прапануе паверыць у справядлівасьць выказваньня Людвіга фон Мізэса: сацыялізм "мае на мэце абавязковую ліквідацыю ўсіх "пражыткаў" свабоды і ператварэньне людзей у поўных рабоў", якія гатовыя "быць вінцікамі ў гіганцкай

машыне, што вынайшаў і прывёў у рух усёмагутны правадыр”. Пра які сацыялізм ідзе гутарка — тэорыю, рух, мэту? Пра дэмакратычны сацыялізм ці “рэальны”? Ні сацыялізм, ні камунізм як тэорыя, рух і мэта не адмаўляюць свабоды. Больш за тое, у Камуністычным маніфэсьце сфармуляваны вялікі ідэал эўраантлянтычнай цывілізацыі: Маркс і Энгельс мараць пра час, калі “на месца старога буржуазнага грамадства зь ягонымі клясамі і клясавымі супрацьлегласьцямі прыходзіць асацыяцыя, у якой свабоднае разьвіцьцё кожнага зьяўляецца ўмоваю свабоднага разьвіцьця ўсіх”. За ажыцьцяўленьне гэтага ідэалу, за пабудову салідарнага грамадства (сынонім асацыяцыі) і змагаюцца дэмакратычныя сацыялісты, паставіўшы прынцып свабоды на першае месца сярод палітычных і маральных каштоўнасьцяў. Здаецца, гэтая мэта (пабудова салідарнага грамадства) запісаная ў праграмах і “старое” БСДГ, і БСДП (НГ), і БСДГ цяперашняй. Падаўленьне свабоды асобы практыкавалася ў грамадстве “рэальнага сацыялізму”. Але “рэальны сацыялізм” быў “першаю фазаю камунізму”, сынонімам камуністычнага рэжыму, пра які піша далей С.Шушкевіч і які з 1918 г. крытыкуюць дэмакратычныя сацыялісты (згадаем “рэнэгата” Каўцкага) і нават камуністы (пачынаючы з Розы Люксэмбург).

У працы С.Шушкевіча марксізм-ленінізм — камунізм. Але і тут ня ўсё так проста — было ж у камунізьме люксэмбургіянства з тэзысам “Свабода заўсёды ёсьць свабодаю для іншадумцаў”. А ад люксэмбургіянства сьцежкі вядуць да эўракамунізму. Ці гэта ня плыні ў камунізьме?
Вось С.Шушкевіч піша, што камунізм — гэта ліквідацыя інстытуту прыватнае ўласнасьці і абагуленьне маёмасьці грамадзянаў. Што ў тэорыі камунізму гэта ня так, можна давесьці цытатамі нават з Камуністычнага маніфэсту. Маркс і Энгельс выступалі перш за ўсё супраць таго грамадства, у якім “прыватная ўласнасьць зьнішчаная для дзевяці дзясятых”, г.зн. для пралетараў і паўпэраў, якія й былі гэтымі 9/10 грамадства. Ці выступалі б яны за сацыялізацыю прыватнае ўласнасьці, калі б тыя 9/10 былі ўласьнікамі, калі б у сярэдзіне XIX ст. склаўся “народны капіталізм”? Далей у працы С.Шушкевіча сьцьвярджаецца, што адна з істотных рысаў камунізму — ваяўнічы атэізм і непрыманьне заходніх

вартасьцяў. Калі гэта праўда, немагчыма растлумачыць, як так здарылася, што камуністы ў Італіі, Літве, Польшчы, Вугоршчыне ды іншых краінах стварылі моцныя сацыял-дэмакратычныя партыі, якія выступаюць за адзіную дэмакратычную і сацыяльную Эўропу.
Марна шукаць адказу на гэтыя пытаньні ў кнізе С.Шушкевіча. Дзіўным чынам ён, разважаючы пра камунізм, не заўважыў яго спэцыфічна расейска-ўкраінска-беларускай праявы — бальшавізму. Магчыма, пачаўшы ab ovo, з гэтае канкрэтнае зьявы, ён унікнуў бы тэрміналягічнае блытаніны і надта агульных азначэньняў ды больш ясна выбудаваў бы лінію разважаньняў: камунізм — бальшавізм — бальшавізм у Беларусі — нэабальшавізм у Беларусі. Тут жа выходзіць: не разгледзеўшы грунтоўна спэцыфікі камунізму (бальшавізму) у Беларусі, аўтар пераходзіць да нэакамунізму (а фактычна нэабальшавізму) у Беларусі.
Кнігі Л.Сечкі і С.Шушкевіча выдадзеныя як навуковыя. І гэта прымушае смуткаваць: калі такое веданьне гісторыі сацыялізму і блытаніну выяўляюць правадыры, дык якое такое тэорыі і стратэгіі варта чакаць ад гэтых сацыял-дэмакратычных партыяў? Між тым даўно вядома, што няма нічога больш практычнага, чымся добрая тэорыя.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/01/21**
[image]

Юры Пацюпа Занядбаная старонка правапісу: прапановы пісаньня прыназоўніка *у/ў* перад словамі, што пачынаюцца з галоснай

ЮРЫ ПАЦЮПА (нар. у 1965 у Полацку) — філёляг, сталы аўтар «ARCHE». У 1992 скончыў філялягічны факультэт Гарадзенскага дзяржаўнага унівэрсытэту імя Янкі Купалы.

Стопрацэнтова дасканалага правапісу не бывае, таму, зьяўляючы, кожны правапіс адначасна і ўтойвае, і скажае. А часамі ён гэтак далёка заводзіць мову, што пачынае дамінаваць над ёю, з служкі ператвараецца ў гаспадара. Вось жа, адну такую занядбаную старонку і хацелася б тут разгледзець.

У выніку працяглае дыскусіі правапісная камісія 1926 году пастанавіла: не пазначаць у пісаньні пазыцыйнага чаргаваньня *і/й*, але пазначаць чаргаваньне *у/ў* (з выняткам пазычаных слоў ды ўласных найменьняў)[1]. Гэтую пастанову ў 1933 годзе бальшавікі мэханічна перанесьлі і ў свой правапіс. Такім парадкам, бальшыня довадаў “за” і “супраць” была выказаная

75 гадоў таму. І хоць зьмеркаваньне камісіі выглядае ўзважаным, грунтоўным, аднак сёньня, у зьвязку з дыскусіяй аб правапісе, праблема ўздымаецца наноў. Каб не пачынаць усё з нуля, дзе можна, я абмяжуюся выказванымі раней довадамі. Адно дадам да іх новыя факты і ўласныя падсумаваньні.
Дык ці ёсьць падставы для перагляду пастановы? Каб адказаць на гэтае пытаньне, вызначым, што ж уплывае на памянёныя чаргаваньні. Чыньнікі тыя дваякага роду: 1) **фанэтычныя**, 2) **сэмантычныя**. Першы чыньнік выклікае **пазыцыйнае** чаргаваньне, а другі можа "здымаць" яго **інтанацыйна**. Калі пры першым правіла лёгка паддаецца аўтаматызацыі, нават яе вымагае, то пры другім яно цалком залежыць ад маўленчай сытуацыі і ўсякая аўтаматызацыя толькі наробіць шкоды. Вяртаньне да "тарашкевіцы", на жаль, не заўсёды ідэнтыфікуецца з моўным пачуцьцём. Пэўна ж, не без уплыву "тарашкевіцы" і ўплыву вельмі павярхоўнага, здараліся некалі спробы *й* нескладовае паміж зычнымі ды пасьля паўзы, прыкладам, *чуеў тыя сеткі... й не ставіў* (Чырвоная зьмена, 1989, 16 ліпеня); *восень й чаканне* (тамсама, 1990, 6 студзеня); *гэты гук й схавае яго* (тамсама). Дадзеныя казусы трапілі ў друк таму, што ўжываліся ў вершах, а паэтам, як ведама, — **[1]** — дароўваюць куды больш. На "паэтычныя вольнасьці" можна было б зусім не зважаць, каб не адна акалічнасьць: а ці заўсёды мы **чуем** тое, што пішам? І ці заўсёды сам правапіс "чуе" народную гаворку?

Характар прыточаных абмылаў кажа пра тое, што іх аўтары наагул не адрозьнівалі пазыцыйных чаргаваньняў і пісалі *й* **гіпэркарэктна**, жадаючы як мага больш "зьбеларусіцца".
У нечым падобная зьява, правапіснае гіпэроканьне *(розорванье)*, назіралася ў старабеларускай мове, што насамрэч было праяваю аканьня. Замест этымалягічнага *[а]* пісалася *о*, бо не пад націскам беларусы заўжды чулі *[а]* і ня ведалі, дзе ж трэба пісаць законнае *о*[2]. Даўней мыляліся ад няведаньня царкоўнаславянскае мовы, а цяпер — ад няведаньня беларускае, ад **моўнае глухаты**.
Паспрабуйма ўсё ж услухацца ў мову. Першым кідаецца ў вочы тое, што гукі *[і]* ды *[у]* маюць няроўную змогу да пазыцыйнага чаргаваньня. Гук *[у]* чаргуецца куды ямчэй за гук *[і]*, і гэтым зьвярталі ўвагу браты Лёсікі і асабліва С.Некрашэвіч.

---

[1] **Працы Акадэмічнай камісіі** па правапісе і арфаграфіі **беларускай мове**. **Мінск, 1927. С.309**

[2] **Гурло Н. Да пытання**

зазначаў: “Гукі *[ŭ]* і *[ў]* у адносінах да галоснасьці не аднолькавыя. У той час як *[ў]* заўсёды зьяўляецца галоснымі гукам, пра *[ŭ]* гэтага сказаць нельга: ён можа быць і ўжо зычным *[j]*”[3]. Каштоўная таксама заўвага А.Лёсіка пра тое, што “*[i]* можа скарачацца толькі ў такіх выпадках, калі папярэдні галосны гук разам зь *[i]* вымаўляецца адным выдыхам паветра… калі ж мы вымаўляем папярэдні галосны гук менш ад *[i]*, то дыфтонг не вытвараецца, і скарачэньня *[i]* ня можа быць”[4].

Такім ходам, супраць скарачэньня *[i]* былі выстаўленыя наступныя довады:

1) у мове ёсьць нямала выпадкаў, калі на *[i]* падае лягічны націск: *Адны вочы і плачуць і сьмяюцца; Павінную галаву і меч ня іме; Ён яго і корміць, і поіць* (А.Лёсік);
2) скарачэньне *[i]* калі-нікалі стварае немілагучныя спалучэньні: *сыпалася ймжака; стаяла ймгла; ў Ймгліне; коні ймчацца; на ймпэрыалістаў* (Я.Лёсік, А.Лёсік);
3) нават пры наяўнасьці правіла бальшыня моўнікаў піша *[i]* без скарачэньня (С.Некрашэвіч)[5].

Апошняе назіраньне, зробленае сучасьнікам Тарашкевіча, асабліва добры напамінак для тых, хто хоча вярнуцца да старога напісаньня. Занедбаваньне гэтага правіла вынікала якраз зь першага доваду. Бо **ў паводзінах на пісьме *[i]* вядзе рэй сэмантыка, а не фанэтыка**. Калі не 50%, дык недзе з 30% *[i]* ў беларускай мове стаіць пад лягічным націскам (чаго ніяк ня скажаш пра *[у]*). Таму адно з двух: або нам абычас давядзецца адступацца ад правіла, або мы пазбудзем сябе змогі **сэнсавага акцэнтаваньня** *[i]*[6].

Асобна трэба разгледзець “сустрэчу” *[i]—[у]* ў адным тэксьце. «Наша Ніва» дае на разгляд прыклад: *кукуруза й у Беларусі расьце*[7]. Цікава, як гэта трэба вымаўляць? Калі сьледаваць напісаньню, то фраза павінна чытацца: *кукуруза [ю] Беларусі расьце.* Але ж так ніхто не гаворыць! Гавораць часьцей за ўсё так: *кукуруза [іў] Беларусі расьце.* Значыць, **незалежна ад парадку гукаў, дамінуе скарачэньне** *[у]*, **а не скарачэньне** *[i]*.

станаўлення беларускай арфаграфічнай сістэмы (па матэрыялах заходнярускай пісьменнасці XIV — XV ст.ст.) // Учёные записки Гродненского государственного педагогического института. Вып. VI (серия гуманитарная). Минск, 1960. С.82.

Працы. С.216.

Тамсама. С.307. Пар.: “Варыянт / ŭ/, што ўжываецца пасьля галосных, характарызуецца значна

меншай ступеньню пад’ёму языка. Велічыня амплітуды вельмі блізкая да велічыні амплітуды папярэдняга галоснага. Выдзеліць у гэтым выпадку сэгмэнт, суадносны зь *[ŭ]*, практычна немагчыма. Таму яго лепш адносіць да папярэдняга галоснага, разам зь якім ён складае дыфтангоід” (Падлужны А. Нарыс акустычнай фанетыкі беларускай мовы. Менск, 1977. С.77.)

[5] Тамсама. С.307—308, 205, 216.

[6] У тых выпадках, дзе *і* заўжды шчыльна зьліваецца з папярэднім словам, варта практыкаваць злучанае пісаньне, як *дый* замест *ды і*, а мажліва — праз злучок: *але-й* замест *але і*.

[7] Наша Ніва, 2000.

Дарэчы, гэты мой артыкул пачаў пісацца менавіта тады, на прапанову газэты.

Памыляецца нават Ф.Янкоўскі, калі піша, што “ў сярэдзіне сказу пасьля часьціцы *і* пішацца *ў*, а вымаўляецца *у*, калі гэта(я) часьціца не выдзяляецца інтанацыйна”[8]. Ніжэй ён нездарма робіць перасьцярогу: “Пры інтанацыйным, **нават слабым** (выдзяленьне маё.**— Аўт.**), выдзяленьні часьціцы вымаўляецца супадае з напісаньнем: *Прыйдзе, тата, і ў нашу хату сьвята*”. Толькі рэч тут перш-наперш не ў інтанацыі, а ў розных прыродзе гукаў. Хіба не камічна будзе гучаць, калі мы кажам *й ужо [южо]* замест *і ўжо*? Крыху лягчэй дапусьціць адпаведнае чаргаваньне *і/й* ў украінскай мове, дзе *[ў]* (*вовна, повний, дівка* супраць беларускіх *воўна, поўны, дзеўка*) крыху іншае прыроды, прыкладам: *Священна сутінь залягла // Й в дрімотнім сні спочила Візантія* (Ю.Клэн)[9]. Тут пасьля *[і]* стаіць гук *[w]*, менш падобны да галоснага, чым беларускі *[ў]*. Цікава, што на правапіснай канфэрэнцыі за скарачэньне *[і]* ня выказаўся практычна ніводзін этнічны беларус. Затое баранілі скарачэньне *[і]* расеец П.Растаргуеў ды ўкраінец П.Бузук, якія, пры ўсіх сваіх ведах, не маглі адчуваць беларускае мовы як роднае і разважалі абстрактна-навукова[10]. Да скарачэньня *[і]*, асабліва перад *[ў]*, беларусы не імкнуліся ў старой «Нашай Ніве», калі правілаў ды абмежаваньняў не існавала, прыкладам: *сваё значэньне і ў цяжкіх варунках* (Наша Ніва, 1910, 5 жніўня). Не імкнуліся і пазьней (паводле памянёнага сьведчаньня С.Некрашэвіча), калі гэтае правіла зьявілася.

Што датыкае правапісу *[у]*, дык тут усё наадварот. Паводле яго скарачэньня, апрача братоў Лёсікаў, не выказваўся ніхто. Зрэшты, істотных довадаў ня выставілі і Лёсікі. Яны абраніліся простаю аналёгіяй: раз не скарачаем *[і]*, то *[у]* таксама не скарачаем. Аднак з усяго сказанага вышэй (у тым ліку і Лёсікамі) вынікае: аналёгія тут зусім недарэчная.

У паводзінах на пісьме *[у]* рэй вядзе фанэтыка,

[8] **Янкоўскі Ф. Пытаньні культуры мовы. Менск, 1961. С.35.**

[9] **Цыт. паводле: Клен Ю. Вибрані. Київ, 1991. С.77.**

а не сэмантыка.
Можа падацца, што з напісаньнем *[у]* зусім няма праблем. Насамрэч вакол *[у]* меней спрэчак, але куды болей супярэчнасьцяў — праблемаў прыватнага характару. Сучасны правапіс *[у]* далёка не заўсёды супадае зь яго рэальным вымаўленьнем. Складовае *[у]* пасьля галосных можа зьяўляцца:

1) пры пісаньні вершаў, дзеля мернасьці мовы (С.Некрашэвіч);
2) пры павольным вымаўленьні фразы (П.Растаргуеў);
3) пры недакладнасьцях іншага роду (П.Растаргуеў)[11].

І, наадварот, гук *[ў]* можа ўзьнікаць (а ў вершах пісацца) **пасьля знакаў прыпынку, калі яны не ўтвараюць паўзы**. Асабліва часта такое здараецца ў слове *ўрэшце.* На жаль, пра гэта помняць хіба што адно паэты — менавіта ў вершаваньні абычас узьнікае канфлікт з правапісам.
Частковае занядбаньне артаэпіі і мэханічнае падпарадкаваньне вымаўленьня правапісу існуе, бадай, у кожнай мове. Што да беларускай, то такое разыходжаньне надта адмоўна адбілася на пісаньні прыймя *у* ў розных пазыцыях, асабліва перад словамі, якія пачынаюцца на *[у]*. На сёньняшні дзень мы маем тры (!) асноўныя віды пісаньня зьбегу *[у]*:

1) *ва ўрадзе*;
2) *ува ўрадзе*;
3) *у ўрадзе*[12].

[10] **Працы С.227—228, 232—233.**

[11] Працы.
С.215, 227.

[12] Гл. пр.:
Станкевіч Я.

І ніводнае зь іх ня можа нас задаволіць. Першы прыклад відочна штучны і перанесены ў беларускую мову з царкоўнаславянскае (праз расейскую). Трэці, у існ беларускі, але “папяровага” паходжаньня, бо вымаві як ён пішацца, бадай, не да змогі. Другі ж становіц складаны гібрыд, паходжаньне якога цьмянае і сум а ўжываньне, дзеля грувасткасьці, непажаданае. Гэ тут можна сказаць напярод, без дасьледаваньня пра Каб разьвязаць праблему напоўніцу, зьвернемся пер як рабіў у складаных выпадках В.Ластоўскі, да эты бо, слушна заўважае К.Вулгайзэр, з гледзішча сынхр марфаналёгіі гэтыя прыстаўкі і прыймёны ў сучаснай беларускай мове становяць пэўныя цяжкасьці[14]. Лі **падставаю** зьяўленьня *[ў]* на месцы этымалягічнага *[в]* (*праўда*) была наяўнасьць у старабеларускіх дыялектах губнога *[w]* супраць губна-зубнога *[в]* (або *[v]*) у ра палякаў, а **прычынаю** — заняпад рэдукаваных *[ъ], [ь]* сказаць, калі адбыўся даны пераход, але ўжо ў грам году пісалася: *оутвєрдять; yздоумалъ; оу ризє; оу рѹ (усток); оу смольнєскъ; оуzяти; наоуспять* і г.д.[16]. У сучаснай беларускай мове апрача *[у]* складавага несклад ёсьць губна-зубное *[в]* (у словах *вішня, вясна*) і губна-губное *[w]* (у словах *вочы, возера, вушы, вуліца*). Значыць, калі расейская мова абходзіцца двума гукамі уліку мяккіх) і дзьвюма літарамі *в — у*, то ў беларус на гэтым месцы маем чатыры гукі *[в] — [w] — [ў] —* літары *в — ў — у*.

Прыстаўка *у-* і прыймя *у* толькі ў дыяхраніі сягаюць *[у]*, у сынхраніі ж фанэмаю прыймя заўсёды ёсьць *[у]*. Т прыймя *ва* пасьля заняпаду рэдукаваных аніяк не м зьявіцца. **Нехарактэрнае *ва* і для народнае мовы.** *ўва*, пэўна што правапісны канструкт, утворана ад п *ўва-*, якая пераважна штучнага паходжаньня. У тэкс запсаваных “кніжнаю мудрасьцю” ды сучаснымі ка мы сустракаем форму *ўходзіць* замест сучаснае *ўваход*

Збор твораў у двух тамах. Т.1. Менск. С.61, 75.

[13] Апрача В.Ластоўскага зь іншых, як той **пішуць,** **ўваход,** **ўвайсьці** **ўбіць** **ўвагнаць,** **ўмоўны,** **ўнайні** **ўкультуралягічны** **ўчасьце.** **Прыкладам, у** **ўстрэбны** **ўбіцьцы** **ў** **ўваходзіць** **ўваход** **ёсьць** **(сяк** **ягэра,** **шацкіскум)** **ад** **ёсьць** **ерлі** **ёсьць** **ўлічнае”** **(Працы.** **С.149). Пры** **ўсіх** **ўбах** **і** **ўкладнасьцях** **В.Ластоўскі** **ўваходзіўся**

Дзёмка і Грышка ўходзяць у карчму (Г.Марцінкевіч); *тым часам Юлька, бледная, пастарэўшы* (П.Просты); *Амільян з Міхасём спраўлялі ўходзіны* (С.Бірыла)[17]. Адно ў форме дзеяслова *ўвайшла* — перад ненацісьненым галосным гукам *[ў]* (фіфка) — законна ўзьнікае прыстаўка *ўва-*[18].

Штучнымі ёсьць такія ўтварэньні, як *увабрацца, уваграцца, увагнуць, увапрэць, увапхнуць, уваскрэснуць, уваход, уваходзіць* і г.д. Пра іх пойдзе гаворка ніжэй, а наагул для літаратурнае мовы як звычайныя варта нарайваць формы *ўбрацца, ўгнуць, упрэць, упхнуць, ускрэснуць, уход, уходзіць*, бо ў іх ўтвораныя ад асноў, што пачынаюцца на зычныя: *брацца, гнуць, прэць, пхнуць, хадзіць*. Спалучэньне *ўва-* ўзьнікае толькі на асновай на галосную: *увасабленьне, увачавідкі*[19].

Балышыня моўнікаў гэтак звыкліся з *ва* ды *ўва*, што іншага ўявіць сабе ня могуць. Пераканаць іх, нават спасылаючыся на народную мову, нельга. І ўсё ж паспрабуем.

Слоў з пачатным *[у]* ў беларускай мове няшмат. Выпадкаў жа, калі перад *[у]* стаіць прыймя *у*, і пагатоў мала. І пры гэтых зьбегах, адважуся заявіць (пакуль што гіпатэтычна), ня *[ваў]*, ня *[ўваў]*, ня *[ууў]* і ня *[у]*, а *[ву]* — этымалягічнае губное *[w]* ды *[у]* (быццам жабіна крумканьне). Калі *урад, улоньне, уступ, Украіна, унівэрсытэт, усе* пастаяць у месным склоне з прыназоўнікам *у*, то яны гучаць *[вурадзе], [вулоньні], [вуступе], [вукраіне], [вунівэрсытэце], [вусіх]*, гэтаксама, як і цэльныя словы *вушы, вусы, вурыя, кавуны*.

Прасьцей кажучы, этымалягічнае *[w]* тут аднаўляецца, а *ў* — ужо зычны гук (хіба толькі зь невялікім адценьнем у пасьці) і таму зьяўляецца ён **перад** *[у]* як пасьля галосных, так і пасьля зычных *[дэпутат вурадзе], [тэма вунівэрсытэце]*. Ніжэй мы пераканаемся, што **губнае губное [w] чуваць перад усякімі галоснымі**, ня толькі перад *[у]*. Адсюль адразу ўзьнікае пытаньне: як пісаць прыназоўнік *у* перад *[у]*, каб перадаць гучаньне сродкамі беларускага правапісу? Гэтае апоры так і не разьвязалі мовазнаўцы за цэлае стагодзьдзе. Урэшце, стварылі ненатуральныя існасьці кшталту *ва* ды *ўва*. І цяпер, хаця-нехаця, мусім зьвяртацца да старабеларускае практыкі.

Даўней *[у]* пісалася амаль так, як і прынята ў сучаснай беларускай мове — пасьля зычных — *у* складовае: *будуць*

Ухо людзіць з Міхасём мэтадам [ў]ніфікацыі, які палягае на [ў]ваходзіці (Пятр. Лоўчы Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філалёгію навукі. Мінск, 1995. С.248 — 249.)[14]

Вухайцер К. Марфалягічнае і марфаналягічнае раўніцьцё ў нас-тупных сказах, і прыназоўнікаў ці, а, то, з, ці ў беларускай мове // Беларуская тапанімістыка. Вып.49. Мінск, 2000. С.10.

На жаль, гэтая праца, прынтоўная будучы

у мене (Акты, 1600 г.), а пасьля галосных *в* замест *ў* нескладовага: *добре в парсуну познавши* (Акты, 1569 г.), *вас ў себе вмыслу* (Акты, 1569 г.)[20]. А.Булыка піша: “Багаты фактычны матар’ял... сьведчыць аб тым, што адлюстраваньне *в* замест *ў*... становіцца ў XVI ст. правапіснай нормай… Нават у канцы XVI — першай палове XVII ст., калі пад уплывам правапісных прыёмаў друкаваных кніг агульная тэндэнцыя да фанэтызацыі правапісу пачынае затухаць, у помніках <справовых> пераход *у* ў *ў* адлюстроўваецца ўсё яшчэ досыць шырока”[21]. Старабеларускія пісары, ня маючы правапісных нормаў, былі досыць пасьлядоўныя. Больш таго, яны пільнаваліся нават тых законаў мовы, якія мы сёньня занядбалі. Я цудоўна разумею, што пры жаданьні можна назьбіраць соткі непасьлядоўнасьцяў, але для нас важная **тэндэнцыя**, сэнс якой палягае не ў статыстыцы, а ў фармаванні адбіцьці рэальных фанэтычных зьяў[22].

Н.Гурло, дасьледуючы старабеларускі правапіс, вылучыў тры способы даўнейшага пісаньня *у*. Адзін зь іх *(оу)* — архаічны, а два іншыя (*у* і *въ/увъ*) — навейшыя. Прыклады з апошніх способаў варта разгледзець уважлівей:

1) *у Полотску*; *у Судомири*; *у тыйжьдень*; *у Копыли*;
2) *увъ Опанасовщине*; *увъ Ильинском*; *увъ Острыни*; *увъ Оболцахъ*[23].

Ня трэба быць лішне назіральным, каб заўважыць, што ў першым разе прыймя *у* стаіць перад зычнымі, а ў другім — перад галоснымі. Значыць, **перад галоснымі прыймя *у* набывае нейкую іншую якасьць**. І ці ня тая самая гэта якасьць, якую сёньня ў пэўных варыянтах “тарашкевіцы” перадаюць як прыстаўное *[в]* пасьля галосных: *у вазі*, *у вазёрах*?

нага боку, ёсьць у сабе пэўную фанэтычную недакладнасьць і абмыляў. Адным з шляхоў да ліквідацыі гэтай недакладнасьці ў старабеларускай мове графіч- ных і фанэтычных формаў, фактычна не бярэ пад увагу ўплыву на сучасную беларускую мову правапісу расей- скае мовы, а “адлюстраванага” правапісу, сваім парадкам, — на літаратурную вымову. Да таго ж, ён абапіраецца на аўтараў, толькі афіцыйна прызнаных

у савецкай традыцыі. Памянёныя хібы прыводзяць да таго, што складанае перапляценьне марфаналягічных, правапісных і асымілятыйных зьяваў ён разглядае як натуральны, “лінейны” і аднародны працэс разьвіцьця фанэтычных формаў. Адпаведна, навукова-практычная каштоўнасьць гэтае працы ў значнай ступені страчваецца і сур’ёзна грунтавацца на ёй нельга.

Янкоўскі Ф. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Менск, 1989. С.101; Rott-Żebrowski T. Gramatyka historyczna języka białoruskiego. Lublin, 1992. S.63. Тэрмін *заняпад, занепадаць* мне падаецца найбольш ясным і згодным зь беларускаю моваю, ёсьць іншыя сынонімы: *занік, занікнуць* (Станкевіч), *чэзьненьне, счэзнуць* (Станкевіч); *страта, страціцца,* (Янкоўскі, Рот-Жаброўскі); *падзеньне*

(Рот-Жаброўскі). Апошні тэрмін — няўдалае пазычаньне з расейскага *падение*, па-беларуску належыць — *упадак, паданьне, спаданьне*. Бо *падзеньне* не магло ўзьнікнуць зь меркаванняў словаўтваральных, а тым часам расейскае *упадок* — па-беларуску *заняпад*. Пар. у іншых мовах даны тэрмін: анг. *disappearance, loss*; фр. *chute*, ням. *Schwund, Ausstoßung*; гішп. *caida*.

[16] Цыт. паводле:

Хрестоматия по истории русского языка. Москва, 1990. С.61 —66.

[17] Цыт. паводле: [Марцінкевіч Г.] Атвечэрэк // Шляхам гадоў. Менск, 1990; Просты П. Сьвякроўка // Сьвіцязь, 1995; Бірыла С. Стражнік // Беларуская дакастрычніцкая проза. Менск, 1965.

[18] Я.Станкевіч на гэты конт цікава заўважае: "*увыйду, ы* маем з праясьнелага ъ (vъjь*-)"; "*о* (*а*) у *увайду* іншых**

дыялектаў маем пад уплывам аналёгіі *пайду, дайду*” (Збор твораў. С.185.) Аднак як на маю думку, дык тут маем не аналёгію, а зьяву дысыміляцыі, бо беларуская мова ў паасобных выпадках унікае спалучэньняў *ый*.

19

Зразумела, што ў сынхраніі ў слове *ўвачавідкі [в]* адносіцца да кораню, а не да прыстаўкі, але з гледзішча псыхалёгіі ўспрыманьня

**слова
істотнае
розьніцы
тут няма.
Наагул,
спалучэньне
ўва-
ў гэтым
шэразе
можа
разглядацца
як
прэфіксоід.**

**[20] Цыт.
паводле:
Социально-
политическая
борьба
народных
масс
Белоруссии:
Конец
XIV в. —
1648 г.:
Сб. документов
и
материалов.
В 3 т. Т.1.
Менск,
1988.**

**[21] Булыка
А. Развіццё
арфаграфічнай
сістэмы
старабеларускай
мовы.
Менск,
1970. С.98,**

103.

[22] Пар.: “Зразумела, тым жа помнікам уласьцівы і напісаньні, дзе пераход *в* у *ў* па традыцыі не адлюстроўваецца, але такія напісаньні сустракаюцца значна радзей, чым разгледжаныя вышэй” (Булыка А. Цыт. выд. С.98).

[23] Гурло Н. Цыт. выд. С.85—86.

[24] Станкевіч Я. Цыт. выд. С.185.

[25] Якубинский Л.П. История древнерусского языка.

Зьяўленьне розных спосабаў пісаньня прыймя *у* невыпадковае. Яшчэ Я.Станкевіч выказаў здагадку аб **дыфтонгавасці** прыродзе *[ў]*, маўляў, “само *ў* складаецца з элемэнтаў *у*. Цыт.[24]. А Л.Якубінскі меркаваў, дзей ў усіх індаэўрапейскіх мовах “гук *в* вымаўляўся толькі як *ў* (нескладовае *у*)” і “да гэтае пары захаваў нешта ад якасьці санорных і галосных”[25]. Іх домневы дапамагаюць зразумець шмат складанага ў паводзінах чаргаваньняў *у/ў*.

Беларуская мова, як ведама, не трывае *жосі* (зьбегу зычных) у той жа меры, што і *турца* (зьбегу зычных)[26]. Даўняя жосі

існавалі наступныя спосабы пісаньня прыймя *у*:

1) *малжонка моего у выменьи* (Акты, 1560 г.); *каля у высподе* (Акты, 1609 г.);
2) *и в ыных многих речех* (Акты, 1601 г.); *варабеньку в оцыну* (Д.Рудніцкі)[27].

Москва, 1953. С.150.

[26] Абодвыя тэрміны прапаноўвае У.Дубоўка ў сваёй наватарскай і з гледзішча рыторыкі вельмі каштоўнай працы “Некаторыя прыватныя выпадкі мілагучнасьці нашае мовы” (цыт. паво- дле: Спадчына, 1992, №5). Гэта куды лепш, чым савецкае пазычань- не з расейскае мовы *зіяньне*, ці недакладны пераклад П.Сьцяцко *зьзяньне*. Калі ўжо пера- кладаць, дык *зиять — зяўраць*,

Першы зь іх можна абазначыць як **аналітычны** (раздзельнае напісаньне дыфтонгу [uw]), а другі — як **сынтэтычны** (злучанае напісаньне дыфтонгу [u]). Сёньня, маючы два спосабы, сынтэтычны спосаб мы запісалі б гэтак: *і ў іных*[28]. Падобныя напісаньні назіраюцца і ў менш экстрэмальных станоўішчах: *поес из ыголником, у выголнику копа грывен* (Акты, 1560 г.); *врадником в ыменю* (Акты, 1600 г.); *Воловичи у ыменью* (Акты, 1609 г.). Кожны ўзор, як можна заўважыць, імкнецца да аднаго — найаптымальнейшага адлюстраваньня эпэнтычнага губна-губнога *[w]*, якое цесна кантактуе з суседнімі гукамі. Яшчэ ў грамаце 1229 году, дзе скроз трапляецца *у (оу)*, раптам спатыкаем напісаньне: *wсынодра мьсто.* Гэтае *вьдино* замест *у адзіна (у вадзіна)* можна растлумачыць толькі тым, што пры вымаўленьні тут гука ня *[у]* ці губна-губное *[w]*, а нешта сярэдняе паміж імі. Што датыкае нешматлікіх выпадкаў *у* перад *[у]*, дык яны гэтаксама, як і перад іншымі галоснымі, прыклады маюць *бывши у вураде своем Пропойску* (Акты, 1555 г.).

У XX стагодзьдзі, калі зьявілася літара *ў*, зрэдку спатыкаем новы адменьнік сынкрэтычнага спосабу: *і ў выбары* і *і ў укладаньні зьместу сваіх твораў* (М.Гарэцкі); *ад кінца бярэцца ў арэнду* (Наша Ніва, 1909, 1 траўня). Такім парадкам, маем ня тры, а пяць спосабаў перадаваньня на пісьме прыдыхальнага *г* перад *[у]*:

1) штучнапазычаны: *ва ўрадзе*;
2) камбінаваны: *ува ўрадзе*;
3) штучналітарны: *у ўрадзе*;

і таму трэба было б *зяўра*, але гэтае слова ня мае такой карэляцыі, якую перадае Дубоўкава *жось — турэц.*

[27] **Прыклад Дамініка Рудніцкага (цыт. паводле: Мацвейка А. З гісторыі выкарыстаньня ў беларускай літаратуразнаўчай навуцы. Менск, 1987. С.65.) сьведзіць пра тое, што ён не зусім дакладны, бо і тут, як і ў слове *увечавідкі*, мы маем не эпэнтэзу, а прагрэсіўны, але гэта ня можа быць падставай для таго, каб адмаўляць самы правапісны прынцып.**

[28] **Даўно пара**

4) аналітычны: *у вурадзе*;
5) сынтэтычны: *ў урадзе (въ ураде)*.

Дзіўна, што два апошнія — найбольш лягічныя — удоры не прыжыліся. Хоць менавіта яны, як было паказана, найбольш спантанна і найпаўней адлюстроўваюць асаблівасьці беларускае мовы. Які выбраць сёньня? Штучнапазычаныя, як мы ўжо зазначалі, не вытрымвае ніякае крытыкі. Катэгарычна адпрэчвае яго і Я.Станкевіч: праславянскае “прыймя *в*” у беларускай мове ніколі ня можа мець выгляду “*вс*”, толькі на вельмі абмежаным прасторы”[30]. На жаль, Я.Станкевіч схіляецца да другога і трэцяга ўзораў, непажаданасьць якога варта патлумачыць асобна.

Камбінаваны спосаб крытыкаваўся вышэй, хоць чыста тэарэтычна прыназоўнік *ува* запраўды можа ўзьнікаць. Таго нельга выдаваць яго за адзіна магчывы. Суіснуюць ж ў беларускай мове, нават ў адной гаворцы, прыслоўі *ту* і *тудой*, *заўсім, сусім* і *саўсім*, але ў літаратурнай мове мы аддаем перавагу першаму. У прыватнай гутарцы Мікола Даўрат зьвярнуў маю ўвагу на нетыповыя адмены *у* ў Федара Скарыны: *і ў ва сьне ні сьнілася* (8078); *яму калісь уватруць носу* (5388); *ліхо далося ў ва знакі* (4334); *ані на мне ані ва мне* (3248); *німа дзе ваткнуць* (2903)[31]. Падобныя прыклады разглядаюць Я.Карскі, Я.Станкевіч, А.Булыка, К.Вулгайзэр: *оуво єнеи*, *Пскове*, *оуво Львове*, *вовсихъ*[32]. На першы погляд здаецца, што яны супярэчаць папярэднім довадам. Але калі разважаць — супраціўнага, дык зусім не, бо ўжываюцца найчасьцей у зьбегах *у*, а пры зьбегах зычных. Ня ўводзіць жа намі правіла. Дарэчы, прыклады можна запісаць сынтэтычна: *ў азнакі*, *ў асьне*, *ў амне* (*ў імне*) і г.д.[33].

Так ці гэтак, але запісы не перадаюць запраўднага гучаньня. А вымаўлялася губна-губное *[w]*, хутчэй за ўсё, амаль што змыканьня губ, голасам. Аб нестандартных адценьнях *[ў]* сьведчаць некаторыя запісы Я.Карскага і Е.Кліха: *ўуцкава*, *иит'еju*; *иит'or*; *иukrau*[34]. У падобных зьявах Я.Карскі бачыў або ўстаўкі, або падваеньні. Спробы аспрэчыць ці даказаць Я.Карскага пакуль што мала чаго далі. Я.Станкевіч піша пра дыфтангальнасьць *[ў]*, але дарэмна спрабуе зьвесьці зьясьняць у дыяхраніі, а *у вадным* — у сынхраніі[35]. Для досыць сынхранічных працэсаў. Хутчэй за ўсё, пасьля зьбегамі зычных разьвіваецца ня толькі прыстаўны *[ў]*,

наўсьлед за Ф.Багушэвічам
дзеры не Я.Станкевічам
ніе рабіць
штучнага
разьмежаваньня
паміж
старабеларускаю
і сучаснаю;
такія
помнікі, як
Статут
(1588), для
ідэалярных
выданьняў
варта
друкаваць
сучасным
правапісам.

[29] Нагул **нераўнапіс** **трацілася —** **гэта “ўзор** **нетіскменнасьці”,** **ці** **дакладней,** **неразьвядоўнасьці** **але тым** **больш** **цікава** **кірасоўваць,** **як** **сягоньня** **графічную** **свабоду** **дыктуе** **сягоньняшняя**

і прыстаўны галосны, як у словах *аржаны*, *амшара*. Канечне, варта падкрэсьліць, што гэтак званы прыстаўны *[в]* у словах **эпэнтэзаю**, а не пратэзаю, таму К.Вулгайзэр беспадстаўна зводзіць у адзін шэраг спалучэньні першага парадку *у рамашуерда* і другога — *до восени*[36].

Асобна варта патлумачыць успамінаную Я.Карскім **рэдуплікацыю**, якая незразумела, скуль бярэцца. Прыйменьні, падваяюцца толькі прыстаўкі, але не прыймёны, — характэрная эпэнтэза. Паводле маіх назіраньняў, у раёне побач з звычайным дзеясловам *урваць* сустракаецца экспрэсіўная, узмоцненая форма *ўварваць*. У тым жа раёне падобных зьяў нямала; прыкладам, слова *лецець* не дублет дзеяслова *ляцець*, а яго ўзмоцненая форма. Яркую, што і пытаньні *зашто? завошта?* У жывых гаворках разьвіваліся як звычайныя ды экспрэсіўныя. Некаторыя з успамінаных вышэй формаў: *увабрацца, увагнаць, увапрэць, увапхнуць* — дапушчальныя і нават патрэбныя, калі разглядаць іх як узмоцненыя адменьнікі формаў звычайных[37].

Канечне, варта падкрэсьліць, што гэтак званы прыстаўны *[в]* у словах эпэнтэзаю, а не пратэзаю, таму К.Вулгайзэр беспадстаўна зводзіць у адзін шэраг спалучэньні першага парадку *у рамашуерда* і другога — *до восени*[36].

Асобна варта патлумачыць успамінаную Я.Карскім рэдуплікацыю, якая незразумела, скуль бярэцца. Прыйменьні, падваяюцца толькі прыстаўкі, але не прыймёны, — характэрная эпэнтэза. Паводле маіх назіраньняў, у раёне побач з звычайным дзеясловам *урваць* сустракаецца экспрэсіўная, узмоцненая форма *ўварваць*. У тым жа раёне падобных зьяў нямала; прыкладам, слова *лецець* не дублет дзеяслова *ляцець*, а яго ўзмоцненая форма. Яркую, што і пытаньні *зашто? завошта?* У жывых гаворках разьвіваліся як звычайныя ды экспрэсіўныя. Некаторыя з успамінаных вышэй формаў: *увабрацца, увагнаць, увапрэць, увапхнуць* — дапушчальныя і нават патрэбныя, калі разглядаць іх як узмоцненыя адменьнікі формаў звычайных[37].

Дарэчы, каб зразумець перапісаць сучасным правапісам, дык мы пераканаліся б, якое жывое гучаньне мае старажытная мова XIII стагодзьдзя блізкая да сучаснае.

[30] Станкевіч Я. Цыт. выд. С.61, 75.

[31] Цыт. паводле: Federowski M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej. T.4. Warszawa, 1935.

[32] Карский Е.

Белорусы. Язык белорусского народа. Москва, 1955. Вып.1. С.335; Станкевіч Я. Цыт. выд. С.185; Булыка А. Цыт. выд. С.102; Вулхайзер К. Цыт. выд. С.11.

[33] Правапіс *ў' імне, з' імною* варта агаворваць асобна.

[34] Цыт. паводле: Вулхайзер К. Цыт. выд. С.12.

[35] Станкевіч Я. Цыт. выд. С.185.

36
Вулхайзер К. Цыт. выд. С.12.

37 Часамі рэдуплікацыя прыводзіць да істотных зьменаў сэмантыкі: можна прыязна сказаць *убрацца ў прыгожыя строі* і непрыязна — *увабрацца ў пер'е*, узаемазамена

дзеясловаў кожнай фразы немажлівая, бо істотна памяняецца сэнс сказаньня.

На жаль, экспрэсіўныя формы дзеясловаў занядбаныя як дасьледнікамі мовы, так і самымі моўнікамі. Бо інтэрнацыяналізацыя з расейскаю моваю асабліва шкодна і непрыкметна адбіваецца на сэмантыцы ў цэлым. Прыкладам, некаторыя словы *ведаць*, *затым*, *канечна*, *пасланьне*, *пісаньне* — ужываюцца з/ра зьмененымі значаньнямі, а некаторыя міжмоўныя амонімы зусім выпратваюцца: *знаць*, *канечны*, *пазорны*, *праціўны*, *слова*, *харошы*[38]. І менавіта ўнікаючы двухсэнсоўнасьці пораз з расейскімі сугучнікамі, замест беларускіх звычайных формаў *уходзіць*, *убрацца*, *угнаць* экспрэсіўныя формы *уваходзіць*, *увабрацца*, *увагнаць* пачынаюць разьвівацца як звычайныя. Тут мы маем падвоеную, вельмі завуаляваную расеізацыю. Вось жа, прыймя *ўва* груваткае, несыстэмнае, прыдатнае для выпадкаў з пачатным *[у]*. Але ў гаворках нават у якасьці ўжываецца нячаста. Галоўная ж яго загана ў тым, што *ўва* не дае рады сваім абавязкам — асабліва пры **сацыяльным субстраце**[39]. Дзе трэба *[uwa]* — зрасеізаваны беларус вымаўляе *[uva]*. І перавага *ўва* супраць *ва* зводзіцца да нуля. Нездарма моўныя “прагматыкі” выбіраюць спосабы штучнапазычаны як эканомнейшы.

Камбінаваны спосаб лягічна цягне за сабою праблему прыймя *у* перад іншымі галоснымі. І Я.Станкевіч у гэтым куды пасьлядоўнейшы за сучасных “вячоркаўцаў”. Ён у адпаведнае дасьледаваньне зборніка казак А.Сержпутоўскі, дзе выявіў два спосабы пісаньня *у* перад (і паміж) галоснымі: першы — *быў у ваднаго чалавека*; *мужык у вагародзе*; *сабе ў ваднаго*; і другі — *маёнтак у аднаго пана*; *быў ў аднаго*[40]. Аднак, як мы бачым, дасьледаваў Я.Станкевіч не саму гутарковую мову, а толькі тыя недасканалыя спробы запісаньня, якія тарнаваў А.Сержпутоўскі. У выніку ён не знаўца народнае мовы стаўся закладнікам не зусім дасканалых запісаў.

38 Гл.: Прафесар Ю. Бядуля **Беларуская мова ў часе і прасторы. Гарманія беларускага слова. Гродна, 1999. С.25.**

39 *Сацыяльным субстратам* называю **сукупнасьць** носьбітаў **мовы, які пад уплывам эканамічна-палітычных зрухаў, уплывае на** **эвалюцыю мовы.**

(Журавлёў В.К. **Тэорыя** **дзяржаўных эвалюцыи**

У.Дубоўка ў запісах народнае мовы, зробленых Я.Карскім і А.Шахматавым, знаходзіць іншы спосаб: А *ў ґдовуцкі, у ґдавіцы нораў не дзявічы*. Гэтую зьяву ён абазначае як пераход галосных (наогул зьліваюцца тут ня толькі галосныя) [41]. Я.Карскі наагул адмовіўся ад катэгарычнага зьясьнення данага артыкуляцыйнага працэсу. Ясна адно: лучнасьць тут надзвычай высокая і разрываць іх ня варта. Спосаб, абірае Я.Станкевіч, адпавядае вышэй памянёнаму аналітычнаму. Прыклад У.Дубоўкі — бліжэйшы да сынтэтычнага [42].

Так ці інакш, лёгіка камбінаванага спосабу няўхільна прыводзіць да аналітычнага. Бо калі мы маем пісацца *дык у вагародзе*, дык трэба і *мужык у вурадзе*. Аднак і пры камбінаваным, і пры аналітычным спосабе захоўваецца тая самая пляга — небясьпека пераўтварэньня губна-губнога ў зрасеізаванае губна-зубное *[v]*, якое не магло ўзьнікнуць натуральным спосабам [43]. Наагул, пазыцыйнае чаргаванне прыстаўных *[в]* зацямняе этымалёгію слова, ускладняе правапіс, псуе яго эстэтыку, прыкладам: *дробныя кнышы ў вадно* (Наша Ніва, 1910, 29 ліпеня). Не адразу зразумееш, чаго паходзіць гэтае *вадно* — ад слова *вада* ці слова *ядно*. І тут было б дарэчы ўспомніць адну тэксталягічную недарэчнасьць, зьвязаную з прыймем *у*.

У 1923 годзе А.Паўловіч надрукаваў верш «Над Сьвіцяззю», дзе быў наступны радок: *За рэчкаю вадалі // Кваціст луг* [44]. Пазьнейшыя ўкладаньнікі «Выбранага» не расчыталі сэнсу слова *вадалі* і выправілі аўтара: *За рэчкаю у далі // Кваціст луг* [45]. Насамрэч *вадалі* — амаль тое самае, што *воддаль*, паходзіць яно ад спакменьніка *аддаль* у месным складзе, адпаведна, сягае старабеларускага *аддаленьне* — “адлегласьць” [46]. Параўнайма ў У.Дубоўкі: *Журавы.. Якстанкевіча з аддалі*; *прамяністасьць — у аддалі* [47]. Паводле аналітычнага спосабу верш можна было запісаць: *За рэчкаю ў вадалі, Кваціст луг*, а паводле сынкрэтычнага — *За рэчкаю ў ваддалі // Кваціст луг.* Які з спосабаў празрысьцейшы, па-мойму, яскрава. Зварот аўтара менавіта да аналітычнага і ня толькі ў савецкіх тэкстолягаў. Цікава, што ў XX стагодзьдзі з *(ў аддалі)* паўтарылася такая самая рэч, як і ў XIII ст. з *въдино (ў адзіна)* [48].

Штучналітарны спосаб, пры ўсёй сваёй эканомнасьці ня

Е.Д.Поливанова (К 100-летию со дня рождения) // Вопросы языкознания, 1991, №4.)

40 Станкевіч Я. Цыкл «Мужык у вагародзе, дык трэба і мужык у вурадзе» // Шлях мас. 1923. №1. С.186.

41 Дубоўка У. Некаторыя прыватныя выпадкі дысімілятыўнасьці галосных // Спадчына. 1992. №5. С.82.

42 Цікава адзначыць адрозьненьні ў паглядах Я.Станкевіча і У.Дубоўкі на рэфлекс *ў* // *в* у пазыцыі перад зычным. Станкевіч: “Перад пачатным *[а]*... прасьле

выглядае нейкаю правапіснаю нісянеціцай. Той, хто прыдумаў, відаць, менш за ўсё дбаў пра вымаўленьне, бо як можна беларусу вымавіць асобна *уў*? Праўда, К.Вулпэр “у народных гаворках і часам нават у гутарковым стылі беларускай літаратурнай мовы” зазначае гэткія прыклады: *[uws’ix]*, *[uwdavy]*, *[uwn’iv’ers’itec’e]*[49], аднак іх прыродна з гістарычнага і з фанэтычнага боку вельмі сумнеўная. Узьнікненьне штучналітарнага спосабу вынікае з шкоды правапіснае догмы, быццам *ў* нескладовае абавязковае пасьля галосных і ніколі ня пішацца ў іншых пазыцыях. Аднак такі спосаб зьявіўся — паспрабуем прасачыць, куды ня ідзе ня лёгіка.

прыймя *у*, ўсё прыстаўное *[в]*” (*у вадзе, ацлена ў вагні)*. Дубоўка: “Калі пасьля галосных і ніколі ня пішацца ў іншых пазыцыях. Аднак ня ідзе ня *[о]* з прыдыханьнем *[в]* траціць свой націск, дык прыдыханьне ўжываецца толькі ў тых выпад- ках, калі папярэдняе слова мае адкрыты канчатак” (*вялікія вазё- ры, на вялікіх азёрах)*. Для Дубоўкі важнае раўнамернае, “сьпеўнае” разьмеркаваньне зыч- ных і галосных гукаў, а для Станкевіча —

беспасярэдні кантакт *у* з *а*. Прыстаўное *[в]* Дубоўкі фактычна ёсьць пратэзаю, а Станкевіча — эпэнтэзаю. Правіла Станкевіча мае “грама-тычны” зьмест, а Дубоўкі — “рытарычны”. У паасобных спалучэнь-нях іх правілы могуць супадаць, але часьцей расходзяцца. Паводле Дубоўкі: *ночкаю васень- няю*; *спраўляў асяніны*. А паводле Станкевіча магло б быць: *ночкаю асеньняю*; *спраўляў*

васяніны. У цэлым Станкевіч больш праў- дзіць, але кожная з тэо- рыяў мае падставы ў жывым маўленьні і па-свойму карысная.

43 У К.Вулхайзэра гэтая праблема асабліва за- блытваецца: спачатку ён слушна сьцьвярджае на- яўнасьць у дабеларускіх дыялектах губна- губнога *[w]*, але потым незразуме- ла дзеля чаго *[y]* ў яго пе- раходзіць у *[w]* губна- губ- ное і, што яшчэ больш

абсурдна, у *[v]* губна-зуб- ное, каб урэшце ўсё гэта зьлілося ў сучасным *[у]* (Вулхайзэр К. Цыт. выд. С.11.). Падобная фанэтычная “акрабатыка” вынікае зь неадрозьненьня зьяваў правапісу ад зьяваў фанэтыкі. Варта зацеміць раз і назаўсёды, што ў беларускай мове беспасярэдняе лучнасьці паміж *[у]* і губ- назубным *[v]* няма і быць ня можа. Неразуменьне гэтага факту і выклікае ўсе

недарэчнасьці.

[44] Цыт. паводле: Выпісы з беларускае літаратуры. Масква-Пецярбург, 1923. С.204.

[45] Цыт. паводле: Паўловіч А. Выбранае. Мінск, 1975. С.51.

[46] Старабеларускія лексіконы. — Мінск, 1992. С.98; 101.

[47] Цыт. паводле: Дубоўка У. Выбраныя творы. У 2-х т. Т.2. Мінск, 1965. С.62, 86.

[48] Аднак трэба мець на ўвазе, што ў старажыт-

ным кантэксьце тое напісаньне можа разглядацца як сынтэтычнае, а ў сучасным — як аналітычнае.

Унівэрсальнаю адметнасьцю беларускае мовы ёсьць ненапружанае вымаўленьне гукаў, адмысловая “лянівасьць” сьпеўнасьць. Адсюль — афрыкаты: *[ʒ’]*, *[ц’]*, цяга да паўнагалосься: *морак, бераг*; прыстаўныя галосныя: *Ілья* (а не *Мстиславль*); прыстаўныя зычныя: *Ворша* (а не ухіленьне ад зьбегу зычных: *Заслаўе*, *рыфмаў* (а не *рифм*); зьбегу галосных: *Ян* (а не *Иоан*). І як толькі мы паспрабуем прыймя *у* перад *[у]* вымавіць як *уў*, яно зьмяніць свайго націску (хоць і вельмі слабога, але яўнага) на ператорыцца ў *вуў*, а потым у *ву*. Таму *у ўрадзе* мусіць гучаць як *[вуўрадзе]* і ўрэшце, як *[вурадзе]*. Як бачым, штучна спосаб або парушае ўнівэрсальную асаблівасьць беларускае артыкуляцыі, або, лёгікаю рэчаў, вядзе да сынтэтычнага спосабу. У кожным разе, пільнавацца яго толькі дзеля правапісных догмаў ня варта.

Здараюцца і такія нетыповыя выпадкі, калі ўсе спосабы сынкрэтычнага, не даюць рады. У беларускай мове, напрыклад, перад націсьненымі губнаватымі галоснымі *[о]*, *[у]* ўзьнікаюць прыстаўныя гукі *[в]* і *[г]*: *возера, востры, гостры*. Аднак гэтае правіла можа “здымацца”, і вымаўленьне *[о]*, *[у]* становіцца напружаным, калі прыстаўку падае **сэмантычны націск**: *одум* “рэфлексія”, “кнея, нетра”, *опаць* “падучка”, *урвіс* “хуліган”[50]. Сыходзячы з пэўнымі агаворкамі, можна аднесьці іншаземныя

Вулхайзер К. С.15.

Прыкл.: *Пан загадаў дамоўсіцаў у Ворпуцчу, каб дыведацца ўзяком чаўпіцца ў Пруажаны (Пастоўскі В. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік. Коўна, 1924. С.396); Пан, уступ збіжэў, як крэйда орган,*

унія. Аднак вымавіць *у одуме, у урвіса* даволі цяжка, і таму пэдантычна выглядае *у водуме, у вурвіса* і зусім недарэчна *ува урвіса*. Перад націсненымі *[о], [у]* прыймя *у* слушна, толькі гэтак: *быць ў одуме, мядзьведзь ў оступе, ён ўбыццё, забраў ў урвіса*.

Такім парадкам, правапіс зьбегу *у* сам сабою выліваецца ў праблему *[у]* перад галоснымі. Усе прыточаныя прыклады з XIII па XX стагодзьдзі можна падзяліць на два тыпы: 1) *у Полоцку, у выменьи*; *у выголнику*; *бывши у вураде*; *мужык у вадначаго*; *служыў сабе ў вадначаго*; *княствы ў вадно*; *за рэчкаю ў адалі*; 2) *wб въдино*; *и в ыных*; *врадником в ыменю*; *Воловичи у ыменью*; *і ў укладаньні*; *маёнтак у аднаго пана*; *быў у аднаго*; *за рэчкаю ў адалі*; *а ў ґдовушкі, у ґдавіцы*. Без сумневу, мы маем справу з складаным фанэтычным працэсам. Гук, які *[w]* вымаўляецца, неаднародны. У першым разе навідавочна імкненьне перадаваць яго аналітычна, у другім — сынтэтычна. Таму пяць спосабаў пісаньня зьбегу *у* таксама можна зьвесьці да двух апошніх, тры першыя спосабы — вынік непаразуменьня. Сама лёгіка рэчаў прымушае выбіраць паміж сынтэтычным і аналітычным.

Аптымальным, так ці гэтак, падаецца пяты, сынкрэтычны спосаб. Паспрабуйма вымавіць: *мужык ў урадзе, мужык ў адведках, мужык ў одуме, былі ў адведках*. Усе прыклады гучаць па-рознаму, але ўсюды адчуваецца “прысмак” губнога *[w]*. І галоўнае, ніякіх прыстаўных літараў трэба, бо літара *ў* аўтаматычна рэгулюе вымаўленьне. Такім значыць, менш трэба траціць сілаў — 1) на засваенне артаэпічных нормаў: *[у wадным]*, а не *[у vадным]*; 2) на пісаньне прыстаўных літараў: *адзін, у ваднаго*; 3) на прыймёнаў: *у яго, ува ўрадзе* і 4) на разуменьне напісаньня *у вадным, у водным, у вадзяным, у вадзіным*. Нават пры найлепшым пільнаваньніся артаэпіі аналітычны і камбінаваны спосабы не перадаюць адналітнасьці вымаўленьня *[w]*, іх плаўнага ўзаемапераходу, пазыцыйнага вылучэньня таго ці другой паловы дыфтонгу.

і таварышы прыехаліся ўсім цягам, быццам яго опаць біла

(Лецка К. Пінскі дыялект // Крывічы. Вып. 1. Полацк, Беларуская дакастрычніцкая проза. С. 234).

Урэшце гэты дохтэзя хоць ходы.

Ліндэ І. Дамэйкі.

Тут мы маем вельмі рэдкі выпадак *[w]* у пачатку слова, які чуецца ў сярэдняга роду назоўнікаў, якія пачынаюцца на галосны.

(Гл. адтуль Фюйин Ф. Происхождение русского, украинского и белорусского языков.

Ленинград, 1972. С.149—160.)
Гэты галосны гук, як і ў іншых выпадках зычны *[g]*, — несыстэмны для беларускае мовы, зазвычай ён нясе экспрэсійную нагрузку.
Рэшта *[o]* маюць у беларускай мове лябіяльную пратэзу *[w]* менавіта з прычыны свае лябіялізаванасьці.
Імкненьне Я.Станкевіча (Гл. Т.2. С.371—373) ды аўтараў «Этымалягічнага слоўніка беларускай мовы» да ўніфікаваньня адкрытага націсьненага *[o]*,

***[у]* як гукаў закрытых — не найлепшая паслуга для мовы. Гэты вынятак мае грунт у народных гаворках і надае мове нечаканае разнастайнасьці, стэрэаскапічнасьц**

Дзеля “натуралізацыі” пакажам усе памянёныя складанасьці на прыкладзе з славутага «Ліста да Абуховіча»: *У злом розуменю, в обмовах людзских и в соромноти сидит, як дьявел у дупли*[51]. Перад намі клясычны ўзор ужываньня прыймя *у*, двойчы як *у* і двойчы як *в*, якое, натуральна, стаяла на месцы *[ў]* нескладовага. Можна толькі дзівіцца, наколькі дакладна адчувалі мову ў XVII стагодзьдзі. Сучасны правапіс перапісаць сказ дакладней: *У злом разуменьню, ў абманлівых людзкіх і ў саромнасьці сядзіць, як д’явел у дуплі*. Адсюль няцяжка сфармуляваць даволі простае правіла:

— Прыймя *у* пішацца як *ў* нескладовае **пасьля** галосных і **перад** неятаванымі галоснымі *а, о, у, э, ы* (магліва, і перад *і*). Перад галоснымі літара *ў* вымаўляецца як гук *[w]*.

Гэты прынцып, як і ўсякі іншы, не ўнівэрсальны. Пры пісаньні прыймёнаў найлепей зьвяртацца да сынкрэтычнага спосабу: *ў агні* (супраць *у вагні*), але пры пісаньні прыставак, наадварот, можна (і пакуль што варта) захоўваць аналітычны спосаб пісаньня: *увасабленьне* (супраць *ўасабленьне*).

Дарэчы, на такі адважны крок, як пісаньне *ў* перад галоснымі пасьля зычных і на пачатку фразы, я адважыўся далёка ня першы. Права першасьці пакідаю за В.Вячоркам, які ў сваім

[51] **Цыт. паводле: Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Минск, 1962.**

праекце правапісу прапанаваў пісаць замежныя словы: *Ўільям, Пўанкарэ, тўіст*. Але чаму такая прывілея для замежных? Падставаю таго ці іншага пісаньня замежных слоў мусіць быць наяўнасьць аналягічных зьяваў у сваёй мове. (Ніхто ж не прапаноўвае ўжываць мяккае *[р’]*, калі яно супярэчыць беларускаму вымаўленьню.) Аднак ці ёсьць беларускія *Ўільямы*? Рэдкім выпадкам гуку *[w]*, які ўзьнікае перад санорным зычным (!), ёсьць псэўданім-абрэвіятура В.Ластоўскага: *Власт.* Раней мне здавалася, дзей тут В.Ластоўскі моцна пахібіў супраць мовы, пакуль я ня вычытаў у Каруся Каганца: *Жыў багаты земянін, — Властам яго звалі*[52]. Выходзіць, у мове далёка ня ўсё адпавядае звыклым нормам. Станкевіч прызнаваўся: “Б.Тарашкевіч думае, што адно посьле прыймя *у* перад *а* зьяўляецца прыстаўное *в* (*дом у вагні*), але просьле *ў* не (*нешта сквірчэла ў агні*). Гэтак і я раней думаў, пакуль не зрабіў дасьледаваньня”[53]. Насамрэч, выснова Я.Станкевіча не канчальная. Перад намі зьява куды складанейшая, чым звычайнае прыстаўное *[в]*. Мне таксама некалі здавалася, што праблема толькі ў пісаньні прыймя *у* перад словамі на *[у]*. Але, упершыню напісаўшы *[ў]* перад *[у]*, я задумаўся: чаму не пішу яго перад іншымі галоснымі, калі *[ў]* тут гучыць натуральна? Вынікам тых разваг і паўстаў гэты досьлед.

Найлепшы правапіс, як і ўсякая іншая норма, — гэта зло, праўда, **зло мусовае**. Даўней нормаў не існавала. А сёньня мы маем норму і ганарымся ёю — як быццам можна ганарыцца стандартам! Нездарма Валянцін Валошынаў на пачатку XX стагодзьдзя мусіў паставіць невясёлы дыягназ: “Сыстэма сабетоесных формаў становіцца існасьцю мовы”[54]. Сёньня ўсё, што пісалася ў старабеларускай мове, лінгвісту, захопленаму стандартызацыяй, або проста маладасьведчанаму чалавеку падасца нейкім хаосам. Насамрэч, існуе процьма нестандартных сытуацыяў, якія нельга абняць жаднаю нормаю. Вось у “старой” «Нашай Ніве» спатыкаецца як быццам бы “правапісная недарэчнасьць”: *прасьвету у сябе — ў хаці*. (1910, 29 ліпеня). Калі ж мы пільна ўчытаемся ў фразу, дык недарэчнымі выглядацьмуць хутчэй знакі прыпынку. Бо прыймя *у* тут пішацца згодна з жывою рытмікаю словаў, а ня мёртвых графічных знакаў. Проста мы развучыліся ўслухоўвацца ў слова і сталі падобныя да таго чалавека, які

[52] Цыт. паводле: Каганец,

каб даведацца, дзе стаіць сонца, глядзіць на гадзіннік.

Карусь. Творы. Менск, 1979. Я раіў бы сёньня пісаць: *Ўласт*.

53

Станкевіч Я. Цыт. выд. С.186.

54

Волошинов

В. Новейшие течения лингвистической мысли на Западе // Волошинов В. Философия и социология гуманитарных наук. Санкт-Петербург, 1995. С.195.

І ўсё ж ёсьць сфэра, што не заўсёды падпарадкуецца правапісу, — гэта прастора вершу. Тут даўно насьпела патрэба сыстэмы рэкамэндацыяў, якія, спадзяюся, не скуюць мовы, а, наадварот, вызваляць яе ад правапіснае абмежаванасьці.

Успамінаю (яшчэ зь першага курсу) гутарку ў літаб'яднаньні «Наднёманскія галасы» перад выступленьнем у нейкай вучэльні. Людміла Кебіч запыталася ў Міхася Губярнатарава, кіраўніка «галасоў»: "А ці заўсёды ў вершах трэба пільнавацца правапісу *у*?" Той лагодна ўсьміхнуўся і адказаў: "Ну што Вы! Гэта амаль немажліва!" А ўжо на другім курсе М.Федзюковіч, паэт высокай культуры ды зычлівы чалавек, вучыў мяне адваротнаму: "Калі ты паважаеш сябе як паэта — старайся ніколі не пісаць *у* супраць нормаў правапісу!" Таго самага вымагаў ад сваіх вучняў і А.Масарэнка ў чырваназьменаўскіх «Крыніцах». Не пагадзіўшыся тады з М.Губярнатаравым, я ня мог да канца пагадзіцца з М.Федзюковічам і выпрацаваў уласныя правілы.

Запраўды, каўтаньне *[ў]* нескладовага паміж двух зычных ці перад зычным на пачатку сказу супярэчыць усім законам беларускае мовы. Але здаровы розум падказвае, што ні ў якім разе нельга забараняць пісаньня *у* складовага пасьля галоснага, калі гэтага вымагае рытм ды памер верша, — чым я і паводзіўся на практыцы. Праўда, аднойчы прылучыўся занадта складаны выпадак. Ў адным з маіх вершаў быў радок:

а галашэньні зьніклі у імглу —

тут *[у]* складовае стаіць ня проста **пасьля** галоснага, але і **перад** галосным, прытым — галосным пратэтычным. Выходзіць жахлівая жось. Значна пазьней я пераправіў радок наступным спосабам:

а галашэньні згінулі ў імглу.

Дапушчальнае, на маю думку, *ў* нескладовае ў вершах і пасьля галоснага за знакам прыпынку, які ўтварае слабую паўзу або зусім не ўтварае паўзы. Дарэчы, тут таксама магу прытачыць уласны прыклад надужыцьця дадзенаю палёгкаю:

Чорны сярод восені стаю
і амаль не заўважаю вёсны,
ў чорным целе век душу таю...

Каб прачытаць *[ў]* нескладовае ў трэцім радку — трэба зьлегкаважыць коску ды падзел радкоў, што рабіць непажадана. Гэта меншы грэх, чым пісаньне *ў* нескладовага пасьля зычных, але сёньня такой вольнасьці я б сабе не дазволіў.

Пакуль паэты пішуць *у/ў* кожны на свой капыл, карэктары і рэдактары мусяць прытарноўвацца да гэтых licentia poetica. Паназіраўшы за рэдактураю вершаў, правапіс адхіленьняў можна зьвесьці да дзьвюх традыцыяў:

1) нормы правапісу падпарадкуюцца рытму і памеру верша;
2) нормаў правапісу пільнуюцца насуперак рытму і памеру.

І адна, і другая традыцыі падаюцца мне заганнымі, хоць за аснову варта было б узяць першую. Бо правапіс, як **55 Цьвікі навідэле: Кастусь Карусь. Стары і новы верш на Беларусі. Мінск, 1990; Абрэскі. Творы. Менск, 1991; Дзень паэзіі ’88. Менск,** зазначалася, грунтуецца на фармальным гучаньні, а верш — на маўленьні. Гэта, відаць, адчуваюць карэктары, зьвяртаючыся найчасьцей да першае традыцыі. Загана другой аднойчы я рызыкаваў спазнаць. У часопіс «Беларусь», дарэчы, заўсёды трымалі высокую марку пісьменнасьці, я прапанаваў вершы, некаторыя зь іх укладзеныя рэдакцыяй памерамі, у тым ліку пяцідольнікам першым, у якім Адкі з дапушчальным парушэньнем нормаў правапісу:

з кв*е*ткамі перапл*е*ценыя, ўздых*а*ньнямі
ц*і*хімі перап*о*ўненыя: бяр*ы*.

Зайшоўшы на прачытаньне карэктуры, я жахнуўся — мал майго пяцідольніка мала чаго засталося:

з кветкамі пераплеценыя, уздыханьнямі
ціхімі перапоўненыя: бяры.

1988.

Карэктарка патлумачыла, дзей рэдактар загадаў пільнавацца правапісу, не зважаючы ні на што. Давялося ісьці да рэдактара даводзіць, маўляў, гэта рэдкі памер, і калі ўсякія там ямбы ды харэі чытач пазнае, дык пяцідольнік — ніколі.
Пасьля таго здарэньня я зразумеў: далей чакаць нельга, трэба даваць якой рады. І вось, ніжэй, выходзячы з уласнага паэтычнага, філялягічнага і рэдактарскага досьведу, я прапаноўваю рэкамэндацыі да правапісу вершаў.

1. Рытм не супярэчыць правапісу, **вершы пішуцца згодна з нормамі правапісу**
— *у* складовае паміж зычнымі:

На палянцы дый у травах
(К.Каганец);
— *ў* нескладовае паміж галоснымі:

Колам ня гнецца і ў іншай сьпіна
(Стары Улас);
— *ў* нескладовае перад галоснымі:

Не цябе я люблю, як ў абоймах сьціскаю
(М.Арол)
і г.д.

2. Рытм супярэчыць правапісу, але **дазваляецца** пісаць
— *у* складовае пасьля галосных:

Пайшлі у пушчу ўтраіх па лыкі
(Стары Улас);

Нікнуць праменьні яго у далі
(М.Арол);
— *ў* нескладовае пасьля галосных за знакамі прыпынку:

Ёсьць многа красак у лузе, ў дуброве
(Стары Улас);

Як у глухім бярлогу, ў шафе сьпіць

56 Гл. прыкл.: Руднев П.А. Стих и проза // Даугава. 1989. №8. С.86. Варта зацеміць, што з уводам прапаноўваных правілаў многія “няслушныя” напісаньні ў вершах (выпадак 1, М.Арол) стануць “слушнымі”,

(Р.Барадулін).

3. Рытм супярэчыць правапісу, і **не дазваляецца** пісаць **— *ў* нескладовае паміж зычнымі і на пачатку сказу**:

Вербалоз між іх ўтуліўся
(К.Каганец);

Прытулак мой — ў пакойчыку адным
(Р.Тармола);

Ў бітвах за долю, ў бітвах за волю
(М.Клімковіч).

а “слушныя” (выпадак 5, М.Федзюковіч) ~~—~~ крыху няслушнымі”. У цэлым жа “слушнага” аўтаматычна пабольшае, а “няслушнага” — паменшае.

4. Рытм супярэчыць правапісу, і **не рэкамэндуецца** пісаць **— *ў* нескладовае пасьля *ў* нескладовага перад зычнымі**:

Вы па-свойму, моў ў прысюды
(К.Каганец).

5. Правапіс супярэчыць рытму, **непажадана** пісаць **— *ў* нескладовае на пачатку радка пасьля галосных**:

што кожны ліст апалы без развагі
ўсё аддае наступнаму — штогод
(М.Федзюковіч)[55].

У вершах, як можна заўважыць, вытрымваюцца не правапісныя, а артаэпічныя нормы. Правапіс хаця-нехаця мусіць ім падпарадкоўвацца. Толькі ў трэцім з прыточаных вышэй выпадкаў, калі груба парушаецца артаэпія, ад паэта трэба вымагаць слушнага напісаньня. На жаль, нават у клясыкаў, асабліва нашаніўскае пары, адступаў ад нормы процьма. У савецкія часы намаганьнямі рэдактараў і літкансультантаў выпрацавалася сякая-такая паэтычная культура (якая сёньня зноў траціцца). Але сьляпое сьледаваньне правапісу не заўсёды ў згодзе з жывым маўленьнем. Апошні, пяты выпадак гэта паказвае. Палемізуючы з сваім дарадцам М.Федзюковічам, я зьвяртаюся да ягоных жа радкоў. Прырода вершу палягае на двайным, сынтаксычным і рытмічным, распадзеле тэксту[56], таму паўза ў канцы радка дае той самы эфэкт, што і коска.

Падсумоўваючы, хочацца сказаць: на практыцы я ўжо пасьпеў, і ня раз, пераканацца, што мае ўдакладненьні правапісу выклікаюць неразуменьне. Што зробіш, звычка — другая натура! Але яны простыя да запамінаньня. Галоўнае — глянуць на рэчы з пазыцыі здаровага розуму. Прапановы да правапісу вершаў куды цяжэйшыя. Зрэшты, гэта вынятак, які ня трэба ведаць кожнаму школьніку. А вось кожнаму паэту ды карэктару, што паважаюць сябе, не зашкодзіла б засвоіць.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Віталь Сіліцкі
Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сербіі і Беларусі*

---

* Заканчэнне. Пачатак у №№ 3—5 2003.

Выбары, рэвалюцыя, разгром: прэзідэнцкія кампаніі ў Югаславіі і Беларусі

Мілошавіч і Лукашэнка мусілі абараняць сваю ўладу (і рэжымы) на прэзідэнцкіх выбарах, што адбыліся, адпаведна, у 2000 і 2001 гадах. Гэтыя выбары таксама сталі экзаменам на сталасць для сербскай і беларускай апазіцыі. З самага пачатку прэзідэнцкай гонкі ў Сербіі пераканаўчае лідэрства захапіў прадстаўнік Дэмакратычнай апазіцыі Сербіі (ДАС) Ваіслаў Каштуніца, які паводле ўсіх апытанняў апярэджваў Мілошавіча на 15—20% галасоў. Пасля галасавання, што адбылося 24 верасня, улады не абвяшчалі вынікаў некалькі дзён. Спробы аб'явіць Мілошавіча лідэрам былі літаральна ўзнятыя на смех. Нарэшце 27 верасня апазіцыя заявіла аб перамозе свайго кандыдата з вынікам 52% галасоў супраць 35% у Мілошавіча. Улады падалі ўласныя звесткі, якія сведчылі аб выніку 49%

аўтарак 39% на карысць Канстанціна Чэрнічэнкі) другі тур, фактычна прызнаўшы, што механізм фальсіфікацыі на гэты раз спрацаваў толькі на некалькі адсоткаў. ДАС рашуча адмовілася ад удзелу ў другім туры і заклікала сваіх паплечнікаў да масавых пратэстаў. Пратэсты дасягнулі кульмінацыі 5 кастрычніка, калі тысячы дэманстрантаў, што з'ехаліся з усёй Сербіі, запаланілі вуліцы Бялграду і ўзялі штурмам будынак федэральнага парламенту. Паліцыя і службы бяспекі капітулявалі. Праз дзень Мілошавіч прызнаў паразу, а яшчэ праз дзень Каштуніца быў прыведзены да прысягі, што азначала канец перадапошняга аўтарытарнага рэжыму ў Еўропе. Падзеі ў Бялградзе былі адначасова і электаральнай рэвалюцыяй, і вулічнай, і палацавым пераваротам, але разгортваліся менавіта ў гэткай паслядоўнасці.

Падзеі ў Беларусі падчас прэзідэнцкіх выбараў 2001 году разгортваліся "з дакладнасцю да наадварот", за выключэннем таго, што апазіцыю таксама нібыта прадстаўляў адзіны кандыдат (тэхнічна поўнага адзінства не было і ў Сербіі: Сербскі рух адраджэння адмовіўся далучыцца да ДАС). Асноўным апанентам Лукашэнкі быў кандыдат ад "шырокай грамадзянскай кааліцыі", старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Уладзімір Ганчарык. Паводле афіцыйных звестак, у выбарах узялі ўдзел каля 82% выбаршчыкаў. Паводле гэтых жа звестак, Лукашэнка перамог з вынікам 75,65% галасоў супраць 15,65% Ганчарыкавых. Апазіцыя спрабавала пратэставаць і заявіла аб перавазе Лукашэнкі ўсяго ў шэсць адсоткаў (46% супраць 40%) і патрабавала другога туру. Паколькі незалежнае назіранне не здолела падаць сваіх звестак, адзіным спосабам праверкі заяваў абодвух бакоў могуць быць толькі вынікі незалежных сацыялагічных апытанняў перад выбарамі і пасля. Яны паказваюць, што за дзень да галасавання Лукашэнка меў падтрымку 46,8% усіх выбаршчыкаў, а Ганчарык — 26% (гл. табл. 1). Пры ўмове, што яўка была 82%, гэта ператвараецца ў 56% галасоў за Лукашэнку і 33% — за Ганчарыка. Нягледзячы на заявы перадвыбарнага штабу, пройгрыш быў відавочны нават заўзятым прыхільнікам апазіцыі. Таму пратэсты супраць парушэнняў выбарчага заканадаўства сабралі толькі некалькі тысячаў чалавек.

Табліца 1

[1] **Goati**

Vladimir. ***Elections in FRY from 1990 to 1998: Will of People or Electoral Manipulation?*** **Addendum: Election 2000. Belgrade: CeSID, 2001. P.223.**

[2] Bujosevic Dragan, Radovanovic Ivan. ***October 5: A 24-hour***

Coup. Belgrade: Media Centar, 2001. P.13—14.

Самым адэкватным тлумачэннем, чаму выбары ў Югаславіі і Беларусі скончыліся з дыяметральна супрацьлеглымі вынікамі, можа быць наступнае: на выбарах ва ўмовах дыктатуры перамагае той, хто фактычна выйграў іхнюю кампанію. У Сербіі ўжо за год да выбараў апазіцыйны лідар мелі сукупны рэйтынг, што ў паўтара разу перавышаў рэйтынг прыхільнікаў Мілошавіча. Ужо тады з 72% сербаў, якія выступалі за перамены, 38% былі гатовыя прагаласаваць за апазіцыю. Падчас перадвыбарнай кампаніі падтрымка дэмакратычнай альтэрнатывы вырасла яшчэ ў паўтара разу

3 Price Joe. **Yugoslavia Lesson for Belarusian Opposition**, *Belarusian Review* **Vol.12. No.3 Fall**

Важна зазначыць, што ў Сербіі быў скансалідаваны менавіта партыйны электарат: існаванне палітычных партыяў, што звязвалі грамадзянскі попыт і палітычнае прапанаванне, і дазволіла потым стварыць падтрымку адзінаму кандыдату шляхам арыфметычнага складання партыйных электаратаў. Цікава, што і падтрымка Мілошавіча за час кампаніі ўзрасла ў паўтара разу, чаго яму ўжо не хапіла.

А ў Беларусі? Расклад за год да выбараў быў такі: 36% — за Лукашэнку (увесь яго электарат) і толькі 13% — за апазіцыю (толькі трэцяя частка жорсткага антылукашэнкаўскага электарату і чвэрць таго электарату, што выступаў за перамены). Пасля байкоту расклад ужо памяняўся: 41% супраць 9% на карысць Лукашэнкі. Болей за тое, калі гаварыць пра канкрэтных палітыкаў з апазіцыйнага лагеру (так званую “пяцёрку”), рэйтынг ніводнага не перавышаў 6%. Падчас кампаніі Лукашэнка толькі нязначна павялічыў свой электарат: “скочыўшы вышэй за галаву”, ён атрымаў падтрымку 46% ад усіх грамадзянаў. Апазіцыя, тым часам, мусіла патраціць усю кампанію на кансалідацыю свайго базавага электарату. І хоць фактычна яна пашырыла сваю падтрымку амаль утрая (з 9% да 26% ад усяго грамадства) ці, калі гаварыць выключна пра Ганчарыка, нават у 13 разоў (з 2 да 26%), але ўсё роўна яна прыгарнула да сябе менш за палову таго электарату, што да выбараў выступаў за перамены!

Вывад просты: менавіта папярэдні ўдзел у “сістэмнай палітыцы” забяспечыў бачнасць дэмакратычнай альтэрнатывы і дазволіў скіраваць грамадскую незадаволенасць на яе падтрымку. Гэты фактар відавочна праігнаравалі беларускія апазіцыянеры, адзін з якіх падчас падзення Мілошавіча заявіў наступнае: “Перамога над Мілошавічам... сведчыць, што наша тактыка дасягнення адзінства верная, што мы павінны змагацца за рэальную ўладу на прэзідэнцкіх выбарах, што неабходна дасягнуць кампрамісу вакол адзінага кандыдата і правесці эфектыўную кампанію за тры месяцы да галасавання”[3]. Два фактары — адзінства і кампраміс — былі зразуметыя правільна, калі не лічыць унутраных апазіцыйных разборак да і падчас перадвыбарнай кампаніі, якія сведчаць аб тым, што вывучыць — гэта яшчэ не азначае эфектыўна ўжыць веды. А вось навука, што перадвыбарныя кампаніі пачынаюцца не за тры месяцы да выбараў, а як мінімум з моманту

заканчэння папярэдніх і што ўдзел у “прамежкавых” выбарах стварае падмурак для перамогі ў канчатковых, была праігнараваная. Адрознасць папярэдняга досведу і здольнасці навучацца на ўласных памылках была яскрава прадэманстравана ў ходзе самой перадвыбарнай кампаніі ў чатырох яе аспектах: аб’яднанне апазіцыі, арганізацыя кампаніі, перадвыбарная агітацыя і, нарэшце, прадухіленне фальсіфікацый.

[4] **Cohen.** ***Serpent in***

the Bosom.
P.412.

[5] Тамсама.

[6] Тамсама.

7

Карбалевич Валерий. Лукашизм — тяжелая патология нации. Главный урок президентских выборов” // *Гражданский форум. Информационно-аналитический бюллетень Объединенной гражданской партии.* 2001. №1, ноябрь. С.3.

Відавочна, што больш шырокія палітычныя гарызонты дапамаглі сербскім палітыкам у дасягненні адзінства. Так, яны раскруцілі аднаго з найслабейшых з іх у ранг нацыянальнага выратавальніка. Выключная гатоўнасць падтрымаць і працаваць на кандыдата, які не з’яўляецца ні наймацнейшым, ні самым прывабным для жорсткага апазіцыйнага электарату, безумоўна, была вынікам горкага ўроку мінулага: не ахвяруеш часткі — не здабудзеш нічога. Цікава сведчыць Ліляна Бачавіч, адна з вядучых сацыёлагаў Сербіі і даўняя каляжанка Каштуніцы ў Бялградскім інстытуце сацыяльных навук:

Ужо ў 1997-м апазіцыя магла выйграць, калі б з’ядналася вакол Каштуніцы. Я тады даказвала гэта сваёй сяброўцы Весне Пешыч

(адной з лідэрак ліберальнай сербскай апазіцыі). Яна абуралася, кажучы, што гэта не варта высілкаў, бо Каштуніца сваімі поглядамі проста пачвара. Я казала: "Згодна, але падумайце, ці маеце вы іншы шанц для перамогі". Тады яны адмовіліся зразумець гэта. Яны зразумелі толькі праз тры гады.

На жаль, асобныя прадстаўнікі нашага апазіцыйнага асяроддзя, што адмаўляліся галасаваць за Ганчарыка, бо ён быў "такі ж, як Лукашэнка", моцна нагадвалі сербскіх апазіцыянераў сярэдзіны дзесяцігоддзя. І справа тут не ў канкрэтным кандыдату, а ў самім падыходзе да выбару. Апазіцыйнае асяроддзе ў Беларусі настолькі разнастайнае, што такія ж настроі паўсталі б сярод асобных групаў пры вылучэнні любога кандыдата, будзь ён Домаш, Чыгір ці Калякін. Стаўленне "альбо ўсё, альбо нічога", няўменне ахвяраваць малым ці нават сярэднім дзеля галоўнага заўжды прывядзе да нулявога выніку. Тут варта прыгадаць выказванне старшыні сербскага НДА "Грамадзянскія ініцыятывы" Міленкі Дарэты аб ягоным стаўленні да Каштуніцы: "Каштуніца для мяне быў персанальнай трагедыяй у тым сэнсе, што ён жыў у адным раёне Бялграду са мной і я быў вымушаны галасаваць за яго дзесяць гадоў, не падзяляючы ніводнай ягонай ідэі. Але ж, як грамадзянін, я мусіў праяўляць грамадзянскую сталасць і разуменне сітуацыі".

У Беларусі апазіцыя фармальна аб'ядналася менш чым за чатыры тыдні да выбараў. Фактычна — за два, бо працэс "аб'ядноўвання перадвыбарных штабоў" (папросту кажучы, гандлю за пасады і ўплыў у кампаніі) не спыняўся да апошняга тыдня жніўня. Нагадаем, што падрыхтоўка да выбараў пачалася тады, калі асноўныя палітычныя партыі знаходзіліся ў працэсе высвятлення адносінаў наконт удзелу / байкоту выбараў-2001. Скандалы ўнутры апазіцыі (выключэнне "Народнай грамады" з КРДС, потым выхад астатніх сацыял-дэмакратаў, потым спробы расколу партыі Статкевіча) на нейкі час пакінулі апазіцыйных лідэраў па-за выбарчым працэсам. Болей за тое, партыйныя кіраўніцтвы знялі з сябе адказнасць за вылучэнне адзінага кандыдата, пасля таго як КРДС у снежні 2000 году прапанавала трох (Сямёна Домаша, Міхаіла Чыгіра і Ўладзіміра Ганчарыка), і пачалі чакаць падзеяў аж да лета, матывуючы сваю бяздзейнасць тым, што яны "будуць падтрымліваць толькі адзінага, а не канкрэтнага кандыдата".

Пасля самаразвалу КРДС і стварэння кааліцыі “За сацыяльныя перамены” механізму вылучэння адзінага кандыдата ўжо не існавала. Фактычна, аб’яднанне аддалі на водкуп самім кандыдатам, паколькі партыі выразна не вызначылі сваіх пазіцый (большасць з іх заявіла пра падтрымку ўсёй пяцёркі, хіба што некаторыя выключылі магчымасць падтрымкі Калякіна). Удзел у перадвыбарных штабах стаў асабістай справай сяброў партый. А раз аб’ектыўных крытэраў для вылучэння адзінага кандыдата сярод самой пяцёркі да сканчэння збору подпісаў не было, то вызначэнне адзінага ператварылася ў банальны палітычны гандаль, які суправаджаўся шматлікімі скандаламі (напрыклад, адзін штаб заўчасна распускаў плёткі аб тым, што іх кандыдат ужо вызначаны як адзіны).
Нарэшце, выбар 21 ліпеня выпаў на Ганчарыка, што адразу ж прывяло да выбуху незадаволенасці ў штабе іншага кандыдата, які здолеў сабраць неабходную колькасць галасоў для вылучэння, — Домаша. За некалькі дзён Домаш і Ганчарык абмяняліся некарэктнымі заявамі адзін пра аднаго ў прэсе. Пасля пачалося ўзгадненне ўмоваў “канчатковага аб’яднання” і паралельна — выпрацоўка пагаднення паміж Ганчарыкам і палітычнымі партыямі, болей дакладна — партыйнымі лідэрамі, што цяпер ужо прэтэндавалі на важную ролю ў кампаніі. Гэта заняло яшчэ некалькі тыдняў, і за гэты час кампанія была паралізаваная ўнутраным гандлем.

Праграмы і рыторыка дэмакратычных кандыдатаў

Падтрымліваючы свайго кандыдата на югаслаўскіх выбарах, ДАС прад’явіла перадвыбарную платформу, што знайшла шырокую падтрымку грамадства. Гэтая праграма сумясціла “гуртовае” шырокае бачанне будучыні Сербіі як цывілізаванай еўрапейскай дзяржавы і “раздробную” частку, якая закранала пытанні, што найбольш турбавалі насельніцтва. Кароткачасовымі мэтамі праграмы было пераадоленне міжнароднай ізаляцыі, барацьба з карупцыяй, спыненне свавольства і адмена паліцэйскага кантролю за вышэйшай адукацыяй (што было выключна важным пытаннем для моладзі). Са словаў каардынатара кампаніі Зорана Джынджыча, апазіцыя “дала грамадству ясны выбар паміж

дабром і злом”, паказаўшы альтэрнатыву паміж сучаснай, дэмакратычнай і еўрапейскай Сербіяй ды міжнароднай ізаляцыяй, анархіяй, вайной, карупцыяй і злоўжываннем уладай з боку рэжыму. Доўгачасовымі мэтамі абвяшчаліся адбудова эканомікі і інтэграцыя Сербіі ў еўрапейскую супольнасць. Адначасова Джынджыч зазначыў, што “вельмі важна ссунуць акцэнт з пытанняў, якія цікавяць палітыкаў, да пытанняў, што цікавяць людзей. Важна пераканаць выбаршчыкаў, што перамога апазіцыі — гэта таксама і іх перамога”[8].

Апазіцыя, аднак, не скацілася да танных папулісцкіх абяцанак. Лепш за ўсё апазіцыйную праграму сфармуляваў сам Каштуніца:

Я ведаю, што вы хочаце таго ж, чаго і я. Жыць у звычайнай, сярэдняй еўрапейскай краіне. Краіне, вольнай унутры, дэмакратычнай. Краіне, вольнай звонку, незалежнай. Краіне з сярэднім узроўнем жыцця. З сярэднімі стасункамі з іншымі дзяржавамі. <…> Сярэдняй эканомікай. Сярэднім узроўнем зарплат і пенсій. <…> Сярэднімі банкамі. Сярэднім выбарам тавараў у крамах. Сярэдне стабільнай нацыянальнай валютай. З сярэдняй сістэмай сацыяльнага забеспячэння. Сярэдняй сістэмай аховы здароўя. Сярэднімі сродкамі масавай інфармацыі дзе першыя старонкі будуць запаўняць навіны культуры. У дзяржаве, дзе ўсё будзе на сярэднім, звычайным еўрапейскім узроўні[9].

У той жа час Каштуніца гуляў і з антызаходняй, антыамерыканскай рыторыкай, але ў дадатнай, а не антаганістычнай дэмакратычных поглядаў манеры: “Мы не пераможам замежнага прымусу, пакуль не пазбавімся ад прымусу ўнутранага. І гэта мы павінны зрабіць самі, без дапамогі звонку, каб не мяняць адно рабства на другое і адну гандбу на другую”[10].

Праграма апазіцыйнага кандыдата ў Беларусі была пазбаўленая такога ж яснага бачання, што здарыцца калі пераможа апазіцыя. Спрабуючы палемізаваць з афіцыйнай прапагандай, Ганчарык зрабіў у сваёй праграме акцэнт на сацыяльную стабільнасць і грамадзянскі мір. Наагул погляды Ганчарыка з прыхільнасцю сустракаліся там, дзе ён здолеў дайсці да выбаршчыкаў. Але ж праблемай яго кампаніі была

Цвятуецца гаводле: Yugoslavia: Djindjic Speaks Of Hard Lessons Learned, Yugoslavia's Future. Tomiuc Eugen. *RFE/RL report*, http://www.rferl.org/nca/features/2001/09/21092001110038.a

невялікая колькасць перакананых прыхільнікаў, якія б успрынялі больш жорстка артыкуляванае рэфарматарскае пасланне. Гэта прымусіла Ганчарыка і яго штаб адчайна шукаць падтрымку сярод “балота”. У выніку ягоная праграма ператварылася ў набор супярэчлівых абяцанняў, такіх, як адначасовая падтрымка эканамічных рэформаў, захавання дзяржаўных прадпрыемстваў і сацыяльнай сферы, а таксама зніжэнне падаткаў, узмацненне дзяржаўнага суверэнітэту і інтэграцыя з Расіяй. У адрозненне ад Сербіі, дзе апазіцыя ўжо мела жорсткае кола прыхільнікаў і таму Каштуніцу трэ было трохі зрушыцца да цэнтру, каб прывабіць абсалютную большасць, у Беларусі пагоня за “сярэднім” выбаршчыкам без скансалідаванага жорсткага электарату прымусіла выходзіць далёка за межы апазіцыйнага электарату, у выніку чаго праграма Ганчарыка стала амаль ідэнтычнай з лукашэнкаўскай. Выключэнне складала толькі палітычная частка, што дапамагло ўладзе паказаць апазіцыю як групоўку, якая змагаецца толькі за ўладу. Ганчарык паспрабаваў “узарваць” сітуацыю, прыцягнуўшы ўвагу да знікнення вядомых апазіцыйных палітыкаў. Але кампрамат, які ён выдаў у ліпені, фактычна не змяніў раскладу сіл. Яму паверылі жорсткія апаненты Лукашэнкі і не паверылі перакананыя прыхільнікі апошняга. У выніку “балота” галасавала пераважна за Лукашэнку ці не брала ўдзелу ў выбарах.

9 http://www.mediacs.com/Libertyi/Koštunica_speech_sept20.htm

10 www.bbnet.org.yu/bdnet/elections/eng/0414Koštunica.htm

Што тычыцца Беларусі, то тут можна вызначыць некалькі

11 Цікавая

істотных адрозненняў ад сербскай кампаніі. Па-першае, наступствам папярэдняй палітычнай тактыкі “навязанага навернутых” было тое, што кампанія зноў фактычна праводзілася толькі ў гарадах, не закрануўшы тым самым большасці лукашэнкаўскага і нават “балотнага” электарату. Так, з шасці тысячаў валанцёраў, задзейнічаных на апошнім этапе кампаніі (а з іх звычайна працавала каля паловы), дзве тысячы працавалі ў Менску.

Кажучы пра арганізацыю кампаніі, трэба зазначыць, што “палітычны” прынцып аб’яднання штабоў прывёў да таго, што адзіны штаб быў паралізаваны ўнутранай барацьбой, дыскусіямі, амбіцыямі, а час ад часу і амаль непрыхаванным сабатажам. Напрыклад, вялізарная колькасць агітацыйных матэрыялаў ці то паступала ў апошні момант, ці наогул была распаўсюджаная. Болей за тое, на выбарах не было і намёку на каардынацыю палітычнай кампаніі з кампаніямі недзяржаўных арганізацый. Апошняя, асабліва контрагітацыйная кампанія, вялася сама сабою, часам з дапамогай рыторыкі, дыяметральна супрацьлеглай, якую несла палітычная кампанія. Некаторыя сімвалы і лозунгі ў ёй выкарыстоўваліся, працавалі толькі на некалькі жорсткага электарату і адштурхоўвалі большую частку выбаршчыкаў. Яны былі потым старанна выкарыстаны афіцыйнай прапагандай для дыскрэдытацыі апазіцыі (вобраз “Снікерса”, Рэмба з узнятым кулаком, гульца ў амерыканскі футбол, лучніка, што ўзмацняла афіцыйныя абвінавачванні ў бок апазіцыі як згуртавання экстрэмістаў і заходніх запраданцаў)[11]. Гаворачы шчыра, кампанія асобных НДА стала па сутнасці спосабам пасіўнага ігнаравання палітычнай кампаніі тымі, хто не пагадзіўся з вынікамі вылучэння адзінага кандыдата. Болей за тое, праз раней адзначаную ўзаемасувязь паміж партыямі і НДА, яна адцягнула большасць чалавечых і матэрыяльных рэсурсаў ад палітычнай кампаніі.

Здаецца, і тут “усё, як у людзей”. І ў Сербіі кампанія няўрадавых аграніізацый была больш заўважная, чым палітычная. Але, як я ўжо зазначыў, палітычная частка кампаніі была выкананая загадзя: апазіцыя мела пераканаўчую перавагу задоўга да таго, як увайшла ў выбарчы марафон, — і толькі таму мабілізацыйная кампанія мела сэнс! Кампанія недзяржаўнага сектару ў Беларусі таксама вялася гэтак,

думка адносна з сяброў сербскага “Адпору” пра наш “Зубра”: “Калі, што ў цяперашняй сітуацыі, дык адразу пайду, штаніны робяць памылку. Яны будуць здрукаваныя ў кватэры і на добрай паперы. У бедным краіне гэта непатрэбная раскоша”.

быццам бы кандыдат апазіцыі ўжо стаў лідэрам, у той час як ён адчайна імкнуўся скансалідаваць хаця б базавы апазіцыйны электарат. Першаснай неабходнасцю беларускай кампаніі было стварыць грамадскую падтрымку для кандыдата і, шчыра кажучы, хаця б пазнаёміць грамадства з ім. Без гэтага контрагітацыя і мабілізацыя проста не мелі сэнсу. Яны не давалі выбаршчыку інфармацыі, за каго галасаваць і чаму галасаваць менавіта за яго. А гэта не давала адказу на пытанне той частцы выбаршчыкаў, якая ўжо расчаравалася ў Лукашэнку, але не ведала альтэрнатывы. Звычайна гэтае пытанне гучала так: “Ён благі, але хто замест яго?” Такім чынам, канфрантацыя з рэжымам мела невялікі сэнс без паспяховай канкурэнцыі з ім. І тут узаемадзеянне палітычнай супольнасці і недзяржаўных арганізацый нагадвала стары анекдот пра двух рабочых, адзін з якіх ішоў па вуліцы і адкопваў ямку, а другі адразу пасля яго закопваў яе. На пытанне, чаму першы робіць адно, а другі другое, было адказана: “Гэта не другі, гэта трэці. Другі садзіць дрэвы, але ён на працу не выйшаў”. Фактычна беларускае грамадства мабілізавалася на абарону не перамогі, а годнай паразы. І не дзіўна, што гэтая даволі бессэнсоўная мабілізацыя не мела поспеху.

Абарона ад фальсіфікацый, вулічная барацьба і палацавы пераварот: логіка падзей

Выбары ў аўтарытарных рэжымах маюць адну асаблівасць, якую калісьці вызначыў Сталін: “Неістотна, як галасуюць, істотна, хто лічыць галасы”. Удакладню — важна і першае, і другое. Параўнанне досведу Сербіі і Беларусі дазваляе зрабіць вывад: калі апазіцыя перамагае са значнай перавагай, яна мае

12 Bojicic Dragan, Radovanovic Ivan. Op. cit. P. 57.

шанцы абараніць перамогу. Калі не — яна атрымае столькі галасоў, колькі ёй “напішуць” улады. (А з гэтага вынікае і наступнае: перамога апазіцыі магчымая толькі ў першым туры. Разумення гэтага былі пазбаўлены ўсе апазіцыйныя штабы, уключаючы штаб Ганчарыка, на які працаваў аўтар гэтых радкоў: усімі імі планавалася стратэгія на два туры, раўназначная прызнанню паразы загадзя.)
Важным і неабходным чыннікам таго, што перамога ў Сербіі была паспяхова абароненая, было здабыццё сербскай апазіцыяй значна большай колькасці галасоў, чым Мілошавіч здолеў сфальсіфікаваць. Тут адыграла ролю і прафесійна арганізаванае назіранне, і ўдзел сяброў апазіцыі ў выбарчых камісіях. Гэта дапамагло апазіцыі абвесціць свае падлікі вынікаў да таго, як гэта зрабіў рэжым. Самае галоўнае, аднак, у тым, што абвяшчэнне перамогі апазіцыі гучала як праўда і для самой апазіцыі, і для грамадства, і для рэжыму. Самі выбарчыя камісіі (а гэта некалькі дзесяткаў тысячаў чалавек) — гэта каласальны зрэз грамадства, які пэўным чынам рэпрадукуе сацыяльную атмасферу. Калі ў грамадстве пераважная большасць настроеная супраць рэжыму, то, хутчэй за ўсё, такая ж атмасфера і ў выбарчых камісіях — і наадварот. Безумоўна, на пэўным этапе імі кіруе страх. Страх, аднак, памяншаецца, калі бачная магчымасць перамогі іншага боку, болей за тое, ён можа саступаць месца іншаму страху — быць прыцягнутым новымі ўладамі да адказнасці за фальсіфікацыі. Існуе, аднак, іншы слой інсайдэраў, якіх рэжым можа выкарыстаць для выкрадання перамогі, — гэта карныя органы і, у выпадку фіксацыі вынікаў выбараў, цэнтральныя выбарчыя камісіі. Гэтыя рычагі кантралююцца “ўнутраным колам” рэжыму, і любая спроба непадпарадкавання жорстка караецца. Арганізацыя “апаратнага перавароту” ва ўмовах персаналізаванай дыктатуры максімальна абцяжараная

менавіта наяўнасцю рычагоў кантролю за ўладнай вертыкаллю з боку “ўнутранага кола”. Любая “праца з наменклатурай” адсочваецца, а яе ўдзельнікі нейтралізуюцца. Пераварот у стане зарганізаваць само “ўнутранае кола”, але яно загадзя занадта шчыльна павязваецца “кругавой парукай” з лідэрам (удзел у карупцыі, нелегальным бізнэсе, палітычных рэпрэсіях і г.д.), каб мець матывацыі здаць яго (выключэннем у Сербіі быў кіраўнік аналагу беларускага КДБ, што зноў пацвярджае:

праца з “наменклатурай” мае поспех, толькі калі яна закранае “ўнутранае кола”).
Адзіным выйсцем у гэтай сітуацыі з’яўляецца арганізацыя масавага вулічнага ціску на ўрад, што сам па сабе немагчымы без усведамлення грамадствам сваёй перамогі і веры ў яе (зноў падкрэсліваем неабходнасць папярэдняга, выбарчага этапу для эфектыўных неінстытуцыйных дзеянняў). Прычым перамога павінна быць рэальнай, а не выдуманай у прапагандысцкіх мэтах. Сацыяльны канфармізм у аўтарытарным грамадстве фармуецца не столькі “спіраллю маўчання” (неабгрунтаванай перакананасцю ў тым, што лідэр усё роўна больш папулярны), колькі адэкватнай ацэнкай сітуацыі на падставе ўласнага жыццёвага досведу. Калі апытанні сведчаць, што, напрыклад, 10% падтрымлівае апазіцыю, а 35% — Лукашэнку, гэта азначае, што з кожных дзесяці чалавек, з якімі сярэднестатыстычны беларус паўсядзённа сутыкаецца, тры ці чатыры падтрымліваюць рэжым, адзін — апазіцыю, а пяць або шэсць ці абыякавыя да палітыкі, ці не вераць Лукашэнку, але не ведаюць, за каго галасаваць. Таму 75% тых, хто лічыць, што прэзідэнтам зноў будзе Лукашэнка, прагназуюць вынікі адэкватна. Было б дзіўна, каб пры ліку 4:1 падчас футбольнага матчу хтосьці сумняваўся ў перамозе каманды, якая вядзе ў ліку. Грамадская думка была адэкватнай і на падзенне рэйтынгу Лукашэнкі. Калі ён знізіўся за год з 46 да 27%, больш за палову апытаных адчулі гэтае паніжэнне рэйтынгу, і толькі 16% заўзятых прыхільнікаў Лукашэнкі гэтага не заўважылі. Важна падкрэсліць, што вулічныя пратэсты ў Сербіі пачаліся не з Бялграду, а з правінцыі, з тых гарадоў, дзе ў 1996 годзе перамагла апазіцыя і дзе мясцовыя ўлады здолелі перацягнуць частку адміністрацыйнага рэсурсу для арганізацыі пратэсту. Дарэчы, тое, што можна назваць “сербскай апазіцыйнай наменклатурай” (апазіцыйныя лідэры паходжаннем з дзяржапарату), аказалася надзвычай эфектыўным у справе супрацьдзеяння магчымым карным акцыям супраць дэманстрантаў. Менавіта яны здолелі правесці сакрэтныя перамовы з кіраўніцтвам “чырвоных берэтаў” (аналаг беларускага спецназу) аб неўмяшальніцтве. У сваёй масе гэта былі былыя вайскоўцы і паліцыянты. Як зацеміў адзін з іх, “не кожны ведае, як размаўляць з паліцэйскім, як перакананаць узброенага вайскоўца”[12].

Якраз адэкватнае разуменне рэчаіснасці, абумоўленае перавагай прыхільнікаў апазіцыі ў грамадстве, і зрабіла магчымымі масавыя акцыі пратэсту падчас падзеяў 5—6 кастрычніка 2000 году ў Бялградзе. І акурат вулічныя пратэсты прывялі да калапсу ўладнай сістэмы Мілошавіча. “Палацавы пераварот” быў толькі апошняй, а не першай яго стадыяй. Галоўныя апоры ўлады — унутраныя войскі, паліцыя і паравайсковыя фармаванні кшталту САХРу ды “службы бяспекі прэзідэнта” (усім ім быў дадзены загад страляць) — здаліся перад абліччам колькаснай перавагі дэманстрантаў (дарэчы, паводле некаторых звестак, за Мілошавіча галасавалі толькі 18% паліцэйскіх — удвая менш, чым у сярэднім па грамадстве). Вось як гэта растлумачыў былы загадчык службы дзяржаўнай бяспекі Сербіі Радамір Маркавіч: “Пасля выбараў усведамленне таго, што Каштуніца перамог, засела ў галовах паліцэйскіх. <…> Ці набраў ён 49, ці 50 адсоткаў, для іх гэта не мела значэння. Для іх важна было тое, што Каштуніца набраў нашмат болей галасоў, чым Мілошавіч. “Каштуніца безумоўна перамог, — сказаў мне адзін афіцэр, — я сам за яго галасаваў!” <…> Паліцэйскіх бянтэжыла адно пытанне — ці варта ім было абараняць гэты адсотак ці адну дзесятую адсотка на карысць Мілошавіча”[13].

Карныя структуры, такім чынам, былі ў асноўным дэзарганізаваныя знізу. Акрамя службы дзяржаўнай бяспекі, кіраўнік якой вёў перамовы з апазіцыяй ужо з красавіка, другой структурай, дзе сабатаж Мілошавіча пачаўся з галавы, была армія. Яе статус быў прыніжаны на карысць іншых элементаў паліцэйскай дзяржавы (паліцыі і паравайсковых фармаванняў), якая не была асабліва зацікаўленая ў яе існаванні. (Як распавёў пасля падзеяў 5 кастрычніка былы шэф генеральнага штабу Югаслаўскай арміі Перышыч, ён яшчэ ў канцы 1990-х падумваў пра пераварот, але адмовіўся ад гэтай ідэі, бо не быў упэўнены, што атрымае пасля яго ўнутраную і міжнародную падтрымку.) У астатнім спрацаваў прынцып “той, хто атрымлівае ўладу на вуліцах, губляе яе таксама на вуліцах”.

>

Калі параўнаць фальсіфікацыю вынікаў выбараў у дзвюх краінах, можна зрабіць цікавы вывад: у адрозненне ад Беларусі, фальсіфікацыі ў Сербіі былі мінімальнымі. У той жа час у адрозненне ад Сербіі, фальсіфікацыі прынцыпова

Отделы книги на политической

выніку выбараў у Беларусі. Менавіта гэты факт, таксама як і безумоўная ўпэўненасць і саміх сяброў выбарчых камісій, і назіральнікаў, і публікі ў канчатковым выніку выбараў зрабілі супраціў фальсіфікацыі немагчымым. Урэшце, абароны “розніцы ў галасах” не мела вялікага сэнсу: яна не змяняла канчатковага выніку выбараў, але пэўна выклікала 30 октябр. з боку пераможцы. Болей за тое, да абароны вынікаў не была падрыхтавана і сама апазіцыя.

кумне к/ *Белорусская деловая газета.* 2001. 30 октября.

Варта прыгадаць успаміны аднаго з кіраўнікоў Сербскага цэнтру за свабодныя выбары і дэмакратыю Зорана Лучыча, які быў назіральнікам на выбарах 9 верасня.

Я быў назіральнікам на ўчастку №1 у Ленінскім раёне Менску. Пасля таго як галасаванне скончылася, а галасы яшчэ не былі падлічаныя, я паспеў разгледзець, як разбіраюць купу бюлетэняў, і быў уражаны, што тут, у цэнтры Менску, вельмі шмат людзей галасавала за Лукашэнку. Паводле маіх назіранняў, Ганчарык усё ж выйграваў на гэтым участку, але толькі з вынікам прыкладна чатыры галасы супраць трох. І калі перавага тут, у сталіцы, толькі чатыры на тры, безумоўна, ва ўсёй краіне Лукашэнка пераканаўча перамагае. Гэта я ведаю з свайго сербскага досведу. Да мяне падышоў мясцовы незалежны назіральнік. Ён спытаўся ў мяне, ці бачыў я, як падтасоўваліся вынікі. Я адказаў, што так, бачыў. “Што мне рабіць?” — “Калі б гэта здарылася ў маей краіне, я проста адчыніў бы вокны і паклікаў бы людзей з вуліцы на дапамогу”.

Што перашкаджала гэтаму назіральніку зрабіць менавіта так? Магчыма, уласны страх. Магчыма, ілюзія, што “заграніца нам дапаможа”, якая доўга культывавалася ў шэрагах апазіцыі. Магчыма, усведамленне таго, што яго заклік не будзе пачуты, і таго, што гэтая кампанія была прайграная яшчэ да яе пачатку. У адрозненне ад Сербіі, дзе апазіцыяй была вытрыманая паслядоўнасць “выбары — вулічныя пратэсты — палацавы пераварот”, у Беларусі апазіцыйная стратэгія канцэнтравалася толькі на апошніх двух этапах, прычым акцэнт рабіўся на трэцім. Усе базавыя элементы кампаніі — і выбар кандыдата, і падрыхтоўка да выбараў, і пераадоленне адміністрацыйнага рэсурсу — былі ўскладзеныя апазіцыяй на былую партыйна-гаспадарчую наменклатуру, якая, на яе думку, была здольная выкарыстаць свае старыя сувязі ў дзяржапараце для

нейтралізацыі дзеянняў лукашэнкаўскай вертыкалі і карных органаў. Заўважым, што ініцыятыва выкарыстання наменклатуры зыходзіла менавіта ад апазіцыі: менавіта КРДС у снежні 2001 году прапанавала, паводле рэкамендацыі сваіх “мазгавых цэнтраў”, апаратную тройку “Домаш—Чыгір—Ганчарык” у якасці сваіх кандыдатаў. Таму з паслявыбарнымі заўвагамі аднаго з лідэраў БНФ, што “наменклатура нясе адказнасць за правал кампаніі. Мы таксама нясём адказнасць за тое, што паставілі на наменклатуру. Яны казалі нам, што змогуць забяспечыць сапраўдны кантроль над выбарамі і падтрымку Расіі. Яны нам сказалі, наша справа — мабілізаваць масы. І мы гэта зрабілі”[14], можна згадзіцца толькі ў плане “размеркавання адказнасці”. Але ж, папраўдзе кажучы, менавіта апазіцыйныя СМІ і апазіцыйныя лідэры за паўгоду-год да выбараў рэкламавалі грамадству (да таго ж, далёка не змабілізаванаму) перавагі “наменклатурнага сцэнару”. Фактычна, яго ажыццяўленне прывяло да электаральных страт і нічога не дало ў плане нейтралізацыі адміністрацыйнага рэсурсу. У электаральным плане гэты сцэнар сутыкаўся са старанна культываваным рэжымам на працягу апошніх год стэрэатыпам аб дзяржаўным апараце як асяроддзі карумпаваных жулікаў. Гэта толькі ўзмацніла лукашэнкаўскую контрагітацыю супраць апазіцыі, якую ён паказваў як кучку былых апаратчыкаў, што цяпер прагнуць рэваншу.
Што да нейтралізацыі адміністрацыйнага рэсурсу, то было б дзіўна, калі б цяперашнія апаратчыкі, значная частка якіх прыйшлі ва ўладу з ніжніх эшалонаў наменклатуры, добраахвотна вярнулі б на свае пасады былых апаратчыкаў. Наменклатура кіравала перадвыбарнай кампаніяй прыкладна так, як перадвыбарны штаб Кебіча падчас выбараў 1994 году. “Наменклатурны сцэнар” быў абраны хутчэй таму, што ацэнка лідэрамі апазіцыі шанцаў на ўласны поспех насамрэч была невысокай, а паколькі сярод іх не знайшлося нікога, хто б адважыўся “падставіцца”, на гэтую ролю быў запрошаны “ахвярны казёл”.

Заходняя дапамога апазіцыйным кампаніям

Нарэшце, ці паўплывалі на паразу дэмакратычных сілаў у Беларусі дзеянні заходняй супольнасці? Безумоўна, у беларускім выпадку прэсінг з боку пэўных сіл у справе

вылучэння адзінага кандыдата справакаваў канфлікты ў стане апазіцыі, але, як здавалася, заходняя супольнасць дзейнічала паводле ўжо апрабаванага югаслаўскага сцэнару!
Каб зразумець прычыны поспеху заходняй дапамогі дэмакратычным сілам у Сербіі, варта прыгадаць тыя чыннікі, што акрэсліў адзін з актыўных назіральнікаў тамтэйшага выбарчага працэсу:

Дапамога была вялікай. Толькі Злучанымі Штатамі ў кампанію было ўкладзена каля 40 мільёнаў даляраў. Заходнееўрапейскія фундатары выдаткавалі прыкладна такую ж суму. Падтрымка дэмакратыі доўжылася цягам некалькіх год. Падтрымка была дэцэнтралізаваная і распаўсюджвалася на ўсю краіну. Падтрымка ішла скаардынавана ад розных агенцыяў, што працавалі на адзін сцэнар. Болей за тое, фінансавая падтрымка і дыпламатычныя высілкі таксама каардынаваліся.
Але самае галоўнае, фінансавая падтрымка "ўзмацняла тыя аспекты палітычнага жыцця ў Югаславіі, што ўжо там існавалі"[15].
Сам сабою "югаслаўскі сцэнар" быў раней рэалізаваны ў меней аўтарытарных умовах (напрыклад, у Славаччыне) і абапіраўся на тыя грамадскія арганізацыі, што ўзніклі раней і ўжо паспелі зрабіць моцны ўплыў на палітычнае жыццё Сербіі (асновамі сербскага апазіцыйнага руху былі "G17 + " і "Адпор"). У Сербіі заходняя дапамога стала паступаць надзвычай позна: фінансаванне ўсіх кампаній пачалося толькі за месяц да выбараў. Аднак сербскія недзяржаўныя арганізацыі здолелі распачаць працу задоўга да пачатку фінансавай падтрымкі, што сведчыць аб адным: кампанія-2000 была для іх у першую чаргу справай жыцця і смерці, і толькі ў другую — сродкам зарабіць грошы. Сама палітычная апазіцыя зрабіла ўсё, каб не акцэнтаваць увагі на заходняй падтрымцы. Каштуніца, напрыклад, выступіў супраць стварэння каардынацыйнага цэнтру фундатараў у Будапешце падчас выбараў.
У адрозненне ад некаторых беларускіх апазіцыйных лідэраў, якія падавалі як сваё дасягненне той факт, што "хамут санкцыяў будзе накінуты на рэжым", высілкі сербскай апазіцыі былі накіраваныя на палягчэнне наступстваў эканамічных і вайсковых акцыяў для насельніцтва. (Прыгадаем хаця б праграмы дапамогі "Энергія для дэмакратыі" і "Асфальты для

[15] **Carothers Thomas. Gusting**

дэмакратыі”, рэалізаваныя сеткаю “G17+” у раёнах, дзе да ўлады ў 1997 годзе прыйшла апазіцыя.) Вядомая фраза Каштуніцы “Нам не патрэбна дапамога ні Вашынгтону, ні Масквы” таксама гучала дысанансам у параўнанні з беларускай апазіцыйнай рыторыкай. І справа тут у стратэгіі самавызначэння апазіцыйных сілаў: ці яны вызначаюць сябе як адказная палітычная сіла, што дзеліць уласны лёс з лёсам свайго народу, ці афармляюцца ў дысідэнцкае коламіцыі ў замежных акцёраў.

Foreign Strongman: Lessons from Serbia // *CIPE* Policy Brief. Vol.1. No.5. May 2001.

У адрозненне ад Сербіі, заходняя дапамога ў Беларусі не была ні вялікай, ні скаардынаванай (да таго ж заўважалася канкурэнцыя паміж Злучанымі Штатамі і місіяй АБСЕ ды іх імкненне падтрымліваць сваіх “любімчыкаў”). Яна пераважна падмацоўвала адпаведныя ўнутраныя высілкі дзеля кланавання югаслаўскага досведу. Кампанію-2001 падтрымлівалі як спробу скапіяваць паспяховы досвед ДАС, але дапамога прыйшла толькі для пэўных аспектаў беларускага апазіцыйнага палітычнага жыцця. На жаль, гэта не прывяло да палітычнай перамогі.

Высновы

Сербскі і беларускі досвед могуць пацвердзіць вядомую аксіёму, якую ў свой час вывеў Сэмюэл Гантынгтан: “Аўтарытарныя рэжымы паўстаюць, калі сілы дыктатуры аказваюцца мацнейшымі за сілы дэмакратыі. Аўтарытарныя рэжымы падаюць, калі сілы дэмакратыі аказваюцца мацнейшымі за сілы дыктатуры”. Аўтарытарызм у поставецкую эпоху — гэта свайго роду кампраміс паміж таталітарызмам і дэмакратыяй, сітуацыя раўнавагі, у якой механізмы таталітарнага панавання ўжо нельга адрадзіць, а дэмакратычныя інстытуты яшчэ не здолелі ўсталявацца. Посткамуністычны аўтарытарызм у той форме, у якой ён існаваў у Сербіі і існуе ў Беларусі, — даволі трывалая канструкцыя, што сумяшчае ў сабе элементы, наяўнасць якіх можа назірацца і ў дэмакратычных сістэмах (такія, як пэўная ступень дэмакратычнай легітымнасці гэтых рэжымаў), з найбольш жорсткімі механізмамі падтрымання дыктатарскага панавання, што існуюць у найбольш зачыненых для палітычных зменаў аўтакратыях. Ён будуецца як на “структурных” падмурках (палітычная культура грамадства ды інстытуцыйная

сістэма, што спрыяе знішчэнню альтэрнатываў), так і на пэўных стратэгіях асноўных палітычных актораў, што спрыяюць яго мацаванню (у гэтай сувязі варта нагадаць і самагубчую тактыку дэмакратычнай апазіцыі, і нізкавокасць замежных акцёраў, якія, імкнучыся дапамагчы дэмакратыі, на самай справе нярэдка спрыялі мацаванню дыктатур).

Можа, Беларусь застаецца ў аўтарытарным стане проста таму, што яна яшчэ “не дарасла” да дэмакратыі? З гэтым можна было б пагадзіцца, калі б сербскі досвед не засведчыў, што ўва ўмовах, калі апазіцыя не здольная стварыць эфектыўную палітычную альтэрнатыву дыктатуры, аўтарытарызм здольны выжываць вельмі доўгі час — нават тады, калі зрухі ў грамадскай свядомасці вымываюць у яго з-пад ног сацыяльную базу, падчас эканамічных крызісаў і сапраўдных эканамічных катастроф, пры нашмат больш, чым у сучаснай Беларусі, ліберальным палітычным клімаце. Амаль паўдзесяцігоддзя тры з чатырох падмуркаў рэжыму Мілошавіча — масавая падтрымка грамадства, адміністрацыйны рэсурс улады і спрыяльнае спалучэнне міжнародных фактараў — знаходзіліся ў стане, які правакаваў яго крызіс. І толькі апошні падмурак — адсутнасць эфектыўнай апазіцыі — дазволіў яму пратрымацца яшчэ некалькі год. Гэта варта памятаць усім, хто тлумачыць стабільнасць лукашэнкаўскага рэжыму толькі расійскім фактарам ці панаваннем рэпрэсіўнага апарату. Безумоўна, бег часу ды натуральныя працэсы сацыяльнай эвалюцыі і навучання падточваюць падмурак аўтарытарызму. Такая эвалюцыя — неабходны, але абсалютна не дастатковы чыннік дэмакратычнай трансфармацыі ў будучыні. Дэмакратыю наўрад ці можна прыспешыць, але яе лёгка можна адкласці на няпэўны перыяд, калі яе пратаганісты не зацікаўленыя ў тым, каб пэўныя палітычныя тэндэнцыі ў краіне выклікалі лагічныя палітычныя наступствы.

На наш погляд, існуе вялікая імавернасць штучнага замаруджвання працэсаў дэмакратызацыі ў Беларусі акурат з прычыны дэфіцыту прапанавання, а не попыту. Да гэтай высновы падводзіць той факт, што за два гады, якія прайшлі з моманту пераабрання Лукашэнкі на пасаду прэзідэнта, імкліва (прыкладна ў паўтара разу) скараціласа сацыяльная база паноўнага рэжыму, працягвалася эвалюцыя масавай свядомасці ў бок усё большага прыняцця дэмакратычных

і заходніх вартасцяў. Таксама акрэсліўся крызіс у беларуска-расійскіх дачыненнях, што прывяло да сітуацыі, калі колішні галоўны замежны спонсар беларускай аўтакратыі можа ператварыцца ў адзін з галоўных фактараў яе дэстабілізацыі. У той жа час не пахіснуўся кантроль рэжыму за адміністрацыйнымі і карнымі рэсурсамі свайго апарату. І самае галоўнае — нельга не заўважыць відавочнага крызісу апазіцыі, які складаецца з дэмабілізацыі і дэмаралізацыі яе чалавечых рэсурсаў ды разгубленасці, адсутнасці стратэгічнага мыслення і страты палітычных арыенціраў яе элітай.

Пры такім раскладзе першы магчымы сцэнар развіцця падзеяў у Беларусі — гэта захаванне сітуацыі, якую я вызначаю як “перадумовы без дэмакратыі”. Ён прадугледжвае развіццё падзеяў, пры якім далейшая сацыяльная эвалюцыя, паступовыя змены ў эканамічнай сістэме, ладзе жыцця грамадства будуць весці да стварэння ўсё больш глыбокіх перадумоваў для развіцця краіны ў дэмакратычным кірунку. Аднак пры гэтым існы палітычны баланс сілаў будзе захоўвацца на карысць паноўнага рэжыму дзякуючы ўсё тым жа чыннікам (слабасць і “несістэмнасць” апазіцыі плюс эфектыўнае вынішчэнне паноўным рэжымам палітычных альтэрнатываў). Такое становішча здольнае справакаваць маштабныя сацыяльныя канфлікты ў тым выпадку, калі “квазідэмакратычная легітымнасць” цяперашняга рэжыму будзе цалкам (ці амаль цалкам) страчаная і ён пяройдзе да выкарыстання выключна султанісцкіх метадаў самазахавання. Магчымасцяў негвалтоўнага выхаду з аўтарытарызму пры такім сцэнары амаль не застанецца. З іншага боку, лукашэнкаўскі рэжым можа пазбегнуць такога сцэнару, калі ў будучым праявіць здольнасць да пэўнай саматрансфармацыі. Для гэтага патрабуецца адначасова працягнуць паўнамоцтвы дзейнага прэзідэнта і ажыццявіць частковую канстытуцыйную рэформу, якая перавядзе Беларусь з “гегеманічнага” аўтарытарызму да аўтарытарызму канкурэнтнага (напрыклад, праз пашырэнне паўнамоцтваў парламенту і мясцовых уладаў). Але такі сцэнар, дарма што ён здольны ўзмацніць стабільнасць паноўнага рэжыму і легітымнасць прэтэнзій Лукашэнкі да ўлады, урэшце здольны прывесці да фармавання мацнейшай і больш структураванай апазіцыі, што пакідае мала шанцаў на тое, што ён калі-небудзь зматэрыялізуецца.

Другі варыянт развіцця падзеяў — гэта трансфармацыя існага рэжыму пад уздзеяннем вонкавых фактараў, у першую чаргу расійскага. Наўрад ці гэты сцэнар набудзе рысы югаслаўскага, паколькі стварэнне ў Беларусі ўнутранай апазіцыі, якая б кантралявалася з Расіі, малаімаверна. Аднак магчыма такое развіццё падзеяў, пры якім ціск звонку (у першую чаргу эканамічнымі сродкамі) згальванізуе крызісныя працэсы ўнутры рэжыму ці не дазволіць яму ажыццявіць дзеянні для працягу свайго існавання, напрыклад, праз рэферэндум. Гэты сцэнар можа выліцца ў захоп улады існай наменклатурай, і максімум, да чаго ён прывядзе, — гэта трансфармацыя персаналісцкай дыктатуры ў канкурэнтную аўтакратыю на расійскі ці ўкраінскі ўзор.
На жаль, найменш імаверным сёння ўяўляецца сцэнар прарыву, пры якім апазіцыя здолее не толькі супрацьпаставіць лукашэнкаўскаму рэжыму эфектыўную дэмакратычную альтэрнатыву, але і рэалізаваць яе ў сістэмнай ці пазасістэмнай палітыцы, гэта значыць забяспечыць пераход да дэмакратыі ці праз выбары, ці праз масавую кампанію грамадскага непадпарадкавання. Каб зрабіць гэты сцэнар больш імаверным, беларуская апазіцыя і апазіцыйная грамадзянская супольнасць мусяць за кароткі час вырашыць як мінімум тры задачы. Першая — гэта ператварэнне ўжо складзенай грамадскай дэмакратычнай большасці ва ўласны электарат, што перадугледжвае прафесійны ўдзел у сістэмнай палітыцы. Другая — гэта мацаванне ў грамадстве “пачуцця адзінага лёсу”, што стварае аснову для нацыянальнага самавызначэння. Важна знівеляваць і зменшыць разбуральную для сябе сілу тых культурных падзелаў, што стваралі на працягу дзесяцігоддзя сацыяльную базу аўтарытарызму. Нарэшце, трэцяе: апазіцыя мусіць быць здольнай да стварэння пазітыўнага іміджу сваёй палітычнай дзейнасці і мэтаў у вачах існых у Беларусі элітаў, чыё асяроддзе не абмяжоўваецца “паралельным грамадствам”. Любы іншы варыянт трансфармацыі, пры якім дэмакратычныя сілы не будуць кантраляваць яе працэс, хутчэй за ўсё, прывядзе да ўсталявання новай аўтарытарнай сістэмы, хоць, магчыма, і мякчэйшай за лукашэнкаўскую.

[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Лявон Юрэвіч Беларусазнаўства па-англійску*

Заходнія навукоўцы без цяжкасцей адрозніваюць амерыканскую літаратуру ад англійскай. Яшчэ больш істотныя адрозненні назіраюцца паміж расійскай і польскай літаратурамі з аднаго боку і беларускай — з другога. Але калі гаворка заходзіць пра гэтую сферу даследаванняў, людзі часта блытаюцца.

Тое самае з пошукам Беларусі на карце свету. Людзі без праблем вызначаюць месцазнаходжанне Кітаю і Тыбету, усведамляючы розніцу паміж імі, аднак Беларусь у геаграфічным плане — гэта па-ранейшаму, так бы мовіць, terra incognita.

Гэтаму ёсць сумнае, але абгрунтаванае тлумачэнне: Джон Воранаф, рэдактар серыі «Еўрапейскія гістарычныя слоўнікі», якая выходзіць у выдавецтве «The Scarecrow Press», у прадмове да «Гістарычнага слоўніка Беларусі» адзначыў: “Беларусь — гэта яшчэ адна з новых дзяржаў, што ўзніклі пасля распаду Савецкага Саюзу. Падобна да іншых, яна не сталася зусім новай, паколькі мела ўласную дзяржаўнасць і фактычна была незалежнай у мінулым. Але яе незалежнасць была непрацяглай, глеба для нацыяналізму — беднай, і зацматлікіх

ЛЯВОН ЮРЭВІЧ (нар. 1965 у Менску) — літаратурны крытык, выдавец. Скончыў філялягічны факультэт Менскага пэдагагічнага інстытуту імя Максіма Горкага (1990). Загадвае аддзелам падарункаў і абмену Нью-Ёрскай публічнай бібліятэкі. Сёлета падрыхтаваў да друку Збор твораў Антона

прычын — эканамічных, палітычных, ваенных і нават дэмаграфічных — краіна апынулася пад уплывам свайго гіганцкага суседа — Расіі”.

Але час мінае, а людзі на Захадзе па-ранейшаму лічаць за лепшае думаць пра Беларусь як пра частку Савецкага Саюзу. Нават нягледзячы на тое, што апошняга болей няма. Вядома, мы можам чакаць зменаў — зменаў у светапогляде, у свеце, у людзях. Але мы можам і рыхтаваць змены. Кажучы “мы”, я маю на ўвазе бібліятэчных работнікаў.

Адамовіча.

*** Артыкул напісаны аўтарам падчас навучання ў дактарантуры «Palmer School of Library and Information Science» у ангельскай мове для амэрыканскіх бібліятэкараў.**

У чым заключаецца галоўная задача бібліятэкара, асабліва бібліятэкара-рэферэнта? “Наша роля простая: бібліятэкі і іх супрацоўнікі павінны імкнуцца да дасканаласці ў выкарыстанні свайго досведу на карысць чытачоў, забяспечваючы зручны доступ да інфармацыі на канцэптуальным, тэхнічным і метадалагічным узроўні інфармацыйнай эпохі. Мы павінны не толькі адлюстроўваць цікавасць грамадства да інфармацыйнай эпохі, але і дапамагаць людзям у іх дзейнасці”[1].

Іншымі словамі — не толькі адказваць на пытанні, але і даваць адказы перш, чым пытанні будуць зададзены.

Тым не менш, нават для дасведчаных бібліятэкараў-рэферэнтаў вышэйазначанае пытанне часам аказваецца няпростым. Чаму? Таму што складаная гісторыя краіны Беларусі адбілася ў рубрыцы «Беларусь» у тэматычным каталогу. Так, вы можаце знайсці матэрыялы пра “Belarus” (з вытворнымі “Belarusa”, “Belarusian”), “Belorus”, “Byelorussia” і нават “White Russia” (“Белую Расію”)!

Чарговая праблема існуе з самімі матэрыяламі. Перавышаная колькасць літаратуры пра Беларусь на англійскай мове была напісана і выдадзена як частка прапаганды падчас “Халоднай вайны”, калі “Вялікая Сястра” Масква піхала краіну ў камунізм.

1 Paul Evan Peters. Information Age Avatars // Library Journal. 1995. March. P. 34.

Змены ў свеце зрабілі большасць гэтых публікацый бескарыснымі. Новыя ж публікацыі рэдкія і часцяком занадта вузкія (пра Халакост, Чарнобыль ці Лукашэнку).
Гэтая кароткая анатаваная англамоўная бібліяграфія пра Беларусь рыхтавалася з мэтай запоўніць лакуну — стварыць даведнік, які б адлюстроўваў цяперашні стан гэтай галіны. Ён можа быць карысны для студэнтаў, якіх цікавяць асноўныя звесткі пра Беларусь (у першую чаргу ў амерыканскіх энцыклапедычных крыніцах), для вучоных-гуманітарнікаў, што ўжо маюць сякія-такія веды ў гэтым абсягу і хацелі б паглыбіць іх (карыстаючыся манаграфіямі і архівамі), а таксама для маіх калег — бібліятэчных работнікаў у іх штодзённай руціннай працы па апісанні крыніц.
Гэтая бібліяграфія закранае найбольш агульныя пытанні, такія, як гісторыя са старажытных часоў да нашых дзён, культура і літаратура. Большасць анатаваных публікацый убачылі свет у 1980—90 гадах, калі свет пачынаў мяняцца ў бок цяперашняга становішча.
Галоўная ж мэта гэтай працы — зрабіць Беларусь бліжэйшай да Захаду.

1.0. Энцыклапедыі, слоўнікі

Цяпер існуе толькі адзін слоўнік, цалкам прысвечаны Беларусі, — **1.1**. Большасць амерыканскіх энцыклапедый даюць агульнае апісанне Беларусі і тлумачаць паходжанне яе назвы. Але і яны з'яўляюцца неблагімі крыніцамі інфармацыі, асабліва ўлічваючы, што **1.1** можна знайсці далёка не ў кожнай школьнай ці ўніверсітэцкай бібліятэцы.

1.1. *Zaprudnik, Jan. Historical Dictionary of Belarus. Lanham, Md.: Scarecrow Press, 1998. 299 p.*
Слоўнік уяўляе сабой 28-ы том вядомай серыі «Еўрапейскія гістарычныя слоўнікі». Ён уключае наступныя раздзелы: «Акронімы і абрэвіятуры», ужытыя ў выданні; найбольш істотныя «Заўвагі па тэрміналогіі і транслітарацыі»; «Карты»; «Гістарычная храналогія»; «Бібліяграфія» (с. 229—293); уласна «Слоўнік» з больш чым 400 артыкуламі і «Дадатак: кіраўнікі Беларусі з 860 да 1997 гадоў». Гэты слоўнік павінен быць адпраўным пунктам для кожнага, хто цікавіцца Беларуссю.

Доктар Запруднік, беларус паводле нацыянальнасці і адзін з найбольш кампетэнтных у гэтай галіне аўтараў, стварыў надзвычай каштоўную, але не ідэальную кнігу. Слоўнік ахоплівае ўсе сферы гісторыі, палітыкі, эканомікі, археалогіі, мастацтва, рэлігіі і культуры Беларусі да 1997 году. Ён закранае персаналіі, тапонімы, арганізацыі, абстрактныя паняцці і пытанні, важныя для гэтай спецыфічнай краіны. «Уводзіны» (с.1—22) дазваляюць атрымаць сапраўды грунтоўнае ўяўленне аб прадмеце.
Некаторыя слоўнікавыя артыкулы («Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», «Лукашэнка Аляксандр», «Расія») утрымліваюць ацэначныя выказванні і меркаванні, якія, напэўна, не пасуюць такому тыпу літаратуры, але зразумелыя, улічваючы тое, што аўтар з'яўляецца палітычным эмігрантам і прадстаўляе ў сваёй кнізе дэмакратычны пункт гледжання.
У артыкуле «Алфавіт» можна знайсці беларускі кірылічны алфавіт і яго лацінічны эквівалент (транслітарацыю). Гэтая інфармацыя каштоўная далёка не толькі з пункту гледжання гісторыі. Каталог беларускіх кніг у Бібліятэцы Кангрэсу і ў Нью-Йоркскай публічнай бібліятэцы пабудаваны паводле прынцыпу транслітарацыі. Таму гэты артыкул будзе вельмі карысны для бібліятэчных работнікаў і даследчыкаў.
Кажучы, што гэтая кніга "не ідэальная", я меў на ўвазе тую акалічнасць, што аўтар слоўніка імкнуўся стварыць крыніцу, якая б максімальна поўна адлюстроўвала сучасны момант. Ён уключыў туды нават палітычных дзеячоў 90-х гадоў, якія памерлі перад самай публікацыяй слоўніка. Такая актуалізаванасць добрая для газеты ці часопісу, але, пэўна, не для даведачнага выдання. Другі мінус кнігі — брак ілюстрацый і прадметнага паказальніка.
Цана слоўніка складае 60 долараў ЗША і выглядае зусім апраўданай. Хоць можна прыдбаць гэтую кнігу і танней — у раёне 40 долараў.

1.2. *Worldmark encyclopedia of cultures and daily life / Timothy L.Gall, editor. Detroit: Gale, 1998.*
Артыкул «Беларусы» (том 4 — «Еўропа», с.60—66) пабудаваны паводле стандартаў гэтай незвычайнай энцыклапедыі. Ён пачынаецца з невялікага анонсу (прысутнічаюць падраздзелы

«Вымаўленне», «Альтэрнатыўныя назвы», «Пражыванне», «Насельніцтва», «Мова», «Рэлігія»), які выглядае не зусім прапрацаваным. Звесткі пра альтэрнатыўныя назвы прапануецца шукаць у самім артыкуле, месцам пражывання, натуральна, указваецца Беларусь, а мовай — беларуская. Фанетычная транскрыпцыя, якая прыводзіцца ў энцыклапедыі, павярхоўная і, варта дадаць, недакладная (Byeh-lah-ROOS-ans). Цела артыкулу мае наступную структуру, агульнапрынятую для энцыклапедыі «Worldmark»: «Уводзіны», «Месца паходжання і пражывання», «Мова», «Фальклор», «Рэлігія», «Галоўныя святы», «Народныя абрады», «Узаемаадносіны людзей», «Умовы жыцця», «Сямейнае жыццё», «Адзенне», «Ежа», «Адукацыя», «Культурная спадчына», “Праца», «Спорт», «Забавы і адпачынак», «Народныя рамёствы і ўлюбёныя заняткі», «Сацыяльныя праблемы», «Бібліяграфія». Прысутнічае адна карта і адна ілюстрацыя.
Артыкул быў напісаны двума амерыканскімі беларусамі — непрафесіяналамі ў гэтай галіне. І гэта наклала адбітак на ўсю працу. У ёй няма памылак, але многія факты выклікаюць сумненні. Ствараецца ўражанне, што аўтары карысталіся старымі крыніцамі. Некаторыя тэзісы (напрыклад, у падраздзеле “Сямейнае жыццё”) не могуць успрымацца сур’ёзна. Аўтары ўжываюць геаграфічныя назвы і культурныя тэрміны не ў беларускай, а ў расійскай транскрыпцыі. Не ўся літаратура, пералічаная ў бібліяграфіі, англамоўная, затое ўся яна, за выключэннем аднаго пункту, малакаштоўная. Гэтым артыкулам можна карыстацца ў навучальных установах, калі няма іншых крыніц.

1.3. *The encyclopedia of democracy / Seymour Martin Lipset, editor in chief. Washington, D.C.: Congressional Quarterly, 1995.*
Артыкул «Беларусь» (том 1, с.121—124) напісаны вядомым філолагам доктарам Запруднікам і разглядае прадмет у наступных аспектах: «Праблемы пераходнага перыяду», «Нараджэнне палітычных партый», «Структура ўраду і новая Канстытуцыя», «Дэмакратычныя перспектывы». Артыкул утрымлівае дзве невялікія, але чытэльныя карты.
Агульная назва энцыклапедыі не характарызуе артыкулу ў цэлым, паколькі ў ім ідзе гаворка не толькі пра дэмакратыю.

Артыкул апісвае сённяшняе палітычнае жыццё ў недэмакратычнай Беларусі і дае добры канспект апошніх падзей у краіне. У той жа час тут змяшчаецца мінімум інфармацыі пра гісторыю і культуру, неабходнай для лепшага разумення сённяшняй сітуацыі. З моманту выдання энцыклапедыі прайшоў пэўны час, што для такіх публікацый крытычна. Аднак гэты артыкул па-ранейшаму здольны даць чытачам усё, што ім трэба: факты, ход падзей, імёны і аналіз. Англамоўная бібліяграфія невялікая, але грунтоўная. Гэты артыкул не варта выкарыстоўваць у сярэдніх школах з прычыны акадэмічнай мовы.

1.4. *Censorship: a world encyclopedia / edited by Derek Jones. London; Chicago: Fitzroy Dearborn, 2001.*

Гэтая энцыклапедыя ў алфавітным парадку падае імёны людзей, геаграфічныя назвы, кнігі, падзеі і г.д., што датычаць яе прадмету. Закранаюцца разнастайныя сферы дзейнасці, такія, як літаратура, музыка, танцы, СМІ і інш. У дадатак да ўсяго прыводзяцца апісанні краін, сярод якіх можна знайсці і Беларусь (с.204—206). Аўтары яўна з'яўляюцца экспертамі ў паасобных пытаннях, і яны добра распрацоўваюць сваю тэму. Артыкул знаёміць з гісторыяй цэнзуры ў Беларусі ад яе ўзнікнення і да цяперашняга часу. Таксама ён прыводзіць агульныя характарыстыкі: колькасць насельніцтва, асноўныя канфесіі, афіцыйныя мовы, узровень пісьменнасці, колькасць радыёпрыёмнікаў на 100 і тэлевізійных прыёмнікаў на 1000 жыхароў, хоць не зусім зразумела, чаму выбраны менавіта такія параметры.

Як заяўляюць аўтары, гісторыя цэнзуры ў Беларусі неаддзельная ад іншых працэсаў, што дзеяліся ў краіне. Гэты тэзіс дае ім нагоду болей расказаць пра гісторыю і культуру Беларусі з XIII стагоддзя да 1998 году. Пры гэтым яны, як ні дзіўна, не абмяжоўваюцца агульнай інфармацыяй. Мова артыкулу добрая і простая. Бібліяграфія не вычарпальная, але ніштаватая. Пералічаныя назвы крыніц у асноўным англамоўныя, але адна беларускамоўная назва перакладзена на англійскую. Гэта стварае памылковае ўражанне аб існаванні англамоўнай літаратуры.

Гэты артыкул разам з **1.3** дае ўяўленне пра сённяшнюю

Беларусь.
У энцыклапедыі змешчаны таксама артыкул пра радыёстанцыю «Беларусь», закрытую з цэнзурных меркаванняў.

1.5. *Encyclopedia of nationalism / editor-in-chief, Alexander Motyl. San Diego, Calif.; London: Academic Press, 2001.*
Гэтая энцыклапедыя — адно з найноўшых выданняў, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра Беларусь. Праўда, не ў асобным раздзеле, як гэтага можна было б чакаць. Замест гэтага тут ёсць артыкул «Расія і былы Савецкі Саюз», напісаны М.Рыўкіным (Нью-Йоркскі гарадскі каледж), спецыялістам па русістыцы. Аўтар па-ранейшаму лічыць, што Расія — гэта найважнейшы кампанент былога Савецкага Саюзу, а іншыя часткі гэтай краіны мелі падобны гістарычны шлях.
Інфармацыю пра нацыяналізм у Беларусі можна знайсці ў падраздзелах «Паходжанне беларускага нацыяналізму» і «Выпрабаванне беларускай нацыянальнай самасвядомасці». Матэрыял арыентаваны на чытача, які сама меней знаёмы з прадметам. Ён можа адыгрываць ролю канспекту, але зноў жа для людзей, якія ўжо дастаткова разбіраюцца ў паасобных праблемах. Аўтарскае разуменне нацыяналізму вельмі спрэчнае. Як вынікае з артыкулу, аўтар піша пра развіццё беларусаў як нацыі, але гэта не нацыяналізм. Артыкул мае «Слоўнік тэрмінаў» (12 дэфініцый), але ўсе яны датычаць расійскай культуры. Гэты артыкул не мае практычнага значэння для вывучэння Беларусі.

1.6. *Encyclopedia of world literature in the 20th century: based on the first edition edited by Wolfgang Bernard Fleischmann / Leonard S.Klein, general editor. Rev. ed. New York: Ungar, 1981—1984.*
У гэтай энцыклапедыі ёсць некалькі артыкулаў, што маюць дачыненне да Беларусі. Па-першае, гэта артыкул «Беларуская літаратура», падрыхтаваны Томасам Бэрдам, аўтарам шматлікіх публікацый пра Беларусь. Па-другое, гэта тры артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў — Наталлю Арсенневу, Максіма Багдановіча і Васіля Быкава, напісаныя доктарам Запруднікам. Кожны артыкул мае бібліяграфію. Добры падбор імёнаў (першыя постаці ў літаратуры), пералік літаратурных

твораў, ясная мова робяць публікацыі ў гэтай энцыклапедыі матэрыялам, з якім неабходна пазнаёміцца кожнаму, хто вывучае Беларусь і яе літаратуру. Наступным этапам у раскрыцці гэтай тэмы можа служыць **3.2**.

1.7. *Harvard encyclopedia of American ethnic groups / Stephan Thernstrom, editor; Ann Orlov, managing editor, Oscar Handlin, consulting editor. Cambridge, Mass.: Belknap Press of Harvard University, 1980.*
Украінскі філолаг з Канады доктар П.Р.Магочы выступіў тут з артыкулам «Беларусы» (с.181—184). Гэта быў першы паважны нарыс пра беларускую дыяспару ў Амерыцы, напісаны пры дапамозе беларусаў. Сумесная праца дала добрыя вынікі. У публікацыі сцісла апавядаецца пра гісторыю Беларусі Сярэднявечча і XIX стагоддзя, перыяду другой сусветнай вайны і апошніх часоў. Большая частка артыкулу прысвечана беларусам у Амерыцы і гісторыі іх іміграцыі. Прыводзіцца, сярод іншага, пералік беларускіх арганізацый, цэркваў, школ, часопісаў, кніг і найбольш вядомых імігрантаў. Артыкул уключае адну карту і бібліяграфію, якая па сёння захоўвае актуальнасць. Ён можа быць рэкамендаваны студэнтам універсітэтаў і навукоўцам, хоць ёсць ужо і шэраг пазнейшых публікацый на гэтую тэму.

1.8. *Gale encyclopedia of multicultural America / contributing editor, Rudolph J. Vecoli; edited by Judy Galens, Anna Sheets, Robyn V.Young. Detroit, MI: Gale Research, 1995.*
Артыкул «Беларускія амерыканцы» (с.174—182) у гэтай энцыклапедыі, напісаны спецыялістам у гэтай галіне доктарам В.Кіпелем, можна назваць міні-манаграфіяй. Ён уключае раздзелы: «Агульны агляд» (з падраздзеламі «Гісторыя», «Беларусь пад расійскай акупацыяй», «Сучасная эпоха», «Беларуская іміграцыя ў Амерыку», «Пасляваенная іміграцыя», «Рассяленне»), «Культурная адаптацыя і асіміляцыя» (з падраздзеламі «Традыцыі, звычаі і вераванні», «Кухня», «Нацыянальны касцюм», «Песні і танцы», «Святы», «Рамёствы»), «Мова», «Сямейныя і зямляцкія адносіны», «Рэлігія», «Палітычнае жыццё і органы кіравання», «Індывідуальнае

і калектыўнае жыццё», «СМІ», «Арганізацыі і асацыяцыі». Яшчэ артыкул змяшчае пералік беларускіх арганізацый у Амерыцы, іх адрасоў і кантактных тэлефонаў, а таксама спіс «Крыніц для дадатковага вывучэння».
Гэты артыкул — у некаторым сэнсе камбінацыя **1.2** і **1.7**, аднак ён больш грунтоўны і глыбей раскрывае тэму. Артыкул дае шырокае і дэталізаванае апісанне беларусаў на Бацькаўшчыне і за мяжой. Мова яго прасцейшая, чым у **1.7**.

1.9. *The encyclopedia of New York City / edited by Kenneth T.Jackson. New Haven: Yale University Press; New York: New-York Historical Society, 1995.*
Артыкул «Беларусы» доктара В.Кіпеля дае сціслае ўяўленне пра беларускую прысутнасць у Нью-Йорку з 1890-х па 1990-я гады. Большасць прыведзеных фактаў можна знайсці ў **1.8**. Маецца на ўвазе, што чытач ужо знаёмы з прадметам.

2.0. Бібліяграфіі

Па сутнасці, англамоўных бібліяграфій па Беларусі не існуе. Што да розных дадаткаў і заўваг да публікацый у энцыклапедыях ці манаграфіях, дык тут можна згадаць толькі адну кнігу — Vakar, Nicholas P. A Bibliographical Guide to Belorussia. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1956. 63 p. Аўтар гэтага даведніка ў свой час быў адным з найбольш аўтарытэтных амерыканскіх навукоўцаў-філолагаў. Ён напісаў таксама манаграфію «Беларусь: нацыяўтварэнне. Сацыялагічнае даследаванне»[2]. Гэтыя кнігі былі заўважным дасягненнем у 50-я гады, але сёння яны маюць толькі гістарычнае значэнне.

2.1. *Kipel, Vitaut, and Zora Kipel, Eds. Byelorussian Statehood: A Reader and Bibliography. New York: BINIM, 1988. 398 p.*
Гэтую кнігу нельга назваць бібліяграфіяй у простым сэнсе слова, яна спалучае рысы бібліяграфіі, біяграфічнага даведніка і даведачнай манаграфіі.
Першыя чатыры раздзелы будуць прапушчаныя дасведчанымі, якія шукаюць хуткіх адказаў на свае пытанні, і ацэнены вялікімі чытачамі, хто жадае атрымаць грунтоўнае ўяўленне пра

[2] **Vakar, Nicholas P.** ***Belorussia: the making of a nation, a case study.*** **Cambridge, Harvard**

прадмеце («Шлях да дзяржаўнасці», «Беларуская Народная Рэспубліка», «Савецкая Беларусь», «Змаганне за беларускую дэмакратыю»). Гэтыя раздзелы з'яўляюцца падборкай артыкулаў розных аўтараў і ў сукупнасці ўтвараюць нарыс гісторыі Беларусі. Чытачы павінны быць знаёмыя з пэўнымі гістарычнымі тэрмінамі, такімі, як "бальшавік" ці "НКВД", паколькі гэтыя тэрміны спецыяльна не тлумачацца.

University Press, 1956. 297 p.

Пяты раздзел мае назву «Бібліяграфія». Ён падзелены на наступныя падраздзелы: «Крыніцы», «Дакументы і матэрыялы», «Газеты і часопісы», «Кнігі і артыкулы ў перыёдыцы», «Літаратура па Слуцкім паўстанні».

Укладальнікі называюць гэтую бібліяграфію (с.245—301) сціплай спробай сабраць разам матэрыялы па прадмеце. Але сапраўды каштоўнай дэталлю іх працы з'яўляюцца анатацыі літаральна да кожнага пункту ў бібліяграфіі. Часам гэта кароткае апісанне "адным радком", а часам некалькі абзацаў, якія даюць чытачу поўнае ўяўленне пра змест і характар той ці іншай крыніцы.

Наступныя тры дадаткі самі па сабе з'яўляюцца энцыклапедычнымі даведнікамі. Гэта «Біяграфічныя нарысы лідэраў беларускага нацыянальнага руху», «Кіраўнікі асноўных беларускіх нацыянальных арганізацый, палітычных партый і ўрадаў», «Храналогія асноўных падзей у Беларусі ў 1914—1921».

Першы дадатак (с.303—362) — гэта маленькі біяграфічны даведнік з бібліяграфічнымі заўвагамі (частка, якой бракуе ў **1.1**).

Манаграфія таксама ўключае раздзелы «Заўвагі аб сістэме транслітарацыі», «Беларуская Народная Рэспубліка: асноўныя звесткі», «Карта Беларусі», «Прадметны паказальнік». Маюцца чорна-белыя ілюстрацыі.

Цяпер гэтую кнігу складана знайсці. З прычыны свайго спецыфічнага зместу і мовы яна рэкамендуецца толькі для навуковых бібліятэк. Асабліва раім яе спецыялістам-гуманітарнікам.

3.0. Даведачныя манаграфіі

Паколькі большасць энцыклапедый змяшчаюць толькі агульныя звесткі, не раскрываючы прадмета глыбока, уяўляецца абгрунтаваным уключыць у гэтую бібліяграфію некалькі

манаграфічных прац, пабудаваных на ўзор энцыклапедычных даведнікаў. Гэтыя даведачныя манаграфіі да сёння застаюцца найлепшымі крыніцамі інфармацыі па беларускай гісторыі (**3.1**), літаратуры (**3.2**) і дыяспары ў Амерыцы (**3.3**).

3.1. *Zaprudnik, Jan. Belarus: At a Crossroads in History. Boulder, Colo., Westview Press, 1993. 278 p.*
Манаграфія выйшла ў серыі выдавецтва «Westview Press», прысвечанай постсавецкім рэспублікам. Кніга ўключае «Прадмову», «Заўвагі па тэрміналогіі», раздзелы «Беларускі алфавіт», «Коратка пра Беларусь», асноўныя раздзелы з гістарычным матэрыялам, выкладзеным у храналагічным парадку ад старажытных часоў да 1992 году, «Дадатак: асноўныя даты беларускай гісторыі», «Слоўнік тэрмінаў», «Бібліяграфію» (с.247—257), «Паказальнік». Кніга выдадзена пры падтрымцы «Праграмы па вывучэнні нацыянальнасцей і Сібіры» Інстытуту Харымана Калумбійскага ўніверсітэту («Nationality and Siberian Studies Program of the Hariman Institute, Columbia University»).
Нягледзячы на назву, манаграфія прысвечана не толькі гісторыі, але і эканоміцы, палітыцы ды культуры.
Доктар Запруднік напісаў кнігу, якая выглядае пашыранай версіяй **1.1**, толькі артыкулы размешчаны не ў алфавітным, а ў храналагічным парадку. “Паказальнік” палягчае пошук патрэбных звестак. Вялікія раздзелы падзяляюцца на меншыя часткі, што маюць уласныя падзагалоўкі, так што патэнцыяльны карыстальнік можа чытаць толькі тое, што яго цікавіць. Мова выдання простая і неакадэмічная, што робіць яго добрым дапаможнікам для школ і каледжаў. Тэкст суправаджаецца архіўнымі і сучаснымі чорна-белымі ілюстрацыямі.

3.2. *McMillin, Arnold B. Die Literatur der Weissrussen = A History of Byelorussian Literature: From Its Origins to the Present Day. Giessen, Germany: Wilhelm Schmiltz Verlag, 1977. 447 p.*
Хоць гэтая кніга выйшла ў 1977 годзе, яна застаецца пакуль што адзінай поўнай гісторыяй беларускай літаратуры на англійскай мове. Іншыя кнігі таго самага аўтара, якія можна

згадаць, ахопліваюць абмежаваны перыяд («Беларуская літаратура ў 1950—1960 гадах: вызваленне і абнаўленне»[3], 1999) ці абмежаваную прастору («Беларуская літаратура дыяспары»[4], 2002).
У манаграфіі разглядаецца беларуская літаратура ад XII стагоддзя і да пасляваеннага перыяду. Стыль працы апавядальны. Звесткі пра літаратуру суправаджаюцца фактамі з гісторыі і культуры. Прысутнічае вялікая колькасць літаратурных твораў і іх фрагментаў у перакладзе на англійскую мову, што пашырае ўяўленне чытача пра беларускую літаратуру. Храналагічныя рамкі раздзелаў выразна акрэсленыя, што робіць кнігу лёгкай для выкарыстання і канспектавання. Карыснымі дадаткамі з'яўляюцца «Паказальнік асобаў» і «Паказальнік назваў літаратурных твораў». Бібліяграфія пададзена шырока, але большасць крыніц неангламоўныя.

3.3. *Kipel, Vitaut. Belarusans in the United States. Lanham, Md.: University Press of America, 1999. 569 p.*
Доктар В.Кіпель зрабіў абсалютна ўнікальнае даследаванне. Сам імігрант, ён аб'яднаў у адной кнізе гісторыю Беларусі і гісторыю Амерыкі. Хоць кніга расказвае пра беларусаў у ЗША, яе пяты раздзел прысвечаны самой Беларусі, яе гісторыі і палітычнаму жыццю. Астатнія раздзелы апісваюць жыццё і дзейнасць беларусаў у Амерыцы з энцыклапедычнай усебаковасцю. Назавём некаторыя з іх: «Беларуская эміграцыя ў даследаваннях, публікацыях і статыстычных крыніцах», «Некаторыя этнічныя характарыстыкі беларусаў», «Рэлігійнае жыццё і рэлігійныя арганізацыі», «Выдавецкая справа. Беларусістыка ў сродках масавай інфармацыі», «Беларуска-амерыканскія культурныя сувязі» і г.д. Кожны раздзел мае больш дэталёвае чляненне на падраздзелы з удалымі і лёгказразумелымі загалоўкамі. Напрыклад, у раздзеле «Беларуская эміграцыя ў даследаваннях, публікацыях і статыстычных крыніцах» вылучаюцца «Англамоўныя публікацыі», «Публікацыі на іншых мовах», «Беларускамоўныя публікацыі», «Некалькі заўваг пра статыстыку». Кніга таксама змяшчае «Заўвагі адносна тэрміналогіі і напісання», «Дадатак: беларускі алфавіт» і «Паказальнік».

McMillin Arnold B. ***Belarusian literature in the 1950s and 1960s:***

Гэтая даведачная манаграфія будзе карысная не толькі даследчыкам беларуска-амерыканскіх сувязей, але і ўвогуле шукае агульнай інфармацыі пра Беларусь. Тут асабліва прыдасца першы раздзел «Асэнсоўваючы Беларусь» (с. 3–26). Стыль выдання блізкі да акадэмічнага. Тут няма бібліяграфіі і асобнай структурнай адзінкі, затое багата спасылак у зносках. Манаграфія ілюстраваная рэдкімі і даволі цікавымі здымкамі. Для навуковых і акадэмічных бібліятэк.

4.0. Бібліятэкі, архівы

4.1. *Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны* (http://www.skaryna.clara.net/skaryna/)
Скарынаўская бібліятэка была заснавана ў 1971 годзе ў Лондане. Гэта найбольшы ў Еўропе (за межамі Беларусі) збор кніг на беларускую тэматыку. Ён уключае даведачныя выданні, слоўнікі, мастацкую літаратуру, кнігі, выдадзеныя да 1800 году, рукапісы і музыку. Маецца кароткі каталог з карыснымі анатацыямі, які можна знайсці на інтэрнэт-старонцы бібліятэкі. Доступ да бібліятэчных фондаў абмежаваны дамоўленасці. Загадчык бібліятэкі Джым Дынглі — выключны прафесіянал у сваёй галіне і добры знаўца еўрапейскіх моў. Адрас: 37 Holden Road, London.

4.2. *Нью-Йоркская публічная бібліятэка. Секцыя славянскіх і балтыйскіх літаратур*
(http://www.nypl.org/research/chss/slv/slav.balt.html)
Гэта найбольш прафесійна арганізаваная калекцыя, чаму

release and renewal. Köln: Böhlau, 1999. 315 p.

[4] McMillin Arnold B. *Belarusian literature of the Diaspora.* Birmingham: University of Birmingham Central Printing Services, 2002. 503 p.

[5] Raeff, Marc. Our First Reader: David Shub and His Times // *Biblion.* №3(2). Spring 1995. P. 109–125.

паспрыялі былыя работнікі бібліятэкі Вітаўт і Зора Кіпелі. Беларуская падборка мае доўгую гісторыю; першыя кнігі пачалі паступаць у бібліятэку ў пачатку 1920-х гадоў. Дарэчы, калі адчыніў дзверы новы корпус бібліятэкі, першы чытач быў якраз з Беларусі[5]. Беларускі аддзел налічвае больш за 9000 тамоў на розных мовах і ў розных фарматах (кнігі, перыядычныя выданні, мікрафільмы і мікрафішы), якія закранаюць усе тэмы, звязаныя з Беларуссю. Каталог бібліятэкі можна знайсці ў Інтэрнеце (catnyp.nypl.org). Усе кнігі, што паступілі да 1972 году, трэба шукаць у «Чырвоным каталогу» бібліятэкі. Сям'я Кіпеляў у 1999 годзе ахвяравала бібліятэцы калекцыю эміграцыйных перыядычных выданняў і кніг пра Беларусь, што выйшлі галоўным чынам ва Ўсходняй Еўропе, Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы ды Аўстраліі з сярэдзіны XIX стагоддзя і да 2000 году ўключна. Калекцыя перыёдыкі ўключае 414 экзэмпляраў часопісаў, газет, бюлетэняў, шматтыражак, праспектаў і іншых выданняў, упарадкаваных у алфавітным парадку па назвах. Іншыя экспанаты калекцыі ўключаюць каля 4500 кніг, брашур, аб'яў, прэс-рэлізаў і дакументаў. Гэта найпаўнейшы збор такога роду ў свеце, адкрыты для даследчыкаў. Цяпер рыхтуецца да друку адпаведны бібліяграфічны даведнік[6].

4.3. Іншыя архівы

Вядома, існуе і шмат іншых архіваў, часам у самых нечаканых месцах. Напрыклад, беларускія фонды ў Інстытуце Гуверы.

[6] ***Belarusian publications in the West: bibliography*** **/ compiled by Zora Kipel and Vitaut Kipel; edit. By Liavon Yurevich. New York: [New York Public Library] , 2001. 2 v. Unpublished typescript.**

5.0. Установы

5.1. *Беларускі інстытут навукі і мастацтва (БІНіМ)*
Інстытут быў заснаваны ў Нью-Йорку ў 1950 годзе беларускімі эмігрантамі і з тых часоў зрабіўся цэнтрам беларусазнаўства ў Паўночнай Амерыцы. Інстытут выдае двухмоўны альманах «Запісы БІНіМ», на сённяшні дзень выйшла ўжо 26 выпускаў. Некаторыя тэксты можна знайсці па адрасе http://belarus8.tripod.com/ZapisyBINIM/zapisy.htm ці http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/binim/spis.htm. Інстытут таксама выдае некалькі кніжных серый («Беларускія пісьменнікі замежжа», «Гісторыя беларускай эміграцыі», «Бібліяграфічная серыя»). Інстытут збірае архівы беларускіх арганізацый дыяспары, а таксама прыватных асоб. Усе яны ўнікальныя і ўтрымліваюць каштоўныя матэрыялы. Інстытут не мае свайго офісу і цяпер размяшчаецца ў доме доктара В.Кіпеля, прэзідэнта БІНіМ. Скантактавацца з інстытутам можна праз тэлефон (732-557-0094), факс (732-557-0095) ці электронную пошту (lyurevich@nypl.org).

6.0. Перыядычныя выданні

Існуюць толькі два англамоўныя перыядычныя выданні, якія могуць дапамагчы ў вывучэнні Беларусі. Адно з іх — часопіс **«The Belarusian Review»** («Беларускі агляд»), што выдаецца Беларуска-амерыканскай асацыяцыяй, галоўнай беларускай арганізацыяй замежжа. Яго аўтарам можа стаць любы навуковец, які цікавіцца беларускай праблематыкай. Гэты часопіс піша пераважна на палітычныя тэмы, але часамі друкуе артыкулы па культуры, эканоміцы, беларускім замежжы і да т.п. Паколькі сам часопіс ёсць далёка не ва ўсіх бібліятэках, можна карыстацца яго бясплатным электронным варыянтам, які сістэматычна абнаўляецца. Выданне мае рубрыкі «Беларускі форум», «Беларусы за мяжой», «Агляд перыёдыкі», «Зводка навін» і інш. Часопіс заўсёды змяшчае інфармацыю пра новыя кнігі пра Беларусь на англійскай мове. На вебвузле размешчана кантактная інфармацыя, раздзелы «Архіў» і «Загрузка», а таксама, што вельмі істотна, пошукавы сэрвіс. Падпісная цана на год складае 45 долараў для прыватных асоб і 65 долараў — для арганізацый. Гэтае выданне — найлепшая крыніца свежай інфармацыі па прадмеце для беларусазнаўца.
Часопіс **«Belarusian Chronicle»** («Беларускія хронікі», **http://**

www.skaryna.clara.net/abs/chronicl.htm) выдаецца Англа-беларускім таварыствам штоквартальна і адносіцца да трэцясортных крыніц. Гэты часопіс змяшчае навіны з Беларусі і паведамленні пра падзеі, звязаныя з Беларуссю, у Вялікабрытаніі, пераважна ў Лондане. Падпісвацца на яго няма асаблівых прычын, але даследчыкам, якія цікавяцца беларускім жыццём у Лондане, ён можа быць карысны. У такім выпадку яго можна знайсці ў Інтэрнеце.

7.0. Базы звестак, крыніцы і матэрыялы ў Інтэрнеце

Англамоўных вебстаронак, што маюць дачыненне да Беларусі, у Інтэрнеце нямала. Не варта шукаць звесткі пра Беларусь праз сістэмы пошуку «About.com», «Yahoo!», «Google», паколькі яны могуць выдаць занадта шмат няправільнай ці простай састарэлай інфармацыі. Тым не менш, усё ж ёсць некалькі сеткавых рэсурсаў, да якіх можна звярнуцца па даведку.

7.1. *Belarusian.com* (http://www.belarusian.com) Пэўна, найлепшы на сёння вузел. Маюцца наступныя раздзелы: «Дзе знаходзіцца Беларусь?», «Дзяржаўнасць», «Палітычнае жыццё», «Эканоміка», «Гісторыя», «Культура», «Беларусь і Захад», «Храналогія», «Чарнобыль», «Прэзідэнт», «Грамадскі рух», «Палітычныя партыі», «Правы чалавека», «Знакамітыя беларусы», «Менск». Вузел забяспечаны пошукавым сэрвісам, спасылкамі на іншыя рэсурсы Інтэрнету з інфармацыяй пра Беларусь, прыводзіцца кантактная інфармацыя. Напаўненне вузла ахоплівае большасць пытанняў, якія могуць сёння ўзнікнуць пра Беларусь. Асобнай старонкай пададзена і бібліяграфія са спасылкамі на іншыя рэсурсы Інтэрнету. Раздзел «Знакамітыя беларусы» выглядае як біяграфічны слоўнік — невялікі (69 асоб), але цікавы. Пошукавая сістэма прапануе некаторыя загадзя сфармуляваныя тэмы для імгненнага пошуку (напрыклад, “беларускі ўрад і Злучаныя Штаты Амерыкі”, “Беларусь і смяротнае пакаранне”, “палітычныя зняволеныя” і інш.). Апошняя інфармацыя вузла датуецца сакавіком 2000 году. Вузел мае некалькі ілюстрацый, карт.

Найлепшае і найбольш даступнае з IX наступнае выданне: Ushkevich Alexander, Zezulin Alexandra. *Byelorussian-English, English-Byelorussian dictionary: with complete phonetics.* New York: Hippocrene Books, 1992. 290 p.

7.2. *Віртуальны даведнік па Беларусі* (http://www.belarusguide.com/main/index.html)
Гэты праект узнік у 1994 годзе і быў першым англамоўным вебвузлом пра Беларусь у Інтэрнеце. Мэта праекту — стварэнне віртуальнай энцыклапедыі пра Беларусь. Вузел мае наступныя раздзелы: «Навіны вузла», «Беларуская гісторыя», «Беларуская дзяржаўнасць і незалежнасць», «Беларуская культура», «Заканадаўства і палітычнае жыццё Беларусі», «Беларускія вебвузлы», «Прырода і геаграфія», «Слоўнік» (спасылка на **7.3**), «Вандроўка», «Беларусь: глабальныя рэсурсы», «Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС», «Беларуская генеалогія», «Беларуская прамысловасць». Кожны раздзел мае кароткую анатацыю і падзел на падраздзелы. У цэлым структура «Віртуальнага даведніка» даволі традыцыйная. Ёсць пошукавы сэрвіс для лягчэйшай навігацыі, а таксама мноства спасылак на іншыя рэсурсы пра Беларусь. Матэрыялы вузла выкладзены на даступным узроўні і не пазбаўлены памылак. Большасць стваральнікаў вузла — студэнты ці аматары, але яны выкарыстоўваюць сур'ёзныя крыніцы. Найлепшая рыса рэсурсу — багацце ілюстрацый, хоць дызайн яго і не ідэальны.

7.3. *Англа-беларускі слоўнік* (http://www.ceti.com.pl/~hajduk/)
Існуе некалькі папяровых беларуска-англійскіх слоўнікаў[7], але большасць з іх паспелі разысціся ці перавыдаюцца толькі ў Беларусі. Не ў кожнай бібліятэцы яны ёсць. Таму гэты электронны беларуска-англійскі і англа-беларускі слоўнік можа стацца выйсцем з сітуацыі.
Вебвузел прапануе, зразумела, сістэму пошуку, а таксама звод граматычных правіл. Ён перакладае словы, геаграфічныя назвы, імёны, спецыяльныя тэрміны і ўстойлівыя выразы (назвы дзён тыдня і месяцаў, састаўныя лічэбнікі і г.д.). Карысная функцыя "гукі", якая дазваляе пачуць як асобныя беларускія гукі, так і некаторыя словы і фразы. Паколькі ў беларускім пісьме ўжываюцца як кірылічны, так і лацінічны алфавіты, слоўнік апісвае сімвалы іх абодвух. Рэсурс досыць просты ў карыстанні, але аб'ём слоўніка невялікі. Не чакайце ад яго залішне.

[7] ***Belarus and Moldova: country studies.*** **Federal**

7.4. *ЦРУ — кніга фактаў* (http://www.odci.gov/cia/publications/factbook/geos/bo.html)
Гэтая знакамітая старонка дае толькі мінімальныя даведкі ў апісанні беларускай геаграфіі, насельніцтва, органаў кіравання, эканомікі, узброеных сіл, шляхоў зносін і сродкаў сувязі і г.д., пераважна ў імёнах і датах. Можа быць карыснай для атрымання асноўнай інфармацыі пра краіну і для высвятлення канкрэтных фактаў пра яе, калі вы ўпэўнены, што такая інфармацыя на вузле ёсць. Пошукавая сістэма адсутнічае.

7.5. *Аддзел краіназнаўства Бібліятэкі Кангрэсу* (http://lcweb2.loc.gov/frd/cs/bytoc.html)
Можа выкарыстоўвацца для даведачных мэтаў як электронны варыянт кнігі «Беларусь і Малдова: краіназнаўства». Тут ёсць поўная версія кнігі з падзелам на часткі, бібліяграфія, слоўнік тэрмінаў, сістэма пошуку. Матэрыял ахоплівае гісторыю краіны і нашы дні. Стыль і мова блізкія да энцыклапедычнага. Маюцца перакрыжаваныя спасылкі, некаторыя ілюстрацыі і карты (у фармаце .pdf).

Research Division, Library of Congress; edited by Helen Fedor. Washington, D.C.: The Division: Headquarters, Dept. of the Army: For sale by the Supt. Of Docs., U.S. G.P.O., 1995. 254 p.

Пераклаў з англійскай мовы
Сяргей Петрыкевіч

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/01/21**
[image]

Вольф Рубінчык Апошняя кніга змагара

Гірш Смоляр. *Менскае гета: Барацьба савецкіх габрэяў партызанаў супраць нацыстаў.* — Менск: Тэхналёгія, 2002.

Гадоў 15 таму беларускія яўрэі расхапалі б гэтую кніжку за тыдзень, яшчэ б і ў чарзе па яе стаялі. Цяпер яна, нягледзячы на досыць кідкую вокладку, сціплы наклад (600 асобнікаў) і цану (меней за 2000 руб.), праз год па выхадзе праглытвае пыліцца ў менскіх кнігарнях. Водгукі на яе — што праўда, сціплыя — змясцілі беларускія яўрэйскія газеты «Берэгіня» ды «Анахну кан». Анатацыю «Менскага гета» дала «Наша Ніва». Насамрэч кніга Гірша (Рыгора) Смоляра — важны крок і яўрэйскай, і беларускай гісторыі.

Гета ў Менску, створанае ў ліпені 1941 году на загад нямецкага каменданта, улучала ў сябе некалькі кварталаў у цэнтры гораду і напачатку называлася “жыдоўскім жылым раёнам”. Праіснавала да кастрычніка 1943 году і было фактычна канцлагерам з асобнымі зонамі — “зондэргета” для заходніх яўрэяў і г.д. Мяркуецца, што з яго насельнікаў у пагромах, ад голаду ды хваробаў загінулі 80—100 тысяч чалавек. Сказаць, што жыццё ў гета было жахлівым, — значыла б сказаць вельмі мала. Каб дазнацца пра ўсе жахі, неабавязкова навалтурыць са старымі яўрэямі: у апошняе дзесяцігоддзе выдадзена нямала ўспамінаў былых вязняў, што жывуць у Беларусі, ЗША ды бо

ВОЛЬФ РУБІНЧЫК (нар. у 1977 у Менску) — палітоляг, перакладчык. Скончыў факультэт палітычных і адміністрацыйных навук Заходнееўрапейскага гуманітарнага універсытэту (1999 г.), асыпірантуру ГІФВК БДУ (2002 г.). Апошняя публікацыя — «Беларускія шахматы ў сусьветным павуцінні» (часопіс «Шахматы» №11, 2003 г.).

Ізраілі[1], навуковых даследаванняў ды зборнікаў дакументаў, знятыя і паказаныя на тэлебачанні фільмы пра гета. Асобным музеі гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі захоўваюцца фатаздымкі і дакументы пра перыяд 1941—1944 гадоў. Пераломным у інфармацыйным плане стаў 1993 год, калі афіцыйна і маштабна адзначалася 50-годдзе ліквідацыі гета, аднак і раней рабіліся спробы асэнсаваць трагедыю Халакосту, Катастрофы, дамагчыся, як пісала гістарыца Г.Купрыянава, “схаванай праўды”[3] пра вайну. Гэтак, у 1992 годзе Музей вялікай айчыннай вайны ладзіў выставу «Трагедыя яўрэяў Беларусі»[4]. Хоць у падручніках пра Менскае гета даведацца гаворыцца мала, вакуум гістарычнай памяці нібыта запаўняецца і цяжка ўжо здзівіць беларускага чытача навізной тэмы. І ўсё ж рэцэнзаваная кніга выпінаецца з назапашаных матэрыялаў — перадусім тым, што яе аўтар быў не проста вязнем, а адным з першых кіраўнікоў падполля. Будучы прадстаўніком гаркаму кампартыі ў гета, стаўся і ідэолагам падпольніцкай барацьбы. Ніхто з ягоных паплечнікаў, якія “па гарачых слядах” не пакінуў, а тым болей не браўся за напісанне гісторыі Менскага гета двойчы — у паваенным СССР і ў Ізраілі.

Кніга Смоляра «Fun Minsker geto» (Масква: Дэр эмес, 1946, ідыш), а ў прыватнасьці яе пераклад на расійскую «Правда гетто» (Масква: ОГИЗ, Дэр Эмес, 1947), на дзесяцігоддзі стала найкаштоўнейшай рэліквіяй для многіх-многіх яўрэяў былога дый усяго Саюзу. Новая кніга перакладзена з ангельскай і выйшла яе аўтар ужо ў 1980-я гады. Змест «Мсціўцаў гета» і «Мсціўцаў гета» і падобны, і непадобны. У другой кнізе Смоляр расказвае пра тое, як няпроста з’яўлялася першае, падцэнзурнае выданне. Аднак жа ў эміграцыі ён не змяніў «Мсціўцаў» — хоць і неслі яны пячатку сацрэалізму, лічыць сапраўдным толькі новае выданне, як гэта зрабіў Анатоль Кузняцоў з сваім «Бабіным ярам»[5].

[2] **Критические заметки о еврейской жизни” в постсоветской России» (заходні «Диаспоры», Масква, №4, 2002 г.).**

[1] **Марголина С. Остаться живым — Минск: Наука и техника, 1997; Рубенчик А. Правда о Минском гетто. — Тель-Авив: Книгоиздательство «Библиотека-Алия», 1989. На перекрестках судеб: Из истории жизни бывших узников гетто и Праведников народов мира). — Минск: Четыре четверти,**

2001; Гальбурт А. Воспоминания. — Минск: Энциклопедикс, 2001; Лапидус А. Нас мало осталось, нам много досталось // Вестник (Балтимор, США). 2003. №3. http://vestnik.com/issues/2003/0205/win/lapidus.htm і г.д.

[2] Кнатько Г. История минского гетто // Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца). Мат-лы Міжнар. навук. канф. 25—27 красавіка 2002 г. —

Мінск: Выдав. Цэнтр БДУ, 2003; Трагедия евреев Беларуси в годы немецкой оккупации (1941—1944). — Минск, 1995. (2-е выданне — 1997); Judenfrei! Свободно от евреев! История минского гетто в документах. — Минск, 1999; і інш.

[3] Гл.: Купрэева Г. Пакінуты народ. Мінскае гета: схаваная праўда // Беларуская мінуўшчына. 1993. №2.

[4] Гл. буклет «Трагедия

еврейского народа: Беларусь, 1941—1944 гг.» — Менск: Полымя, 1992.

Праўда, цяперашні кіраўнік беларускай Асацыяцыі яўрэяў — былых вязняў гета і нацысцкіх канцлагераў Міхаіл Трэйстэр казаў мне летам 2001 году, што вельмі мала людзей наведвала тую выставу. Дадзеныя аб ахвярах сярод яўрэяў Беларусі ў 1941—1944 гадах у буклеце чамусьці заніжаныя ў 2—

2,5 разу: называецца лічба “каля 300 тысяч чалавек яўрэйскай нацыянальнасці” (нават не 450 тыс., як я памылкова адзначыў у «Народнай волі» ад 16.04.2003).

«Мсціўцы гета» — кніга-сведчанне, справаздача аб барацьбе. «Менскае гета» мае больш навуковы кірунак, яно й названа “навукова-папулярным выданнем”. Натуральна, у кнізе 1989 году Смоляр выкарыстоўвае менш лозунгаў, а больш спасылак на даследаванні аб палітыцы нацыстаў у Беларусі, упісвае змаганне сваіх сутаварышаў у гістарычны кантэкст. Не чужыя «Менскаму гета» сацыялагічныя назіранні, заўвагі аб людской псіхалогіі ў экстрэмальных абставінах. Калі ў першай кнізе рашэнне змагацца прыходзіць нібыта само па сабе, у другой аўтар падае яго як плён цяжкіх роздумаў. Падкрэслівае, што праграма “Рабіць хоць нешта” была першым крокам нават для актывістаў і толькі пакрысе выпрацоўвалася тактыка ўзброенай барацьбы: “Трэба прызнацца, што пераканаць габраяў у правільнасці нашага галоўнага лозунгу “Гета азначае смерць! Разбурайце гетаўскую агароджу!” было зусім няпроста” (с.175).

«Мсціўцы гета» мелі на мэце паказаць адзін працэс: нацысцкі тэрор выклікаў адэкватны адказ савецкіх грамадзянаў яўрэйскай, якія, змагаючыся поруч з беларусамі, расійцамі, няшчэдрэнна ўсе перашкоды (напрыклад, цкаванне “аператыўнікаў” яўрэйскай паліцыі, што была створана пры юдэнрацы) спыняліся з гета ў партызанскія атрады, дзе праяўлялі мужнасць і ўзнікаў. Канва аповеду захаваная і ў новым выданні, аднак «Менскае гета» — кніга даволі шматвымерная. Падзеі разглядаюцца ў дынаміцы, факты параўноўваюцца з тым, што пісалася пра

5 Гл. Кузнецов А. Бабий Яр. — Москва: Захаров, 2001.

6 Баранэвіцкий Е. Кремль не доверял членам и узникам. Вечерний Минск.

іншыя гета, часам аўтар палемізуе з іншымі даследчыкамі. Паводле выдання 1947 году, супраціў пачынаецца з адначасовых ды ўзгодненых дзеянняў “карэнных” савецкіх яўрэяў (Фельдман, Окунь, Чыпчын і інш.) і былых грамадзянаў Польшчы (Смоляр, Кіркаешта…). Вось жа, з рэцэнзаванай кнігі вынікае, што актывісты-“заходнікі” мусілі настойліва пераконваць “усходнікаў” у неабходнасці самаарганізацыі (с.40—41). Кіраўнік менскага гаркаму партыі Славік Пабядзіт (Ісай Казінец) мяняе свае погляды не без удзелу гетаўскіх актывістаў (с.66). Да эвалюцыі лозунгаў менскага падполля спрычыняюцца эмісары з партызанскага атраду (с.69). У параграфе «Канфлікт паміж “заходнікамі” і “ўсходнікамі”» выяўленыя супярэчнасці ўнутры гета, а ў падраздзельчыку «Дзве ўлады ў гета» паказана барацьба за ўладу і танную працоўную сілу паміж генеральным камісарам Кубэ (цывільнай уладай) і оберштурмбанфюрэрам Штраўхам (паліцэйскай уладай) (с.55—56). Падкрэсліваецца фатальная наіўнасць нямецкіх яўрэяў, што збольшага пагарджалі беларускімі, даўжэй давяралі нацыстам («Канец гамбургскага гета», с.110). Не замоўчваюцца памылкі партызан (с.131—132), антысемітызм, што нярэдка сустракаў уцекачоў з гета ў атрадах («І ў лесе — нянавісць да габраяў», с.133—141), прызнаны цяпер і “афіцыйным” беларускім гісторыкам[6]. Нарэшце, гаворыцца і пра нежаданне партыйнага кіраўніцтва аддаць належнае яўрэйскім змагарам — нават адразу па вайне (с.166, 168—169). Сам Смоляр, аказваецца, быў чальцом нефармальнай суполкі яўрэйскіх партызанаў, што супрацьстаяла, напрыклад, хуліганам-антысемітам на вуліцах Менску (с.168).

У «Менскім гета» апісанні баявых чыноў займаюць менш месца, чым у «Мсціўцах». Аднак і тут вядзецца пра дыверсіі, пра дапамогу, якую аказвалі партызанам з гетаўскай больніцы (с.73), пра тое, што дзякуючы намаганням гета быў утвораны не толькі сямейны атрад №106 (“Мірныя”), але й шэсць іншых фармаванняў (с.161). Часам падкрэсліваецца роля падлеткаў, апанаваных жаданнем помсціць ворагу: “Нашымі праваднікамі ў лес былі таксама дзеці, якія, зрэшты, перасталі ў гета быць дзецьмі” (с.102). Крыху болей аб аўтару «Менскага гета». Хоць і выключна літаратар Уладзімір Мехаў біяграфію Смоляра ў прадмове

7. Гэта… Аповесць // Мінскі кур'ер. — 1992. — №1. — 2 студз. — С. 3.

2002 19 верасня.

рэцэнзаванай кнігі, аднак сёе-тое засталося за кадрам
год нараджэння. Біяграфія ж гэтая прываблівае
тым, што ў ёй адлюстраваліся ілюзіі і здаровы глузд
усходнееўрапейскіх яўрэяў XX стагоддзя, іхняе захапленне
ідэямі ўсеагульнай роўнасці і паступовае вяртанне
каранёў.

Нарадзіўся Гірш Смоляр у 1905 годзе ў Замбруве
павету. Робячы гарбаром, ужо гадоў у пятнаццаць
у працы беластоцкага рэўкаму. Друкаваўся з 1921
у СССР па навуку, вучыўся ў камуністычным
нацменаў Захаду, які ўзначальвала знаная менская
Марыя (Эстэр) Фрумкіна. Быў агентам Камінтэрну
двойчы арыштоўваўся, адседзеў сем год, з іх
у камеры-адзіночцы. Сядзеў у віленскім астрозе
побач з Сяргеем Прытыцкім. Сябраваў з Максімам
Валянцінам Таўлаем. Пасля 1939 году Смоляр,
рэвалюцыянер, стаў сакратаром Беластоцкага
аддзялення Саюзу пісьменнікаў. У гета меў псеўданім
“Сталярэвіч”. Па ўцёках з гета ў лістападзе 1942 году
камісарам атраду імя Лазо ў Налібоцкай пушчы, які
злучыўся з атрадам імя Кутузава — пра што даволі
напісаў у «Менскім гета». Рэдагаваў таксама
партызанскую газету (з 1943 году). Пасля вайны
у газеце «Літаратура і мастацтва», спецкарам
яўрэйскай газеты «Эйнікайт» («Адзінства» — на
У 1946 годзе рэпатрыяваўся ў Польшчу, дзе
«Фольксштыме» («Голас народу» — ідыш), з’яўляўся
агульнапольскай яўрэйскай культурніцкай
1968 году, у якіх бралі ўдзел яго сыны Яўген і
перабрацца ў Ізраіль. Даваў прыкурыць польскім
напісаў некалькі кніг: акрамя згаданых у дадзенай
«Дзе ты, таварыш Сідараў?» (1973), «Савецкія яўрэі
гета» (1985). Былі яшчэ й артыкулы: прыкладам,
жыццё ў падсавецкай Заходняй Беларусі (1939—1941)
у часопісе «Швут» №4 за 1976 год — на іўрыце.
паводзіны савецкіх кіраўнікоў да вайны, у час
— таго ж Панамарэнку. Не дзіўна, што творчасць
далася ў знакі ідэолагам старой закваскі, якіх
трапна параўнаў з вертухаямі. На першым этапе
існавання Менскае аб’яднанне яўрэйскай культуры

**Савецкай
ідэалогіі
1991.
Пасля
выхаду
«Мінскае
гета»
(Мн.:Хадэй
Беларусь,
1995),
Смоляр
Давідавіч
перабраў
“даянкі”
Менскім
«Беларускай
энцыклапедыі»
Смоляр
Самуэлэвіча
«Пакатар”.
Там
ён
Мяўка
Жытніцкага,**

карысную рэч: з дакументамі ў руках выкрыла фальсіфікацыю А.Бажка і В.Пепяляева, што ў 1987 годзе на старонках бюлетэня «Дары данайцев» абзывалі Смоляра “правакатарам” і абвінавачвалі закідалі яму “валютныя шашні з акупантамі”[7]. Аднак і ў 1992 годзе пад эгідай Інстытуту гісторыі беларускай Акадэміі навук выйшла кніга з бруднымі намёкамі на адрас змагара — на што ў «ЛіМе» зрэагавала жонка Смоляра Валянціна Найдус[8]. Памёр Г.Смоляр — камуніст, што пачаў здрадзіў свайму народу, — у Ізраілі, у Рамле 16 сакавіка 1993 году. Да сваіх апошніх гадоў цікавіўся жыццём рускіх яўрэяў, сустракаўся з былымі вязнямі гета ў час іхніх візітаў на Зямлю абяцаную.

прыкладаў некалькі работ Менскаму гета і ў Ізраіль у пачатку 1970-х — прыкладна ў той жа час, што і Смоляр. Падаецца, што чужынцам Смоляр застаўся і за межамі Беларусі; былы даследчык гісторыі партыі Леанід Сміловіцкі не пажадаў унесці кнігу Смоляра «The Minsk Ghetto» у спіс крыніцаў свайго даследавання «Катастрофа евреев в Белоруссии: 1941—

Імя Смоляра, як аднаго з кіраўнікоў падполля, згадвалася ў вядомай кнізе І.Новікава «Руіны страляюць ва ўпор», што некалькі разоў перавыдавалася ў 1960—1970-я гады. Першай публікацыяй самога Смоляра ў Беларусі быў — калі не лічыць фрагментаў з «Мсціўцаў гета» ў першым нумары маладзёжнай яўрэйскай газеты «Авив» — ягоны рапарт у ЦК КП(б)Б пра падзеі 1941—1942 гадоў, напісаны па-расійску ў 1944 годзе, перакладзены на беларускую ў 1990-я гады (Полымя, 1995, №6.).

Які з двух Смоляравых аповедаў аб менскім гета стане культавым тэкстам для беларускіх яўрэяў XXI стагоддзя — той, даўні, ці гэты, новы і апошні? Адказ: бадай, ніякі. Пэўная эйфарыя яўрэйскага адраджэння канца 1980-х—пачатку 1990-х змянілася на слаўназнаныя млявасць і абыякавасць.

У сярэдзіне 1990-х гадоў, памятаю, спрабавалі актывісты сабраць у менскіх яўрэяў грошы на перавыданне ўспамінаў Смоляра па-расійску — дзе там! Дый у вышэйзгаданым выказ

1944 гг.» (Тэль-Авіў, 2000; гл. мой водгук «Яшчэ раз пра Галакост» на гэтую пасрэдную кнігу ў ARCHE, №4/2000).

[8] Найдус-Смоляр В. Ці ж гэта не “сталінская сірата”? // Літаратура і мастацтва. 1993. 22 кастрычніка.

[9] Каган Дж., Котер Д. Як мы перажылі Галакост з яўрэйскім партызанскім атрадам у Беларусі. — Менск: СП «Медысонт», 1999. Наклад 100 (сто) асобнікаў.

гісторыі і культуры галоўнымі героямі выглядаюць “казённыя” яўрэі нашага часу (напрыклад, архітэктар, лаўрэат Ленінскай прэміі Леанід Левін), а не Смоляр ці ягоны паплечнік Міхаіл Гебелеў, забіты гестапаўцамі ў 1942 годзе. Тым не менш, ёсць нейкая глыбінная праўда ў тым, што гісторыя змагання яўрэяў з нацыстамі выйшла менавіта ў наш час і на беларускай мове, як, дарэчы, і ўспаміны былых партызанаў з Навагрaдку[9]. Мо і сапраўды, як сказана ў анатацыі, прыдасца “шырокаму колу чытачоў”. Прынамсі, яўрэі — выхадцы з Беларусі ў ЗША ўжо хочуць мець яе ў сваіх хатах.

Напрыканцы — пра пару прыкрых памылак, што трапілі ў «Менскае гета». Прозвішча гісторыка, аднаго з кіраўнікоў супраціву ў Нясвіжскім гета — Шолем (Шалом) Халяўскі, а не “Чоляўскі” (с.11). Кіраўніка ж паўстання ў Сабіборы звалі Аляксандр Пячэрскі, а не “Пячорскі” (с.149—150). Дзіўна, што на вокладцы пазначана: “Менск быў адзіным горадам у Савецкім Саюзе, дзе нацысцкія акупацыйныя сілы стварылі габрайскае гета. У астатніх гарадах габраяў знішчалі ўсіх і адразу”, — толькі ў Беларусі было больш як 150 гета. Аднак усё гэта, як кажуць, не псуе агульнага ўражання ад каштоўнай кнігі. Як бы там ні было, «Менскае гета» станецца часткай калектыўнай памяці беларускіх яўрэяў.
У 2002 годзе чытачы незалежнай яўрэйскай газеты «Анахну кан» выказаліся за тое, каб у Менску з’явіліся вуліцы Смоляра і Гебелева. Веру, што так і будзе. Відавочна, беларускай сталіцы не зашкодзіў бы і помнік яўрэйскім *змагарам*...
А пакуль, нібы віртуальны манумент, — вось яна, кніга «Менскае гета».

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне [mk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]

Арнольд Макмілін Чым адрозніваюцца і хто вінаваты

АРНОЛЬД МАКМІЛІН — прафесар расейскай літаратуры лёнданскага ўнівэрсытэту. Сярод навуковых зацікаўленьняў вылучае сучасную расейскую прозу, расейскую музыку, а таксама беларускую літаратуру й мову. Летась выдаў манаграфію «Belarusian Litera- ture of the Diaspora».

Нина Мечковская. Белорусский язык: Социолингвистические очерки. / Specimina Philologiae Slavicae, 138. — München: Verlag Otto Sagner, 2003.

Да праблемы беларускай нацыянальнай самасвядомасці, якую вырашае Беларусь пасля распаду Савецкага Саюзу, у палітычных дэбатах падыходзяць па-рознаму. Ключавы пункт ва ўсёй праблеме звязаны з пытаннем пра беларускую мову. Дэманстрацыі, якія ўлада бязлітасна разганяе і якія, тым не менш, у буйных беларускіх гарадах робяцца ўсё больш рэгулярнымі, — гэта найбольш адкрытае, рашучае і пафаснае выражэнне трывог не толькі аб дэмакратыі, але і аб мове. Пафаснасць зусім не ўласціва таму падыходу да розных сацыяльных і палітычных аспектаў моўнай сітуацыі ў краіне на працягу апошніх дзесяці гадоў, які паказаны ў кнізе Ніны Мячкоўскай. Аўтарка выяўляе сябе хутчэй у якасці назіральніка, чым перадузятага каментатара, але менавіта таму эфект гэтай кнігі — паводле жанру даследніцкай, добра дакументаванай і з імкненнем да поўнай доказнасці — асабліва ўражвае. У наш час гэта важная і неабходная кніга.

Прафесарка Мячкоўская, сёння вядучы беларускі спецыяліст у соцыялінгвістыцы, аўтарка шэрагу кніг з агульнай і сацыяльнай лінгвістыкі, уключыла ў гэтае выданне серыю разгорнутых даследаванняў асноўных спрэчных пытаннях пра характар і статус мовы ў Беларусі. Храналагічныя межы разгляданай рэальнасці шырокія — пачынаючы ад гістарычных перадумоў сучасных калізій да дурных палітычных авантураў бягучых дзён і ад выбару алфавіту беларускімі пісьменнікамі XIX стагоддзя да зрыву ў 2002 годзе перамоваў паміж прэзідэнтамі Беларусі і Расіі наконт аб'яднання дзвюх краінаў. Шмат якія з тых праблем, што абмяркоўваюцца ў кнізе, маглі б абудзіць дыскусіі, аднак, дзякуючы чыста даследніцкай інтанацыі, адначасова стылістычна блізкай да жывога маўлення, большасць праблем у кнізе апісваецца спакойна і цалкам празрыста, у тым ліку шматлікія цяжкія дылемы, што стаяць перад свядомасцю зацікаванай беларускай інтэлігенцыі. Прафесарка Мячкоўская наўмысна адмовілася ад мадэрнізацыі шэрагу артыкулаў, што выйшлі ў свет некалькі гадоў таму, аднак усе тэксты чытаюцца так, быццам яны публікуюцца ўпершыню, ствараючы, такім чынам, своеасаблівую жывую гісторыю грамадскай свядомасці.

У кнізе сем артыкулаў, першы з якіх — «Статус і функцыі расійскай мовы ў апошніх савецкіх законах аб мове» (1992) — з'яўляецца аналітычным аглядам спробаў савецкай улады рэгуляваць выбар і ужыванне моваў у розных сферах грамадскага жыцця, ад адукацыі да афіцыйных папер і ад шыльдаў да абвестак. У пастскрыптуме (2003), прыгадваючы неразважлівы аптымізм пачатку 1990-х, выкліканы наданнем беларускай мове статусу дзяржаўнай, аўтарка піша пра фінал надзеяў: у Беларусі аптымізм скончыўся пасля рэферэндуму 1995 году; з былых савецкіх рэспублік Беларусь стала адзінай краінай (выключаючы Кыргызстан), дзе расійская мова атрымала юрыдычны статус, роўны статусу нацыянальнай мовы.
У другім артыкуле — «Моўная сітуацыя ў Беларусі: этычныя калізіі дзвюхмоўя» (1994) — разглядаецца Другое беларускае адраджэнне 1989—1991 гадоў (першае мела месца ў 1906—1918 гадах). Пасля гістарычнага экскурсу пра літаратурную мову Вялікага Княства Літоўскага, пра сітуацыю ў XIX стагоддзі

і кароткі перыяд беларусізацыі ў 1920-я гады сп-ня Мячкоўская ставіць пытанне пра тое, ці можна наагул спыніць і пераадолець наступствы той палітыкі русіфікацыі, якую на пачатку 1930-х гады павялі бальшавікі. Хто, пытаецца аўтарка, вінаваты ў дэнацыяналізацыі беларускага народу? Яе галоўным фактарам быў расійскі шавінізм у адносінах і да Ўкраіны, і да Беларусі (нядаўна ён быў канспектыўна ўзноўлены ў кнізе Салжаніцына), пры тым што адносную блізкасць да расійскай мовы і беларушчыны, і ўкраіншчыны, зразумела, прыходзіцца прызнаць фактарам, які абумовіў неспрыяльныя пазіцыі гэтых моваў у Расійскай / Савецкай імперыі (у параўнанні са становішчам моваў, генеалагічна больш аддаленых ад расійскай). Табліцы з разнастайнымі статыстычнымі звесткамі закліканы высветліць розныя аспекты беларускай этналінгвістычнай сітуацыі, у тым ліку ў супастаўляльным плане. Услед за статыстыкай разглядаюцца своеасаблівасць этналінгвістычнай самаідэнтыфікацыі беларусаў, характар беларуска-расійскага дзвюхмоўя ў цэлым, а таксама розныя матывы злучэння дзвюх моўных стыхій у адным тэксце: іронія, цытатнае клішэ, тлумачэнне беларускага слова з дапамогай расійскага эквівалента, скарыстанне слова з іншай мовы дзеля стварэння асаблівых канатацый і, вядома, лексічнае змяшэнне без усялякіх матываў (як самы звычайны выпадак беларуска-расійскай інтэрферэнцыі). Напрыканцы артыкулу абмяркоўваюцца перспектывы таго, што аўтарка называе “нацыянальны рамантызм і моўная практыка” (с.43), уключна з працэсамі, якім Васіль Быкаў даў векапомнае азначэнне “агонія нацыянальнай мовы” (с.44).
Наступны артыкул мае пераважна гістарычны характар: «Навошта аднаму народу дзве азбукі? (Кірыліца ды лацінка ў калізіях беларускага адраджэння)» (1998). Асноўная і прадказальная выснова такая: суіснаванне двух алфавітаў значна аслабляла першае беларускае адраджэнне.

У чацвертым, вельмі вялікім артыкуле аб нацыянальным адраджэнні ў Беларусі і Ўкраіне разглядаюцца падабенствы і адрозненні дзвюх сітуацый у сацыяльным і лінгвістычным аспектах. Артыкул будуецца на глебе стараннага аналізу гістарычных працэсаў; шматлікія статыстычныя звесткі падаюцца ў сціслым таблічным выглядзе. Як і зборнік у цэлым,

артыкул вылучаецца не толькі эрудыцыяй аўтаркі, але і адсутнасцю пабочнага або залішняга матэрыялу — дзякуючы дакладнаму адбору таго, што на самай справе істотна для тэмы.

У адрозненне ад іншых артыкулаў зборніка, у даследаванні «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч не быў аўтарам вадэвілю “Пінская шляхта”» (2000) у цэнтры ўвагі знаходзіцца літаратуразнаўчая праблема, хаця яна і вырашаецца лінгвістычнымі метадамі. Бескампрамісны загаловак артыкулу дазваляе бачыць тут выклік тым даследчыкам літаратуры, якія прызвычаіліся абавязкова адшукваць аўтараў для ананімных тэкстаў.

У артыкуле даецца ўражальнае абвяржэнне канону, згодна з якім вадэвіль лічыцца апошнім творам самага буйнога беларускага пісьменніка сярэдзіны XIX стагоддзя.

У працы «Чым беларусы адрозніваюцца ад расійцаў?» (2002) пададзена элегантнае і разам з тым цалкам навуковае даследаванне загаловачнага пытання, якое, дарэчы, і мне часта ставілі ў розных аўдыторыях. Прафесарка Мячкоўская адказвае на пытанне ў дзесяці ўзважаных раздзелах, якія заслугоўваюць таго, каб тут прывесці іх загалоўкі: «Еўрапейцы-беларусы versus еўразійцы-расійцы»; «Беларускія сяляне-аднаасобнікі versus расійскія сяляне-абшчыннікі (калгаснікі)»; «Народ, пакараны Імперыяй за саюз з Польшчай»; «“Прыватныя” жыхары заходняй імперскай украіны versus “дзяржаўны народ”»; «Беларусы раней за расійцаў пакідаюць “супольнае ўлонне” ўсходнеславянскіх народаў»; «Беларуская падатлівасць асіміляцыі і беларускі касмапалітызм versus неўспрымальнасць расійцаў да навакольных моваў»; «Беларускі недавер і/або раўнадушнасць да слова, адукацыі, да кніжнай і гарадской культуры, да ідэалогіі versus расійская словацэнтрычнасць і ідэалагічная палкасць»; «Вузкасць культурных гарызонтаў беларускай гуманітарыстыкі»; «Дзвюхмоўе і бікультуральнасць беларусаў versus аднамоўе і монакультуральнасць расійцаў»; і, нарэшце, амаль што кплівы і гарэзлівы фінальны пункт: «У Беларусі людзі жывуць у сярэднім дольш, чым у Расіі», які даў аўтарцы права, са спасылкай на ААН, сфармуляваць напрыканцы артыкулу яшчэ адну цікавую заўвагу: “Дарэчы, у глабальных шматпрыкметных рэйтынгах па “чалавечым развіцці”, якія штогод складаюць у ААН, Беларусь усё яшчэ наперадзе ад Расіі” (с.125).

У апошнім артыкуле гэтай захапляльнай кнігі паказваюцца новыя рысы ў беларускай моўнай сітуацыі, што праявіліся на пачатку XXI стагоддзя, а таксама зафіксаваны той “момант ісціны” аб беларускім суверэнітэце, што стаў відавочным летам 2002 году, калі Аляксандр Лукашэнка, урэшце ігнаруючы раздражнёнасць Пуціна, абвясціў: “Беларусь ніколі не стане 90-м суб’ектам Расійскай Федэрацыі” (с.140), чым заслужыў іранічныя ўхвалы беларускай ліберальнай прэсы. Гэты артыкул пачынаецца з канстатацыі таго, што пасля рэферэндуму 1995 году ўжыванне беларускай мовы звузілася, аднак пры гэтым пашырылася яе сімвалічнае ўжыванне настолькі, што яно пераважае выкарыстоўванне літаратурнай мовы ў камунікатыўных функцыях. Узмацніўся канфлікт паміж старой, рэпрэсаванай арфаграфіяй (*тарашкевіца*) і саветызаваным (русіфікатарскім) правапісам (*наркамаўка*). Змяшэнне моваў набывае новыя формы і функцыі: часам у газетным артыкуле на расійскай мове галоўная ідэя фармулюецца па-беларуску; у расійскамоўным палітычным выступе асобныя беларускія фразы могуць ужывацца як знакі нацыянальнай свядомасці і нацыянальна-адраджэнскай арыентацыі аўтара ці прамоўцы; беларуская мова на шыльдах прадпрыемстваў дробнага бізнесу часам успрымаецца як знак нацыянальнай трываласці і ўкаранёнасці; у расійскамоўных СМІ ўкрапіны на беларускай гучаць як кпіны з беларускамоўнай апазіцыі ці з традыцыйнай беларускай культуры; у сваю чаргу, у апазіцыйнай беларускай прэсе ўкрапіны трасянкі — звычайна гэта кпіны з расійскамоўных беларусаў; скажоная ці ўтрыраваная расійская мова падкрэслівае непрыманне русіфікацыі і “савецкасці”.

У апошнім артыкуле гучыць іранічны пасаж адносна канца абвешчанага аб’яднання Беларусі з Расіяй, пры гэтым цытуецца галоўны носьбіт *трасянкі* — сам беларускі прэзідэнт, калі ён зухавата адкідвае нацыянальную мову сваёй краіны як мову бедную, на якой нельга выразіць нічога вялікага (с.127).

Гэты выдатны зборнік глыбокіх, дбайна дакументаваных і дакладна напісаных даследаванняў будзе карысным усім, каго цікавіць дзвюхмоўе, моўная палітыка і феномен мовы ў якасці сімвалу і падмурку нацыянальнай ідэнтычнасці. Першыя шэсць артыкулаў упершыню пабачылі свет за межамі Беларусі,

апошняя праца напісана спецыяльна для разгледжанага тому. Варта спадзявацца, што ў недалёкай будучыні гэтая высакаякасная кніга будзе перавыдадзена; яна заслугоўвае таго, каб знайсці свайго шырокага чытача ў самой Беларусі.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Майстраваньне **[mk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/01/21
[image]